*Historia est testis temporum, lux veritatis, vita memoria, magistra vitae, nuntia vetustatis.*
*M. Tullius Cicero, De Oratore 2.36*

# Гарадзенскі палімпсест.
# XII – XX стст.

## Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі

## Горадня, 7 лістапада 2008 г.

Горадня – Беласток

2008

pawet.net

Серыя «Гарадзенская бібліятэка»
выдаецца пад патранатам
Аляксандра Мілінкевіча,
лідэра Руху «За Свабоду»,
лаўрэата прэміі імя А. Сахарава
Еўрапейскага парламента
«За свабоду думкі»

Лагатып серыі і праект вокладкі: Алеся Раднова

Каардынатар серыі: Павал Мажэйка

Навуковае выданне

Рэцэнзенты:
Доктар гістарычных навук, прафесар З.В.Шыбека.
Кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.М.Токць.

**Гарадзенскі палімпсест. XII – XX стст.** Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Горадня, 7 лістапада 2008 г.) / Пад рэдакцыяй А.Ф.Смаленчука, Н.У.Сліж. – Горадня-Беласток, 2008. 228 с., іл.

Матэрыялы зборніка прысвечаныя гісторыі Горадні. Аўтары артыкулаў імкнуліся прачытаць знішчаныя часам і людзьмі старонкі гарадзенскага мінулага. У цэнтры іх увагі апынуліся праблемы палітычнай, ваеннай і нацыянальна-культурнай гісторыі. Асобнае месца ў зборніку адведзена крыніцазнаўству і публікацыі дакументаў.

Зборнік адрасаваны навукоўцам, а таксама ўсім, каго цікавіць гісторыя Беларусі і мінулае яе гарадоў.

© Аўтарскі калектыў, 2008.

# Прадмова

Гэты зборнік з'явіўся ў выніку скандалу. У красавіку 2008 г. шэраг беларускіх і польскіх гісторыкаў байкатавалі правядзенне юбілейнай канферэнцыі "Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі". Яе галоўнымі арганізатарамі былі кафедра гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я.Купалы (загадчык І. Крэнь) і Гарадзенскі гарвыканкам (А.Антоненка). Байкот быў выкліканы тым, што арганізатары ў апошні момант выкраслілі з складу яе ўдзельнікаў двух гісторыкаў – Алеся Смаленчука і Аляксандра Краўцэвіча. Гарадзенскія чыноўнікі "ад ідэалогіі" разам з "чэснымі" гісторыкамі на пасадах з гістарычнага факультэту ГрДУ пры вызначэнні складу ўдзельнікаў навуковай канферэнцыі выкарысталі ідэалагічную цэнзуру.

Гэты абуральны факт шмат гаворыць пра сітуацыю ў Горадні. Чыноўная Горадня разам з афіцыйным Менскам сёння з'яўляюцца нефармальнымі лідэрамі, як у справе знішчэння гарадской гісторыка-культурнай спадчыны, так і "зачысткі" гістарычнай навукі і адукацыі ад навукоўцаў, якія супрацьстаяць "экскаватарнай археалогіі" і г. зв. "рэканструкцыі" гістарычных цэнтраў гэтых гарадоў. Між тым злачынства навукоўцаў толькі ў тым, што яны настойваюць на выкананні палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" і прывядзенні ўсіх рамонтна-будаўнічых прац у адпаведнасць з Генеральнымі планамі развіцця Горадні і Менску.

Варта яшчэ раз падкрэсліць, што **рэканструкцыя па-гарадзенску** – гэта фактычнае знішчэнне гісторыка-культурнай аўтэнтычнасці гораду і ператварэнне помнікаў гарадской архітэктуры ў муляжы пад адкрытым небам або ў пляцоўкі з бетону і пліткі. Менавіта гэта адбываецца зараз у гістарычным цэнтры Горадні на вачах яе жыхароў, у т.л. выкладчыкаў і студэнтаў гістарычнага факультэта ГрДУ, большасць якіх дэманструе поўную абыякавасць да лёсу гістарычнай Горадні.

Звесткі пра "ідэалагічны" адбор удзельнікаў канферэнцыі ўскалыхнулі навуковую супольнасць краіны. Адным з першых ідэю байкоту выказаў гісторык Генадзь Сагановіч. Яе падхапілі вядомыя даследчыкі з Менску, Горадні, Берасця, Гомеля, Беластоку і Кракава. Паводле неафіцыйных ацэнак, у канферэнцыі не прынялі ўдзелу каля 40 навукоўцаў (!) Прычым некаторыя з іх заявілі, што наогул адмаўляюцца ўдзельнічаць у "навуковых" мерапрыемствах гістарычнага факультэту ГрДУ. Асаблівую мужнасць праявілі гарадзенцы, якія вытрымалі моцны псіхалагічны і адміністрацыйны ціск і не пабаяліся адкрыта асудзіць ідэалагічную цэнзуру і тое пагардлівае стаўленне да гістарычнай навукі і гісторыкаў, якое прадэманстравалі арганізатары канферэнцыі.

Салідарнасць гісторыкаў стала ПАДЗЕЯЙ у навуковым і культурным жыцці. Асабіста гэта адчуў падчас сустрэчы з кіраўніком Цэнтра еўрапейскіх

pawet.net

даследаванняў Універсітэту ў Стэнфардзе прафесарам Амірам Вайнерам. Салідарнасць беларускіх навукоўцаў зрабіла моцнае ўражанне на амерыканскіх калегаў. Сапраўды, сярод навуковай і універсітэцкай супольнасці нашай краіны праявы публічнай падтрымкі тых, хто трапіў у "чорныя спісы" адміністрацыйных ідэолагаў надзвычай рэдкая.

Перамога афіцыйных і неафіцыйных "ідэолагаў" абярнулася навуковым правалам канферэнцыі. Між тым гісторыя Горадні, асабліва ў сітуацыі той пагрозы, якая навісла над гістарычнай унікальнасцю горада, заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі. Менавіта таму нарадзілася ідэя альтэрнатыўнай канферэнцыі без ідэалагічнай цэнзуры. Адзіным крытэрыем адбору яе ўдзельнікаў быў высокі навуковы ўзровень прапанаваных тэкстаў[1]. Дасланыя да ўдзелу ў канферэнцыі заяўкі і тэксты рэцэнзаваліся вядомымі гісторыкамі. Частка дасланых тэзісаў і рэфератаў была адхіленая арганізатарамі. Спадзяюся, што іх аўтары не пакрыўдзяцца і прымуць чынны ўдзел у падрыхтоўцы зборніка гістарычных тэкстаў "Таямніцы каралеўскага гораду", які будзе чарговым выданнем у серыі "Гарадзенская бібліятэка"[2].

Канцэпцыя канферэнцыі адлюстравалася ў яе назве – "Гарадзенскі палімпсест. XII – XX ст." Нагадаю, што паняцце "палімпсест", звязанае з гісторыяй кніжнай культуры. Да вынаходніцтва друкарскага станка ва ўмовах дэфіцыту пергаменту асновай для стварэння новай кнігі часцяком былі іншыя рукапісныя кнігі, тэкст якіх знішчаўся. Новая кніга пісалася на выскабленых старонках. Гэты вобраз добра разумеюць даследчыкі беларускіх гарадоў, у тым ліку і Горадні. На працягу стагоддзяў яна вельмі часта ператваралася ў своеасаблівы палімпсест, у якім чарговая ўлада спрабавала пісаць уласную гісторыю, вынішчаючы пры гэтым былы вобраз горада і ягоныя традыцыі. У пэўным сэнсе гэта адбываецца і сёння на нашых вачах… **Задача даследчыкаў Горадні – прачытаць знішчаныя часам і чарговымі "адміністратарамі" старонкі гарадзенскага мінулага.**

Сярод аўтараў зборніка вядомыя і маладыя даследчыкі з Горадні, Менску, Вільні, Кракава, Беластоку, Варшавы і Стакгольма. Тэксты раздзела "Гісторыя" асвятляюць праблемы гарадабудаўнічага развіцця Горадні XII – XX стст., у т.л. гісторыі яе храмаў, лёсу Горадні ў войнах XVI – XVII стст. з Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй, удзелу гарадзенскай шляхты ў палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVII – XVIII стст., рэфармацыйнай дзейнасці славутага гарадзенскага старосты Антонія Тызенгаўза. Даследчыкі

[1] Прапанова прыняць удзел у канферэнцыі была таксама накіраваная выкладчыкам гістарычнага факультэту ГрДУ.

[2] У серыі "Гарадзенская бібліятэка" (рэдактар А.Смалянчук, каардынатар П.Мажэйка) ужо выйшлі з друку наступныя выданні: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня (сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў 16 – 18 ст.). Гародня – Wrocław, 2008; Бічэль Д. Хадзі на мой голас. Гародня – Wrocław, 2008;Сяўрук П. Небыцця не існуе. Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху. Гародня – Wrocław, 2008.

аналізуюць склад насельніцтва Горадні на рубяжы XIX – XX стст., асаблівасці штодзённага жыцця гораду ў адлюстраванні “Нашай Нівы”, характарызуюць дзейнасць Беларускага нацыянальнага камітэту ў Горадні (1918-1921), а таксама адносіны вучнёўскай моладзі Гарадзеншчыны да г.зв. “першых Саветаў” (1939-1941). Асобна трэба адзначыць матэрыялы раздзела “Гістарыяграфія. Крыніцазнаўства”, якія паказваюць даследчыя магчымасці крыніцазнаўчай базы архіваў і музеяў Беларусі і Польшчы па гарадзенскай тэматыцы, звяртаюць увагу на гістарычныя крыніцы, што захаваліся ў гарадзенскіх храмах.

… “Гарадзенскі палімпсест” таксама адлюстраваўся ў назвах горада над Нёманам. Як вядома, існуюць розныя неафіцыйныя варыянты назвы, кожны з якіх нясе ў сабе адбітак пэўнай эпохі. Калі “Гародня” падаецца больш адпаведнай назвай для даследчыкаў Сярэднявечча і ранняга Новага часу, то “Горадня” – для гісторыкаў, што займаюцца першай трэццю XX ст. Варыянт “Гродна” часцей ужываецца пры даследаваннях гарадской праблематыкі другой паловы XX – пачатку XXI ст. Рэдактары зборніка вырашылі захаваць аўтарскія варыянты назвы горада.

У заключэнні хочацца выказаць удзячнасць усім навукоўцам, якія праявілі салідарнасць і далучыліся да байкоту ідэалагічнага “маразму” у ГрДУ, а пазней даслалі свае тэксты для нашага зборніка і выказалі згоду на ўдзел у канферэнцыі “Гарадзенскі палімпсест. XII – XX стст.”

Выданне гэтага зборніка было б немагчымым без падтрымкі Грамадскага руху “За свабоду!”, шведскіх партнёраў з *NGO Center for Development Cooperation “Forum Syd”* і арганізацыйных намаганняў гарадзенскіх сяброў і калег.

Вялікі вам дзякуй.

Рэдактар
Алесь Смалянчук,
доктар гістарычных навук

# Спіс ілюстрацый

Гарадзенскі замак у XVI ст.
Фрагмент гравюры Мацея Цюндта па малюнку Ганса Адэльгаўзера 1568 г. ........ 7

Плошча Стэфана Баторыя на паштоўцы часоў Другой Рэчы Паспалітай ........ 111

Пячатка гарадзенскага магістрата XVI ст. ........ 177

КП – 9217. Delineacya[!] Placu z Domem drewnianym Koszary zwanym, oraz z Częścą Lodowni drewnianey[!]: w ogóle[!] Morg ieden[!] w Sobie zawieraiącego[!]. Podpisuię[!]. .... 199

КП – 8495. Plan Placów w Mieście Grodnie. Wyliczenie Placów w Mieście Grodnie do Klasztoru PP.Brygidek należnych po uczynionym wymiarze przez Niżej podpisanego Geometrę w Roku 1830 dnia 14 Sierpnia Uczynione. ........ 200

КП – 9010. Планъ Геометрическій Части Города Гродна, то есть: Плаца съ строеніемъ Гродненской Еврейской Больніцы. ........ 201

КП – 14757/3. Планъ города Гродны. Составленъ въ Губернской Чертежной въ 1892 году. Печ. въ Типо-Литографіи Грод. Губерн. Правленія. ........ 202

НД – 251/13, 14. Orjentacyjny plan miasta Grodna. Wydawnictwo księgarni E. Ibierskiego, Grodno. Zakł. graf. Ł.Miejłachowicza, Grodno. 1932 r. ........ 203

# Гісторыя.

# Гародня ў XII – XVIII ст.



*Аляксандар Краўцэвіч,*
*доктар гіст. навук (Гродна)*

# Фармаванне гістарычнага цэнтру Гародні

Планіровачнае развіццё Гародні на працягу доўгага (каля тысячагоддзя) перыяду прайшло некалькі этапаў:

1. Канец X – XIV ст. Узнікненне і развіццё паселішча паводле традыцыйнай для ўсходнеславянскіх гарадоў схемы: дзядзінец – вакольны горад – пасад.

2. XV – XVI ст. Стварэнне па заходнееўрапейскаму ўзору двухцэнтравай прасторавай кампазіцыі (замак і рынак з ратушай), развіццё новага пасаду паводле прамавугольна-квартальнай схемы, узнікненне Занёманскага пасаду.

3. XVII – XVIII ст. Фармаванне вуліц барочнага кшталту (плаўныя дугі) і новай сістэмы архітэктурных дамінантаў (барочныя касцёлы ў ключавых пунктах гарадской тэрыторыі), узнікненне архітэктурнага комплексу Гарадніцы.

4. XIX – XX ст. Змена архітэктурнага аблічча горада (перабудова пад цэрквы або знос некалькіх касцёлаў), будаванне фабрычных і адміністрацыйных будынкаў (у межах цэнтру або па-за межамі гораду XVIII ст.)

5. XX – пачатак XXI ст. Паступовае вынішчэнне гістарычнай забудовы цэнтру (у час святовых войнаў і, галоўным чынам, праз дзеянні савецкіх і лукашэнкаўскіх уладаў).

***

Як і многія іншыя старажытныя беларускія гарады, Гародня пачыналася з невялікага ўмацаванага паселішча эпохі сярэднявечча. На працягу XI – XII ст. тут сфармавалася тыповая для ўсходнеславянскіх гарадоў планіровачная структура. Менавіта, трохчасткавая: дзядзінец (месца жыхарства князя, умацаваны адміністрацыйны цэнтр - Стары замак) – вакольны горад (умацаваны пасад – Новы замак) – неўмацаваныя пасады (сягалі да сучаснай Савецкай плошчы і вуліцы Падольнай).

Самае старажытнае паселішча ў Гародні, якое датуецца канцом X – пачаткам XI ст., адкрыта археолагамі на мысе пры ўпадзенні р. Гараднічанкі ў Нёман. Тут знаходзіўся дзядзінец горада эпохі Кіеўскай Русі. Вакольны горад, па ўсёй верагоднасці, размяшчаўся на суседнім узвышшы, дзе ў сярэдзіне XVIII ст. быў пабудаваны каралеўскі палац (Новы замак). Найстаражытнейшыя матэрыялы, знойдзеныя падчас раскопак на Новым замку, датуюцца XI – XII ст. Па даных археалогіі, у XI ст. ужо быў заселены правы бераг Гараднічанкі насупраць дзядзінца, а таксама тэрыторыя, прылягаючая да Старога замку з усходу.

У XII ст. тут пабудавана мураваная Прачысценская царква. У XI – XII ст. быў заселены ўчастак, што прылягае да Старога замку з паўночнага ўсходу і Падол (зараз вуліца Падольная).

Адметнасцю тагачаснай гарадзенскай планіроўкі былі мураваныя храмы (4 ці 5) з своеасаблівым вонкавым выглядам, што для сучасных даследчыкаў стала адной з падстаў выдзялення асобнай Гарадзенскай архітэктурнай школы XII ст.[1] З усіх помнікаў гэтай школы толькі адна Барысаглебская царква ў паўразбураным выглядзе захавалася да нашых дзён. Яна размешчана на правым беразе Гараднічанкі за межамі асноўнай тэрыторыі горада. Усе астатнія вядомыя нам збудаванні адкрытыя археолагамі. Да іх адносяцца: гэтак званая “Ніжняя царква” ў цэнтры дзядзінца (ужо ў XIV ст. ляжала ў руінах), княскі церам на паўднёва-заходнім ускрайку Замкавай гары, сцяна з плінфы (відавочна, уваходзіла ў комплекс з драўлянымі ўмацаваннямі), збудаваная на самым мысе, Прачысценская царква на пасадзе на ўсход ад дзядзінца. Назва апошняй вядома па дакументах XVI ст. Падмурак і рэшткі сцен Прачысценскай царквы знойдзены ў 1980 г. на тым месцы, дзе храм паказаны на гравюры 1568 г.[2] Можна меркаваць пра наяўнасць у канцы XII ст. у Гародні яшчэ двух цэркваў: на вакольным горадзе (па дакументах XV – XVI ст. тут вядомая Васкрасенская царква, а падчас нашых раскопак у 1987 – 1988 г. на Новым замку знойдзеныя кавалкі сцен з плінфы) і гэтак званая “Малая царква” (на пасадзе на паўночны усход ад дзядзінца быў раскапаны развал плінфы), вядомая па крыніцах канца XIV ст. Абодва гэтыя храмы паказаныя на гравюры 1568 г.

Па летапісных звестках, якія адносяцца да XIII ст., мы ведаем пра існаванне яшчэ адной архітэктурнай дамінанты: вежы валынскага тыпу на гарадзенскім дзядзінцы. “Столб бе бо камен высок стоя пред вороты города. И бяху в немъ заперлися Прузы и не бысть имь мимо нъ паити к городу, пабивахуць бо со столпа того”[3]. Месцазнаходжанне вежы вызначаецца даволі дакладна – каля моста, што злучае вакольны горад з дзядзінцам. Відавочна, вежа ўвайшла ў склад умацаванняў замка Вітаўта, збудаванага ў канцы XIV – пачатку XV ст., і відная на гравюры.

Гэты магутны мураваны замак у гатычным стылі быў узведзены на месцы ранейшых умацаванняў дзядзінца. У плане ён паўтараў абрысы дзядзінца і меў форму няправільнага трохвугольніка. Абарончыя збудаванні замка Вітаўта грунтоўна разгледжаныя ў працы Я.Вайцэхоўскага[4]. Чатыры з пяці вежаў (акрамя ўпамянутай круглай) былі ў плане квадратнымі (12 х 12 м). Даўжыня сцен па

[1] Галоўнымі прычынамі выдзялення гэтай школы, акрамя багата дэкараваных маёлікавымі пліткамі і шліфаванымі камянямі сценаў, былі таксама кампазіцыйныя асаблівасці гарадзенскіх мураваных будынкаў і спецыфічная тэхніка іх будавання.

[2] Да гарадзенскай архітэктурнай школы акрамя названых помнікаў належыць недабудаваная, як мяркуюць даследчыкі, царква на Замчышчы ў Ваўкавыску.

[3] ПСРЛ. Т. 2. С. 878.

[4] Wojciechowski J. Stary zamek w Grodnie. Warszawa, 1938.

перыметру складала каля 220 м, таўшчыня дасягала 3 м. Палац размяшчаўся ў паўднёва-усходняй частцы замка. Ён быў прыбудаваны да абарончай сцяны. Да нашых дзён захаваліся толькі фрагменты сцен.

У XIV ст. на тэрыторыі замку над разваліднамі Ніжняй царквы збудавана гэтак званая "Верхняя царква" ў гатычным стылі. Па памерах яна значна саступала сваёй папярэдніцы. У плане Верхняя царква мае квадрат са зрэзанымі вугламі са старанай 8,8 м (памеры Ніжняй царквы – 16 x 11 м).

У беларуска-літоўскіх летапісах сустракаюцца звесткі пра Ніжні замак. Так у "Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай" гаворыцца, што ў 1399 г. "…Нижний замок королевские жолънере на що сам Витолт з жалостью гледьял, взяли были. И так Витолт, переставши нового замку будовати, ланцук великий желъзный през Немен до Вышшого Гродненского замку припровадивши, у Брамы казал привязати"[5].

Ніжні замак размяшчаўся на вакольным горадзе. Я.Вайцэхоўскі прыйшоў да высновы, што тут было дапаможнае Верхняму замку ўмацаванне ў выглядзе абарончай сцяны, магчыма, з вежамі[6]. Замкі дамінавалі над горадам і з'яўляліся галоўнымі цэнтрамі ў прасторавай кампазіцыі паселішча.

У некаторых дарэвалюцыйных працах упамінаецца замак на левым беразе Нёмана. Яго збудавалі крыжакі ў 1392 г. з дазволу князя Вітаўта і ўвялі туды гарнізон. Відавочна, ордэн дабіўся дазволу на будаўніцтва ў абмен за дапамогу Вітаўту ў вайне з Ягайлам. Аднак у тым жа годзе Вітаўт гэты замак разбурыў[7].

Археалагічныя матэрыялы сведчаць пра ўпадак гарадскога жыцця ў канцы XIII – XIV ст. М.М.Воронін адзначае "выключную беднасць і адрывачнасць" рэчавага матэрыялу гэтых стагоддзяў з раскопак на Старым замку[8]. Відавочна, у гэты час прыпыніўся далейшы рост горада. Асноўная пасадская тэрыторыя горада XIV ст. размяшчалася паміж замкам і рынкам. З поўначы і захаду тэрыторыя Гародні абмяжоўвалася Нёманам і Гараднічанкай. Тэрыторыя вакол Барысаглебскай царквы (Каложа), была занятая пабудовамі, звязанымі з Барысаглебскім манастыром. Вызначыць прыкладныя межы гарадской тэрыторыі ў канцы XIV – пачатку XV ст. можна па размяшчэнню могілак. Праваслаўныя могілкі знаходзіліся на Падоле, каталіцкія – каля касцёла, жыдоўскія – на беразе Гараднічанкі. Відавочна, у гэты час склалася планіроўка заходняй часткі гораду, арыентаваная на замак, якая захоўвалася і ў наступныя часы.

У горадзе канца XIV – пачатку XV ст. вядомыя наступныя асноўныя збудаванні: замкі Верхні і Ніжні, царква Барыса і Глеба на правым беразе Гараднічанкі, цэрквы Прачысценская і Малая на пасадах, адпаведна на ўсход і паўночны ўсход ад Верхняга замка, Верхняя царква на Верхнім замку, Васкра-

[5] ПСРЛ. Т. 32. С. 67.

[6] Wojciechowski J. Stary zamek w Grodnie. S. 134.

[7] Историческое описание города Гродно. Гродно, 1860. С. 10 – 11.

[8] Воронин Н.Н. Древнее Гродно. С. 165.

сенская (?) на Ніжнім замку (усе мураваныя), драўляны касцёл і сінагога. У гэты час ужо існаваў кірмаш на тым самым месцы, дзе знаходзіўся і пазней (зараз Савецкая плошча), а таксама, былі ўмацаванні вакол пасада.

Несумненна, што ў другой палове XIII – XIV ст. вялікі ўплыў на жыццё горада аказвала знешняя пагроза з боку крыжакоў. Горад неаднаразова быў аб'ектам нападу, спальваўся і разбураўся. Зразумела, што ў такіх умовах задачы абароны выклікалі неабходнасць умацавання акрамя замку яшчэ і пасаду, што было зроблена[9].

У XV ст. адбылася кардынальная змена ў плановачным развіцці Гародні, звязаная з агульным для краіны працэсам змены цывілізацыйнай арыентацыі, менавіта ўваходам Беларусі ў сферу ўплываў заходнееўрапейскага гісторыка-культурнага арэалу. Горад набыў двухцэнтравую планіроўку - акрамя даўняга адміністрацыйнага цэнтру – Старога замку (сядзіба прадстаўніка цэнтральнай улады), узнік новы цэнтр (сядзіба гарадскога самакіравання) на рынкавай плошчы з ратушай. Гэтая еўрапейская асаблівасць гарадской планіроўкі была ўласцівая ўсім гарадам Беларусі, якія мелі самакіраванне (па Магдэбургскаму ці іншаму праву) і выразна адрознівала іх ад расейскіх гарадоў, якія не мелі самакіравання да XIX ст.

З XV ст. па-за старажытнай часткай пасаду, сфармаванага па радыяльна-кальцавой схеме пачаў разрастацца новы на аснове прамавугольна-квартальнай схемы. Болей за дзвесце гадоў (да сярэдзіны XVII ст.) горад абыходзіўся без знешніх умацаванняў і развіццё вулічнай сеткі вызначалася галоўным чынам горадабудаўнічымі традыцыямі таго часу і асаблівасцямі рэльефу. Горад рос у асноўным ва ўсходнім кірунку паміж рэчышчамі Нёмана і Гараднічанкі. Галоўным фактарам, які вызначаў фармаванне вулічнай сеткі Гародні ў XV – XVII ст. быў накірунак дзвюх гандлёвых дарог з Вільні на Варшаву і з усходу, з Смаленска на захад. Ва ўсходняй частцы горада размяшчэнне вуліц увязана з напрамкам гэтых шляхоў. Рэгулярная форма галоўнага гарадскога рынку вызначылася, на думку А.Д.Квітніцкай, хутчэй за ўсё ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст., калі былі збудаваныя фарны касцёл і карчма[10]. Магістралі падыходзілі да рынку з вуглоў, каб падчас кірмашу не ўскладняўся праезд праз рыначную плошчу[11].

Да канца XV ст. належыць першае дакументальнае сведчанне аб наяўнасці занёманскага пасаду. У прывілеі на магдэбургскае права, выдадзеным у 1496 г., гаворыцца, што гарадское ўпраўленне па Магдэбургскаму праву распаўсюджваецца і на гараджан, якія жывуць за Нёманам, і на падалян, а таксама на людзей, што пражываюць у дварах феадалаў[12]. Прывілей называе гарадскія грамадскія пабу-

[9] Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня; Wrocław, 2008. С. 20.

[10] Квитницкая Е. Д. Центры городов Белоруссии в XVI – первой половине XIX в. // Архитектурное наследство. Москва, 1982. № 31. С. 28–50.

[11] Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI – XVIII вв. // Архитектурное наследство. Москва, 1964. №17. С. 11 – 38.

[12] Акты Виленской археографической комиссии (далей – АВАК). Т. 7. С. 60.

довы, якія гораду дазвалялася ўзводзіць “у падыходзячых месцах”. Гэта млын, камяніца для размяшчэння вагаў і васкабойні, лазня і ратуша. Вядома месцазнаходжанне толькі ратушы (на рынку). Пра млын гаворыцца, што яго можна збудаваць на р. Нёман. У дакуменце ўпамінаюцца тры карчмы (якія на той час ужо існавалі), але іх месцазнаходжанне не выяўлена. У прывілеі згадваецца яшчэ адно грамадскае збудаванне – “месца, дзе караюць злачынцаў, інакш, шыбеніца”, якая размяшчалася на некаторым аддаленні ад горада, каля гарадскога лугу. На гравюры Мацея Цюндта, выкананай на 72 гады пазней, шыбеніца паказана на ўзгорку за ўсходняй ускраінай горада[13].

Каля 1480 г. упершыню ў дакументах упамінаецца царква Праўдзівага крыжа на Падоле[14]. Стары раён горада паміж замкам і рынкам у XV – XVI ст. заставаўся без істотных зменаў. Умацаванні XIV ст., відавочна, у гэты час былі знесены і таму не абазначаныя на планах XVII – XVIII ст. Паступова прыходзіў у заняпад і разбураўся Ніжні замак. На гравюры 1568 г. на яго месцы відаць толькі рэшткі сцен.

З дакументаў XVI ст. вядома пра існаванне ў гэты час у горадзе калодзежа і водаправода[15]. У 1579 г. Стэфан Баторый даў прывілей на пабудову карчмы на рынку[16].

Пра планіроўку Гародні ў XVI – XVIII ст. мы можам гаварыць болей акрэслена дзякуючы значна большай колькасці (у параўнанні з папярэднім перыядам) пісьмовых крыніц. Асноўнай з іх з’яўляецца “Валочная памера горада Гародня з валасцямі, якія да яго належаць”, складзеная ў 1560 г. Агульны воблік гарадской забудовы перадае найстарэйшая з выяваў сярод усіх беларускіх гарадоў - гравюра Гародні з 1568 г., выкананая немцам Мацеям Цюндтам.

Найбольш грунтоўна над вывучэннем планіроўкі Гародні XVI – XVIII ст. працавала Алена Квітніцкая. Яе рэканструкцыя на 1560 г. стала магчымай дзякуючы стабільнасці планіровачнай структуры[17]. Па апісанню ў дакументах Валочнай памеры горад у другой палове XVI ст. складаўся з дзвюх няроўных частак: Старога гораду, размешчанага на правым беразе Нёмана, і Новага гораду – левабярэжная частка. У Старым горадзе было 24 вуліцы, у Новым – 4. Усяго налічвалася 712 пляцаў, з іх большая частка належала мяшчанам-хрысціянам, 56 пляцаў былі ў валоданні жыдоў. У старой частцы горада было два рынкі: галоўны (з ратушай) і Нямецкі. Трэці рынак размяшчаўся ў Новым горадзе. Пад гарадской юрысдыкцыяй знаходзілася 17 вёсак. У пачатку XVI ст. за ім лічылася больш за 418 валок (каля 9 тыс. га) зямлі[18].

13 Lüneburger Beiträge zur Vedutenforschung. Lüneburg, 1983. S. 103–107.

14 Вестник Западной России. Вильна, 1866. 4. Кн. 5. Т. 2. Отд. 2. С. 62.

15 АВАК. Т. 7. С. 75.

16 Тамсама. С. 93.

17 Квитницкая Е. Планировка Гродно в XVI – XVIII вв. С. 11 – 38.

18 Писцовая книга Гродненской экономии. Вильна, 1881–1882. Ч. 1. С. VII.

Усяго ў Гародні ў XVI ст. вядома шэсць мураваных праваслаўных храмаў: Прачысценская царква – саборная, Барысаглебская, гэтак званая “Верхняя”, Васкрасенская, гэтак званая “Малая”, капліца на могілках, а таксама два мураваныя касцёлы (фарны і Святога духа). Не вызначана Сямёнаўская царква. Такую назву маглі насіць Малая царква, капліца, а магчыма, гаворка ідзе пра асобны храм. Акрамя названых, у горадзе былі і драўляныя цэрквы – Праўдзівага крыжа і Мікалаеўская, а таксама Траецкая царква, пра якую невядома, была яна драўлянай ці мураванай. З дрэва была збудаваная і гарадзенская сінагога[19].

У гарадскіх актах XVII ст. часта ўпамінаюцца царкоўныя ўчасткі на Падоле. На іх было многа “…усялякіх будынкаў з комінамі мураванымі, з печамі, вокнамі, усялякімі жалезамі і ўсялякім начыннем … з парканам”[20].

На гравюры Цюндта ва ўсходняй частцы гораду відныя каралеўскія стайні. Аднак ёсць падставы меркаваць, што яны размяшчаліся далей, чым паказаныя на гравюры. Важным збудаваннем дзяржаўнага значэння быў мост праз Нёман. У апісанні да гравюры ўпамінаюцца неўмацаваныя гарадскія брамы.

Падчас гаспадарання Стэфана Баторыя (1576 – 1586) на месцы замка Вітаўта быў збудаваны новы, ад якога да нашых дзён захаваўся неаднаразова перабудаваны палац. Дакладных звестак пра планіроўку замкавых пабудоваў у нас няма. Рэканструкцыя, прапанаваная Я.Вайцахоўскім, заснаваная на вывучэнні планаў XVIII ст. і інвентарных вопісаў XVII ст. У гэты час знешні воблік замку моцна адрозніваўся ад будынку часоў Баторыя. Гэта было звязана з акупацыяй і разбурэннямі, прынесенымі войскамі Маскоўскай дзяржавы ў 1655 г. На месцы Ніжняга замку быў збудаваны каралеўскі дом, які бачны на гравюры. У апісанні гравюры гаворыцца, што горад не абнесены сцяной, і што ён не мае прад сабой умацаванняў. У ім мала цагляных дамоў.

У сярэдзіне XVI ст. участкі гарадзенцаў звычайна мелі ў плане форму, блізкую да прамавугольніка або выцягнутай трапецыі. На вуліцу выходзіў вузкі бок участка. Зямельны надзел складаўся з дзвюх частак: сядзібнай і агароднай. Паводле Валочнай памеры можна прасачыць плошчу гарадскіх сядзібаў XVI ст. і зрабіць пэўныя высновы пра маёмасны стан іх уладальнікаў. Каля 11,7% жыхароў Старога гораду мелі сядзібы плошчаў у 0,5 прэнта (каля 12 кв.м). На такім участку магло змясціцца толькі невялікае аднакамернае збудаванне. Драўляныя жылыя дамы такой жа плошчы адкрытыя Алегам Трусавым і Міхасём Ткачовым на Старым замку. Па аналагах з імі можна меркаваць, што гарадскія пабудовы плошчай 0,5 прэнта мелі памеры прыблізна 3 х 4 м.

Значную частку сядзіб складалі надзелы плошчай у 1 – 1,5 прэнта (23,7 і 35,5 кв. м). На такой плошчы маглі змясціцца два невялікія збудаванні па 12 кв. м і маленечкі дворык або жылы дом з прыбудовамі. На гравюры 1568 г. бачны так-

[19] Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння 14–18 стст.: Планіроўка, культурны слой. Мн. 1991.С. 77–84.

[20] АВАК. Т. 1. С. 354.

сама двухпавярховыя дамы. Большасць збудаванняў былі драўлянымі, у той жа час на гравюры выразна вылучаюцца таксама дамы фахверкавай канструкцыі. Добра прыкметныя круглыя шыбы ў вокнах; па малюнку можна вывучыць канструкцыю пад'ёмніка вады ў студні, павозкі і г.д.[21]

Новы этап горадабудаўнічага развіцця Гародні пачаўся ў XVII ст. і закончыўся разам з пачаткам расейскай акупацыі. Кардынальных зменаў планіроўкі ён не прынёс, але візуальнае аблічча гораду змянілася даволі значна пад уплывам новай грамадска-ідэалагічнай з'явы – контррэфармацыі і звязанага з ёй мастацкага стылю – барока.

У нашыя дні старая Гародня паводле свайго архітэктурнага аблічча – суцэльны помнік барока. Гістарычны цэнтр гораду дня захаваў барокавую планіроўку, характэрнай рысай якой з'яўляюцца вуліцы, закругленыя плаўнай дугой.

У XVII ст. паўстала большасць каталіцкіх касцёлаў, якія і сёння фармуюць воблік гарадскога ландшафту. Яны спецыяльна ўзводзіліся ў ключавых пунктах гарадской планіроўкі, як правіла, на узвышаных месцах. Калі ў XVI ст. у горадзе было шэсць цэркваў і адзін касцёл, то пад канец наступнага стагоддзя касцёльныя пабудовы дамінавалі. У XVII ст. актыўна разбудоўваўся пачаты яшчэ ў мінулым стагоддзе кляштар і касцёл бернардынаў, паўсталі будынкі манастыроў і касцёлаў дамініканаў, францысканцаў, езуітаў, брыгітак, бернардынак. У XVIII ст. былі ўзведзеныя кляштары баніфратраў, кармелітаў і кармелітак.

Не ўсе яны захаваліся да нашага часу. Некаторыя пабураныя або перабудаваныя так, што ў іх немагчыма пазнаць першапачатковы выгляд. Ад манастыра дамініканаў застаўся толькі кляштар (вул. Савецкая 8). Калі прыглядзецца да будынку побач з ім (мураваны двухпавярховы жылы дом), то можна пазнаць у ім касцёл, у якога спілавалі вежы (яшчэ ў царскія часы). Перабудаваны касцёл кармелітаў (цяпер у тым будынку банк), разбураны манастыр бернардынак.

Важнай горадабудаўнічай падзеяй стала ўзвядзенне Новага замку, менавіта, каралеўскага палацу ў стылі ракако (1737 – 1742 г.), як месца правядзення агульнадзяржаўных соймаў. Адбылося гэта ў часы саксонскай дынастыі пры каралі Аўгусце III. Праектавалі палац і звязаныя з ім будынкі саксонскія архітэктары Караль Попельман, Яўхім Яўх, Ёган Кнобель. Выбрана было выдатнае месца (былы вакольны горад) каля самога цэнтру на беразе Нёмана насупраць Старога замку.

Ад 1792 г бяруць пачатак каталіцкія гарадзенскія могілкі (першае зарэгістраванае пахаванне) на сучаснай вул. Антонава – сапраўдны помнік культуры, адзін з нямногіх, ацалелых ў Беларусі[22]. Размешчаныя побач старыя праваслаўныя могілкі нашмат старэйшыя, па некаторых звестках, яны сягаюць сваімі пачаткамі часоў сярэднявечча.

---

21 Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння… С. 84 – 86.

22 Rozmus J., Gordziejew J. Cmentarz farny w Grodnie 1792–1939. Kraków, 1999.

Гародня ўвайшла ў склад Расейскай імперыі ў 1795 г. па трэцяму і апошняму разбору Рэчы Паспалітай. Расейскае панаванне пакінула глыбокі адбітак на горадзе, які выразна відаць і сёння. Перабудова моцна змяніла аблічча фарнага гатычнага касцёла (фара Вітаўта). У 1804 г. ён быў пералвораны ў праваслаўную царкву (Сафійскі сабор), аднак вонкавы выгляд яго доўгі час заставаўся ранейшым гатычна-рэнесансным. Пасля пажару 1892 г. храм быў перабудаваны ў абавязковым тады на "забраных землях" псеўдарускім стылі. Вежу завяршылі шатром, над базылікай паставілі пяць купалоў-цыбулінаў. У падобным стылі быў збудаваны і Вайсковы сабор (1907 г., вул. Ажэшкі).

Да сярэдзіны XIX ст. расейцы будавалі галоўным чынам "казённыя" ўстановы: Акруговая лячэбніца, Кантрольная палата і вялізныя казармы. Ажыўленне гарадскога жыцця і будаўніцтва пачалося пасля правядзення праз Гародню лініі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі – першай у Расейскай імперыі (1862 г.). У 1868 г. на гарадской ускраіне быў пастаўлены гарадзенскі чыгуначны вакзал (разбураны ў 1984 г., нягледзячы на пратэсты грамадскасці). Чыгунка ажывіла прамысловасць. Пачалі ўзнікаць шматлікія новыя прадпрыемствы. Самым вялікім прамысловым закладам не толькі ў Гародні, але і ва ўсёй Беларусі была тытунёвая фабрыка Шарашэўскага, на якой працавала каля паўтары тысячы работнікаў.

Летам 1885 г. Гародня перажыла страшэнны пажар, які працягваўся некалькі дзён і знішчыў большую частку гораду. Развіццё прамысловасці і гандлю выклікала пашырэнне прыватнага будаўніцтва. Расейскі гісторык архітэктуры ацаніў тыя часы як хуткае развіццё горадабудаўніцтва (транспарту, сувязі, інжынерныя збудаванні) і пераважна хаатычную забудову з ігнараваннем "мастацкіх патрабаванняў". "Застройка велась домами с разноликой, большей частью безвкусной архитектурой сообразно с финансовыми возможностями и вкусом заказчиков... Сухостью, официальностью веет от больших казарменных зданий, построенных в последнюю треть XIX и первые годы XX в. Близка к ним и архитектура Народного дома"[23] (зараз тут гарадскі дом культуры, вул. Дзяржынскага).

Але трапляліся таксама і цікавыя будынкі, напрыклад, дом Сялянскага банку (1910 г. вул. Сафійская, цяпер Леніна,), дом Тальгейма на той жа вуліцы (1911 г.), вядомы як "дом урача", будынак рэальнага вучылішча (цяпер там Аграрны універсітэт, вул. 1-га Мая). У сённяшнім гарадскім краявідзе вылучаюцца дзве воданапорныя вежы на вул. Свярдлова і пажарная вышка каля Новага замку.

Імперскія ўлады планавалі цалкам змяніць барочную планіроўку каралеўскага гораду на тыповую расейскую. У маскоўскім архіве захоўваецца план перабудовы Гародні ў межах "Генеральнага перапланавання гарадоў Расейскай імперыі", якое распачалося там яшчэ ў XVIII ст. Калі Расея захапіла Бела-

[23] Кудряшов В.И. Гродно. Москва, 1960. С. 90–92.

русь, то гэтае "мерапрыемства" было перанесенае і сюды. Ва ўсходнебеларускіх гарадах, якія першымі трапілі пад уладу Расею, гэта ўдалося зрабіць у XIX ст. Была перарobленая ўся сетка вуліц – замест выгнутых барочных праведзеныя прамыя "класічныя", горад падзелены на прамавугольныя клеткі-кварталы. Будынкі (жылыя дамы, касцёлы), якія перашкаджалі выпрамленню, проста зносіліся. Так былі перакроеныя Полацак, Віцебск, Мсціслаў, Магілёў і інш. Да Гародні і іншых панямонскіх гарадоў чарга падышла ў XX ст., але расейскія планы перакрыжавала Першая сусветная вайна. Яны засталіся ў архівах. На тых праектах чорным атраментам нанесеная існуючая барочная планіроўка, а паверх яе чырвоным алоўкам намаляваныя "шахматныя" клеткі кварталаў, раздзеленых прамымі вуліцамі.

Самыя вялікія разбурэнні Гародня перажыла ў другой палове XX ст. і ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. У гэтыя мірныя часы гораду было нанесена больш ранаў, чым ваеннымі дзеяннямі у двух сусветных войнах. У 1958 г. была разбураная большая частка пабудоваў Тызенгаўза. У 1961 г. улады ўзарвалі галоўную гарадскую архітэктурную дамінанту – знакамітую Фару Вітаўта[24]. Планавалася знішчэнне ўсіх касцёлаў XVII – XVIII ст.

У 70-я гады для ўзвядзення будынку аблвыканкаму быў знесены цэлы квартал гістарычнага цэнтру, а дзеля стварэння плошчы Леніна засыпанае рэчышча Гараднічанкі (г.зв. Швейцарская даліна). У 80-я гады знесены будынак чыгуначнага вакзалу, які належаў Пецярбургска-Варшаўскай чыгунцы. Знішчаныя ці моцна пашкоджаныя каралеўскія палацава-паркавыя комплексы ў Панямоні і Станіслававе...

У 2005 – 2007 гг. "рэканструкцыя" гістарычнага цэнтру парушыла яго структуру, разбурыла шматмятровыя напластаванні культурнага слою і небяспечна ўзмацніла транспартны рух каля Старога і Новага замкаў. Калі падобныя работы будуць працягвацца далей, то гістарычны цэнтр Гародні ў хуткім часе страціць рысы комплексу і, адпаведна, гістарычную і гаспадарчую (турыстычную) вартасць. На месцы ўнікальнага горада-помніка застанецца новабуд з паасобнымі фрагментамі гістарычнай забудовы.

[24] Краўцэвіч А., Трусаў А., Трусаў І. Вяртанне да людзей // Мастацтва. 1993. № 8. С. 45-51.

*Андрэй Янушкевіч,*
*кандыдат гіст. навук (Мінск)*

# Харугва Гарадзенскага павету ў паспалітым рушэнні ВКЛ 1567 г.

Паспалітае рушэнне, сабранае ў ВКЛ у 1567 г. пад Маладзечнам, было найбольшым зборам узброеных сіл дзяржавы ў XVI ст. Скліканае падчас Інфлянцкай вайны, яно павінна было засланіць ўсходнія і паўночныя землі ВКЛ ад патэнцыяльнага нападзення з боку Маскоўскай дзяржавы і нанесці непрыяцелю пры спрыяльных абставінах вырашальны ўдар. Захаваўся падрабязны попіс (перапіс) гэтага паспалітага рушэння[1]. Такіх каштоўных крыніц захавалася толькі дзве – у распараджэнні гісторыка ёсць яшчэ попіс 1565 г.[2] Іх унікальнасць заключаецца не толькі ў выдатных магчымасцях для характарыстыкі стану ўзброеных сіл і мабілізацыйных рэсурсаў дзяржавы, але таксама ў важнай інфармацыі для аналізу сацыяльных, гаспадарчых, дэмаграфічных працэсаў і інш.

Гарадзенскі павет, уваходзячы ў склад Трокскага ваяводства, знаходзіўся здалёк ад раёну баявых дзеянняў у Інфлянтах і паўночна-усходняй Беларусі. Па вялічыні тэрыторыі і колькасці насельніцтва ён займаў месца ў сярэдзіне спіса паветаў ВКЛ, прыкладна адпавядаючы Ашмянскаму альбо Берасцейскаму паветам. Асаблівасцю Гарадзенскага павету з’яўлялася наяўнасць вялікай колькасці дзяржаўных (гаспадарскіх) уладанняў.

Месца збору паспалітага рушэння ў 1567 г. таксама знаходзілася здалёк ад Гарадзенскага павету. Гэта стварала дадатковыя праблемы для павятовай харугвы, звязаныя з транспартнымі выдаткамі, неабходнасцю мець павялічаныя запасы харчавання і інш. Аддаленасць ад вайсковага лагера, безумоўна, паўплывала на тое, што першыя жаўнеры з Гарадзенскай харугвы прайшлі попіс толькі ў верасні 1567 г. Прыкладам, з набліжаных да Маладзечна і Радашковічаў паветаў (Менскі, Ашмянскі) першыя жаўнерскія почты сабраліся ўжо ў чэрвені – ліпені.

Усяго харугва Гарадзенскага павету, сабраная ў паспалітым рушэнні 1567 г., налічвала 677 коннікаў (з іх 12 было выстаўлена “на ласку господарскую”), 29 драбаў і 28 пешых шляхцічаў[3]. Па сваім мабілізацыйным патэнцыяле гэты павет

---

[1] Русская историческая библиотека. Т. 33: Литовская Метрика. Отдел третий. Ч. 3: Книги публичных дел. Переписи Литовского войска / Ред. С. Л. Пташицкий. Петроград, 1915 (далей – РИБ).

[2] Тамсама. С. 238-430.

[3] У тэксце попісу даюцца наступныя сумарныя лічбы: 714 коннікаў, 29 драбаў, 29 пешых шляхцічаў. Гл.: Тамсама. С. 711-712. Адзначым, што ў попісе Гарадзенскага павету былі асобна выдзелены род Эйсмантаў, Эйсмантаў Пашавічаў са Свіслачы і шляхта Мерачскай харугвы, якая мела маёнткі паблізу Сеірэі (?).

знаходзіўся ў лідэрах. Калі не лічыць Жамойцкае староства і падляшскія паветы, якія выставілі рэкордную колькасць коннікаў, то вялікшыя харугвы былі толькі ў Лідскага (799 коннікаў) і Ковенскага (694) паветаў.

Колькасць коннікаў, выстаўленых у павятовую харугву паасобнымі землеўладальнікамі, была невялікай. Падаўляючая большасць шляхты выставіла па адным конніку, што склала агулам 93 % ад усёй колькасці конных жаўнераў. Вялікшыя почты (ад 3 да 13 коннікаў) выправіла ў паспалітае рушэнне толькі 12 землеўладальнікаў. Гэтыя лічбы сведчаць пра дробны характар шляхецкіх землеўладанняў у Гарадзенскім павеце.

Табліца 1.

**Склад почтаў**

| К-ць коней у почтах | К-ць почтаў | % ад к-ці почтаў |
|---|---|---|
| па 1 кані | 579 | 93 |
| па 2 кані | 31 | 5 |
| па 3 кані | 5 | 0,8 |
| па 4 кані | 4 | 0,6 |
| па 5 каней | 1 | 0,2 |
| па 6 каней | 1 | 0,2 |
| па 13 каней | 1 | 0,2 |
| Усяго | 622 | 100 |

Паказальнай з'яўляецца таксама колькасць конных жаўнераў, выстаўленых "на ласку господарскую" – своеасаблівага дадатку да почтаў, накіраванага з добраахвотнай згоды феадалаў. Такіх аказалася толькі 12 чалавек. Дадатковых жаўнераў сабе дазволілі мець мясцовы павятовы падсудак Івана Макаравіч (9 коннікаў), былы павятовы харужы Богуш Пятровіч Міцута (2 конніка) і дзеючы харужы Фёдар Кунцэвіч (1 коннік)[4]. Адзначым, што іншыя згаданыя ў попісе ўраднікі Гарадзенскага павету – земскі суддзя Іван Фёдаравіч Масальскі і войскі Бенедыкт Васільевіч Пратасовіч (прозвішча ў попісе не згадваецца[5]) – выставілі свае почты ў складзе княскай і дваранскай харугваў.

Попіс жаўнераў з Гарадзенскага павету распачаўся 10 верасня 1567 г. Асноўная маса жаўнераў сабралася ў другой палове верасня – першай палове кастрычніка 1567 г. Гэта было значнае спазненне, таму што збор войска быў прызначаны яшчэ на 17 траўня 1567 г.[6] Аднак за малым выключэннем шляхта з усіх паветаў ВКЛ пачала прыбываць у вайсковы лагер менавіта на пачатку восені 1567 г. Спазненне была звязана з аглядкай на гаспадара, які рушыў пад Ма-

[4] Тамсама. С. 708, 673-674, 677.

[5] За ідэнтыфікацыю прозвішча складаю падзяку Андрэю Радаману.

[6] Нацыянальны гістарычны архіў у Мінску. Ф. КМФ-18, воп. 1, ад. з. 529. Арк. 161-164.

ладзечна толькі ў верасні. Перад гэтым ён быў заняты перамовамі з маскоўскімі пасламі ў Гародні. Фармальна шляхта мела права чакаць на гаспадара. Ухвала Гарадзенскага сойма 1566/1567 гг. выразна агаварыла, што Жыгімонт Аўгуст павінен абавязкова ўзначаліць земскае войска[7]. Аднак страта спрыяльнага летняга часу значна зніжала шансы на поспех ваеннай аперацыі.

Табліца 2.

**Фарміраванне павятовай харугвы па перыядах прыбыцця ў вайсковы лагер***

| Назва павету | Перыяды прыбыцця ў вайсковы лагер | | | | | | | | | | Усяго (фактычна) | Усяго па попісу |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 28.06-15.07 | 16.07-30.07 | 1.08-15.08 | 16.08-31.08 | 1.09-15.09 | 16.09-30.09 | 1.10-15.10 | 16.10-31.10 | 1.11-15.11 | пасля 16.11 | | |
| Гарадзенскі павет | - | - | - | - | 12 | 194 | 345 | 97 | - | 29 | 677 | 714 |

* – улічваліся толькі коннікі.

Большасць конных жаўнераў у харугве Гарадзенскага павету мела пад сабой найгоршы род коней – "клячаў" (49 %) і конікаў (8 %). На другім месцы знаходзіліся звычайныя коні – 188 (28 %). Дастаткова шмат было мерынаў – іх налічвалася 103 (15 %). Элітны род коней – "валах" – быў прадстаўлены толькі адным конем. Калі параўнаць сітуацыю з іншымі паветамі, то мы бачым выразнае адставанне гарадзенцаў. Прыкладам, у харугве Менскага павету клячаў быў толькі 21 %, а ў Ашмянскім – 30 %.

Па гэтых дадзеных можна сцвердзіць, што гарадзенскія шляхцічы ў сваёй большасці былі незаможнымі. З іншага боку, трэба памятаць, што к 1567 г. шляхецкія фінансавыя рэсурсы былі ўжо істотна вычарпаны выдаткамі на ваенныя патрэбы. Дамінаванне конікаў і клячаў было абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі.

Табліца 3.

**Склад харугвы па роду коней**

| Род коней | К-ць коней | % ад к-ці коннікаў |
|---|---|---|
| Коні (звычайныя) | 188 | 28 |
| Валахі | 1 | 0,2 |
| Мерыны | 103 | 15 |
| Конікі | 52 | 7,8 |
| Клячы | 333 | 49 |
| УСЯГО | 677 | 100 |

[7] РИБ. Т. 30: Литовская Метрика. Отделы первый-второй. Ч. 3: Книги публичных дел. / Ред. И. И. Лаппо. Юрьев, 1914. С. 409-410.

Аналіз узбраення вершнікаў адлюстроўвае карціну, характэрную для павету са слабымі мабілізацыйнымі рэсурсамі. Падаўляючая большасць коннікаў (572 чалавека) была ўзброена рагацінамі – адным з найбольш папулярных відаў зброі ў войску ВКЛ. 72 чалавекі мела сагайдакі – баявыя камплекты з лукам і стрэламі. 45 жаўнераў было ўзброена "дрэвам" (кап'ём). Толькі 21 вершнік меў шаблі, а 18 – мячы.

З усяго гэтага вынікала, што харугва Гарадзенскага павету была ўзброена не лепей за астатнія харугвы. Мясцовая шляхта, верагодней за ўсё, не мела матэрыяльных магчымасцяў ў поўнай ступені выканаць ухвалу Віленскага сойма 1563 г. і Гарадзенскага сойма 1567 г., у якіх гаварылася, што вершнік павінен мець "зброю, тарч, древо"[8].

Табліца 4.

**Баявая зброя коннікаў**

| Від зброі | К-ць жаўнераў | % ад к-ці коннікаў |
|---|---|---|
| Шабля | 21 | 3 |
| Дрэва (кап'ё) | 45 | 7 |
| Рагаціна | 572 | 84 |
| Корд | 46 | 7 |
| Сякера | 18 | 3 |
| Меч | 18 | 3 |
| Сагайдак | 72 | 11 |
| Аркебуз | 28 | 4 |
| Ручніца | 1 | 0,1 |
| Ашчэп | 8 | 1 |

Што датычыць засцерагальнага ўзбраення, то большасць коннікаў мела панцыры з прылбіцамі (адпаведна 193 і 191 чалавекі). Дастаткова вялікая колькасць жаўнераў магла пахваліцца тым, што была ўзброена цэласнай "зброяй бляховай" ("збройно") – 77 чалавек. Аднак толькі 7% вершнікаў мела тарчы. Сярод беднейшай шляхты найпапулярнейшым відам засцерагальнага рыштунку быў кафтан (129 чалавек). Некалькі чалавек мелі шышакі і скуркі.

---

8 Тамсама С. 320, 412.

Табліца 5.

**Засцерагальнае ўзбраенне коннікаў**

| Від узбраення | К-ць жаўнераў | % ад к-ці коннікаў |
|---|---|---|
| Зброя бляховая (збройно) | 77 | 11 |
| Панцыр | 193 | 29 |
| Бехцер | 1 | 0,1 |
| Прылбіца | 191 | 28 |
| Шышак | 7 | 1 |
| Кафтан | 129 | 19 |
| Скурка | 9 | 1 |
| Тарча | 48 | 7 |

Найбольш інфарматыўным, аднак, з'яўляецца не простае пералічэнне відаў зброі, а супастаўленне баявых камплектаў з наступальнага і засцерагальнага ўзбраення. Мы скарысталіся метадам Юрыя Бохана[9] і склалі наступную табліцу, якая з усёй выразнасцю прадстаўляе баявы рыштунак вершнікаў.

Табліца 6.

**Баявыя камплекты коннікаў**

| | Зброя, прылбіца | Зброя, панцыр, прылбіца | Зброя, панцыр, шышак | Зброя | Бехцер, прылбіца | Панцыр, прылбіца | Зброя, панцыр, шышак | Панцыр, шышк | Панцыр | Кафтан, панцыр, прылбіца | Кафтан, прылбіца | Кафтан | Скурка | Скурка, прылбіца | Прылбіца | Без ахоўнага ўзбраення |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **11** | **12** | **13** | **14** | **15** | **16** | **17** |
| Тарча, дрэва | - | 31 | - | - | - | 9 | | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Тарча, дрэва, корд | - | - | - | - | - | - | | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Тарча, дрэва, аркебуз | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Тарча, дрэва, корд, аркебуз | - | 1\2 | - | - | - | - | | - | - | | - | - | - | - | - | - |

[9] Маецца на ўвазе структура табліц у яго манаграфіі "Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст." (Мінск, 2002).

Працяг. Пачатак на с. 21.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тарча, рагаціна | 1 | - | - | - | - | 1\2 | | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Тарча, рагаціна, аркебуз | - | 1 | - | - | - | - | | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Тарча, рагаціна, корд | - | - | - | - | - | - | | - | - | | - | - | - | - | 1 | - |
| Дрэва | 1 | - | - | - | - | - | | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Рагаціна | 7 | - | 1 | - | - | 44 | 1 | 1 | 23 | | 10 | 79 | 7 | 2 | 4 | 257 |
| Рагаціна, корд | - | - | - | - | - | 5 | - | - | - | | - | 4 | - | - | - | 15 |
| Рагаціна, шабля, корд | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | | - | - | - | - | - | - |
| Рагаціна, шабля | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | 1 | - | - | - | 2 |
| Рагаціна, меч | - | - | - | - | - | - | - | - | 2 | - | - | 3 | - | - | 1 | 7 |
| Рагаціна, сякера | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | 1 | - | - | - | 3 |
| Рагаціна, сякера, меч | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - |
| Рагаціна, аркебуз | - | 1 | - | - | - | 5 | - | 2 | 1 | - | 1 | 1 | - | - | - | 1 |
| Рагаціна, корд, сякера | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - |
| Рагаціна, ашчэп | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Сагайдак | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | 1 | 2 | - | - | - | - |
| Сагайдак, аркебуз | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - |
| Сагайдак, корд | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Сагайдак, шабля | - | - | - | - | - | 3 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Сагайдак, сякера | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Сагайдак, ашчэп | - | - | - | - | - | - | | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - |

Працяг. Пачатак на с. 21-22.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сагайдак, шабля, сякера | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Сагайдак, рагаціна | - | 5 | - | 3 | 1 | 16 | - | 1 | 1 | - | - | 13 | - | - | 2 | 4 |
| Сагайдак, рагаціна, корд | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Сагайдак, рагаціна, шабля | - | - | - | - | - | 6 | - | - | 2 | - | - | 1 | - | - | 1 | - |
| Сагайдак, аркебуз, рагаціна | - | - | - | - | - | 3 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Сагайдак, аркебуз, корд | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Аркебуз, корд | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - |
| Аркебуз, корд, сякера | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Аркебуз, сякера | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Ручніца, меч | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - |
| Аркебуз | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| Корд | 2 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 9 |
| Шабля | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Меч | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | 1 |
| Ашчэп | - | - | - | - | - | - | - | - |  | - | - | 2 | - | - | - | 3 |
| Сякера, ашчэп | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Корд, сякера | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 2 |
| Меч, сякера | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| Шабля, сякера | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |

Выразна відаць, што найбольшае распаўсюджанне мелі рагаціны з кафтанамі. За імі ішлі тыя ж рагаціны ў пары з прылбіцамі і панцырамі. Аднак

большасць тых, хто выходзіў у рушэнне з рагацінай, увогуле не мела засцерагальнага рыштунку – такіх было аж 257 чалавек.

Не самая вялікая група жаўнераў была ўкамплектавана найбольш якасным баявым камплектам – "па-гусарску". Гэта была свойго роду эліта харугвы. Падставовымі элементамі рыштунку гусара былі шчыт (тарча) і кап'ё (дрэва). Яны ішлі звычайна ў пары з панцырамі і прылбіцамі. Таксама, як правіла, магла дадавацца "зброя". Сустракаліся спарадычна і іншыя віды зброі. Такіх добра ўзброеных жаўнераў налічвалася 42-45 чалавек.

Унія ВКЛ са Швэцыяй 1655 г. была зацверджаная ў Кейданах (Kėdainiai) у чатырох прынцыповых актах. Першы – дэкларацыя станаў ВКЛ ад 17 жніўня 1655 г. пра згоду ды ўмовы шляхты, што да уніі з Швэцыяй. Другі акт – дагавор ад 20 кастрычніка 1655 г. аб дзяржаўнай уніі што злучала Швэцыю і ВКЛ у адну фэдэрацыйнаю дзяржаву. Тэкст уніі падпісала 1172 прадстаўнікі палітычнай нацыі ВКЛ[1]. Трэці акт уяўляў сабой публічную дэкларацыю, скіраваную да

[1] Nos Magni Ducatus Lithuaniæ Proceres et Ordines, Universis et singulis has inspecturis et lecturis ad perpetuam rei memoriam notum testatumque facimus Quandoquidem in summa status nostri Magni Ducatus Lithuaniæ per potentiam hostilem oppressione et ab armis et protectione Serenissimi

эўрапейскай супольнасьці з тлумачэньнем прычынаў разрыву уніі з Польшчай і злучэньня са Швэцыяй[2]. Публічная дэклярацыя была надрукаваная на лаціне і нямецкай мовах у Кейданах і разасланая ў краіны Эўропы[3]. Вельмі хутка яна выйшла друкам па-галяндзку, нямецку і ангельску ў Амстэрдаме, Гамбургу і Лёндане[4]. Нарэшце апошні акт, які падпісалі каля 450 шляхціцаў, быў прыняты 23 кастрычніка 1655 г. Гэты дакумэнт абвяшчаў стварэньне пад кіраўніцтвам сэнатара і легата караля Швэцыі Бэнгта Шкуттэ (Bengt Skytte) рады ВКЛ[5]. У склад рады ўвайшлі Ежы Белазор (Jerzy Białłozor) як прадстаўнік каталіцкага касьцёла, ды тры шляхціцы-камісары ад кожнага павету, якія ня былі акупаваныя Расеяй ці Украінай і таму перайшлі пасьля Кейданскай уніі пад швэдзкі кантроль (Жамойць, Коўна, Браслаў, Вількамір (Ukmergė), Упіта)[6].

На думку станаў ВКЛ, артыкулы уніі адпавядалі мадэлі Люблінскай уніі з Польшчай 1569 г. Пры гэтым ВКЛ атрымала больш шырокую аўтаномію, захавала ўласную праўную сыстэму, свабоду веравызнаньня і вялікія палітычныя

---

Poloniæ Regis Ioannis Casimiri avulsione fatalis et inevitabilis necessitas Nos urserit, ut Serenissimi ac Potentissimi Principis Domini Domini CAROLI GUSTAVI. Riksarkivet (Дзяржаўны архіў Швэцыі). Militaria. Krighistoriska handlingar. Karl X Gustafs tid. Polska kriget 1655-60. Vol. M. 1304. 31 pp.

2 Nos Magni Ducatus Lithuaniæ Proceres et Ordines, Universis et singulis has inspecturis et lecturis ad perpetuam rei memoriam notum testatumque facimus. Quod cum maioris partis Magni Ducatus Lithuaniæ patriæ nostræ charissimæ a Moscho occupatio et oppressio, tum a Sacra Regia Majestate Sueciæ, post belli contra nos declarationem, imminens Summum periculum, nec non a Serenissimo Poloniæ Rege Johanne Casimiro omnis consilij. Riksarkivet. Militaria. Krighistoriska handlingar. Karl X Gustafs tid. Polska kriget 1655-60. Vol. M. 1304. Арыгінал. 22 pp.

3 Procerum & Ordinum Magni Ducatus Lithvaniæ Literæ Reversales De Fide, Subjectioneq; Regibus & Regno Sveciæ æternum præstanda. Der Herrn und Stände Des GroszFurstenthumbs Littawen Endlicher Revers, Dardurch Sie sich und ihre Nach-kommen An Ihrer Königl. May:t und die Cron Schweden zu Ewigen Zeiten verbunden und unterthänig gemacht. Datum Keidani, d. 15 Oct. Anno 1655. Друк. Kungliga biblioteket (Каралеўская бібліятэка Швэцыі). Sv:s förh.839.

4 Schriftelijck renversael ende verklaringe der laths-heeren ende staten van ...Littauw, van trouwe ende onderdanigheyt aen de koningen…van Sweden. 1655. Amsterdam. The Royal Library of Netherlands. (Каралеўская бібліятэка Галяндыі). No. T. 4398; Revers der Waywoden und Ständen/deß Gros-Hertzogthumbus Littauen von wegen der Huldigung, Treu, Untertänigkeit, den Königen und Königreich Schweden ewiglich zu lassen und zu halten. 1656. Hamburg. Kungliga biblioteket. Sv:s Förh 840, p. 13-16; An act of the Nobility and Estates of the Great Dukedom of Lithuania, whereby they for ever oblige themselves to yield Fidelity and Subjection to the Kings and Kingdom of Sweden. Mercurius Politicus. London. November 15 - November 22, 1655. No 284. P. 5757-5760.

5 Nos Proceres et ordines Magni Ducatus Littuaniæ notum testatumqve Facimus quod cum in extraordinario Reipublicæ statu extra ordinarijs quoqve remedijs opus sit salusqve Patriæ Suprema Lex merito esse debeat Ideoqve ad requisitionem Illustrissimi et Excellentissimi Dni Domini Benedicti Skytte… et ad exercitus Legati, qui Suæ Maiestatis Vices apud nos nunc obtinet hos infra Scriptos Vigore harum Constituimus, nomine nostro Plenipotentes ex Ordine Ecclesiastico per Illustrem et Reuerendissimum. In: Riksarkivet. Militaria. Krighistoriska handlingar. Karl X Gustafs tid. Polska kriget 1655-60. Vol. M. 1304. Арыгінал. 21 pp.

6 Kotljarchuk Andrej. The pro-Swedish Advisory Council of the Grand Duchy of Lithuania in 1655-1656: the origin, structure and fate of members // Faworyci i opozycjoniści. Król a elity polityczne w Rzeczypospolitej XV-XVII wieku. Kraków, 2006. S. 311-329.

правы шляхты. Гэаграфічная адлегласьць мэтрапольнай Швэцыі давала панамшляхце большыя магчымасьці для арганізацыі ўласнага палітычнага жыцьця. Нарэшце зьявіўся рэальны шанец з дапамогай Швэцыі спыніць агрэсію Масковіі і Украіны, вывесьці краіну з крызысу ды забясьпечыць стабільнае развіцьцё Беларусі і Летувы ў межах балтыцкай імпэрыі[7].

Якое месца і пазіцыю займала ў новай палітыцы ВКЛ шляхта Гарадзенскага павету? Доўгі час гэтае пытаньне заставалася невядомым. Але апошнія знаходкі з Дзяржаўнага архіву Швэцыі (Riksarkivet) дазваляюць адказаць на гэтае пытаньне. Аднак на пачатку мэтазгодна высьвятліць ці мела наагул шляхта Гарадзенскага павету свае інтарэсы ў Кейданскай уніі, ці была Швэцыя зацікаўленая ў Нёманскім краі і калі так, ці існавалі там палітычныя колы зацікаўленыя ва уніі са Швэцыяй?

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі Гарадзенскі павет XVII ст. разглядаецца як выключна каталіцкі рэгіён, шчыльна звязаны з Польшчай. Між тым на самой справе тагачасны Гарадзенскі павет быў значным цэнтрам палітычнай і рэлігійнай апазіцыі да палітыкі каралеўскай улады Рэчы Паспалітай. Заходняя частка павету (сёньня ў складзе Польскай дзяржавы) заставалася і на XVII ст. рэгіёнам пратэстанцкай шляхты. Цэнтрам аднаго з 6 дыстрыктаў пратэстанцкага збору ВКЛ Ядноты Літоўскай быў гарадзенскі Заблудаў (Zabludów) – горад літоўскага Падляшша, дзе існавала кальвінская школа і вялікі збор. Тут на пачатку XVII ст. на землях Радзівілаў асела шмат пратэстанцкіх сем'яў, між іншых, кляны Патоцкіх (Potocki), Любянецкіх (Lubienecki), Рысінскіх (Rysiński) Арцішэўскіх (Arciszewski), Курошаў (Kurosz), Блонскіх (Błoński), Карманоўскіх (Karmanowski) і Сухадольскіх (Suchodolski). Дасьледчык радыкальнага сацыянскага (арыянскага) руху пратэстантаў ВКЛ Пэтэр Блок адзначаў, што большасьць арыянаў Літвы былі этнічнымі беларусамі, а не балтамі[8]. Але пасьля знішчэньня Ракава - арыянскага цэнтру ў Польшчы (1638 г.) у памежны Гарадзенскі павет пад пратэкцыю Радзівілаў пераехалі этнічна польскія роды Любянецкіх і Пжыпкоўскіх (Przypkowski)[9].

Заўважым што прадстаўнікі гэтых кланаў былі найбольш актыўнымі прыхільнікамі уніі ВКЛ са Швэцыяй. Габрыэль Любянецкі (Gabriel Lubieniecki) быў галоўным прадстаўніком Януша Радзівіла на сэпаратных перамовах са Швэцыяй у 1655 г. Адначасова Станіслаў Любянецкі (Stanisław Lubieniecki) з 1655 г. працаваў у дыпляматычнай службе караля Швэцыя Карла X[10]. Інтэлектуальны

[7] Гл. далей: Kotljarchuk Andrej. In the Shadows of Poland and Russia: the Grand Duchy of Lithuania and Sweden in the European Crisis of the mid-17th Century. Doctoral dissertation. Södertörns högskola, 2006. 347 pp.

[8] Brock Peter. Antitrinitarians in the Grand Duchy of Lithuania against non-resistance, 1583 // East European Quarterly. 1998. Vol. 32. No. 1. P.1-8.

[9] Tazbir Janusz. Arianie w Białymstoku i okolicach [у:] Studia i materiały do dziejów miasta Białegostoku. 1968.Vol. 1. S. 81-105; Tazbir Janusz. Bracia polscy w służbie Radziwiłłów w XVII wieku // Miscellanea Historico-Archivistica. Warszawa – Łódź, 1989. Vol. III. S. 141-158.

[10] Tazbir Janusz. Stanisław Lubieniecki, przywódca ariańskiej emigracji. Warszawa, 1961; Jørgensen Jordt. Stanisław Lubieniecki. Zum Weg des Unitarismus von Ost nach West im 17. Jahrhundert.

лідар сацыянскага руху Самуэль Пжыпкоўскі (Samuel Przypkowski) быў аўтарам апалёгіі Януша Радзівіла, якая апраўдвала хаўрус са Швэцыяй і якая выйшла друкам у Кейданах у 1656 г.[11] Абсалютную большасьць сваіх маёнткаў (91 %) Радзівілы раздалі ў "трыманьне" кліентнай пратэстанцкай шляхце. У Гарадзенскім павеце Янушу Радзівілу належаў шэраг уладаньняў, між іншымі, Заблудаў, Орля, Беласток, Дойліды і Собалева (Zabłudów, Orla, Białystok, Dojlidy, Sobolewo). Такім чынам, клян Радзівілаў меў свае інтарэсы на Гарадзеншчыне і шырокую палітычную падтрымку мясцовай шляхты. Гэты факт стаў важным ў палітычных падзеях 1655-1661 г.

Ці мела Швэцыя свае інтарэсы ў Гарадзенскім павеце? Дзяржаўны канцлер Швэцыі Аксель Уксэншэрна распрацаваў у 1620-х г. канцэпцыю знешняй палітыкі Швэцыі *Dominium maris Baltici*. Згодна гэтай канцэпцыі, Швэцыя мусіла дасягнуць дамінацыі ў Балтыцкім рэгіёне ды пераўтварыць Балтыцкае мора ва ўнутранае возера швэдзкай дзяржавы. Канцэпцыя палітычнай дамінацыі Швэцыі грунтавалася на эканамічных падставах[12]. Швэцыя мусіла ўзяць пад свой кантроль усе парты і рачныя шляхі Балтыкі[13]. Такім чынам, Швэцыя манапалізавала балтыцкі гандаль і кантралявала экспарт у Заходняю Эўропу тавараў з Масковіі, Прусіі, Рэчы Паспалітай і Даніі. У гэтых умовах басэйн Нёмана займаў асаблівае месца ў швэдзкай палітыцы. У верасьні 1655 г. каралеўскі раднік Шэрінг Росенгане (Schering Rosenhane) распрацаваў сьпіс мэтаў Швэцыі ў вайне супраць Польшчы. Да Швэцыі мусілі адыйсьці: Данцыг, Курляндыя, Інфлянты (польская Лівонія ў швэдзкай тэрміналёгіі) і паўночныя ды заходнія паветы ВКЛ[14]. Швэдзкі картограф, палкоўнік драгунскага рэгіменту "Savolax" Георг вон Швенгельн (Georg von Schwengeln) падрыхтаваў мапу Нёманскага рэгіёну[15].

Згодна швэдзкім мілітарным плянам, Швэцыя збіралася акупаваць перадусім абшары басэйнаў Дзьвіны і Нёмана. Адміністрацыйным цэнтрам швэдзкай Літвы мусіла стаць Коўна. Гародня плянавалася як адна з галоўных

---

Göttingen, 1968; Kowalik Janina. Stanisław Lubieniecki. Företrädare för socianerna och svensk korrespondent. Karolinska förbundets årsbok, 1981-82. S. 148-173.

11 [Przypkowski, Samuel] Apologia pro illustrissimo ac celsissimo principe Janussio duce Radvilio, Sacri Romani Imperii PRINCIPE, DUCE BIRSARUM et DUBINCORUM &c. quondam PALATINO VILNENSI, et EXERCITUUM Magni Ducatus Litvaniae SUPREMO GENERALI. 61 pp. Biblioteka Czartoryskich. Muzeum Narodowe w Krakowie, № 11615.I.

12 Attman Artur. The Russian and Polish markets in international trade 1500-1650. Göteborg, 1973; Attman Artur. Swedish aspirations and the Russian market during the 17th century. Göteborg: Vetenskaps- och vitterhets-samhället, 1985. S. 1-41.

13 Ahnlund Nils. Svensk Östersjöpolitik under det tidigare 1600-talet // Forum navale. Uppsala, 1946. No. 7. S. 3-15.

14 Wittrock Georg. Karl X Gustaf i Polen. Krigsmålet och allianserna. Karolinska förbundets årsböcker. Stockholm, 1920. S. 43.

15 Litauen. Kowno 1600-talet. Riksarkivet. Kartor och ritningar utan känd proveniens. No. 594 (2025:20); Köhlin Harald. Georg von Schwengeln and His Works, 1620-1645. Imago Mundi. 1949. Vol. 6, p. 67-72. Köhlin памылкова атрыбутаваў гэтую мапу 1628 г.

базаў швэдзкага войска[16]. На першым этапе перамоваў са Швэцыяй Януш Радзівіл дамагаўся перадачы Гародні і павету ў сваю ўласнасьць[17].

На перамовах ў Кейданах прысутнічалі прадстаўнікі Гарадзенскага павету. Дэклярацыю станаў ВКЛ ад 17 жніўня падпісалі гарадзенскія шляхціцы стольнік ВКЛ Крыштап Патоцкі (Krzysztof Potocki), абывацель Гарадзенскага павету Мацей Казімер Эйсымонт (Maciej Kazimierz Eysymont, obywatel Powiatu Grodzieńskiego) ды афіцыял закону кармелітаў Казімер Марцін Масон (Kazimierz Marcin Masson). Крыштап Патоцкі ішоў пад нумерам тры ў складзеным Янушам Радзівілам сьпісе 22 найбольш адданых хаўрусьнікаў Швэцыі[18]. Абраны ў выніку Кейданскай уніі вялікім князем літоўскім, Карл Х раздаў шэраг маёнткаў Гарадзенскага павету сваім хаўрусьнікам з ВКЛ. Так, капітан харугвы Януша Радзівіла кальвініст Самуэль Высоцкі (Samuel Wysocki) атрымаў мястэчка Гарасімовічы. Палкоўнік Багуслава Радзівіла інфлянцкі шляхціц, лютэранін Эбэрхард Путкамэр (Eberchard Puttkammer) атрымаў мястэчка Масты[19]. Менавіта з гэтых прычынаў сэнатар Швэцыі і губэрнатар Лівоніі і Рыгі Магнус Дэ ля Гарды (Magnus Gabriel De la Gardie), што кіраваў перамоўным працэсам атрымаў з ВКЛ інвэнтар Гарадзенскай эканоміі, які сёньня захоўваецца ва унівэрсытэцкай бібліятэкі Упсалы[20].

Але 16 жніўня 1655 г. расейскае войска захапіла Коўна, а 18 жніўня - Гародню. У гэтых умовах швэдам давялося тэрмінова змяняць свае пляны і галоўнай базай швэдзкага войска замест Нёманскага краю зрабілася Падзвіньне. Буйныя швэдзкія залогі размясьціліся ў Біржах і Дынабургу. Страта Гарадзенскага павету была ўдарам для палітыкі Януша Радзівіла. Звяртаючыся ў верасьні 1655 г. да Дэ ля Гарды, Радзівіл націскаў на тэрміновым супольным паходзе супраць Расеі і Украіны. Ён паведамляў, што Расея пагражае канчатковым спусташэннем Прынямоньня: “Вораг паслаў адборную конніцу з Коўна да Гародні, каб вынішчыць агнём і мечам гэты край”. Радзівіл папракаў швэдаў, што “гэтага ніколі б не адбылося, калі б своечасова туды была дасланая патрэбная дапамога Швэцыі”. Таму, на думку гетмана, “адзіная рацыя захаваць рэшткі Княства вымагае, каб шырокім фронтам выступіць супраць ворага і спыніць яго”[21].

Наступным ударам для курса Радзівілаў стаў рокаш ва ўласным войску. 23 жніўня 1655 г. у Вірбалах (сучасны Virbalis або польскае Wierzbołow) частка войска ВКЛ (звыш 2000 жаўнераў) стварыла анты-швэдзкую канфэдэрацыю. У

---

[16] Tersmeden Lars. Carl X Gustafs strategi i kriget mot Polen 1655 // Militärhistorisk Tidskrift. 1980. No 2, S. 11 (3-62).

[17] Šapoka Adolfas. 1655 metų Kėdainių sutartis arba švedai Lietuvoje 1655-1656 metais. Vilnius, 1990. S. 54.

[18] Janusz Radziwiłł till Magnus Gabriel De la Gardie. 18.08 1655. Kėdainiai. Latin. Riksarkivet. De la Gardieska Samlingen. Skrifvelser till M. G. De la Gardie. Ser. C:I. E. 1531.

[19] Wasilewski Tadeusz. Zdrada Janusza Radziwiłła w 1655 r. i jej wyznaniowe motywy // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. Warszawa, 1973. Vol. XVIII. S. 141-146 (125-147).

[20] Annerstedt Claes. Uppsala Universitets biblioteks historia intill år 1702. Stockholm, 1894. P. 88-99.

[21] Janusz Radziwiłł till Magnus Gabriel De la Gardie. September, 1655. Kėdainiai. Latin. Riksarkivet. De la Gardieska Samlingen. Skrifvelser till M. G. De la Gardie. Ser. C:I. E. 1531.

акце канфэдэрацыі гаварылася, што “пабачыўшы адкрытую здраду Радзівіла і яго дамову з Швэцыяй, яны застаюцца вернымі свайму каралю і будуць змагацца з ворагамі”. Было падкрэслена, што адзіным гетманам адгэтуль лічыцца Вінцэнт Гансеўскі. Лідарамі канфэдэрацыі былі афіцэры-каталікі Казімер Жэромскі (Kazimierz Żeromski), Станіслаў Ліпніцкі (Stanisław Lipnicki), Самуэль Кміціц (Samuel Kmicic) і Канстанты Катоўскі (Konstanty Kotowski). Як высьветліў Анджэй Рахуба, за сьпінамі канфэдэратаў стаяў магнат Крыштап Пац (Krzysztof Pac)[22].

Канфэдэрацыя накіравала паслоў да караля Яна Казімера Вазы. Вынікам сустрэчы сталі тры прывілеі караля, выданыя 8-10 верасьня 1655 г.[23] Згодна гэтым актам, Януш і Багуслаў Радзівілы і ўсе іх супрацоўнікі абвяшчаліся “здрайцамі Айчыны”. Іх уладаньні падлягалі канфіскацыі і пераходзілі на ўтрыманьне верных афіцэраў войска ВКЛ[24]. Генрык Віснер заўважыў што падобныя, па-сутнасьці, антыпраўныя акты, Ян Казімер ужыў толькі ў адносінах да ВКЛ. У Польшчы (у тым ліку Украіне) кароль не адабраў ніводнага маёнтка ў мясцовых хаўрусьнікаў Швэцыі[25]. Канфэдэраты рушылі ў бок Гарадзенскага павету і Падляшша, каб рабаваць тамтэйшыя ўладаньні Радзівілаў. Тады Радзівіл аддаў загад старасьце Заблудава Мікалаю Гарасімовічу (Mikołaj Harasimowicz), калі ў места прыйдуць “здрайцы, што ў войску маім бунт паднялі”, знішчыць іх. Гарасімовіч мусіў параіцца з пастарам Пандлеўскім (Pandlewski), як гэта зрабіць. На думку Радзівіла, найлепш было моцна напаіць канфэдэратаў, каб потым верныя месьцічы забілі іх уначы па-хатах, альбо атруціць півам[26]. Гэты дакумэнт сьведчыць, што Радзівіл разглядаў Гарадзенскі павет як поле ўласнага палітычнага ўплыву.

Наступным крокам Радзівіла стала згуртаваньне вернай гарадзенскай шляхты. Знойдзены мною ў Дзяржаўным архіве Швэцыі дакумэнт, сьведчыць, што гэткая палітыка прынесла часовы посьпех. 20 лістапада 1655 г. да уніі са Швэцыяй схілілася частка гарадзенскай шляхты. Каля 30 шляхціцаў, што сабраліся на соймік у Гародні, выслалі да Дэ ля Гарды пасла Аляксандра Браташэўскага (Aleksander Bratoszewski). Ва ўмовах новага наступу маскоўскага войска “з боку Павету Трокскага на тым боку Нёмана ляжачага”, шляхта прасіла Дэ ля Гарды і караля Швэцыі прыняць іх павет у свае падданства ды ратаваць ад тыраніі Масквы (гл. іл. 2)[27]. Арганізаваў соймік і першым паставіў свой подпіс стольнік ВКЛ

---

[22] Rachuba Andrzej. Konfederacja wojska litewskiego w Wierzbołowie w 1655 // Miscellanea historico-archiwistica. Warszawa, 1994. Volume IV. S. 13-31.

[23] Tyla Antanas. Kėdainių unijos opozicija (1655-1656 m.) // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos Darbai, Serija A. 1979.Volume 2 (67). S. 67-84; Wisner Henryk. Janusz Radziwiłł 1612-1655. Wojewoda wilenski. Hetman wielki litewski. Warszawa, 2000. S. 203; Frost Robert.. After the Deluge. Poland-Lithuania and the Second Northern War 1655-1660. Cambridge University Press, 1993. P. 51.

[24] Archiwum Głòwne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. Nr 1302.

[25] Wisner Henryk. Janusz Radziwiłł ... S. 203.

[26] Janusz Radziwiłł do Mikolaja Harasimowicza. 26.08.1655. Kėdainiai. Jakuba Michałowskiego wojskiego Lubelskiego a późniéj kasztelana Bieckiego księga pamiętnicza. Kraków, 1864. S. 767 - 768.

[27] Riksarkivet. Militaria. Krighistoriska handlingar. Karl X Gustafs tid. Polska kriget 1655-60. Vol. M. 1304.

Крыштап Патоцкі. Нагадаю, што гэты ўплывовы пратэстант з Гарадзеншчыны быў шчырым хаўрусьнікам Швэцыі. Апрача Патоцкага з ураднікаў свае подпісы паставілі падчашы Вэндэнскі (Wenden сёньня Cēsis ў Латвіі), пратэстант Салямон Рысінскі (Salomon Rysiński) і пісар земскі Станіслаў Сапоцька (Stanisław Sopocko), веравызнаньне якога мне высьвятліць не ўдалося[28].

Тым ня меньш, пераход Гародні пад кантроль Швэцыі не адбыўся. Ад зоны швэдзкага кантролю ў ВКЛ павет аддзяляла паласа расейскай акупацыі. У гэтых ўмовах уваход швэдзкага войска туды азначаў выбух вайны паміж Швэцыяй і Расеяй, што не адпавядала інтарэсам знешняй палітыкі Стакгольма. Да таго ж большасьць гарадзенскай шляхты складалі каталікі, у асноўным верныя каралю Польшчы.

Тым часам, на абшарах швэдзкай зоны Літвы панавала войска Швэцыі. Там не засталося рэгулярнага войска ВКЛ. На загад швэдаў Януш Радзівіл пакінуў разам з вернымі яму зьвязамі межы княства і апанаваў Падляшша. Швэды не давалі веры ліцьвінам, збіраючы вялікія падаткі ды "трымаючы ліцьвінаў у цуглях"[29]. Шляхта ВКЛ баялася брутальных акцый швэдзкага войска, якое патрабавала грошай, забівала ксяндзоў, ды, негледзячы на пратэсты Радзівіла, хапала як закладнікаў заможных шляхцянак. Нават Януш Радзівіл вывез сям'ю і найбольш каштоўныя рэчы з Кейданаў у Таўрогі (Tauragė) ля прускай мяжы[30].

У 1655 г. з 5 падкантрольных паветаў ВКЛ швэды назбіралі 62 653 талераў падаткаў. У 1656 г. падатковы ціск драматычна узрос і толькі за першыя тры месяцы швэдамі было забрана з пяці паветаў ВКЛ 185 233 талераў падаткаў з запланаваных 243 522 талераў на ўвесь год[31]. Нагадаю, што ў сярэдзіне XVII ст. усе 24 паветы ВКЛ разам плацілі каралю Рэчы Паспалітай каля 300 000 талераў штогадовага падатку. Шляхта ВКЛ зразумела, што быць пад моцнай уладай швэдзкага караля горш, чым карыстацца вольнасьцямі шляхецкай Рэспублікі.

Унія з ВКЛ таксама стала непатрэбнай Швэцыі, армія якой са жніўня 1655 г. кантралявала поўнач Княства і ўхілялася ад вайны з Масковіяй за рэшту ВКЛ. Жаўнеры Швэцыі глядзелі на ВКЛ як на акупаванаю краіну ды выкарыстоўвалі пад лютэранскія набажэнствы каталіцкія касьцёлы Жамойці. Шляхта ВКЛ бачыла, што яна адхіленая ад ўлады. Створаная рада ня мела самастойнага значэньня і выконвала толькі патрэбныя швэдам дарадчыя функцыі. Такім чынам, хутка унія страціла сэнс для абодвух бакоў.

Становішча ўзаемнага недаверу зрабіла будучыню "швэдзкай Літвы" праблематычнай. На пачатку студзеня 1656 г. швэды перагледзелі мэты ў вайне з

[28] Станіслаў Сапоцька быў каталіком. НГАБ. Ф.1755, воп. 1, адз. з. 46, арк. 523–528 адв., 693–696 адв. (Рэд.)

[29] Pufendorf Samuel von. Samuel von Pufendorfs sju böcker om konung Carl X Gustafs bragder. Stockholm, 1915. T. 3. S. 92.

[30] Kotłubaj Edward. Życie Janusza Radziwiłła. Wilno-Witebsk, 1859. S. 387.

[31] Fagerlund Rainer. Kontribution, försträckning och kaduck: svensk krigsfinansiering i Östersjöprovinserna 1655-1661. Historiskt tidskrift för Finland. 1981. Vol. 66. S. 321-337.

Польшчай. Цяпер у ВКЛ Швэцыя мусіла змагацца толькі за Інфлянты і Жамойць і не рызыкаваць дзеля беларускіх паветаў Прынямоньня і Падзвіньня[32]. У гэтых умовах 26 сьнежня 1655 г. Януш Радзівіл напісаў свой апошні ліст да Дэ ля Гарды. Ён прызнаў, што за апошні час ад Кейданскай уніі адпаў шэраг магнатаў. Скардзіўся на кепскі стан здароўя, які не дазваляў яму ўласнымі сіламі вырашыць гэтую праблему. Паведамляў, што працуе над новым плянам[33]. Але 30 сьнежня 1655 г. вялікі гетман ВКЛ Януш Радзівіл раптоўна памёр ў собскім замку Тыкоцын (Tykocin) на самай мяжы з Гарадзенскім паветам. Пратэстанты ВКЛ лічылі, што вялікага гетмана атруцілі палякі. Версія аб атруце грунтавалася на паказаньнях сьведкаў, якія сьцвярджалі нібыта на целе нябожчыка выступілі плямы[34].

Праект Януша і Багуслава Радзівілаў пабудовы пад швэдзкай пратэкцыяй пратэстанцкага Вялікага княства паміж каталіцкай Польшчай і праваслаўнай Расеяй пацярпеў паразу. Пасьля вайны пратэстанцкую шляхту Гарадзеншчыны напаткалі рэпрэсіі. Па рашэньню вальнага сойму ўсе арыяне мусілі або пакінуць сваю веру, альбо з'ехаць у выгнаньне[35]. У гэтых умовах частка "рускіх" арыянаў на чале з украінскім магнатам і хаўрусьнікам Швэцыі Юры Нямірычам (Jerzy Niemirycz) прапанавала сваім братам прыняць "веру продкаў"- праваслаўе. Так праваслаўнай стала пратэстантка Алена Любянецкая (Helena Lubieniecka) з Гарадзеншчыны. Але і яна, з цягам часу, перайшла на каталіцтва[36].

У 1662 г. апошнія 32 пратэстанцкіх сем'і Гарадзеншчыны з'ехалі на эміграцыю ў мястэчка Андрэасвальдэ (Andreaswalde сёньня Kąsinowo) ва Ўсходняй Прусіі, дзе Багуслаў Радзівіл атрымаў пасаду генэральнага губэрнатара. Апошні пратэстанцкі пастар гарадзенскага паходжаньня памёр у Прусіі ў 1803 г. У XVIII ст. Гарадзенскі павет канчаткова пераўтварыўся ў бастыён каталіцтва. Разбураная маскалямі сталічная Вільня, не аднавіла пасьля вайны былога значэньня, і адміністрацыйны цэнтар ВКЛ перамясьціўся да Гародні[37].

...Але сёньня, калі знішчаны ў вайне 1654-1661 гг. каралеўскі замак Вільні паволі аднаўляецца па рашэньню летувіскага ўраду, улада Беларусі разбурае эўрапейскую забудову старой Гародні. Вайна са спадчынай ВКЛ працягваецца з дапамогай бульдозера....

---

[32] Wittrock Georg. Karl X Gustaf i Polen. Krigsmålet och allianserna. Karolinska förbundets årsböcker. Stockholm, 1920. S. 14-15.

[33] Janusz Radziwiłł till Magnus Gabriel De la Gardie. December 26, 1655. Tykocin. Latin. In: RA/ Riksarkivet. De la Gardieska Samlingen. Skrifvelser till M. G. De la Gardie. Ser. C:I. E. 1531.

[34] Wasilewski Tadeusz. Radziwiłł Janusz // Polski Słownik Biograficzny. Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk-Łódź, 1987. T. XXX/1. S. 214.

[35] VL, Prawa, Konstytucye y Przywileie Krolewstwa Polskiego, Wielkiego Xięstwa Litewskiego y wszystkich prowincyi należących. Volumen Quartum (4). Ab anno 1641 ad annum 1668. St. Petersburg, 1859. S. 238-239.

[36] Kot Stanisław. Jerzy Niemirycz. W 300-lecie Ugody Hadziackiej. Paryż, 1960. S. 55.

[37] Kosman Marceli. Problem stołecznych funkcji Wilna do połowy XVII wieku // Zapiski historyczne. Vol. LXIV. 3-4. S. 37-66.

*Віталь Галубовіч,*
*кандыдат гіст. навук (Гродна)*

# Пастулаты Гарадзенскага сойміка на Сойм 1646 г.

Гісторыя парламентарызму на Гарадзенскай зямлі часоў існавання Вялікага княства Літоўскага дагэтуль вывучаецца і папулярызуецца амаль выключна ў кантэксце XVIII ст. ды абмяжоўваецца толькі правядзеннем соймаў Рэчы Паспалітай. Знаменным і вызначальным для гісторыі Гародні стала рашэнне пацыфікацыйнага сойма 1673 г., згодна з якім кожны трэці форум супольнай дзяржавы *"польскага і літвінскага народаў"* належала праводзіць у гэтым найбольш зручным месце княства з пункту гледжання яго размяшчэння для прыбыцця паслоў з розных частак шляхецкай рэспублікі.

Зацверджаны прынцып вытрымліваўся не заўсёды[1], але гэтае агульнадзяржаўнае мерапрыемства прыцягнула ўвагу гісторыкаў і адсунула на другі план, магчыма, больш вартыя даследавання падзеі. Гаворка ідзе пра гісторыю гарадзенскага сойміка. Была пакінута па-за ўвагай насычаная падзеямі і важная для сучаснікаў традыцыя, закладзеная яшчэ ў час рэформаў Жыгімонта Аўгуста. Уласны соймік гарадзенская шляхта атрымала ў 1565 г. пасля т.зв. *"соймікавай рэформы"*[2]. З гэтага моманту соймік становіцца асноўнай падзеяй палітычнага жыцця гарадзенскай шляхты, важнейшым інстытуцыйным элементам дзяржаўнай сістэмы, які не проста шчыльна звязваў мясцовых абывацеляў з заканадаўчай і выканаўчай уладамі краіны, а дазваляў удзельнічаць у прыняцці рашэнняў і ўплываць на функцыянаванне публічнай улады.

Толькі невялікім эпізодам у больш чым 200-гадовай гісторыі гарадзенскага сойміка былі падзеі 1646 г. Да гэтага часу мясцовая ўстанова шляхецкага парламентарызму стала гарманічнай часткай жыцця абывацеляў, ператварылася ў традыцыю. На жаль, з-за адсутнасці дастатковай колькасці гарадзенскай соймікавай дакументацыі канца XVI – першай паловы XVII ст. пакуль нельга прасачыць палітычнае жыццё павету ў яго храналагічным развіцці.

Падзеі, што папярэднічалі форуму 1646 г., як і ход самога сойма, адносна добра апісаны ў польскай гістарыяграфіі[3] і закраналіся намі[4].

---

1 Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569-1763. Warszawa, 2002. S. 176-178.

2 Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności 1492-1569. Poznań, 2002. S. 125.

3 Czermak W. Plany wojny tureckiej Władysława IV. Kraków, 1895; Wisner H. Litwa i plany wojny tureckiej Władysława IV. Rok 1646 // Kwartalnik Historyczny. R. LXXXIV. 1978. Nr. 2. S. 255-268.

4 Галубовіч В. Спрэчкі пра далучэнне Лоева да Вялікага Княства Літоўскага на сойме 1646 года // Шостыя Міжнародныя Доўнараўскія чытанні. Міжнародная навуковая канферэнцыя (Рэчыца, 2007) у 2 ч. Ч. 2. Рэчыца ў часе і прасторы: 795 год заснавання горада. Гомель, 2008. С. 38-44.

Час правядзення гарадзенскага сойміка не адрозніваўся ад іншых паветаў ВКЛ. Ён адбыўся 13 верасня 1646 г., г. зн., за 12 дзён да пачатку працы сойма. Прынятыя ў перыяд яго працы пастулаты вядомыя дзякуючы захаванай інструкцыі, якая ў выглядзе копіі зберагаецца ў складзе рукапіснага зборніка ў бібліятэцы Польскай акадэміі навук у Кракаве[5]. Напісаны дакумент на сярэднепольскай мове і па структуры нічым не адрозніваецца ад аналагічных дакументаў, складзеных у іншых паветух княства. Памеры інструкцыі не дазваляюць казаць, што яна была толькі фармальнасцю. Дакумент ствараўся як аснова для дзейнасці на сойме гарадзенскіх паслоў.

Ад павету на сойм былі абраныя пасламі гарадзенскі староста Фрыдрых Сапега і гарадзенскі маршалак, каралеўскі сакратар Уладзіслаў Кердзей. Асобы паслоў дастаткова вядомыя. Ф. Сапега прадстаўляў неаднаразова гарадзенскі соймік і быў чалавекам дасведчаным ў публічных і вайсковых справах. Але падзеі 1646 г. ледзь не сталі для старосты лёсавызначальнымі. Справа ў тым, што Ф. Сапега на сойм не трапіў, бо яго разбіў паралюш[6]. Гарадзенскі павет быў прадстаўлены толькі адным паслом. Гарадзенскі маршалак У. Кердзей пакінуў след у гісторыі пераважна як парламентарый (у 1639 г. нават кіраваў соймавымі пасяджэннямі), аднак, па ацэнках польскіх даследчыкаў, ён не карыстаўся вялікім аўтарытэтам[7].

Вызначэнне фракцыйнай прыналежнасці гарадзенскіх паслоў не выклікае вялікіх праблемаў. Фрыдрых Сапега належаў да сапежынскай групоўкі[8]. Як вядома Кердзеі ўваходзілі ў лік родаў, якія былі шчыльна звязаны з каралеўскай дынастыяй[9]. Уладзіслаў Кердзей сваёй кар'ерай абавязаны Уладзіславу Вазе і гарантавана падтрымліваў манарха. Адметна, што шляхта абірала паслом рэгаліста, але адначасова забяспечвала яго інструкцый у вялікай ступені стрыманай у адносінах да прапаноў караля.

Наколькі свабоднымі маглі быць у сваіх дзеяннях абраныя паслы? Высокія пасады гарантавалі ім некаторую варыятыўнасць у дзеяннях, ды і соймік дазваляў неасветленыя ў інструкцыі пытанні вырашаць самастойна.

Гарадзенскія соймікі з XVI ст. традыцыйна адбываліся ў замку, а пазней, у другой палове XVII ст. і ў бернардынскім касцёле[10]. У 1646 г. месцам нарадаў было замкавае памяшканне. Колькасць асобаў, якія ўдзельнічалі ў сойміку, можна высветліць толькі з пэўнай доляй верагоднасці. У сярэднім у павятовыя цэнтры ВКЛ прыязджала ў гэты час каля паўсотні асобаў[11]. На жаль, інструкцыя

[5] Biblioteka PAU i PAN w Krakowie. Rks. 365. S. 148-153.

[6] Паўстаў нават праект па адабранню ў яго пасады: Rachuba A. Sapieha Fryderyk. PSB. T. XXXIV/4. Z. 143. Wrocław etc. 1993. S. 611.

[7] Hołdys S. Praktyka parlamenterna za panowania Władysława IV Wazy. Wrocław, 1991. S. 97.

[8] Dzięgielewski J. Izba poselska w systemie władzy Rzeczypospolitej w czasach Władysława IV. Warszawa, 1992. S. 129.

[9] Dzięgielewski J. Izba poselska w systemie władzy Rzeczypospolitej... S. 111.

[10] Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym… S. 89.

[11] Лойка П. Шляхта беларускіх земляў у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – першай паловы XVII ст. Мн., 2002. С. 37.

1646 г. утрымлівае толькі няпоўны спіс удзельнікаў. Пад дакументам свае подпісы паставілі 28 шляхціцаў[12], але колькасць прысутных была значна большай. Спіс заканчваецца фразай *"іншых шмат подпісаў Іх Міласцяў паноў абывацеляў павету гарадзенскага"*. Што хаваецца пад гэтым "шмат" можна толькі здагадвацца, але, напэўна, самыя актыўныя парупіліся пра засведчанне свайго ўдзелу у працы сойміка. Няма сярод подпісаў і імёнаў абраных паслоў. Магчыма, колькасць шляхты, якая прымала ўдзел у сойміку ў Гародні, у два і болей разоў перавышала пазначаную лічбу, але рэгулярна збіраць вялікую грамаду атрымлівалася зрэдку. Апошняе пацвярджаецца і зместам інструкцыі, дзе канстатавалася: *"З-за позняга выдання соймавых лістоў няхутка даходзіць паведамленне пра соймы і соймікі, з-за чаго таксама малая прысутнасць на сойміках бывае"*. Не выключана, што такі стан рэчаў датычыўся толькі перадсоймікавых соймікаў. Атрымліваецца, што інфармацыя з Варшавы нават да Гародні, аддаленай значна менш у параўнанні з іншымі павятовымі цэнтрамі ВКЛ, не заўсёды даходзіла своечасова.

Аналіз спісу ўдзельнікаў сойміка дазваляе выказаць пэўныя меркаванні. Калі сыходзіць з пашыранай акурат у Трокскім ваяводстве, на трокскім павятовым сойміке практыкі, то дырэктарам гарадзенскага сойміка павінен быў стаць найбольш уплывовы ўраднік[13]. Першым падпісаў інструкцыю віленскі кашталян Ян Казімір Хадкевіч. Ён жа сярод прысутных займаў найбольш высокі ўрад. Верагодна, што менавіта Я.К. Хадкевіч здзяйсняў кіраванне соймікавымі нарадамі. Сярод іншых цэнтральных ураднікаў ВКЛ на соймік прыехалі чашнік ВКЛ Крыштаф Патоцкі і земскі падскарбі ВКЛ Гедэон Трызна. Мясцовыя ўлады былі прадстаўленыя судовымі ўраднікамі: падкаморым, земскімі і гродскімі суддзямі і пісарамі. Сярод ураднікаў, прысутных на сойміку, былі не толькі прадстаўнікі княства – слонімскі стольнік, але таксама і прадстаўнікі Інфлянтаў ды Кароны: парнаўскі падчашы і падляшскі падстолі.

Гарадзенская інструкцыя звяртае на сябе ўвагу выразным усведамленнем яе аўтараў спецыфікі і асобнасці інтарэсаў ВКЛ. Вялікая колькасць выпадкаў ужывання абрэвіятуры "ВКЛ" ці словазлучэння "княства літоўскае" сведчыць пра пэўны эмацыйны ўздым гарадзенскай шляхты пад уплывам якога ствараўся дакумент. Справа ў тым, што досыць часта адрозніць каронныя пастулаты ад літоўскіх амаль немагчыма, і відавочнай адметнасцю з'яўляецца ўжыванне назвы дзяржавы.

---

12 Пад тэкстам інструкцыі стаяць наступныя подпісы: Ян Казімір Хадкевіч, віленскі кашталян; Крыштаф Патоцкі, чашнік ВКЛ; Гэдэон Міхал Трызна, падскарбі ВКЛ; Аляксандр Бухавецкі, гарадзенскі падкаморы, пілінаўскі староста; Астафей Казімір Валовіч, уцянскі і платэльскі староста; Ян Міцута, гарадзенскі земскі суддзя; Адам Бухавецкі, гарадзенскі земскі пісар; Адам Колыч, ваўкавыскі падстолі, гарадзенскі гродскі суддзя; Мікалай Міхал Галімонт, гарадзенскі гродскі пісар; Стэфан Дзевялтоўскі; Станіслаў Тышкевіч, слонімскі стольнік; Станіслаў Александровіч; Дадзібог Талочка; Габрыэль Баўфал; Крыштаф Бухавецкі; Казімір Тышкевіч; Стэфан Міцута; Ян Слагоўскі, падляшскі падстолі; Аляксандар Бухавецкі; Януш Пузулянін Свяцкі; Самуэль Валовіч; Тамаш Масціцкі; Юрый Цесейка, парнаўскі падкаморы; Самуэль Буйна; Казімір Казлавіцкі; Андрэй Абуховіч; Рыгор Занеўскі; Казімір Заруба.

13 Zakrzewski A. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI-XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. Warszawa, 2000. S. 64.

pawet.net

Што ж найболей хвалявала гарадзенскую шляхту, і не толькі яе, напярэдадні сойму 1646 г.? Калі лічыць, што важнейшыя праблемы фіксаваліся ў інструкцыі ў першую чаргу, то галоўнай з іх трэба назваць абарону ад ворагаў. У пытаннях вайны гарадзенская шляхта выказала сваю насцярожанасць, паколькі *"не было ніколі спакою межам Рэчы Паспалітай ад вераломных і амаль спадчынных побач размешчаных непрыяцеляў, якія рады ў імгненне вока, маючы спрыянне фартуны, пры межах нашых апошнія праглынуць"*. Па пытанню абароны паслам рэкамендавалася прытрымлівацца супольнай пазіцыі прадстаўніцтва ВКЛ на сойме, але пры гэтым не дазвалялася пачынаць актыўныя дзеянні з *"ніводным непрыяцелям"*. Больш таго, прапаноўваліся самыя жорсткія санкцыі (да выкліку на наступны сойм) супраць ініцыятараў распачатай у ВКЛ вярбоўкі жаўнераў, якія на той час паспелі panішчыць шляхецкія і каралеўскія маёнткі.

Сярод важнейшых задачаў знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай было забеспячэнне міру з татарамі, і гэта добра ўсведамляла шляхта ВКЛ, але лічыла, што разлікі з татарамі – гэта справа выключна *"каронных братоў"*. Такога ж меркавання прытрымліваўся гарадзенскі соймік настойваючы на тым, каб падаткі на *"татарскія упамінкі"* ў княстве не прызначаліся. Гэтая супярэчнасць не была адзінай у адносінах польскай і літвінскай шляхты. На сойміку ў Гародні, як і ў іншых павятовых цэнтрах, актыўна абмяркоўвалася праблема парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці ВКЛ у выніку перадачы Маскоўскай дзяржаве Трубецка. Гарадзенская шляхта з абурэннем успрыняла аднабаковае рашэнне кароннай шляхты. Мірыцца з такім станам рэчаў гарадзенцы не збіраліся і сваім прадстаўнікам загадвалі дзейнічаць такім чынам, каб *"Княству Літоўскаму з-за страты той правінцыі, як і пакрыўджаным узнагарода была"*[14]. Занепакоенасць выказаў гарадзенскі соймік адносна абароназдольнасці важнейшых фартэцыяў на ўсходзе краіны Смаленска і Дынабурга, пра забеспячэннем якіх належала турбавацца паслам[15]. Відаць, што шведскі накірунак знешняй палітыкі не вельмі непакоіў гарадзенскіх абывацеляў, але тым не менш, яны прасілі прызначыць "камісараў для перамоваў аб вечным міры з шведамі". Канстытуцыя аб шведскай камісіі сапраўды была прынята на сойме 1646 г.[16]

Шэраг пунктаў датычыўся рэкамендацый па выпраўленню недахопаў у функцыянаванні дзяржаўных органаў улады. Незадаволенасць выклікалі *"inkommoda"* падчас соймавых канклюзій. Аптымізацыя дзейнасці сойма заключалася, на думку сабраных на сойміке, у недапушчэнні пралангацыі соймавых нарадаў і неабходнасці фіксацыі канстытуцый на працягу трох дзён пасля заканчэння сойму ў гродскім судзе з подпісам маршалка. Вялікія праблемы ўзнікалі, на думку шляхты, з-за адсутнасці належнай арганізацыі побыту паслоў падчас сойма, паколькі па просьбе дэлегацыі княства кароль выслаў сваіх сакратароў на рэвізію *"гасподаў"* у Варшаве,

14 Пункт быў рэалізаваны на сойме 1646 г. у канстытуцыі "Інкарпарацыя Лоева і Любеча да ВКЛ": Volumina legum. T.IV. Petersburg, 1859. S. 44-45.

15 Пункты былі рэалізаваны на сойме 1646 г.: Volumina legum. T.IV. Petersburg, 1859. S. 47.

16 Ibid., S. 45-46.

якая хаця і адбылася, але не вызначыла трэцюю частку будынкаў для паслоў ВКЛ. Паслам належала, нарэшце, дамагчыся выдзялення неабходных памяшканняў, каб *"ад Іх міласцей паноў маршалкаў паны паслы раней гасподы маглі мець"*.

Пад пільнае вока па-гаспадарску абачлівых шляхціцаў амаль заўсёды трапляў скарб. Цікава, што нягледзячы на тое, што на сойміку прысутнічаў сам падскарбі земскі ВКЛ, яго ўдзельнікам не ўдалося высветліць, як ён збіраўся выплочваць доўг, што ўзнік у выніку побыту маскоўскіх паслоў. Напэўна, на сойміке падскарбі яшчэ не быў падрыхтаваны адказаць на гэта пытанне.

Функцыянаванне судовых установаў у ВКЛ таксама не выклікала заспакаення. Вастрэйшай праблемай была кампетэнцыя судоў. Гарадзенскі соймік катэгарычна настойваў на тым, каб *"стан шляхецкі ў земскіх і гродскіх справах не выклікаўся мандатам на задворныя суды"*. Знаходзілі недахопы і ў працы Трыбунала, які, напрыклад, абмінаў соймавыя канстытуцыі ў рашэннях па справах па доказу шляхецтва.

Але публічныя справы, нават вельмі важныя, не выціснулі з поля зроку гарадзенцаў лакальныя і прыватныя інтарэсы, якія можна было вырашыць толькі на сойме. У інструкцыі шляхта выступала ў якасці абаронцаў інтарэсаў манаскіх ордэнаў, аселых у Гародні: брыгітак, езуітаў і дамініканцаў. Павятовым паслам даручалася дамагацца пацвярджэння на сойме фундацыі брыгіцкага кляштара вялікім маршалкам ВКЛ Крыштафам Весялоўскім і яго жонкай Аляксандрай Сабескай, а таксама вызвалення падараваных пляцаў ад падаткаў на горад. Да таго ж патрабавалася пацвердзіць іншыя шляхецкія фундацыі на кляштар. Прынятая на сойміке пастанова знайшла падтрымку Рэчы Паспалітай, праўда, зацверджана гэта было толькі на наступным сойме 1647 г.[17]

Сутнасць справы езуітаў была падобнай. Перад пасламі была пастаўлена задача пацвердзіць падчас нарадаў пераход да гарадзенскіх езуітаў вёскі Гаростава, якая была ім падаравана "навечна" мечнікам ВКЛ Крыштафам Халецкім. Дадзены пункт быў рэалізаваны ў значна пашыранай версіі на сойме 1647 г. у канстытуцыі: *"Апрабацыя айцам езуітам гарадзенскім вёскі Гаростава і фальварка Кілбасіна"*[18].

Нарэшце, на сойміку пастулявалася патрэба ў абнаўленні фундацыі дамініканам "*з дадаткам ад імя Яго Міласці пана гарадзенскага старосты Фрыдрыха Сапегі і Яго Міласці памерлай жонкі*"[19].

Сярод пунктаў, за якія неслі адказнасць паслы, была справа гарадзенскіх шляхціцаў Эйсмантаў. Паслы павінны былі заняцца гэтай праблемай і найперш паспрыяць стварэнню камісіі для разбору пытання аб далучэнні да гарадзенскай эканоміі іх зямель. Меліся парупіцца паслы і пра справы паноў Пацаў, каб іх двор *"у Гародні ля рынку на Віленскай вуліцы побач з касцёлам Фарным"* быў вызвалены з-пад юрысдыкцыі горада. Як і шэраг іншых, гэты пункт атрымалася ўключыць у асобную канстытуцыю толькі ў 1647 г.[20]

---

[17] Ibid., S. 58.

[18] Ibid., S. 57.

[19] Ф. Сапега зрабіў запіс гарадзенскім дамініканам у 1632 г. // Rachuba A. Sapieha Fryderyk. PSB. T. XXXIV/4. Z. 143. Wrocław etc. 1993. S. 611.

[20] Volumina legum. T.IV. Petersburg, 1859. S. 61.

Пралабіраваныя былі на сойміку таксама інтарэсы жыхароў Гародні. Паслы атрымалі даручэнне прасіць *"за гарадзенскіх мяшчан, якіх Пан Бог вялікім агнём наведаў"*, каб кароль дазволіў пацярпелым вольна нарыхтоўваць у пушчы лес для адбудовы дамоў.

Ключавым для ўсяго места Гарадзенскага і не толькі стала яшчэ адно пытанне, закранутае на гарадзенскім сойміку ў верасні 1646 г. Тут было падтрымана рашэнне пра пабудову мосту праз Нёман, але хаця мост і быў названы *"патрэбным"*, пабудаваць яго не было магчымасці *"без спецыяльнага штогадовага падатку"*. Механізм ажыццяўлення прынятага рашэння ўяўляўся шляхце наступным чынам: на падставе прынятага на сойміку ляўдыюме, на падставе якога ўводзіліся падаткі на шляхецкія і каралеўскія землі, манарх выдаваў прывілей, а заканчвалася працэдура зацвярджэннем пастановы на сойме Рэчы Паспалітай. Так, зрэшты, і атрымалася, толькі не ў 1646 г., а на наступным сойме ў 1647 г., на які гарадзенская шляхта павезла тыя ж самыя пастулаты, паколькі рэалізаваць праграму 1646 г. не было аніякай магчымасці. Канстытуцыя 1647 г. пра пабудову моста на Нёмане, аднак, была вынікам не вераснёўскага, а лютаўскага сойміка 1646 г.[21]

Многія прынятыя на гарадзенскім сойміку пастановы па аб'ектыўных прычынах не маглі быць рэалізаваныя на сойме 1646 г. Соймавыя пасяджэнні былі амаль цалкам прысвечаныя важнейшай для ВКЛ праблеме кампенсацыі за кошт Кароны страты Трубецка, і таму справа не дайшла да абмеркавання шырокага кола прапаноў. Тым не менш, важнейшыя палітычныя пытанні ўзнятыя на гарадзенскім сойміку былі вырашаны ўжо на сойме 1646 г.: прынятыя канстытуцыі пра Трубецк, забеспячэнне Смаленска і Дынабурга. Больш таго, аналіз канстытуцый сойма 1647 г. дазваляе сцвярджаць, што гарадзенская шляхта большасць пунктаў перанесла на павестку дня наступнага сойму, дзе былі рэалізаваныя многія сфармуляваныя ў інструкцыі 1646 г. пункты. Дзякуючы пастулатам 1646 г., такім чынам, высвятляецца змест пастановаў гарадзенскага і перадсоймавага сойміка 1647 г.

---

[21] Ibid., S. 57. Соймавая канстытуцыя ўтрымлівае наступную інфармацыю. Мост праз Нёман належала збудаваць за кошт прыбыткаў каралеўскага скарбу, але з-за хуткасці вады ў рэчцы драўляная будоўля доўга не вытрымлівала, і было прынятае рашэнне аб узвядзенні мураванага мосту. Паколькі да запланаванай акцыі вырашылі далучыцца гарадзенскія абывацелі, на 3 лютага ў Гародні быў скліканы соймік, дзе яны пастанавілі прыняць пэўныя падаткі: чатыры паборы і чопавае на адзін год. Менавіта гэтая пастанова (ляўдыюм) і пацвярджаецца ў канстытуцыі 1647 г. Але сам збор грошай (ланавы падатак), які належала ажыццяўляць з усіх уладанняў павету, пачынаўся з 1 студзеня 1648 г. і працягваўся шэсць тыдняў. Паўтары тысячы злотых на справу мелі аддаць мясцовыя габрэі. Толькі вось ажыццявіць такую маштабную будоўлю ва ўмовах ахапіўшага Рэч Паспалітую з вясны 1648 г. крызісу наўрад ці было магчыма.

*Андрэй Мацук,*
*кандыдат гіст. навук (Мінск)*

# Эліта Гарадзенскага павету ў перыяд праўлення Аўгуста III. 1733-1763 гг.

XVIII ст. у гістарыяграфіі прынята лічыць перыядам панавання магнацкай алігархіі. Але за барацьбой магнацкіх груповак застаецца незаўважанай роля павятовай эліты, а менавіта яна вызначала палітычную сітуацыю ў павеце. Дзейнасць павятовай эліты прыводзіла да перамогі той ці іншай магнацкай групоўкі ў большасці паветух, а з ёй і перамогі ў выбарах у Трыбунал ВКЛ ці сойм Рэчы Паспалітай, а значыць і дамінаванню ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы. Уплывы на павятовую эліту давалі магнатам перавагу ў Княстве. Эліта кожнага павету мела свае асаблівасці, якія адрознівалі яе ад эліты іншых паветаў ВКЛ. Мела іх і эліта Гарадзенскага павету.

Самым простым шляхам для вызначэння эліты Гарадзенскага павету ў разглядаемы перыяд падаецца вылучэнне прадстаўнікоў шляхецкіх родаў, якія займалі асноўныя гарадзенскія павятовыя пасады ў часы праўлення Аўгуста III. Гэта былі выбарныя ўрады маршалка, падкаморыя, харужага, суддзі, падсудка, пісара, а таксама гродскага старосты, войскага, стольніка і падстолія.

У разглядаемы час вядомы адзіны гарадзенскі маршалак – Тамаш Антоні Міцута. Ён намінаваны быў 19 верасня 1746 г.[1], але нядоўга займаў пасаду, бо памёр 7 студзеня 1748 г. Урад гарадзенскага падстолія атрымаў Міхаіл Эйсмант. Падкаморы быў таксама толькі адзін – Тадэвуш Юндзіл. Прывілей яму быў выдадзены 19 верасня 1746 г., і трымаў ён урад да свайго пераходу на гарадзенскае маршалкоўства да 28 лютага 1765 г.[2] У той жа дзень, 19 верасня 1746 г. гарадзенскім харужым стаў Юзаф Вал, які да гэтага з 8 ліпеня 1737 г. з'яўляўся гарадзенскім войскім. Урад гарадзенскага войскага пасля яго атрымаў гарадзенскі гродскі пісар Дабрагост Казімір Баўфал, які выконваў абавязкі да смерці напрыканцы 1754 г. А ўжо 26 траўня 1755 г. прывілей на ўрад войскага быў выдадзены гарадзенскаму стольніку Міхаілу Эйсманту, які займаў яго да канца праўлення Аўгуста III.

Урад стольніка ад 8 лютага 1720 г. да пераходу на ўрад гарадзенскага земскага суддзі (19 верасня 1746 г.) 26 гадоў займаў Бенедыкт Яўстахі Александровіч. Марцін Ян Алізаровіч атрымаў урад падсудка 19 верасня 1746 г. і займаў пасаду да канца праўлення Аўгуста III. Адначасова маюцца звесткі, што ў канцы 30-х – пачатку 40-х гг. XVIII ст. гарадзенскім стольнікам быў Ян Літавор Храптовіч, але ў Метрыцы ВКЛ не ўдалося выявіць адпаведнага прывілея. Пасля Александровіча

[1] НГАБ. Ф. 1711, воп.1, ад. з. 36, арк. 49-50.
[2] НГАБ. Ф. 1711, воп.1, ад. з. 36, арк. 51-52аб.

гарадзенскае стольнікаўства дасталася Антонію Палітальскаму, але менш чым праз месяц у сувязі з яго смерцю пасада перайшла гарадзенскаму мечніку Якубу Храптовічу (12 снежня 1746 г.). Пасля смерці Якуба Храптовіча ўрад гарадзенскага стольніка 7 чэрвеня 1752 г. трымаў гарадзенскі падстолі Міхаіл Эйсмант, які займаў яго да свайго перахода 26 траўня 1755 г. на пасаду войскага. Урад гарадзенскага падстолія пасля яго сыходу атрымаў гарадзенскі падчашы Дамінік Сапоцька, які ўслед за пераходам Эйсманта на войскага атрымаў таксама ўрад гарадзенскага стольніка. Падстольства атрымаў гарадзенскі гараднічы Лукаш Барановіч. А ўжо напачатку 60-х гг. XVIII ст. урад гарадзенскага падстолія аказаўся ў гарадзенскага падстаросты Антонія Тызенгаўза[3].

Найвышэйшы гродскі ўрад – гарадзенскага гродскага старосты – увесь час праўлення Аўгуста III займалі прадстаўнікі роду Масальскіх. Міхаіл Юзаф Масальскі знаходзіўся на пасадзе гарадзенскага гродскага старосты з 27 сакавіка 1727 г. Ён перадаў староства свайму сыну Юзафу Андрыяну. Метрыка ВКЛ утрымлівае аж 5 кансэнсаў на перадачу староства ад 20 лістапада 1738 г., 12 лістапада 1740 г., 7 лістапада 1744 г., 16 лістапада 1748 г., 1 лістапада 1750 г.[4]

Калі прааналізаваць спіс ураднікаў Гарадзенскага павету ў часы Аўгуста III, то заўважальна, што ў павятовую эліту ўваходзілі максімум па два прадстаўнікі якога-небудзь шляхецкага роду: Баўфалы, Каленкевічы, Міцуты, Барановічы, Эйсманты, Храптовічы і інш. Апроч іх трэба назваць род, які значна пераважаў іншых па колькасці ўладанняў і ступенню ўплывовасці. Размова ідзе пра род Масальскіх, якія ў гэты час перайшлі з шэрагаў сярэдняй шляхты ў лік магнатэрыі. Дастаткова прывесці некалькі прыкладаў.

На Трыбунале ВКЛ 1741 г. павінна была разглядацца судовая справа пра спадчыну памерлага трокскага кашталяна Антонія Казіміра Сапегі і пра апеку над сынамі памерлага генерала артылерыі Казіміра Леона Сапегі. Выбары на сойміках суправаджаліся барацьбой паміж сапежынскімі і радзівілаўскімі прыхільнікамі. Кандыдатам ад Сапегаў на пасаду трыбунальскага маршалка быў мсціслаўскі ваявода Міхаіл Масальскі. Радзівілы ўсімі магчымымі спосабамі імкнуліся перашкодзіць яго абранню. Яны ўважліва сачылі за гарадзенскім соймікам, дзе іх канкурэнты якраз збіраліся выбраць М. Масальскага. Сапегі даведаліся, што Радзівілы выдаткавалі Есману (магчыма Эйсманту – *А.М.*) 200 талераў, каб сарваць працу сойміка і параілі свайму прыхільніку абірацца на жамойцкім сойміку[5]. Аднак ён адмовіўся ад прапановы: “Мсціслаўскі ваявода з Гародні вырашыў стаць дэпутатам, нягледзячы на ўсё, смела ідучы на рызыку”[6].

---

[3] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T.2. Województwo trockie XIV-XVIII wiek. / Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba, P.Romaniuk, przy współpracy J.Aniszczenki i A.Macuka. [у друку].

[4] НГАБ. Ф. кмф-18, воп. 1, ад. з. 170, арк.117, 445-446. НГАБ. Ф. кмф-18, воп. 1, ад. з. 173, арк.283-284; НГАБ. Ф. кмф-18, воп. 1, ад. з. 176, арк. 220-221, 694-695.

[5] Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos Rankraščių skyrius (далей – LMAB). F.139, b. 4061, M.A.Sapieha do J.S.Sapiehy, 15.01.1741, Czerlona, l.409-412,

[6] LMAB. F.139, b. 4061, M.A.Sapieha do J.S.Sapiehy, 21.01.1741, Zelwa, l.414.

Сапегі вымушаны былі распрацаваць план, каб забяспечыць абранне М. Масальскага дэпутатам. Сутнасць яго заключалася ў тым, каб у выпадку зрыву гарадзенскага сойміку, абраць мсціслаўскага ваяводу дэпутатам на ваўкавыскім сойміку: "У Ваўкавыску затрымлівалі пачатак паседжання, пачаўшы соймік пад прэтэкстам стрымлівання прэтэндэнтаў, а ў Гародні ён павінен быў распачацца каля восьмай гадзіны раніцы, і калі б там быў сарваны […] Ягомасць пан ваявода мсціслаўскі павінен быў дабірацца да нас з дапамогай коней, расстаўленых на шляху. Соймік у Ваўкавыску распачалі а чацвёртай гадзіне дня"[7]. Але запасны варыянт М. Масальскаму не спатрэбіўся. Разам з гарадзенскім падстоліям Антоніям Міцутай ён быў абраны дэпутатам у Гародні[8]. Паспяховы выбар М. Масальскага на гарадзенскім сойміку, як згадваў Юзаф Станіслаў Сапега, быў дасягнуты з дапамогай хітрасці: "Стараннямі майго брата, які супраціўную групоўку так спаіў, што яна спала тады, калі соймік адбываўся"[9]. Соймік прайшоў у чатыры гадзіны раніцы, і толькі потым пад'ехаўшыя радзівілаўскія прыхільнікі пратэставалі[10].

Навагрудскі ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл рабіў спробы аспрэчыць абранне Міхаіла Масальскага дэпутатам, сцягнуўшы ў Вільню пратэстаўшых супраць выбараў на гарадзенскім сойміку "некалькі дзесяткаў шляхты, якая жадала кампенсаваць, што праспала соймік і ўзятую на яго зрыў узнагароду"[11]. Аднак з-за хваробы на Трыбунал ВКЛ не прыбыў вялікі гетман ВКЛ Міхаіл Вішнявецкі, і перавага аказалася на баку Сапегаў і М. Масальскага[12].

Дамінаванне Масальскіх абумовіла рост палітычнага значэння гарадзенскага сойміка для ВКЛ. Дастаткова сказаць, што ў 40-я гг. XVIII ст. трыбунальскімі маршалкамі станавіліся дэпутаты слонімскага і гарадзенскага соймікаў (па 3 разы)[13]. Яшчэ адзін толькі выпадкова не заняў гэтую пасаду. У 1746 г. кандыдатам на трыбунальскага маршалка ад кааліцыі магнацкіх груповак быў вызначаны пінскі староста Уладзіслаў Ельскі. Ён і быў абраны дэпутатам на сойміку ў Гародні, але выпадкова стрэліў сабе ў нагу і не здолеў быць на рэасумпцыі[14] Трыбунала ВКЛ.

У гістарычнай літаратуры на падставе ўспамінаў Марціна Матушэвіча даволі часта адзначаецца выключная роля ковенскага сойміка (лічылася, што яго немагчыма сарваць), але мала хто звяртае ўвагу на значэнне астатніх павятовых соймікаў.

---

7 AGAD. Archiwum Roskie, t.II Korespondencja, LIII/14, k.269-270.

8 НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 30, арк. 73-74. LMAB f. 139, b. 4061, M.A.Sapieha do J.S.Sapiehy, 04.02.1741, Grodno, l.421.

9 Biblioteka Narodowa, Biblioteka Ordynacji Zamojskich nr 941, k.339.

10 AGAD. Archiwum Radziwiłłów, dział II, 2588, k.1-2. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział IV, teka 45, koperta 628, k.140.

11 AGAD. Archiwum Roskie, t.II Korespondencja, LIII/14, k.289-290.

12 Ibid., k.152.

13 Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis / pod red. Andrzeja Rachuby; oprac. Andrzej Rachuba i Przemysław P. Romaniuk przy współpr. Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki; Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. Warszawa, 2004. s. 188, 212, 217.

14 Рэасумпцыя (reasumpcio – лац.) Трыбунала ВКЛ – зацвярджэнне, паўторнае зацвярджэнне. У дадзеным выпадку пацвярджэнне легітымнасці абрання дэпутатаў і зацвярджэнне складу Трыбунала ВКЛ.

У той жа час гарадзенскі соймік, таксама, лічыўся соймікам, які складана сарваць. Гарадзенскі соймік кантраляваўся прыхільнікамі гэтак званай "Фаміліі", дакладней Масальскімі, якія на працягу доўтага часу былі гарадзенскімі гродскімі старостамі, і падскарбіям ВКЛ Юрыям Флемінгам, што кіраваў Гарадзенскай эканоміяй. Ён уплываў на шляхту праз наданне ўладанняў эканоміі, а акрамя таго меў абяцанне каралеўскага двара, што ўсе гарадзенскія павятовыя ўрады будуць надавацца толькі з яго згоды[15]. Флемінг перацягнуў на бок "Фаміліі" лідэра радзівілаўскай групоўкі ў павеце гарадзенскага войскага Міхаіла Юзафа Эйсманта за заставу некаторых уладанняў ад гарадзенскай эканоміі[16].

Неабходна заўважыць, што найчасцей будучыя маршалкі Трыбунала ВКЛ абіраліся на сойміку ў Гародні дзякуючы таму, што з'яўляліся мясцовымі ўраднікамі. У 1741 г. мсціслаўскі ваявода Міхаіл Масальскі быў адначасова і гарадзенскім гродскім старостай. У 1748 г. гэтую пасаду займаў ужо ягоны сын, які таксама быў абраны дэпутатам ў Гародні. Увогуле ўплыў гарадзенскага старосты Юзафа Масальскага на мясцовую шляхту быў вялікім. Дастаткова сказаць, што ён абіраўся паслом на соймы 4 разы (1744, 1750, 1754 і 1758 гг.). Аднак трэба адзначыць, што ў трох першых выпадках яго выбар без вялікіх пратэстаў адбываўся дзякуючы таму, што калегамі па пасольству станавіліся лідэры радзівілаўскай групоўкі ў павеце польны стражнік ВКЛ Казімір Барановіч (1744), гарадзенскі абозны Лукаш Барановіч, гарадзенскі стольнік Міхаіл Эйсмант (1754)[17].

Падчас супрацоўніцтва Радзівілаў і "Фаміліі" ніхто не мог перашкодзіць абранню іх дэпутатаў на гарадзенскім сойміку. Напрыклад, у перыяд выбараў у Трыбунал ВКЛ 1746 г., які павінен быў разглядаць справу спадчыны Вішнявецкіх, асноўная барацьба разгарнулася паміж кааліцыяй Чартарыйскіх з Радзівіламі і кааліцыяй Агінскіх з Салагубамі. Грамнічныя соймікі скончыліся перамогай першых або, як іх яшчэ называлі, "воўчынска-нясвіжскай кааліцыі". Найбольш надзейным соймікам Чартарыйскія і Радзівілы лічылі гарадзенскі. Менавіта тут і быў абраны дэпутатам будучы кандыдат на пасаду трыбунальскага маршалка пінскі староста Уладзіслаў Ельскі[18]. Яго выбар адбыўся ў першую чаргу дзякуючы Масальскім, якія адказвалі за выбары на гарадзенскім сойміку[19]. Масальскія бліскуча выканалі план кааліцыі, хоць у Гарадзенскім павеце мелі сваіх прыхільнікаў і Агінскія, і Салагубы[20].

Значны ўплыў у Гарадзенскім павеце мелі Сапегі. Як згадвалася вышэй, Міхаіл Антоні Сапега ў 1741 г. спрыяў абранню дэпутатам Міхаіла Масальскага. Сапегі нават лічылі, што з дапамогай сваіх прыхільнікаў могуць пераш-

[15] Мацук А. Роль М. Чорторийського під час розподілу повітових урядів у ВКЛ в 40-х рр. XVIII ст. // Український історичний збірник. 2007. Вип. 10. С.67-68.

[16] AGAD. AR, dz.IVa, ks.14, M.K.Radziwiłł do B.Radziwiłł, Nieswiż, 11.08.1756, k.396.

[17] НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 33, арк. 777; НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 39, арк. 389; НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 43, арк. 316.

[18] НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 35, арк. 85. Biblioteka Jagiellońska 5006, к.228.

[19] LMAB. F. 139, b. 4062, l.349v.

[20] Ibid., M.A.Sapieha do J.S.Sapiehy, 11.11.1745, Ołyka, l.361.

каджаць усемагутным ў павеце Масальскім. Падчас канфлікту з Масальскімі ў сярэдзіне 1747 г. у справе пасагу жонкі Казіміра Масальскага Крысціны Ружы з Сапегаў, Міхаіл Антоні Сапега быў упэўнены, што не дасць стаць дэпутатам і трыбунальскім маршалкам Юзафу Масальскаму, бо зробіць усё, каб сарваць гарадзенскі соймік[21]. Можна меркаваць, што пагроза была вельмі сур'ёзнай, бо М. Масальскі ўсур'ёз апасаўся, што Міхаіл Антоні Сапега перашкодзіць яго плану выбараў на ваўкавыскім і гарадзенскім сойміках[22]. Мелі сваіх прыхільнікаў сярод мясцовай шляхты і іншыя магнацкія роды. Сітуацыя перамянілася з уваходам сапежынскай групоўкі ў склад "Фаміліі" пасля жаніцьбы ў 1748 г. Міхаіла Антонія Сапегі на дачцэ падканцлера ВКЛ Міхаіла Чартарыйскага Аляксандры.

У Гарадзенскім павеце соймікавымі кампаніямі "Фаміліі" кіравалі Масальскія і Флемінг, а сапежынскія кліенты сталі іх падначаленымі. Пасля разрыву з Чартарыйскімі ў 1758 г. Міхаіл Антоні Сапега знайшоў сабе ў павеце прыхільнікаў толькі сярод не самых аўтарытэтных шляхціцаў: сына гарадзенскага падкаморыя Францішка Юндзіла, гродскага пісара Юзафа Бауфала і нейкага Садлускага[23]. Але і ў адносінах да названых шляхціцаў існавала падазрэнне, ці не засталіся яны на самой справе прыхільнікамі "Фаміліі", а не Сапегаў.

У 1752 – 1754 гг. адбыўся разрыў Чартарыйскіх з каралеўскім дваром, і "Фамілія" перайшла ў шэрагі апазіцыі, што прывяло да аслаблення яе пазіцый у некаторых паветух ВКЛ. У той жа час у Гарадзенскім павеце пазіцыі "Фаміліі" засталіся нязменнымі. Міхаіл Чартарыйскі быў упэўнены, што яго-ныя прыхільнікі здолеюць самастойна правесці абранне сваіх стаўленнікаў на гарадзенскім сойміку 1754 г.[24] У выніку пасламі былі абраныя лідэры мясцовай групоўкі Чартарыйскіх (надворны падскарбі ВКЛ Юзаф Масальскі) і Радзівілаў (гарадзенскі стольнік Міхаіл Эйсмант)[25]. Інструкцыя ім была складзена згодна планам "Фаміліі". Насуперак меркаванню Міхаіла Казіміра Радзівіла ў яе не ўвайшоў пратэст супраць падзелу Астрожскай ардынацыі[26].

Падчас абвастрэння барацьбы паміж Радзівіламі і Чартарыйскімі ў 1755–1756 гг. гарадзенская шляхта ў сваёй большасці займала бок "Фаміліі". Гарадзенскі соймік разам з ваўкавыскім і аршанскім найбольш прыхільна ставіліся да планаў арганізацыі антыдворскай і антырадзівілаўскай канфедэрацыі ў ВКЛ. Аб моцы пазіцыі "Фаміліі" сведчаць падзеі 1756 г., калі Радзівілы выдалі сваім прыхільнікам у павеце 5 тыс. злотых толькі за ўнясенне пратэстацыі супраць сойміка, а нават не за яго зрыў[27].

[21] LMAB. F. 139, b. 4063, M.A.Sapieha do J.S.Sapiehy, 26.08.1747, Słonim, k.52v.

[22] LMAB. F. 139, b. 4040, J.S.Sapieha do M.A.Sapiehy, 04.08.1746, Wilno, к.12-12v.

[23] Biblioteka PAU i PAN 361, k.60.

[24] Biblioteka Narodowa 3285/1, к.20.

[25] НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 43, арк. 316.

[26] Тамсама, арк. 316-321.

[27] AGAD, AR, dz.IVa, ks.14, k.369. AGAD, AR, dz.IVa, ks.14, M.K.Radziwiłł do K.Baranowicza, Nieśwież, 09.08.1756, k.391.

Некаторая частка шляхты ВКЛ пасля разрыву Чартарыйскіх з дваром, палічыла за лепшае пакінуць шэрагі прыхільнікаў "Фаміліі" і далучыцца да новай прыдворнай групоўкі. Гэта было не выгодна Чартарыйскім, таму яны распачалі дзейнасць па спыненню такіх "здрадніцкіх" памкненняў шляхты. Для атакі быў абраны адзін з перабежчыкаў – Марцін Матушэвіч. Непасрэдным штуршком для пачатку справы былі дзеянні брэсцкай шляхты пад кіраўніцтвам Матушэвічаў падчас брэсцкага пасольскага сойміка 1754 г. Міхаіл Чартарыйскі падтрымаў справу па прызнанню роду Матушэвічаў нешляхецкім. Атака на Матушэвічаў супала са спробай Міхаіла Казіміра Радзівіла правесці на пасаду трыбунальскага маршалка свайго сына Караля.

Новая хваля супрацьстаяння паміж Радзівіламі і Чартарыйскім разгарнулася падчас выбараў у Трыбунал ВКЛ 1755 г. Выбары на дэпутацкіх сойміках прайшлі ва ўпартай барацьбе паміж воўчынскімі і нясвіжскімі прыхільнікамі. Не абмінула яна і гарадзенскі соймік. Дэпутатамі на ім былі абраны гарадзенскі абозны Антоні Каленкевіч і гарадзенскі пісарэвіч Каэтан Міцута[28]. Радзівілаўскія прыхільнікі Барановічы зрабілі ўсё магчымае, каб перашкодзіць абранню сваіх праціўнікаў на гарадзенскім сойміку. Яны ўнеслі пратэстацыю, якую Міхаіл Казімір Радзівіл прасіў падтрымаць, прыбыўшы на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ[29]. Адначасова, праўда, Міхаіл Казімір Радзівіл віншаваў з выбарам дэпутатам гарадзенскага абознага Антонія Каленкевіча[30]. Вялікія намаганні на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ прыкладалі падканцлер ВКЛ Міхаіл Антоні Сапега, падскарбі ВКЛ Юры Флемінг і польны гетман ВКЛ Міхаіл Масальскі. Яны дабіваліся, каб прыхільныя "Фаміліі" лідскія і адзін гарадзенскі (Каленкевіч памёр да рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ) дэпутаты ўвайшлі ў трыбунальскае кола[31]. У выніку на падставе пратэстацыі Міхаіл Казімір Радзівіл як віленскі ваявода, не дапусціў гарадзенскіх дэпутатаў у трыбунальскае кола[32].

Яшчэ больш абвастрылася ўнутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ перад дэпутацкімі соймікамі на наступны Трыбунал ВКЛ. Міхаіл Казімір Радзівіл асабіста прасіў сваіх прыхільнікаў у павеце пра абранне радзівілаўскіх стаўленнікаў на большасці соймікаў, у тым ліку і гарадзенскім. Аднак магчымасці радзівілаўскіх прыхільнікаў у Гарадзенскім павеце ў той час былі ўжо невялікімі. Яны здолелі толькі сарваць соймік: "Ягомасць Пан Эйсмант войскі [гарадзенскі войскі Міхаіл Юзаф Эйсмант – *А.М*] не хацеўшы сойміку на нікога дазволіць [не хацеў – *А.М*]. Ягомасць Пан падскарбі надворны ВКЛ [Юзаф Масальскі – *А.М*] рознымі прапановамі і моцным стараннем аб тым трактаваў, што калі не Іхмосць Паны канкурэнты, тады з ім [Эйсмантам хто-небудзь – *А.М*] з Гарадзенскага па-

[28] НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 44, арk. 19.

[29] AGAD. AR, dz.IVa, ks.13, k.654.

[30] AGAD. AR, dz.IVa, ks.15, k.655-656.

[31] AGAD. AR, dz.IVa, ks.13, k.793.

[32] Ibid., k. 787.

вету, каб дайшоў соймік, бо былі бы абраны дэпутаты. І на такое не быў згодны Ягомасць, бо не знайшлі такога [задаволіўшага Эйсманта – *А.М*] кандыдата"[33].

Асноўная барацьба паміж Чартарыйскімі і Радзівіламі павінна была разгарнуцца на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. Лідэры "Фаміліі" заклікалі прыехаць у Вільню на рэасумпцыю як мага больш сваіх шляхецкіх прыхільнікаў, якія павінны былі дапамагчы стаць трыбунальскім маршалкам падскарбію ВКЛ Юрыю Флемінгу. Не апошняе месца ў гэтых планах займала гарадзенская шляхта. У выніку, паводле польскага даследчыка У.Канапчыньскага, найбольш прыхільнікаў "Фаміліі" (каля 700), прыбылі пад кіраўніцтвам Караля Храптовіча менавіта з Гарадзенскага павету. Значэнне гарадзенскай шляхты для Чартарыйскіх падчас рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ было прыкметным, бо агулам прыбылі падтрымаць "Фамілію" каля 5 тыс. шляхты.

Не было нічога дзіўнага, што перад наступнымі гарадзенскімі соймікамі Радзівілы апасаліся, што "Фамілія" правядзе ў Гародні абранне Юзафа Масальскага ці каго-небудзь іншага з лідэраў "Фаміліі". Яны вырашылі пратэставаць супраць сойміка. Для гэтага было даслана 5 тыс. злотых Лукашу Барановічу[34].

Радзівілам гэта не дапамагло, і на гарадзенскім сойміку сасламі былі абраны ваўкавыскі староста Ян Масальскі і палкоўнік Уладзіслаў Ельскі. Інструкцыя, якая была ім уручана, утрымлівала антыдворскія і антырадзівілаўскія пункты (наданне пасадаў у ВКЛ толькі літвінам; адкрыццё ў Рэчы Паспалітай манетнага двара; выканання трыбунальскіх правоў)[35]. У дадзеным выпадку мы можам казаць, што Масальскі і Ельскі былі абраны пасламі на гарадзенскім сойміку, але не можам быць упэўненымі, што яны здолелі бы ўтрымацца падчас ругаў[36] у сойме, бо супраць іх выбару былі занесены пратэстацыі, якія падпісала значная колькасць шляхты[37]. Пратэстацыя была арганізавана і занесена праз радзівілаўскіх прыхільнікаў Барановічаў. Іх спробу пратэсту на сойміку ў лісце да першага міністра Аўгуста III Генрыха Бруля прызнаваў нават Юры Флемінг. І адначасова заўважаў, што пры спробе Барановічаў пратэставаць, іх ледзьве не пасекла прысутная на сойміку шляхта[38]. Радзівіл збіраўся не прапусціць на сойме падчас ругаў гарадзенскіх паслоў і планаваў прывесці пратэставаўшую шляхту на сойм[39]. Захаваўся нават "Рэестр пратэставаўшых шляхціцаў 1756 г. на

[33] Biblioteka Narodowa, Biblioteka Ordynacji Zamojskich, nr 939, M.Massalski do M.A.Sapiehy, Mysz, 15.02.1756, k.3.

[34] AGAD. AR, dz.IVa, ks.14, M.K.Radziwiłł do Baranowicza strażnik polny WKL, Nieswiż, 29.07.1756, k.369; AGAD, AR, dz.IVa, ks.14, M.K.Radziwiłł do Baranowicza strażnik polny WKL, Nieswiż, 09.08.1756, k.391.

[35] НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 45, л.143-151.

[36] Ругі – праверка законнасці выбараў на сойм і пацвярджэнне мандатаў.

[37] НГАБ. Ф.1722, воп. 1, ад. з. 109, арк.105-106.

[38] Biblioteka Jagiellońska 24/61, b.p.

[39] AGAD. AR, dz.IVa, ks.14, M.K.Radziwiłł do Baranowicza strażnik polny WKL, Nowogródek, 04.09.1756, k.458.

варшаўскім вальным сойме". Згодна яму Радзівілы збіраліся выплаціць па 2 чырвоных злотых за ўтрыманне пратэстацыі наступным гарадзенскім шляхціцам: Станіславу Дашкевічу, Дамініку Гарыскезаву, Мікалаю Ціхоцкаму, Казіміру Зубарскаму, Стэфану Пырскаму[40].

Зразумела, што ў сітуацыі абвастрэння барацьбы паміж Чартарыйскімі і Радзівіламі апошнія лічылі за лепшае зрываць соймікі на якіх "Фамілія" мела перавагу. Быў сарваны гарадзенскі дэпутацкі соймік на Трыбунал ВКЛ 1757 г.[41] Выбары ў наступны Трыбунал ВКЛ 1758 г. прайшлі больш спакойна, але дэпутацкія соймікі 1758 г. зноў адбыліся ў абстаноўцы канкурэнцыі паміж прыхільнікамі Радзівілаў і Чартарыйскіх. Для забеспячэння добрых вынікаў на гарадзенскім сойміку 1758 г. Радзівілы выдаткавалі 4 тыс. злотых. Для параўнання тады ж на ваўкавыскі соймік было выдадзена толькі дзве тысячы злотых[42]. Гэтага было недастаткова, каб у Гародні правесці выбар прыхільнага Радзівілам дэпутата без згоды Масальскіх, і Міхаіл Казімір Радзівіл звярнуўся з просьбай аб падтрымцы кандыдатуры гарадзенскага абознага Віктара Кжыўкоўскага[43].

У выніку на гарадзенскім сойміку былі абраны шляхецкія лідэры Чартарыйскіх (гарадзенскі падсудак Марцін Ян Алізаровіч) і Радзівілаў (гарадзенскі гараднічы Францішак Барановіч). Праўда, супраць выбару дэпутатам Алізаровіча ў ваўкавыскія гродскія кнігі была пададзена пратэстацыя[44]. Міхаіл Казімір Радзівіл асабіста павіншаваў з выбарам дэпутата Францішка Барановіча[45]. Падзякаваў ён за вынікі сойміка і кіраўнікам сваёй "партыі" ў павеце – гарадзенскаму лоўчаму Людвіку Дашкевічу і гарадзенскаму стольніку Лукашу Барановічу. Пры гэтым прасіў апошняга затрымаць падпісанне крэдэнсу дырэктарам сойміка ротмістрам Мацеем Гажкоўскім і ўтрымліваць пратэстацыю супраць выбараў пакуль не атрымае новых інструкцый[46]. Радзівіл меркаваў пераканаць гарадзенскага стольніка ўтрымаць пратэстацыю і не дапусціць падпісання крэдэнсу, бо вельмі непрыязна адносіўся да дэпутацтва Алізаровіча[47]. Але пазней ён быў вымушаны змяніць сваю пазіцыю, бо зразумеў, што недапушчэнне гарадзенскіх дэпутатаў пасварыць яго з Барановічам. Радзівіл пагаджаўся на гарадзенскіх дэпутатаў, але прасіў пільнаваць, каб замест гарадзенскага гараднічага Ф. Барановіча крэдэнс не быў падпісаны каму-небудзь іншаму[48]. У выніку Алізаровічу і Барановічу на-

---

[40] AGAD. Archiwum Radziwiłłów, dz.II, suplement, 1012, к.1. AGAD, AR, dz.IVa, ks.4, k.458. AGAD, AR, dz. IV, teka 48, koperta 640. B.Radziwiłłowa do M.K.Radziwiłła, Zdzięcioł, 25.08.1756, k.180.

[41] НГАБ. Ф.1711, воп. 1, ад. з. 47, арк. 161-162

[42] AGAD. AR, dz.IVa, ks.15, k.29.

[43] Ibid., k.61.

[44] НГАБ. Ф.1710, воп. 1, ад. з. 18, арк.707-707аб.

[45] AGAD. AR, dz.IVa, ks.15, k.77.

[46] Ibid.

[47] Ibid., k.85.

[48] Ibid., k.85.AGAD, AR, dz.IVa, ks.15, k.112.

пачатку сакавіка быў падпісаны крэдэнс і, фактычна, знікла апошняя перашкода на іх шляху стаць трыбунальскімі суддзямі[49].

На выбарах у Трыбунал ВКЛ 1758 г. большасць галасоў атрымалі радзівілаўскія прыхільнікі, і маршалкам быў абраны Адам Бжастоўскі. Вынікі выбараў у Трыбунал ВКЛ 1758 г. пацвердзілі, што радзівілаўская групоўка мела перавагу над "Фамільяй" на большасці сойміках ВКЛ. Аднак "Фаміліі" ўдалося ўраўнаць сітуацыю ў Трыбунале ВКЛ з дапамогай сваіх прыхільнікаў і трыбунальскага маршалка. Той пайшоў насустрач і пагадзіўся, каб прыхільнікі "Фаміліі" занялі важныя пасады. Пісарам рускай кадэнцыі стаў Людвік Шэмет, а маршалкам Скарбовага Трыбунала – гарадзенскі падсудак Марцін Ян Алізаровіч[50].

Падчас жа пасольскіх соймікаў 1758 г. Міхаіл Казімір Радзівіл даў згоду, каб паслом на гарадзенскім сойміку быў абраны надворны падскарбі ВКЛ Юзаф Масальскі, і нават напісаў ліст сваім прыхільнікам у падтрымку яго абранню[51]. Праўда, не атрымалася абраць калегай Масальскага радзівілаўскага прыхільніка, і другім паслом стаў нейтральны пінскі староста Уладзіслаў Ельскі.

Каралеўскі двор у канцы 1759 г. прадпрыняў паспяховую спробу пасварыць гетманаў ВКЛ. Пасля смерці Антонія Салагуба генералам артылерыі ВКЛ павінен быў стаць палкоўнік Ян Масальскі. Але ён быў прыхільнікам "Фаміліі", і таму было вырашана прызначыць на вызваліўшуюся пасаду Яўстахія Патоцкага. Двор хацеў выклікаць неабдуманыя дзеянні з боку Яна Масальскага. Той, сапраўды, перадаў сваю адмову ад пасады кракаўскаму біскупу Каэтану Солтыку і выклікаў Яўстахія Патоцкага на дуэль. Кіраўнікі прыдворнай партыі спешна звярнуліся да Міхаіла Казіміра Радзівіла з патрабаваннем суда над Масальскім як вайскоўцам, які выклікаў на дуэль свайго непасрэднага начальніка[52]. Нягледзячы на патрабаванні Міхаіла Масальскага, Радзівіл не жадаў прыпыняць справы ў гетманскім судзе[53]. Міхаіл Масальскі вырашыў звярнуцца да соймікаў, каб яны паслалі да караля паслоў з пратэстам на злоўжыванні вялікага гетмана ВКЛ. Радзівіл таксама імкнуўся атрымаць у гэтай справе падтрымку ад каралеўскага двара і прымаса[54].

У выніку ўся барацьба разгарнулася на дэпутацкіх сойміках на Трыбунал ВКЛ 1760 г. Не апошняе месца ў планах Масальскага займаў гарадзенскі соймік. Радзівілы планавалі яго сарваць, бо Масальскія мелі найбольшы ўплыў менавіта на гарадзенскую шляхту. У выніку план Радзівілаў па зрыву гарадзенскага сойміка быў рэалізаваны часткова. У 1760 г. з-за шматлікіх пратэстацый не былі дапушчаныя ў трыбунальскае кола прыхільныя "Фаміліі" гарадзенскія дэпутаты гродскі пісар Юзаф Феліцыян Баўфал і віцэ-адміністратар Гарадзенскай

[49] НГАБ. Ф.1711, воп. 1, ад. з. 47, арк. 270-271.
[50] AGAD. AR, dz.IVa, ks.15, k.389-390.
[51] Ibid., k.380.
[52] Biblioteka Czartoryskich 3835, k.216.
[53] Ibid., k.161, 163.
[54] Ibid., k.206-208, 211-212.

эканоміі Ян Валкавіцкі[55]. Аднак у той жа час пад ціскам Масальскага на сойміку ўдалося абраць гарадзенскага земскага пісара Караля Літавора Храптовіча і гродскага суддзю Юзафа Валовіча пасламі да караля ў справе заступніцтва Яна Масальскага перад судом вялікага гетмана ВКЛ Міхаіла Казіміра Радзівіла[56].

Супрацьстаянне Радзівілаў і Чартарыйскіх напачатку 60-х гг. XVIII ст. абвастрылася і на гарадзенскіх дэпутацкіх сойміках. Былі сарваныя соймікі 1761 і 1762 гг., а ў 1763 г. прыхільнікі Радзівілаў і Чартарыйскіх арганізавалі кожны свой соймік. Віленскі ваявода Караль Станіслаў Радзівіл дапусціў у лік суддзяў сваіх прыхільнікаў Антонія Рамановіча і Тадэуша Александровіча. Гарадзенскія дэпутаты прыхільныя "Фаміліі" падпісалі маніфест супраць незаконных дзеянняў Радзівіла на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ[57].

Зусім іншая сітуацыя склалася на гарадзенскіх пасольскіх сойміках. У 1760 і 1761 гг. яны скончыліся пераканаўчай перамогай "Фаміліі". На сойміку 1760 г. пасламі сталі гарадзенскі харужы Антоні Вал і гарадзенскі падстолі і падстароста Антоні Тызенгаўз[58]. Апошні быў лідэрам прыхільнікаў "Фаміліі" ў Гарадзенскім павеце[59]. Радзівілаўскія стаўленнікі толькі занеслі пратэстацыю супраць сойміка ў наваградскія гродскія кнігі[60]. На пасольскім сойміку 1761 г. пасламі зноў сталі прыхільнікі "Фаміліі" гарадзенскі падстароста Антоні Тызенгаўз і гарадзенскі земскі пісар Храптовіч[61]. Апошні быў кліентам падскарбія ВКЛ Юрыя Флемінга, але ў 1761 г. якраз перайшоў на бок Радзівілаў[62]. Радзівілаўскія прыхільнікі зноў занеслі пратэстацыю супраць выбару паслом Антонія Тызенгаўза ў лідскія гродскія кнігі[63]. Яны і праз год пратэставалі супраць рашэнняў сойміка[64]. Аднак хутчэй за ўсё гэта зусім не перашкодзіла абранню прыхільных Масальскім паслоў на сойм.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў перыяд праўлення Аўгуста III адсутнасць моцных сярэднешляхецкіх родаў абумовіла ўплывы ў Гарадзенскім павеце Масальскіх і іх саюзнікаў з "Фаміліі". Мясцовая шляхта, калі хацела супрацьдзейнічаць Масальскім, была вымушана шукаць падтрымкі іншых магнацкіх родаў. У выніку пэўную колькасць сваіх прыхільнікаў у павеце мелі таксама Сапегі і Радзівілы. У апошніх атрымлівалася перашкаджаць "партыі" Масальскіх абірацца пасламі на гарадзенскіх сойміках, але не хапала сіл, каб перашкодзіць дамінаванню Масальскіх у Гарадзенскім павеце.

---

55 Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794)… s. 265; Czeppe M. Kamaryla pana z Dukli. Kształtowanie się obozu politycznego Jerzego Augusta Mniszcha 1750-1763. Warszawa, 1998. s. 202.

56 НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 49, арк.11.

57 Czeppe M. Kamaryla pana z Dukli… s. 203, 205, 206.

58 НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 49, арк. 71.

59 Czeppe M. Kamaryla pana z Dukli… s. 204.

60 НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, ад. з. 34, арк. 712-712аб.

61 НГАБ. Ф. 1711, воп. 1, ад. з. 49, арк. 300; Czeppe M. Kamaryla pana z Dukli… s. 204. 294. Kościalkowski, S. Antoni Tyzenhauz: podskarbi nadworny litewski. T. 1. Londyn, 1970. s. 59.

62 Czeppe M. Kamaryla pana z Dukli… s. 204.

63 НГАБ. Ф. 1722, воп. 1, ад. з. 112, арк. 597-597v.

64 НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, ад. з. 35, арк. 1906-1906v.

*Наталля Сліж,*
*кандыдат гіст. навук (Гродна)*

# З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI – XVIII ст.

Гісторыя Прачысценскай царквы з'яўляецца маладаследаванай старонкай гарадзенскай гісторыі. Гарадзенцы ведаюць пра яе існаванне, некаторыя нават могуць прыгадаць месца яе знаходжання, але пераважна гэтым іх веды і абмяжоўваюцца. Між тым у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) у Гародні захаваліся дакументы, якія дапамагаюць зразумець месца царквы ў гісторыі Гародні XVI – XVIII ст., аднесці на пазнейшы перыяд яе знікненне з карты горада. Менавіта яны сталі асновай гэтай публікацыі. Але напачатку некалькі слоў пра ранейшыя гістарыяграфічныя згадкі царквы.

*Гістарыяграфія.* Упершыню пра Прачысценскую царкву напісаў архімандрыт Каложскага базыліянскага манастыра Ігнат Кульчыцкі[1] ў "Хроніцы архімандрытаў, царкоўных старастаў і заступнікаў Гарадзенскага Каложскага манастыра" (1736)[2]. У ёй была прадстаўлена не толькі гісторыя Каложскай царквы, але і іншых цэркваў у Гародні, у тым ліку і Прачыценскай. Аўтар змясціў звесткі пра маёмасць, якою яна валодала, адзначыў пасяленне пры ёй манашак-базыліянак ды інш.[3]

Жаночы базыліянскі манастыр стаў правапераемнікам Прачысценскай царквы, адпаведна дакументы на маёмасць, якой яна валодала перайшлі да яго[4]. Але ў 1843 г. манастыр вярнулі ў праваслаўе[5]. Яго кіраўніцтва было непасрэдна зацікаўленае ў вяртанні колішніх уладанняў. Гэта актуалізавала гісторыю праваслаўнай Прачысценскай царквы. Для выяўлення царкоўных фундушаў былых грэка-уніяцкіх цэркваў у 1847 г. была створаная Гарадзенская камісія. Камісія сабрала дакументы (выпісы з гарадзенскіх гродскіх і земскіх судоў, інвентарныя апісанні Гародні і інш.), якія дапамаглі выявіць нерухомую маёмасць цэркваў, ідэнтыфікаваць яе, і прымусіць новых уладальнікаў вярнуць царкоўныя пляцы. На падставе гэтых матэрыялаў гісторыю царквы пачыналі з рэвізіі 1560–1561 гг. Коратка згадвалася знішчэнне храма маскоўскім войскам [гл. дадатак 4].

---

1 Марозава С.В. Ігнат Кульчыцкі – першы гродзенскі краязнавец // Памяць. Гродна. Мінск, 1999. С. 109–111.

2 Часткова праца была надрукавана ў: Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 9. Вильна, 1870. С. 413–423.

3 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ), ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 38; ад. з.4, арк. 41.

4 Тамсама, ад. з.1–4.

5 Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 263; Карнілава Л. Гродзенскі манастыр базыліянак // ЭГБ. Т. 3. Мінск, 1996. С. 136–137.

Звесткі пра Прачыценскую царкву і базыліянскі жаночы манастыр таксама былі змешчаны ў "Памятнай кніжцы па Гродзенскай губерні" за 1866 г.[6]

Яўстафі Арлоўскі ў кнізе па гісторыі Гародні шмат увагі надаў мінуламу Прачысценскай царквы. Ён абагульніў вядомыя друкаваныя крыніцы і выкарыстаў архіў базыліянскага жаночага манастыра[7]. Гэта найбольш грунтоўнае даследаванне гісторыі храма, у якім адзначаныя фундацыі кіеўскага ваяводы Д. Пуцяціча, братоў Валовічаў, Я. Кунцэвіча, Я. Валовіча, пасяленне манашак пра царкве ды інш. Насуперак меркаванню П. Баброўскага, які датаваў царкву 1560 г.[8], Я.Арлоўскі лічыў, што яна была заснавана не пазней за 1506 г.

Юзаф Ядкоўскі заснаванне царквы звязваў з ініцыятывай жонкі польскага караля і вялікага князя літоўскага Аляксандра Аленай (каля 1500 г.). Ён адзначыў з'яўленне пры царкве манашак базыліянскага ордэну ў 1633 г. і сцвярджаў, што царква загінула падчас пажару ў канцы 1640-х гг.[9]

Кропку ў вырашэнні праблемы заснавання царквы паставілі археолагі. Раскопкі 1980 г. далі магчымасць вызначыць дату пабудовы і аднесці Прачысценскую царкву да Гарадзенскай архітэктурнай школы XII ст.[10], як і Каложскую і Ніжнюю цэрквы. Археолагі таксама зрабілі вялікі ўнёсак у рэканструкцыю знешняга выгляду царквы[11].

Польскі гісторык Пшэмыслаў Баравік адзначыў некаторыя падзеі з гісторыі Прачыценскай царквы: фундацыі Мікалая Рабея Гнайніцкага (1643), Яраша Валовіча (1626), зруйнаванне царквы ў 1655 г.[12] У працы Юрыя Кішыка царква прадстаўлена ў кантэксце развіцця планіроўкі Гародні[13]. Некаторыя факты (фундацыйны запіс І. Астрожскага, з'яўленне базыліянак пры царкве і інш.) адлюстраваліся ў даследаванні Юрыя Гардзеева[14].

---

6 Памятная книжка Гродненской губернии на 1866 г. С. 10–13.

7 Яўстафі Арлоўскі працаваў з дакументамі з вышэйзгаданай справы. Аб гэтым можна меркаваць на падставе яго ўзгадкі пра пацверджанне даруючага запісу Я. Валовіча і прывілея на шпіталь у XVIII ст., але даты выдачы дакументаў ён прывёў памылковыя (Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 163).

8 Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 53, 66, 72, 98–99, 104–105.

9 Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 23.

10 Трусаў А. Гродзенская архітэктурная школа // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 124.

11 Чарняўскі І., Жаровіна Г. Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1982. № 4 . С. 34–36; Чернявский И. Пречистенская церковь XII в. в Гродно // Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983. С. 119–121; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысценская царква // Архітэктура Беларусі. Мн., 1993. С. 170; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысценская царква // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 130; Краўцэвіч А. Археалагічнае вывучэнне Гродна // Памяць. Гродна. Мн., 1999. С. 28.

12 Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. Supraśl, 2005. S. 32, 63, 118.

13 Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно… С. 33, 35, 85, 94, 102.

14 Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня–Вроцлаў, 2008. С. 76–77.

Застаецца дыскусійнай таксама праблема датавання знішчэння царквы. Я. Арлоўскі сцвярджаў, што яна згарэла падчас пажару 27 чэрвеня 1647 г.[15] Ю. Ядкоўскі пайшоў па яго слядах, адзначыўшы, што царква была знішчаная ў канцы праўлення Уладзіслава IV, прыкладна ў 1647 ці 1648 гг.[16] І. Чарняўскі звязаў знішчэнне царквы з пажарам 1654 г.[17] П. Баравік на падставе дакумента 1659 г.[18] у якасці прычыны руйнавання храма падаў рабункі маскоўскіх войскаў на тэрыторыі Гародні ў 1655 г.[19] Аднак у іншым даследаванні ён сцвердзіў, што царква працягвала сваё існаванні і пасля вайны[20]. Ю. Гардзееў таксама спасылаўся на гэты дакумент пры апісанні гісторыі Васкрасенскай царквы, руйнавання горада і знішчэння цэркваў маскоўскім войскам[21], але даследчык не звязаў яго з зруйнаваннем Прачысценскай царквы[22]. Безумоўна, многія факты і падзеі з гісторыі Прачысценскай царквы патрабуюць дадатковага даследавання.

*Крыніцы.* Асноўныя крыніцы па гісторыі Прачысценскай царквы прыпадаюць на перыяд XVI – XVII стст. Значная іх частка захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гародні ў фондзе 1475 ("Дело о претензиях церкви к разным лицам на занимаемые ими земельные участки и долга". 20 октября – 7 ноября 1847 г.). У асноўным ён змяшчае крыніцы XIX ст. Камісія імкнулася выявіць фундушовыя запісы на праваслаўныя цэрквы і вярнуць ім пляцы. Дзеля гэтага расшукваліся дакументы за розныя часы, якія б пацвердзілі правамоцнасць прэтэнзій. У асобным сшытку былі сабраныя дакументы аб фундушах Прачысценскай царкве [гл. дадатак 1]. Да іх прыкладзены спіс дакументаў на рускай мове (33 наймення). У ім згадваецца таксама інвентар 1560 г., якога няма сярод дакументаў[23]. Верагодна, маецца на ўвазе рэвізія Гарадзенскай эканоміі.

Тры дакументы з гэтага фонду змешчаныя ў дадатках [гл. дадаткі 2–4]. Два дакументы былі надрукаваны ў "Актах віленскай археаграфічнай камісіі": фундацыйныя запісы на шпіталь Жыгімонта Аўгуста (1562) і на пляцы Яраша Валовіча Прачысценскай царкве (1626)[24]. Шэраг фундацыйных запісаў утрымліваецца ў іншых зборніках крыніц[25].

---

15 Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 104–105.

16 Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 23.

17 Чарняўскі І. Гродзенская Прачысценская царква // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 130.

18 НГАБ у Гродне. Ф.1475. Воп.1. Ад. з.2. Арк.78–79.

19 Borowik P. Jurydyki miasta Grodna… S. 32.

20 Гл. артыкул у зборніку: Borowik P. Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas „potopu moskiewskiego" (1655-1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali.

21 Копія гэтага дакументу захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы.

22 Гардзееў Ю. Магдэбургская Гароднян... С. 78.

23 НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 48–94.

24 Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею (далей – АВАК). Т. 1. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1865. С. 13–15, 52–54.

25 Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 1: 1340–1506. СПб, 1846. С. 368–371; АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 6–10; Archiwum książat Sanguszków w Slawucie. T. 4. Lwów, 1890. S. 206.

Сабраць дакументы Камісія здолела дзякуючы таму, што яны былі актыкаваны ў гарадзенскія гродскія і земскія кнігі, а ў XVIII ст. базыліянскі манастыр рабіў выпісы з гэтых кніг, якія сталі часткай базыліянскага архіву. Архіў Прачысценскай царквы, у якім захоўваліся арыгіналы дакументаў, быў знішчаны ці вывезены маскоўскім войскам падчас вайны 1654–1667 гг.[26] Дадзеныя крыніцы, у асноўным, маюць дачыненне да маёмасных адносінаў. Фундушовыя запісы паказваюць, якой маёмасцю валодала царква, і як яна яе атрымала. Таксама захаваліся дакументы па куплі-продажы пляцаў вакол храма. Гэта, канешне, не дае магчымасць рэканструяваць гісторыю храма ў XVI–XVII стст. цалкам, бо ёсць прагалы з пералікам святароў, унутраным убраннем царквы і інш.

*Назва царквы.* Вядома, што царква была закладзена ў гонар Багародзіцы. У дакументах за XVI – XVII стст. царква называлася па-рознаму: Святая Прачыстая, Святой Багародзіцы Прачыстай, Найсвяцейшай Панны Марыі Прачыстай, Святая Прачыстая Саборная, а ў дакуменце за 1659 г. прыведзена назва на каталіцкі манер – Гарадзенская Капітульная царква Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. У той час у ВКЛ назва “Прачысценская царква” сустракаецца даволі часта. Так былі названы цэрквы ў Наваградку, Вільні, Кіеве, Смаленску і іншых гарадах. Прысутнасць у назве слова “Саборная” азначала яе высокі статус сярод іншых цэркваў Гародні, а таксама наяўнасць некалькіх светароў пры царкве і пратапопа. Калі дакладна царква стала Саборнай, вызначыць даволі складана. Згадкі пра пратапопа, які, звычайна, прызначаўся кіеўскім мітрапалітам для Саборнай царквы і быў там галоўным святаром, адносяцца да 1539 г.[27]

*Знешні выгляд царквы.* Крыніцы адзначалі, што храм быў мураваным[28]. Як выглядала царква? Якім было яе ўнутранае аздабленне? Пісьмовыя крыніцы не даюць адказу. Сенсацыйнае адкрыццё яе рэшткаў, якое адбылося падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі базыліянскага манастыра ў 1980 г., дало магчымасць высветліць планіроўку царквы, матэрыялы, якія выкарыстоўваліся пры яе пабудове і аздобе. Гэта быў шасціступовы трохнефавы храм з трыма прамавугольнымі ў плане апсідамі. Падлога была выкладзена маёлікавай пліткай зялёнага, жоўтага і карычневага колераў. Як і ў іншыя цэрквы Гарадзенскай архітэктурнай школы, у муроўку з плінфы ўстаўляліся шліфаваныя камяні. Таксама былі выкарыстаны галаснікі і паліваная плітка. Па сваёй планіроўцы яна набліжалася да Ніжняй царквы. Знойдзеныя матэрыяльныя крыніцы дакладна вызначылі час пабудовы царквы – XII ст.[29] У XV ст. храм рамантаваўся, аб чым

---

[26] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 78–79.

[27] АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 51. У назве дапушчана памылка. У томе змешчаны дакументы не земскага, а гродскага суда.

[28] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 53 адв., 68–69, 78, 98; АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 6–10 і інш.

[29] Чарняўскі І., Жаровіна Г. Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1982. № 4 . С. 34–36. Чернявский И. Пречистенская церковь XII в. в Гродно // Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983. С. 119–121; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысценская

сведчылі выяўленыя сляды кладкі цэглы-пальчаткі, фрагменты дахоўкі і рэшкі вялікага склепа ў падкупальнай прасторы[30].

Акрамя таго пра знешні выгляд царквы можна меркаваць на падставе двух гравюр Адэльгаўзера–Цюндта 1567–1568 гг.[31] і Тамаша Макоўскага 1600 г. На першай выяве царква змешчана паміж Старым замкам і Фарай Вітаўта. Над ёй надпіс: "Templum muro circumdatum russoum" ("Мураваны храм русінскага (праваслаўнага) асяроддзя"). Яна даволі добра намалявана. Царква мела двухскатны дах са скатам у выглядзе казырка. Частка храма, якая абапіралася на квадрат унутраных апораў мела дах у выглядзе высокага шатра. Па краям галоўнага фасаду верагодна змяшчаліся дзве круглыя вежы[32]. Недалёка ад храма з боку апсіды знаходзілася ўязная брама.

На гравюры 1600 г. царква таксама знаходзіцца паміж Старым замкам і Фарай Вітаўта. Над ёй напіс "B.M. Virg. Paroch. Eccta[33] Graecorum" ("Праваслаўная (грэчаская) Саборная (парафіяльная) царква Благаславёнай Панны Марыі"). Тут прыведзеная яе поўная назва і адзначаны статус царквы як Саборнай. Царква намалявана з шатровым верхам, а побач ўязная брама з дахам са шпілем[34]. На колькі можна меркаваць па гэтым выявам царква амаль не змянілася ў параўнанні з папярэдняй гравюрай[35]. На гравюры Т. Макоўскага акрамя царквы добра бачны раён, які знаходзіўся побач з ёй, і быў дастаткова населены, што пацвярджаюць дакументы.

*Святары.* Імёны і прозвішчы святароў і служак Прачысценскай царквы выяўлены фрагментарна з-за адсутнасці дакументаў. Самы ранні ўспамін пра царкоўных служачых адносіцца да 1502 г. У якасці сведак падчас продажы ігумену Каложскага манастыра Луке мяшчанкай Аўдоцціяй Перхуравайдварышча фігуравалі поп Фёдар, дзяк Іван і панамар Осташа[36]. Дакумент па продажу Ходарам Семаковічам гарадзенскаму ляснічаму Васілю Дарашковічу зямлі Антонаўшчына запісаў дзяк Фёдар (1502)[37].

Наступныя згадкі святароў сустракаюцца амаль праз 40 год. Гаспадарскія падданыя скардзіліся на дзяка Дарафея Афанасавіча, які нібыта незаконна валодаў іх зямлёю (1538). Падчас працэсу высветлілася, што частку зямлі купіў яго бацька, гарадзенскі мешчанін Афанас, а частку зямлі дзяк захапіў самаволь-

---

царква // Архітэктура Беларусі. Мн., 1993. С. 170; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысценская царква // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 130.

30 Чарняўскі І., Жаровіна Г. Нечаканае адкрыццё … С. 35.

31 Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно... С. 81–84.

32 Там же. С. 94.

33 У назве памылка павінна быць Ecclesia.

34 Бачкоў У. Невядомая нам Гародня // Мастацтва. Студзень, 2007. №1.

35 Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно... С. 102.

36 НГАБ у Гродне. Ф.128, воп.1, ад. з.2, арк. 6. Дакумент выяўлены Аляксеем Шаландай.

37 Шаланда А. Пергаміны XVI ст. у фондах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // Герольд–Litherland. Горадня, 2002. № 1–2 (5–6). С. 25–26.

на. Яе вярнулі падданым. У 1539 г. у царкве служыў дзяк Сысой Федковіч. Акрамя таго, ён запісваў дакументы ў кнігі гарадзенскага гродскага (замкавага) суда. На той час структура суда не была сфарміраваная, і ў якасці пісара ў ім маглі працаваць царкоўныя служачыя як адукаваныя асобы. У судовых справах згадваецца і сама Прачысценская царква. Напрыклад, у 1540 г. менавіта каля яе прыносілася прысяга[38] ўдзельнікамі працэсу[39].

У некаторых судовых справах прасочваецца ўплыў пратапопа на тагачасныя падзеі ў грамадстве. Святар Павел, які служыў у земскага падскарбія Івана Гарнастая, і Юхно Янушкевіч з Мастоў былі пасаджаны ў Гарадзенскі замак за напад на гарадзенскага архімандрыта Іону і мешчаніна Яна Краўца (1539). Пры вырашэнні справы адправілі за гарадзенскім пратапопам, а яго на той час не было ў горадзе. Было вырашана чакаць яго прыезду, бо за Паўла ніхто не хацеў паручыцца[40].

На падставе судовай справы гарадзенскага мешчаніна Мішко Анашковіча вядома, што пратапоп меў паўнамоцтвы пры вырашэнні сямейна-шлюбных дачыненняў (1540). Мешчанін скардзіўся яму на збеглую жонку. Ён хацеў прыцягнуць яе да адказнасці на падставе кананічнага права. Але М. Анашковіч настолькі непачціва павёў сябе з духоўнай асобай, што быў пасаджаны на ланцуг. Гарадзенскія мешчане спрабавалі яго ўзяць на парукі, але пратапоп адмовіўся выдаць. У іншай справе пратапоп падаў скаргу на войта і бурмістра, што яны пасадзілі ў гарадзенскую ратушу “рожественского попа”. Верагодна, ішла гаворка пра святара Прачысценскай царквы (1540). 5 чэрвеня 1540 г. на паседжанні суда прысутнічаў гарадзенскі пратапоп Юхно[41].

У скарзе ад 12 верасня 1540 г. ужо згадваецца пратапоп Іоў Давыдовіч. Міхайлаўскі і Забалоцкі святчэннік Якаў скардзіўся на слугу пратапопа, які яго збіў, забраў каня, грошы і рэчы, у т.л. дзве кнігі, якія каштавалі 5 коп літоўскіх грошаў. Якаў прасіў, каб да адказнасці прыцягнулі пратапопа. Той прызнаўся, што конь, рэчы і грошы ў яго, а пра кнігі нічога не ведаў[42].

Наступны дакумент прадстаўляе некаторыя звесткі пра тое, як выглядаў двор Іова. У скарзе гарадзенскага мешчаніна Паўла Залатара сцвярджалася, што пратапоп пабудаваў стайню на яго зямлі, а вада з стоку на страсе цячэ і залівае яго падворак і склеп (1540). Пры разглядзе справы высветлілася, што стайня з даўніх часоў належыць Іову, і бацька П. Залатара не прэтэндаваў на яе раней. Але, паколькі двару мешчаніна былі нанесеныя шкоды, то было прысуджана пратапопу перасунуць сток, забрукаваць двор, ямы ў двары засыпаць пяском. Мешчанін абяцаў сваім коштам засыпаць палову двара[43].

---

[38] У судовым працэсе прысяга патрабавалася ў выпадку, калі адзін ці другі бок не маглі даказаць сваю правату дакументамі і сведкамі, а толькі словамі. Тады чалавек быў абавязаны выканаць прысягу каля храма, каб пацвердзіць свае словы.

[39] АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 3, 83–84, 110, 124, 248.

[40] Тамсама.

[41] Тамсама. С. 50–51, 78, 80–81, 124.

[42] Тамсама. С. 158.

[43] Тамсама. С. 248.

Пра двор іншага пратапопа, які знаходзіўся на Гарадніцы побач з касцёлам Св. Мікалая, ёсць пазнейшыя згадкі ў валочнай памеры 1560–1561 гг.[44]

Можна сцвярджаць, што гарадзенскі пратапоп мог прысутнічаць у судзе пры разборы спраў, удзельнічаць у вырашэнні канфліктных сітуацый, звязаных з святарамі, разглядаць справы па сямейна-шлюбным дачыненням.

Імя і прозвішча дзяка Давіда Сідаровіча стала вядома з яго скаргі на гарадзенскага баярына Марціна Белку (1557). Апошні абвінавачваўся ў тым, што 8 красавіка, калі прыйшоў прасіць пазыку і атрымаў адмову, то "вырваў бараду" ў дзяка, збіў яго і яго хворую жонку, звёў з іх двара каня, які каштаваў 3 капы літоўскіх грошаў[45]. Святар Андрэй Паўлавіч Васкрасенскі скардзіўся на Міхаіла, сына гарадзенскага падстаросты Аляхно Гардзеевіча за тое, што ён збіў і пасадзіў на ланцуг яго слугу Антона Саковіча. А калі святар прыйшоў у яго двор, каб высветліць абставіны справы, то Міхаіл яго абразіў словамі і выказаў жаданне таксама пасадзіць на ланцуг (1560)[46].

Наступныя звесткі пра святароў адносяцца да XVII ст. Гарадзенскі пратапоп Васіль Гаўрылавіч прадаў пляц гарадзенскаму харужаму Якубу Кунцэвічу за 40 коп літоўскіх грошаў. Ліст продажы быў актыкаваны ў гарадзенскія земскія кнігі 18 студзеня 1605 г. Гарадзенскі пратапоп Захарый Стэфановіч і свяшчэннік Агінскі ўзгаданы ў фундушы Я. Кунцэвіча і яго жонкі на царкву ў 1614 г. Таксама ў дакуменце адзначалася, што пры царкве служаць некалькі святароў, бо аднаго з іх павінны былі прызначыць для выканання фундушу. У прывілеі Уладзіслава IV адзначалася, што гарадзенская пратапопія была пры Прачысценскай царкве[47]. Святары Стэфан Лацэвіч, Якуб Парфіновіч, Ян Бароўскі згадваліся ў скарзе пратапопа Юзафа Валевіча, прызначанага 10 верасня 1659 г.[48]. Ю. Валевіч быў пратапопам яшчэ ў 1673 г., калі ў царкве служылі святары Яна Шашка і Самуэль Калоскі[49].

З вышэй прыведзеных звестак можна меркаваць, што штат царквы складаўся з пратапопа, некалькіх святароў, дзякаў і панамара. Іх сацыяльнае паходжанне ўсталяваць цяжка, асабліва для першай паловы XVI ст. У адным выпадку адзначана, што бацька дзяка быў мешчанін. Сярод духавенства былі асобы (пратапоп Іоў Давыдовіч, Д. Афанасавіч, Д. Сідаровіч, В. Гаўрылавіч), якія мелі маёмасць, а менавіта пляц або дом у горадзе, землі. Калі ў дакументах за 1502 г. згадваюцца толькі імёны святароў, то пазней прыводзяцца імёны іх бацькоў, а з другой паловы XVI ст. таксама прозвішчы, што звязана з агульнымі тэндэнцыямі.

У першай палове XVI ст. царкоўныя служачыя вялі справаводства. Дзякі, і не толькі Прачысценскай царквы[50], выконвалі ролю пісара як у замкавым суд-

[44] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 111.

[45] АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 217.

[46] АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 421.

[47] АВАК. Т. 1. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1865. С. 57–58.

[48] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк.60–63, 68–69, 78–79.

[49] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 181.

[50] НГАБ у Гродне. Ф.128, воп.1, ад. з.2, арк. 7.

зе, так і пры складанні прыватных дакументаў. Гэта сведчыць пра іх адукаванасць і ўдзел у жыцці горада, знаёмства з уплывовымі асобамі. Крыніцы змяшчаюць фрагментарныя згадкі пра святароў і служак, які служылі пры царкве ў той ці іншы час, але іх поўны склад, перыяд служэння, сацыяльнае паходжанне, біяграфічныя звесткі яны не фіксуюць.

*Фундацыі і фундатары.* Фундацыйныя запісы на царкву з'яўляюцца аднымі з асноўных крыніц. У іх утрымліваюцца звесткі пра ахвярадаўцаў, апісанне ахвяры і час, калі яна рабілася. Так, кіеўскі ваявода Дзмітрый Пуцяціч (?–1505) у сваім тэстаменце запісаў грошы на ўспамін душы цэламу шэрагу цэркваў у розных гарадах Вялікага княства Літоўскага. Сярод іх фігуравалі гарадзенскія цэрквы Св. Барыса і Глеба і Прачысценская, якім было прызначана па 10 коп літоўскіх грошаў. Апошнюю волю кіеўскага ваяводы выконваў дворны маршалак Міхаіл Львовіч Глінскі ў 1506 г.[51] Браты гарадзенскі канюшы Багдан, Іван, Лукаш, Марк, Рыгор, Міхаіл, Павел Грыньковічы Валовічы па волі свайго бацькі Грынька Хадкевіча[52] надалі фундацыю царкве Св. Спаса ў маёнтку Балі і адзначылі, што кожныя тры гады на Прачысценскую царкву ў Гародні будзе даваццa дзесяціна Багданам з маёнтка Русота (1526)[53]. 10 коп літоўскіх грошаў запісаў на царкву Ілля (1539)[54], сын гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага[55].

У першай палове XVI ст. Прачысценскую царкву не абыходзілі ўвагай як вядомыя людзі, так і мясцовая шляхта. Паводле валочнай памеры 1560–1561 гг. Прачысценскай царкве належалі 2 валокі ў с. Альшанка[56], але, якім чынам яна іх атрымала ў дакументах не згадваецца. Гэтыя валокі, як і 8 іншых, што належалі цэрквам Св. Мікалая, Васкрасенскай, Св. Сімяона, Св. Крыжа, былі далучаны Антоніям Тызенагўзам да Гарадзенскай эканоміі (1766)[57]. Акрамя таго, па звест-

[51] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 1: 1340–1506. СПб., 1846. С. 368–371; Ярушевич А. Ревнитель православья князь Константин Иванович Острожский (1461–1530) и православная литовская Русь в его время. Смоленск, 1897. С. 111–112; Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 53.

[52] Грынька Хадкевіч зрабіў фундацыйны запіс на Евангеллі на карысць царквы Св. Барыса і Глеба (1480). Але дзеці пасля смерці бацькі не выдавалі прызначаныя муку, солад і інш. Таму мітрапаліт Макарый вымушаны быў нагадаць нашчадкам выканаць загад бацькі (1492). Пасля смерці Богуша Багавіцінавіча дзеці Г. Валовіча захапілі кцітарства над манастыром і царквой Св. Барыса і Глеба і нанеслі вялікія шкоды. У 1546 г. яны былі вызвалены ад іх апекі. НГАБ у Гродне. Ф.128, воп.1, ад. з.1, арк. 1; Археографический сборник документов… Т. 9. Вильна, 1870. С. 413, 424–426.

[53] АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 6–10.

[54] Archiwum książąt Sanguszków w Slawucie. T. 4. Lwów, 1890. S. 206; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 76.

[55] Канстанцін Іванавіч Астрожскі запісаў фундацыі шэрагу праваслаўных храмаў: Успенскай замкавай царкве ў Тураве, Нікольскай царкве ў Смалявічах, Прачысценскаму сабору ў Вільні і інш. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895. S. 347–351; Ярушевич А. Ревнитель православья князь Константин Иванович Острожский… С. 121, 181–186.

[56] Писцовая книга Гродненской экономии. Ч. 2. Вильна, 1882. С. 87.

[57] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 107 адв.; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 74.

кам І. Кульчыцкага, царкве належалі яшчэ дзве валокі ў в. Грандзічы, якія пасля перайшлі базыліянкам[58].

Важнай падзеяй для Прачысценскай царквы стаўся фундацыйны запіс на 10 коп літоўскіх грошаў на шпіталь пры царкве польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста. Мсцібагоўскі староста і гарадзенскі гараднічы Рыгор Валовіч павінен быў перадаваць гэтыя грошы з капшчыны старшаму шпітальнаму, пачынаючы з 1565 г., на дзень Св. Марціна – 11 лістапада. Яны прызначаліся на харчаванне жабракоў, якія там жылі. Верагодна пазней выплаты спыніліся. Стэфан Баторый пры спрыянні дворнага падскарбія ВКЛ, гарадзенскага старосты Фёдара Скуміна Тышкевіча (?–1618) пазней пацвердзіў фундацыйны запіс. Сума грошай не змянілася. Пра царкву было напісана, што яна мураваная і знаходзіцца побач з замкам [гл. дадатак 2][59].

Гэты дакумент быў надрукаваны сярод іншых дакументаў з гарадзенскай земскай кнігі. Адзначана, што ён быў прынесены для актыкацыі ў суд гарадзенскім бурмістрам Багданам Міхайловічам (1596)[60]. Выплаты на шпіталь працягваліся доўгі час. У інвентары базыліянскага манастыра за 24 красавіка 1763 г. занатавана, што на яго са скарбу ішло 25 злотых[61]. Аднак у наступным інвентары за 1784 г. ужо быў зроблены запіс, што выплаты не рабіліся 20 гадоў – з 1764 г.[62] Шпіталь існаваў таксама пры базыліянскім манастыры, пераемніку Прачысценскай царквы.

У сваім тэстаменце гарадзенскі шляхціч Іван Андрэевіч Сапоцька[63] прасіў сваю жонку Настассю Багуфалаўну Дарашкевічаўну[64] пахаваць яго цела ў Пра-

---

[58] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.1, арк. 35.

[59] Тамсама, ад. з.2, арк. 53–57.

[60] АВАК. Т. 1. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1865. С. 13–15.

[61] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 76адв.–77.

[62] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 163.

[63] Бацькам Івана быў гарадзенскі канюшы (1539), жараслаўскі і квасоўскі дзяржаўца (1540) Андрэй Сцяцковіч Сапоцька. Ён валодаў маёнткам Ласосна (Гарадзенскі павет). Акрамя Івана ў яго былі сыны Шыман і Васіль. Верагодна ў іх была яшчэ сястра Настасся, якая стала другой жонкай смаленскага ваяводы Васіля Тышкевіча (?–1571). У Івана Сапоцькі і яго жонкі Настасіі было чацвёра дзяцей: сын Марк і дочкі Кацярына, Марына і Палонія. НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.7, арк. 67–70; НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.6, арк. 265–268; АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 3, 13, 140; АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 3, 13, 140; АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 170, 176, 179; АВАК. Т. 22. Акты Слонимского земского суда. Вильна, 1895. С. 388–392, 418–425.

[64] Настасся была дачкой Багуфала Васілевіча Дарашкевіча. Акрамя яе ў сям'і былі сыны Андрэй, Міхаіл, Іван і Сульян. Сульян быў жанаты з дачкой Афанаса Васілевіча Масальскага Марынай. За пасаг 150 коп літоўскіх грошаў ёй было запісана вена 300 коп на маёнтку Ласосна ў 1571 г. Ён падараваў свайму брату Міхаілу валоку зямлі ў маёнтку Ласосна (1578). Іван памёр да 1579 г., яго браты Сульян і Міхаіл судзіліся з яго жонкай Аўдоцццяй з-за яго маёмасці. Сям'я была праваслаўнай. Аб гэтым сведчыць просьба яе дзядзькі Хваліміра Пракопа Дарашкевіча пахаваць яго ў царкве Св. Крыжа на Падоле (1564). НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.6, арк. 171–175; ад. з.7, арк. 69, 243–244, 403–415 адв.; АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 438; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 53–56.

чысценскай царкве (6 чэрвеня 1578 г.). Але ў дакуменце нічога не гаворыцца пра ахвяраванні на царкву. Можна толькі меркаваць, што жонка перадала царкве пэўную суму.

Гарадзенскі харужы Якуб Кунцэвіч і яго жонка Барбара Фурсаўна 2 сакавіка 1614 г. падаравалі Прачысценскай царкве пляцы [гл. дадатак 3]. Яны знаходзіліся на вуліцы Падольнай і межавалі з аднаго боку з царкоўным пляцам, дзе знаходзіўся дом святара Агінскага, з другога – з пляцам жонкі плоцкага ваяводы Крыштафа Клоцкага, які цягнуся да пляцу Халецкіх[65], з трэцяга і чацвёртага – з пляцам габрэя Назкевіча. Раней гэты пляц належаў бацьку Якуба гарадзенскаму харужаму Фёдару Іванавічу Кунцэвічу[66] (?–пасля 1584). Пляцы былі перададзены Захарыю Стэфановічу, які быў на той час гарадзенскім пратапопам. Святары павінны былі вылучыць аднаго з іх, які павінен быў служыць кожны тыдзень за душы бацькі і маці Кунцэвіча. Таксама службы павінны былі праводзіць ў маёнтку Жараслаўка (Гарадзенскі павет), з якога святар і дзяк атрымлівалі корм для каня, віно і ладан. Даравальны запіс быў актыкаваны ў гарадзенскія земскія кнігі 5 сакавіка. Гарадзенскі возны Мацей Тамашэўскі разам са шляхцічамі Янам Эйсмантам і Грышкам Карчыцкім у той жа дзень увёў З. Стэфановіча ў валоданне пляцамі[67].

Напэўна Кунцэвічы на той момант яшчэ захавалі сваё праваслаўнае веравызнанне, і шанаванне памяці продкаў для іх таксама мела важнае значэнне. Вядома, што ў іх быў сын Міхаіл, які пасля займаў пасады пінскага падстаросты (1632 г.) і падкаморыя (1633), быў дэпутатам на Галоўны Трыбунал ВКЛ (1634). Ажаніўся ён з Ганнай Падбярэскай[68].

---

[65] Па рэвізіі 1560–1561 гг. Халецкія валодалі дваром у Гародні, які знаходзіўся на вул. «Ад ірва да Перавозу». Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 48. У другой палове XVI ст. пляц у Гародні меў мечнік ВКЛ (1579), дворны падскарбі (1588), падскарбі і пісар ВКЛ (1590) Дземетры Халецкі (кл.1550–1598). Ён быў праваслаўным і некаторы час апекаваўся царквой Св. Барыса і Глеба ў Гародні. Аднак неўзабаве яму было дазволена пабудаваць капліцу пры Фары Вітаўта (1591), якая стала сямейнай крыптай. Гэта азначала змену веравызнання. Пасля яго смерці пляц у Гародні, як і іншая маёмасць, перайшоў па спадчыне яго сынам Лаўрыну, Крыштафу, Аляксандру і Адаму. Halecki O. Chalecki Dymitr // Polski Słownik Biograficzny. T. 3. Warszawa; Kraków; Poznań; Łódź; Wilno; Zakopany, 1937. S. 247–249.

[66] Фёдар Кунцэвіч меў братоў Канстанціна, Абрахама і Марціна і сястру Ганну. Поп царквы Сямён Фёдаравіч у Квасоўцы падаў скаргу на Марціна аб тым, што ён пабіў яго ў карчме ў Квасоўцы (1565). Марцін быў жанаты на Ганне Вінскай, якая пасля смерці мужа (да 1578 г. выйшла замуж за Станіслава Талочку. А Канстанцін узгаданы як уладальнік Жараслаўкі ў 1560 г. Ён набыў пляцы на рацэ Пыра і ў сяле Быльчычы (1578). НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.3, арк. 181–183; ад. з.7, арк. 158адв.–153, 254–263адв. АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. С. 418, 440; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 68–69. Фёдар Кунцэвіч набыў маёнткі Сіргуцэвічы ў Давіда і Гаўрылы Гарасімовічаў і Гарчакі ў Міцька Івановіча (1571). Ён судзіўся з падскарбіям ВКЛ Лаўрынам Войнам з-за зямель Казерадаўская, Баранаўская і Сысоеўская (1571). НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.6, арк.506–517.

[67] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 68–71.

[68] Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. t. 7. Warszawa, 1911. s. 202.

Камісія 1847 г. высветліла, хто валодаў гэтай маёмасцю ў XVIII ст. Сярод уладальнікаў быў адзначаны Міцута, але ў дакументах не адзначана яго імя і перыяд валодання[69]. Верагодна тут ішла гаворка пра гарадзенскага падкаморыя Казіміра Фларыяна Міцуту, які быў уладальнікам пляцаў у 1726 г.[70] У 1781 г. тут гаспадарыў Яхім Карнэль. Юзафат Дабжанскі выдаў яму дазвол там будаваць і распараджацца маёмасцю па свайму жаданню. У той час пляц знаходзіўся побач з пляцам гетмана ВКЛ Міхаіла Агінскага. Па апісанню 1847 г. вядома, што Кунцэвічскія пляцы знаходзіліся на завулку, які ішоў ад Падольнай на Бернардынскую гару каля дамоў габрэяў Шымеля Натковіча і Карла Катвінскага. Ён працягваўся ўздоўж усіх пляцаў па леваму баку Падольнай. Большую частку царкоўнага пляца займаў Шымель Любіч. Ён набыў гэтую частку ад Вікенція Кандыбы[71].

Інфармацыю пра Прачысценскую царкву ўтрымлівае таксама фундацыйны запіс пісара ВКЛ, дворнага паскарбія, падканцлера ВКЛ, жамойцкага старосты Яраша (Гераніма) Валовіча (?–1643)[72]. Ён вызначыўся актыўнай грамадскай, палітычнай і рэлігійнай дзейнасцю. Суправаджаў Жыгімонта Вазу ў Швецыю, выдаткоўваў грошы на патрэбы Айчыны, засноўваў касцёлы і, нават, пабудаваў мост праз Нёман[73]. Яраш быў сынам маршалка ВКЛ і гарадзенскага маршалка Івана Іванавіча Валовіча і Марыны Мялешкаўны[74], якія былі праваслаўнымі. А іх дзеці Яраш, Яўстахій (1572–1630), Павел (?–1630), Андрэй (?–кл.1614) перайшлі ў каталіцызм[75]. Разам з братамі Андрэем і Яўстахіем Яраш быў на службе ў Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі[76]. Браты Валовічы, якія запісалі на Прачысценскую царкву дзесяціну ў 1526 г., былі яго продкамі (гл. аб гэтым вышэй). Жамойцкі староста быў жанаты з каталічкай Гальшкай Гаслаўскай. У іх нарадзілася двое дзяцей. Сын Станіслаў памёр у маладым узросце, а дачка Тэкля

---

[69] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 76–91.

[70] Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 196, 198.

[71] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк.95, 96.

[72] Lulewich H., Rachuba A. Urzędnicy cenralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy. Kórnik, 1994. S. 250.

[73] Niesiecki K. Herbarz Polski. T. 9. Lipsk, 1839. S. 416–417.

[74] Марына была дачкой гарадзенскага падкаморыя Івана Фёдаравіча Мялешкі і Тамілы Сапоцькаўны. Перад тым як выдаць замуж Марыну за Івана Валовіча яе бацька падараваў будучаму зяцю 1/3 маёнтка Кузніца, а палову заставіў у 500 коп літоўскіх грошаў. За ўнесены пасаг І. Валовіч запісаў ёй на маёнтку Кузніца 1 000 коп літоўскіх грошаў, і на маёнтку Балі 250 коп. У сваім тэстаменце яе маці Таміла саваё вена (600 коп), якое запісаў ёй муж на маёнтку Горніца, падаравала дочкам Настассі, Кацярыне і Марыне, кожнай па 200 коп. Марына за добрае стаўленне мужа запісала яму грошы на Кузніцы, Балі і Горніцы (1557). (АВАК) Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 352–353.

[75] Kuty D. Etapy budowania pobernardyńskiego kościoła w Grodnie // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. / red. J. Lileyko. Lublin, 2000. S. 399; Przyałgowski W. Żywoty biskupów wileńskich. T. 2. Petersburg, 1860. S. 47.

[76] Kempa T. Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztafa Radziwiłła Sierotki // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia historica. T. 9. Poznań, 2003. S. 198.

выйшла замуж за сына Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі, маршалка ВКЛ Аляксандра Людвіка (1594–1654)[77].

Фундацыйны запіс Я. Валовіча быў зроблены 3 кастрычніка 1626 г. Прычынай для напісання дакумента стала пахаванне ў царкве яго маці Марыны Мялешкаўны ў прытворы, перад парогам у вялікіх царкоўных варот. Ён падараваў пляцы з пабудовамі, дзе жыло 16 мяшчан. Яны знаходзіліся за царквой Св. Крыжа (Чэснахрэсцкая) над Нёманам на Падоле. На гравюры Т. Макоўскага добра бачна як шчыльна забудованы пляцы перад царквой. Раней яны былі падараваны бернардынцам яго дзедам па мацярынскай лініі гарадзенскім падкаморыям Іванам Мялешкам. Але манахам гэтага ордэну нельга было мець нерухомасць, таму Я. Валовіч выкупіў пляцы. Як каталік, жамойцкі староста доўга вагаўся ці запісваць гэтыя пляцы Прачысценскай царкве. Ваганні зніклі, калі царква стала уніяцкай. Умовай фундацыі стала абедня ці штотыднёвая літургія за паміnанне душы М. Мялешкаўны (1626)[78].

Крыніца змяшчала не толькі інфармацыю пра фундацыю і пра пахаванні ў скляпеннях царквы, але і пра пераход царквы ва уніяцтва да 1626 г.[79] Гэта істотны факт у гісторыі царквы. Дакладную дату гэтай падзеі вызначыць даволі складана, але ў 1609 г. у лісце з згодай падпарадкоўвацца уніяцкаму кіеўскаму мітрапаліту фігуравалі гарадзенскі пратапоп Захарый Стэфановіч і гарадзенскі архімандрыт Каложскай царквы Багдан Годкінскі[80].

У пачатку XVII ст. такі лёс напаткаў многія праваслаўныя цэрквы. Так, царква Св. Троіцы ў Вільні, якая была заснавана гетманам ВКЛ Канстанцінам Іванавічам Астрожскім у гонар перамогі пад Воршай над маскоўскім войскам у 1514 г., была перададзена уніятам у 1608 г. Праз год былі адабраны ў праваслаўных іншыя цэрквы ў Вільне: Святое Прачыстае, Перанясення Св. Мікалая, Васкрасенне Спаса, Св. Пакровы, Св. Пятніцы, Св. Юрыя, Св. Пятра, Св. Кузьмы і Дзям’яна, Раства Хрыстова, другая царква Св. Мікалая, Св. Івана[81]. З-за дзейнасці Язафата Кунцэвіча многія цэрквы Полацка, Віцебска сталі уніяцкімі ў 1620-я гг.[82] Гэтай тэндэнцыі не пазбеглі і гарадзенскія цэрквы. Акрамя Прачысценскай ва уніяцкае падпарадкаванне перайшла царква і манастыр Св. Барыса і Глеба, напэўна, царква Св. Крыжа. А вось Васкрасенская царква заста-

---

[77] Сліж Н. Сямейнае і штодзённае жыццё Гальшкі Гаслаўскай // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час. Зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2007. С. 270–277.

[78] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк.72–73; АВАК. Т. 1. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1865. С. 52–54; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 118.

[79] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 98–99.

[80] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 6. Вильна, 1869. С. 156–157; Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 96.

[81] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 6. Вильна, 1869. С. 153; Kłos J. Wilno. Przewodnik krajoznawczy. Wilno, 1937. S. 180, 247–248.

[82] Казуля С. Кунцэвіч Іасафат // ЭГБ. Т. 4. Мн., 1997. С. 305.

лася праваслаўнай[83]. Пазней у Гародні, як і ў Вільні, Навагарадку і іншых гарадах уніяты і каталікі на дазволілі вярнуць цэрквы праваслаўным[84].

Лёс падараваных пляцаў быў такі. Са згоды кіеўскага мітрапаліта Ю. Валевіч і святары Яна Шашка і Самуэль Калоскі прадалі віленскаму кашталяну Андрэю Катовічу царкоўныя пляцы на Падоле ў 1673 г.[85] У 1674 г. мітрапаліт Цыпрыян Жахоўскі пацвердзіў кармелітам прыналежнасць пляца з гарбарскімі могілкамі, які раней належаў царкве[86]. На падставе дакументаў камісія ў 1847 г. высветліла, што гэтыя пляцы знаходзіліся ў валоданні Кубалоўскіх і Гальмуноўскіх. Паводле дакумента ад 17 сакавіка 1808 г., іх памер складаў 900 прутоў ці 946 кв. сажаняў, а іншымі пляцамі валодалі кармеліты[87].

Каталік Мікалай Рабей Гнайніцкі (?–1644) падараваў Прачысценскай царкве (а не базыліянскаму манастыру) пляц з домам, які знаходзіўся на Падоле на вул. Дубатоўская (28.09.1634 г.). Раней ён належаў яго маці Таміле Жыжэмскай, якая атрымала пляц у спадчыну па бацьку Данілу Міхайлавічу Жыжэмскаму і маці Багдане Сідараўне Ляўковічаўне. Таміла выйшла замуж за Сідара Рабея Гнайніцкага, і такім чынам пляц перайшоў да яе сына Мікалая[88]. Ён прадаў яго Івану Анісімавічу Маскалю, але пасля набыў у яго сына. Дакумент быў актыкаваны ў гарадзенскіх земскіх кнігах 5 кастрычніка 1634 г.[89]

У дакументах 1775–1780 гг. адзначаецца, што пляц быў уласнасцю старадубскага маршалка Біспінга, а побач з ім знаходзіліся пляцы святароў[90]. Па звестках камісіі, у 1847 г. ён належаў габрэю Кузніцкаму[91].

Пазней М. Гнайніцкі разам з другой жонкай Ганнай Мацееўнай Басяцкай запісаў Каложскай царкве маёнткі Гнойніца і Стары Двор (Гарадзенскі павет) за права жыць у манастыры ў старасці (1643). Запіс быў зроблены праз год пасля напісання тэстаменту. Прычынай такога рашэнне стала дрэннае стаўленне да яго сына Юрыя, які зруйнаваў маёнтак, пазычаў шмат грошай і не жадаў даглядаць бацькоў у старасці, амаль што мучыў іх голадам[92].

Каталіцкае веравызнанне М. Гнайніцкага вядома з яго тэстамента, які быў напісаны 5 ліпеня 1642 г., а актыкаваны 9 чэрвеня 1644 г. [гл. дадатак 5]. Ён прасіў пахаваць яго па каталіцкаму абраду ў склепе бернардынскага касцёла

[83] АВАК. Т. 1. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1865. С. 60–61; Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 25–26.

[84] Mironowicz A. Cerkiew prawosławna w okresie metropolii Piotra Mohyły // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 1997. № 8. S. 55.

[85] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 181.

[86] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк.80.

[87] Тамсама, ад. з.3, арк.64 адв., 77адв–78.

[88] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 96.

[89] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 76–77.

[90] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 96.

[91] Тамсама, ад. з.3, арк. 78 адв–79.

[92] НГАБ у Гродне. Ф.128, воп.1, ад. з.12, арк.1–5.

побач з першай жонкай Даротай Мацееўнай Петрашэўскай у прысутнасці не толькі каталіцкага, але і праваслаўнага духавенства. Яго першапачатковая прыналежнасць да праваслаўнага асяроддзя паказвае, што запісы на памінанне душы былі размеркаваны не толькі на каталіцкія храмы Гародні, але і на праваслаўныя: Фары Вітаўта – 10 злотых, езуітам – 10, дамініканам – 10, бернардынкам – 10, Прачысценскай царкве – 25, царкве Св. Крыжа – 10, царкве Св. Барыса і Глеба – 10. Самая вялікая сума была запісана Прачысценскай царкве. Усе выдаткі павінен быў выплаціць сын Юрый, які быў вінен бацьку 400 злотых. У выпадку яго адмовы гэты абавязак пераходзіў на старэйшага Юзафа, а доўг Юрыя пераходзіў яму. Маёнтак Гнойніца дзяліўся паміж трыма сынамі Юзафам, Канстанцінам і Юрыем, сынам ад другой жонкі. Так як Канстанцін на той час ужо памёр, то маёмасць пераходзіла па спадчыне яго дзецям Яну, Канстанцыі і Еве, якія былі народжаны ў шлюбе з Настассяй Вольскай[93].

З яго нашчадкаў вядомы лёс Канстанцыі Канстанцінаўны Рабееўны Гнайніцкай (?–1675). Яна выйшла замуж за гарадзенскага земскага падсудка (1662) Станіслава Сапоцьку (?–1663), нарадзіла сыноў будучага смаленскага скарбніка і гарадзенскага гродскага пісара Аляксандра і Юзафа і дачку Юстыну. У тэстаменце Канстанцыя прасіла пахаваць яе ў гарадзенскім бернардзінскім касцёле ў Сапоцькаўскім склепе, дзе ужо быў пахаваны яе муж Станіслаў[94]. Наступныя пакаленні Гнайніцкіх сталі ўжо каталікамі.

Гэтыя фундацыйныя запісы Я. Кунцэвіча, Я. Валовіча і М. Гнайніцкага паказваюць даволі цікавую сітуацыю з веравызнаннем і памяццю аб продках у гарадзенскай шляхты. Я. Валовіч ужо быў выхаваны ў каталіцкай веры і ў яго не было сантыментаў адносна праваслаўя, наадварот, ён, як шчыры каталік вагаўся паміж верай і шанаваннем продкаў. Я. Кунцэвіч не выказваў ніякіх хістанняў і быў зацікаўлены ў правядзенні царкоўнай службы за ўспамін душы сваіх бацькоў. М. Гнайніцкі не быў выхаваны каталіком, прыняў каталіцызм пазней і быў больш схільны да свайго першага веравызнання – праваслаўя. У яго быў “пераходны стан” ад аднаго веравызнання да другога. У старасці ён хацеў жыць пры уніяцкім, а не пры каталіцкім кляштары. На ўспамін душы М. Гнайніцкі запісаў і касцёлам і цэрквам, а фундацыйныя запісы зрабіў на цэрквы, што дае падставы сумнявацца ў шчырасці яго каталіцкага веравызнання. Гэтае пакаленне яшчэ памятала пра прыналежнасць продкаў да праваслаўя і адзначала гэта ў фундацыйных запісах і тэстаментах. Але наступныя пакаленні ўжо нічога не ўзгадвалі. Так, унучка Канстанцыя Гнайніцкая (1675), як і стольнік ВКЛ Яўстахій Валовіч (1658) у сваіх тэстаментах выбіралі ў якасці месцаў для пахавання каталіцкія храмы і абыходзілі ўвагай праваслаўныя цэрквы[95].

---

[93] Тамсама, арк.6–7.

[94] НГАБ. Ф.1755, воп.1, ад. з.49, арк.304–307адв.

[95] Тамсама, ад. з. 44, арк.180–198; ад. з.49, арк.304–307адв.

Дадзеныя фундушы былі важныя для Прачысценскай царквы. Яны істотна павялічылі яе ўладанні. Пры чым усе яны канцэнтраваліся ў раёне вуліцы Падольная: каля Бернардзінскай гары, на беразе Нёмана і вул. Дубатоўская.

У першай палове XVII ст. склаліся даволі складаныя ўмовы для праваслаўя ў ВКЛ. Пад уздзеяннем Контррэфармацыі большасць шляхты перайшла ў каталіцызм, адпаведна і фінансавая падтрымка ў большасці ішла каталіцкаму касцёлу. У Гародні стала дамінаваць каталіцкае духавенства праз дзейнасць езуіцкага, брыгіцкага, дамініканскага, бернардынскага, францысканскага ордэнаў. Аднак і ў такой сітуацыі Прачысценская царква працягвала захоўваць свой уплыў у Гародні.

*Раён вакол царквы.* У дамове пра продаж пляца гарадзенскім пратапопам Васілём Гаўрылавічам гарадзенскаму харужаму Якубу Кунцэвічу (29.12.1604 г.) было змешчана апісанне месца яго знаходжання: *"Kotory plac z powinnosty cerkownoy za wsiakim budowaniem lezaczy w Meste Hospodarskom Horodenskim kotory leżyt odnym bokom od domu Jeho Miłosty Pana Jakuba Kuncowicza Choruzoho Powieta Horodenskoho od domu sweszczennika Woskresenskoho Maksima Jurewicza a tretim bokom od twintaru cerkwi Swetojo Preczytoy murowanoy"*[96]. Згадка царкоўных могілак дазваляе сцвярджаць, што пляц знаходзіўся недалёка ад царквы, каля вуліцы *Ад Рынку да царквы.* Сам пляц не выходзіў на вуліцу, а знаходзіўся ў сярэдзіне. Ён межаваў з домам святара Васкрасенскай царквы Максіма Юр'евіча[97] і домам Я. Кунцэвіча.

У куплі-продажы пляца Ельскіх утрымліваецца апісанне царкоўных могілак і пляцаў, якія знаходзіліся з іншага боку могілак. Адзін з гэтых пляцаў належаў шляхціцу Гаўрыле Ельскаму (?–да 1615)[98]. Ён быў куплены ў 1593 г. у кіеўскага архімандрыта, мялецкага ігумена, падляшскага пратапопа Несцера Кузьмініча. Пазней уладальнік вырашыў прадаць яго старэйшаму сыну Юзафу (?–да 1638) за 100 коп літоўскіх грошаў (22.06.1609 г.)[99]. На наступны дзень дакумент быў актыкаваны ў судовыя кнігі, і возны Валенты Вільмін разам са шляхцічамі Янам Свяцкім і Шчасным Цыдзікам увёў яго сына ў валоданне пляцам. У крыніцы змешчана апісанне межаў пляца: *"Plac y dom z budowaniem w Grodnie, na granicie*

[96] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк.60–63.

[97] Да пажару 1613 г. Васкрасенская царква знаходзілася праз дарогу ад Прачысценскай, насупраць замку, а пасля была перанесена на вул Рэзніцкай у 1633 г. Аб ёй гл. Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 38, 59, 110, 176, 205, 233; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 78–79.

[98] Гаўрыла Ельскі разам з Іванам і Гаўрылам Кудрычамі скардзіўся на Міхаіла Масальскага за тое, што ён не выплаціў частку грошаў за іх айчызную маё маёмасць на рацэ Ушывіца (1558). АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 313. Пазней ён судзіўся з Аленай Масальскай за права валодання Кудрычамі на рацэ Уснара (1566). (НГАБ. Ф. 1755, воп.1, ад. з.3, арк. 49–52). Г. Ельскі быў жанаты з Раінай Кандрацеўнай Быкоўскай. На яе і сына Адама скардзіўся Ян Прокшыч за нанясенне пабояў іх падданымі яму і яго сыну Лукашу на дарозе Гародня-Панямунь (1615). (Архіў Гарадзенскага Францысканскага касцёла. Ф.1, воп. 1, ад. з. 8)

[99] Па звестках камісіі 1847 г., пляц Г. Ельскага быў прысвоены Кандыбай (1847). (НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.1, арк.76–91).

*cerkiewnym stoyący naprzeciw cerkwi murowaney Boga Rodzicy Przeczystey na rogu po prawie idąc z Rynku do Cerkwi z iedney strony od dwora JM Pana Krzysztofa Iłowskiego woiewodzica Płockiego tyłem podworza, druga strona tyłem budowania od domu y podworza Oyca Bohdana Hotkinskiego Archimandryty Brasławskiego. Trecim bokiem od ulicy, a czwartym bokiem samym czałem i gdzie y worota same postanowione są na cmentarz tey że Cerkwi plac z budowaniem nowym sosnowym odemnie samego nowopobudowanym*"[100]. Пляц знаходзіўся амаль у канцы вуліцы на рагу. На ім быў пабудаваны Г. Ельскім драўляны дом. Ён межаваў з дваром сына плоцкага ваяводы КрыштафаІлоўскага[101], з дваром браслаўскага і гарадзенскага архімандрыта Багдана Готкінскага[102], а таксама - з могілкамі.

5 сакавіка 1638 г. сыны Юзафа Ельскага Геранім, Тамаш і Стэфан, якія сталі спадкаемцамі па бацьку і роднаму брату Міхаілу, вырашылі прадаць гэты пляц Андрэю Яну Эйсманту і яго жонцы за 150 злотых: "*Ja Hieronim, Tomasz y Stefan Józefowieczy Jelscy ziemianie Króla Jego Msci powiatu Grodzienskiego zeznawamy tym naszym wieczystey przedaży listem zapisem dobrowolnym komy o tem wiedzieć lezało, niniejszym j na potem bedącego wieku ludziom. Jż co ktory dom z placem w miescie Grodzienskim leżaczy na gruncie cerkiewnym Bogarodzice Preczystey na rogu po prawie idząc z Rynku od cerkwie z jedney strony od dwom y placu Jego Msci Pana Jakuba Czernickiego który ma ot Pana Iłowskiego a z drugiey strony tyłem budowania y podworka przed tym Oyca Bohdana Hotkinskiego Archimandryta Brasławskiego a teraz dzierżącego Pana Bienkowskiego trzecim bokiem od ulicy, a czwarty bokiem od cmęntarza u cerkwie tey mianowaney murowaney z jey założenia Najswiętszey Panny Maryi Przeczystey będącey który dom y plac niebosczyk godney pamięci JM Pan Hawryło Jelski oycowi Panu Józefowi Helskiemu przedał*"[103]. У дакуменце адлюстравалася змена гаспадароў, якая адбылася ў перыяд 1609–1638 гг. Якуб Чарніцкі набыў пляцы ў віскага кашталяна Войцеха Ілоўскага, сына Крыштафа Ілоўскага, 26 верасня 1629 г.[104] А ад Б. Годкінскага пляц перайшоў да Бянькоўскага. Абмежаванне з двух другіх бакоў не змянілася.

Дадзеныя дакументы даюць уяўленне пра навакольную тэрыторыю царквы ў першай палове XVII ст. У раёне вуліцы "ад Рынку да царквы" трымалі пляцы гарадзенскі пратапоп Васіль Гаўрылавіч (да 1604 г.), святар Васкрасенскай царк-

---

[100] Тамсама, ад. з.2, арк.64–65, 66–67, 98–100 адв.

[101] Крыштаф Ілоўскі быў жанаты з Паланеяй Катовічаўнай. У шлюбе нарадзілася дачка Магдалена і сыны Фаларыян і Войцех. К. Ілоўскі надаў сенажаць Русотка памерам 1 валока гарадзенскім бернардынам у 1609 г. Uruski S. Rodzina. t. 5. Warszawa, 1908. s. 261; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 119. Першы раз Паланея была замужам за Канстанцінам Халецкім, які сваю частку маёнтка Сідра заставіў жонцы (20 сакавіка 1567 г.). Ён запісаў ёй вена на суму 500 коп літоўскіх грошаў (20 сакавіка 1567 г.). Пасля смерці першага мужа з К. Ілоўскім ім трымала гэтую маёмасць, бо ёй Халецкія не выплацілі вена (1578). НГАБ. Ф. 1755, воп.1, ад. з.3, арк.198–201.

[102] Багдан Годкінскі быў не толькі браслаўскім, але і гарадзенскім архімандрытам, ігуменам манастыра Св. Барыса і Глеба ў Гародні. Ён атрымаў манастыр у 1591 г., а перадаў яго свайму сыну Макарыю ў 1617 г. НГАБ у Гродне. Ф. 128, воп.1, ад. з.3, арк. 6; ад. з.4, арк. 6–8, 29адв.

[103] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 98–100 адв.

[104] Писцовая книга Гродненской экономии. Ч. 2. Вильна, 1882. С. 252–253.

вы Максім Юр'евіч (1604), Якуб Кунцэвіч (1604), Крыштаф Ілоўскі, а пасля яго сын Войцех (да 1629 г.), Якуб Чарніцкі (з 1629 г.), Бяньκоўскі (1638), браслаўскі і гарадзенскі архімандрыт Багдан Готкінскі (1604), кіеўскі архімандрыт Несцер Кузьмініч (да 1593 г.), Гаўрыла Ельскі (1593–1609), Юзаф Ельскі (з 1609 г.), Геранім, Тамаш і Стэфан Ельскія (да 1638 г.), Андрэй Ян Эйсмант (з 1638 г.). У большасці гэта было духавенства і шляхта. Верагодна, дадзеная тэрыторыя належала да "прэстыжных". Адным з пляцаў валодаў таксама Казімір Гадачэўскі (?–1732), які ў тэстаменце ў 1732 г. запісаў яго стрыечнай сястры Канстанцыі Гадачэўскай[105]. Гэты раён добра развіваўся і быў густанаселеным, не тое, што раён Васкрасенскай царквы, якая знаходзілася побач.

Размяшчэнне Прачысценскай царквы недалёк ад замка побач з дарогай да Нёману значна паўплывала на фарміраванне навакольнага раёну і вуліц вакол яго. Прыналежная да царквы тэрыторыя знаходзілася ў яе сферы ўплыву. На ёй маглі быць пабудаваны дамы для святароў. Пры царкве знаходзіўся шпіталь для жабракоў. Найбольш верагодна, што гэта была драўляная пабудова. Акрамя таго, за царквой знаходзіліся могілкі. Верагодна, першыя пахаванні з'явіліся адразу пасля пабудовы царквы ці трохі пазней. У той час могілкі звычайна размяшчалі побач з храмамі[106]. Падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі Ніжняй царквы былі выяўлены пахаванні XII ст., а таксама пазнейшыя могілкі, якія адносіліся да Верхняй царквы[107]. Таму цалкам верагодна, што маглі быць пахаванні ў той час і ў Прачысценскай царкве, як і ў іншых цэрквах горада (Васкрасенскай, Св. Крыжа, Св. Барыса і Глеба). Гэта цалкам адпавядала праваслаўнай традыцыі. Пра могілкі ёсць звесткі ў лістах-продажах пляцаў, якія межавалі з імі[108], у інвентару ад 10 лютага 1768 г. У ім жа было адзначана існаванне пустога пляцу насупраць былой Саборнай царквы паміж вуліцамі пры могілках той жа царквы. У 1847 г. пляцам валодаў габрэй Аўзер Ейназгорн. Могілкі на той час былі забудаваны[109]. Акрамя могілак каля царквы існавалі пахаванні ў яе скляпеннях. Пра гэта сведчаць тэстамент І. Сапоцькі (1578), фундацыйныя запісы Я. Кунцэвіча (1614) і Я. Валовіча (1624).

За царкоўнымі могілкамі знаходзілася другая лінія гарадскіх умацаванняў, а сама царква ўваходзіла ў абарончую сістэму горада. Лінія абароны пазней пераўтварылася ў вуліцу *Ад Рынку да царквы* і абумовіла яе закруглены характар[110]. У другой палове XVI – першай палове XVII ст. гэта быў ужо даволі густа населены раён горада. Ад царквы да вуліцы пляцы ішлі ў два рады. Першы рад межаваў з царкоўнымі пляцамі і могілкамі. З іншага боку да царквы прымыкала Замкавая вуліца. Забудаваныя там габрэйскія пляцы межавалі з царкоўнымі. Паз-

[105] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.4, арк.102–108.
[106] Гардзееў Ю. Магдэбургская Гароднея... С. 101–104.
[107] Воронин Н. Древнее Гродно. М., 1954. С. 175–182.
[108] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 64–65, 98–100 адв.
[109] Тамсама, ад. з.1, арк. 11–12.
[110] Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно… С. 33–35.

ней паміж імі з’явілася сцяна. Ад царквы ішла яшчэ адна вуліца, “што ідзе Святое Прачыстае і Падолу”. Яна была названа так у заставе Мацея Фёдаравіча Тарусы сваёй жонцы Ульяне Васільеўне Дарашковічаўне пляца. Бок пляца выходзіў на гэтую вуліцу (1558)[111].

У адрозненні ад царквы ў сельскай мясцовасці, чый уплыў распаўсюджваўся на вёску і наваколле і яе тэрытарыяльныя інтарэсы не перасякаліся з суседнімі храмамі, царква ў горадзе суседнічала з іншымі. У XVI ст. побач з Прачысценскай царквой знаходзіліся царква Св. Сімяона, Малая царква, Васкрасенская царква[112]. Цяжка дакладна вызначыць мэжы прыходаў гэтых цэркваў. Верагодна, да Прачысценскай царквы маглі належаць вуліцы Маставая і *Ад рынку да царквы*.

*Базыліянскі манастыр пры царкве. Зруйнаванне царквы.* З дазволу мітрапаліта Вельяміна Руцкога (?–1655) пры царкве пасяліліся манашкі ў 1633 ці 1635 гг. З Вільні прыехала ігумення Васіліса Сапежанка, дачка віленскага ваяводы[113] і з ёю чатыры манашкі. Пасля яе манастыр узначальвала Юстына Сіруцёўна (?–1644). Дзейнасць базыліянак не была асабліва паспяховай. Яны прынялі да сябе ў 1638 г. адну манашку, у 1639 г. – трох, а ў 1641 г. – двух. У 1642 г. Гародню наведаў мітрапаліт Антоній Сялява, які загадаў перадаць ім “навечна” пляцы, якія знаходзіліся справа ад царквы і цягнуліся амаль да замку[114].

Даволі складаныя адносіны склаліся ў манастыра з габрэямі, якія мелі пляцы побач з царквой. Ігумення Мітрадора Казлавіцкая справакавала канфлікт з габрэйскай грамадой з-за хрышчэння дзяўчынкі ў 1650 г.[115] Наступная спрэчка ўзнікла з-за зямлі (1649–1650). У выніку дамовіліся (5 сакавіка 1650 г.) пабудаваць сцяну, якая б размяжоўвала габрэйскія і царкоўныя пляцы *“ад свірну Лазара Давідовіча, пад якім каменны склеп, і да канца пляца габрэя з Індуры пры вуліцы, якая ішла ад царквы да замку”*. Гэтую сцяну пяць габрэяў абавязаліся пабудаваць, чыніць і бяліць за свой кошт. Камісія, прызначаная мітрапалітам А. Сялявай 12 жніўня 1650 г., адзначыла, што сцяна не дабудавана. Абавязалі дарабіць вугал у шырыню сцяны хлява Л. Давідовіча[116].

Дзейнасць манастыра была звязаная не толькі з судовымі справамі. Па прывілею Яна Казімера царкоўнаму брацтву было дазволена без выплаты

---

[111] АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 325.

[112] Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня… С. 73–80.

[113] Аб Васілісе Сапежанцы ўзгадвае Я. Арлоўскі, а пасля і Ю. Ядкоўскі. Па тытулатуры яна павінна была быць дачкой канцлера ВКЛ Льва Сапегі, але ў яго біяграфічных звестках аб дачцэ Васілісе інфармацыі няма. Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 104–105; Lulewicz H. Sapieha lew // Polski Słownik Biograficzny. t. 35/1. zesz. 144. Warszawa; Wrocław; Kraków 1994. s. 102–103.

[114] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 102адв–103 адв.; Археографический сборник документов... Т. 9. Вильна, 1870. С. 440; Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 104–105; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 77.

[115] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 104–105, 114.

[116] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 89 адв., 90 адв., 102 адв–103 адв.

капшчыны і іншых збораў рабіць мёд 4 разы ў год, з умовай, каб старэйшы даваў царкве свечку (21.11.1654 г.)[117]. Але складана вызначыць, ці атрымалася рэалізаваць атрыманае права падчас вайсковых падзей.

Вайна з Масковіяй 1654–1667 гг. стала цяжкім выпрабаваннем для Гародні, як і для ўсёй краіны[118]. Гародня страціла 46,4% жыхароў. У жніўні 1655 г. Гародню захапілі войскі ваяводы Якава Чаркаскага і казацкае войска пад кіраўніцтвам Івана Залатарэнкі. 9 сакавіка 1659 г. горад зноў перайшоў да войскаў ВКЛ, а ў снежні яго захапіў ваявода Іван Хаванскі. Канчатковае вызваленне прыйшло ў 1661 г. Страты Гародні былі настолькі значныя, што пастановай сойму 1661 г. горад вызваляўся на 4 гады ад падаткаў[119].

Прачысценская царква, як і іншыя храмы Гародні, стала ахвярай маскоўскіх войскаў. Гарадзенскі пратапоп Юзаф Валевіч у судовай скарзе апісаў памеры страт [гл. дадатак 4]. З царквы былі забраныя прывілеі, лісты камісараў, званы, усё ўнутранае ўбранне. Былі забітыя святары Стэфан Лацэвіч, Якуб Парфіновіч, Ян Бароўскі. Судовая скарга Ю. Валевіча была выклікана стратай дакументаў на валоданне 14 валокамі зямлі. Дакумент быў актыкаваны ў гарадзенскі гродскі суд 11 верасня 1659 г., на наступны дзень пасля прызначэння Ю. Валевіча гарадзенскім пратапопам[120]. У той час падобныя заявы ішлі ў суд ад усіх, хто страціў маёмасць і дакументы. Ю. Валевіч зафіксаваў стан царквы на момант яго прыбыцця. На падставе гэтага дакумента можна меркаваць, што знішчэнне царквы адбылося ў перыяд з жніўня 1655 г. па 9 сакавіка 1659 г. А хутчэй за ўсё падчас пажару 1655 г., калі вораг захапіў горад.

Зруйнаваны былі і іншыя цэрквы. Паводле звестак І. Кульчыцкага, маскоўскія войскі выкарыстоўвалі царкву Св. Барыса і Глеба для стральбы з яе па Старому замку, для чаго быў знесены дах, а сама яна была засыпана зямлёю. Была знішчаная царква Св. Крыжа, якая пасля вайны не аднавіла сваю дзейнасць[121]. У 1680 г. яна стаяла пустая, службы не вяліся, а ў 1720 г. яе стан пагоршыўся з-за таго, што Нёман падмыў падмуркі[122].

Вядома, што напярэдадні вайны ў адным з уніяцкіх храмаў Гародні захоўваўся цудатворны абраз Найсвяцейшай Панны. Гэтая царква згарэла падчас нападу маскоўскіх войскаў, і абраз быў перададзены на часовае захаванне ў гарадзенскі бернардзінскі касцёл гетманам Паўлам Янам Сапегам. Гэта адзна-

[117] Тамсама, арк. 90 адв.

[118] Ткачоў М.А. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай // ЭГБ. Т.2. Мн., 1994. С. 189–200; Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. Мн., 1995.

[119] Volumina Legum. T. 4. Petersburg, 1856. S. 385я–386.

[120] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.2, арк. 78–79.

[121] Археографический сборник документов... Т. 9. Вильна, 1870. С. 410; Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży w świetle badań archiwalnych i archeologicznych dokonanych w 1935 r. Grodno, 1936. S. 11–15; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 32.

[122] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 106; АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 273.

чалася на уніяцкай кангрэгацыі ў Жыровіцах 28 снежня 1661 г. Таксама на ёй гаварылася, што маскоўскія войскі з найбольшай жорсткасцю дзейнічаюць супраць уніяцкіх храмаў. Уніяты не былі супраць часовай перадачы абраза бернардынцам[123], хоць бернардзінскі касцёл і кляштар таксама былі моцна пашкоджаныя[124]. Ю. Ядкоўскі меркаваў, што абраз знаходзіўся ў царкве Св. Барыса і Глеба. Аб факце перадачы бернардынамі абраза Каложскай царкве І. Кульчыцкі не ўзгадвае[125]. Не выключана, што гэта быў абраз з Прачысценскай царквы.

Нягледзячы на вялікія знішчэнні, царква пэўны час працягвала існаваць[126]. Пры продажы сядзібы пры вёсцы Сухое Сяло гарадзенскаму шляхцічу Казімеру Гумонскаму гарадзенская мяшчанка Ганна Салалайкаўна, жонка Паўла Сянкевіча, адзначала, што атрымала гэтую маёмасць па нябожчыку бацьку Андрэю Салалайку, які дажываў свой век пры Саборнай царкве (1675)[127]. Значыць у гэты час царква аднавіла сваю дзейнасць, а таксама пры ёй існаваў шпіталь.

Камісія 1847 г., спасылаючыся на візітацыю 1681 г., адзначала, што ў Гародні ў той час былі дзве царквы: каменная Саборная Багародзіцы на Падзамчышчу і драўляная Васкрасенская – на вул. Азёрскай. Верагодна, Прачысценская царква існавала яшчэ ў XVIII ст. Паступова яна прыйшла ў заняпад. У 1720 г. адна з сцен царквы абвалілася. Мітрапаліт Лявон Кішка загадаў яе разабраць і пабудаваць новую царкву (1720–1751), якая існуе і зараз. Пакуль яна была не скончаная, то служба ішла ў драўлянай капліцы[128]. У 1753 г. новая царква была пашкоджана пажарам, але па распараджэнню мітрапаліта Грыбніцкага манастыр за свае грошы адрамантаваў яе[129].

У пасляваенных дакументах царкву называюць Саборнай. Гэта і дае магчымасць вызначыць, што гаворка ідзе менавіта пра Прачысценскую царкву. На той час такі статус іншая царква не магла набыць. Каложская царква стаяла ў запусценні, царква Св. Крыжа была зруйнавана. А Васкрасенская царква хоць і аднавіла сваю дзейнасць, але ніколі не называлася Саборнай. Звесткі за другую палову XVII ст. – пачатак XVIII ст. ускосныя і фрагментарныя, але яны даюць падставу сцвярджаць, што царква існавала да пабудовы новага храму пры мана-

---

[123] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 12. Вильна, 1900. С. 75.

[124] Kuty D. Etapy budowania pobernardyńskiego kościoła w Grodnie... S. 404.

[125] Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży w świetle badań archiwalnych i archeologicznych dokonanych w 1935 r. Grodno, 1936. S. 30, 62; Археографический сборник документов... Т. 9. Вильна, 1870. С. 411–412.

[126] Гл. артыкул у зборніку: Borowik P. Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas „potopu moskiewskiego" (1655-1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali.

[127] НГАБ у Гродне. Ф.128, воп.1, ад. з.3, арк. 16–16 адв.

[128] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк. 38, 102адв–103 адв., 105 адв.; Археографический сборник документов... Т. 9. Вильна, 1870. С. 440; АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 273; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 77.

[129] НГАБ у Гродне. Ф.1475, воп.1, ад. з.3, арк.103адв.

стыры. Аднак гэты перыяд у гісторыі Прачысценскай царквы патрабуе больш глыбокага даследавання.

У гісторыі Прачысценскай царквы адлюстраваліся многія культурныя і рэлігійныя працэсы, якія адбываліся ў Гародні і Вялікім княстве Літоўскім. У XVI ст. у горадзе дамінавала праваслаўе і па колькасці цэркваў адносна касцёлаў і па колькасці вернікаў. Уплыў каталіцкага касцёла на культуру ВКЛ меў у той час фрагментарны характар. Першыя касцёлы былі заснаваныя з ініцыятывы вялікіх князёў літоўскіх, а пасля дзейнасць каталіцтва падтрымала шляхта[130]. Так, у Гародні з'явіўся першы касцёл Унебаўзяцця Маці Божай, які быў фундаваны вялікім князям Вітаўтам каля 1392 г.[131] У дзяржаве для распаўсюджвання той ці іншай рэлігіі мела значэнне, які адсотак шляхты да яе належыць, і ці ёсць у яе шэрагах заможны і ўплывовы дзяржаўны дзеяч. Дзякуючы падтрымцы К. Астрожскага, яго сына, князёў Слуцкіх і іншых, праваслаўе змагло захаваць свае пазіцыі ў XVI ст.[132] Рэфармацыя амаль не закранула гарады. Яна умацавалася ў прыватных уладаннях шляхты[133]. Аднак Берасцейская унія 1596 г. прынесла раскол у праваслаўную супольнасць і справакавала канфлікты паміж праваслаўным і уніяцкім духавенствам і ўнутры грамадства[134]. Найбольш востра ўспрымалася павялічэнне колькасці уніяцкіх храмаў за кошт цэркваў, а не касцёлаў, ці праз пабудову ўласных храмаў. Прывілей Уладзіслава IV 1635 г. канчаткова размежаваў уладанні праваслаўных і уніятаў[135]. Такім чынам, манастыр пры царкве Св. Барыса і Глеба перайшоў да уніятаў, як і манастыры ў Ануфрыева, Менску, Мсціслаўлі і іншых гарадах ВКЛ. Прачысценская царква таксама стала уніяцкай.

За гэты час набраў моц контррэфармацыйны рух, і ў гарадах ВКЛ хуткімі тэмпамі сталі будавацца касцёлы. У першай палове XVII ст. у Гародні з'явіліся езуіты, брыгіткі, бернардынкі, дамінікане, кармеліты, францысканцы. Гэта істотна змяніла архітэктурны, культурны і рэлігійны воблік горада. Імкненне каталіцкага духавенства авалодаць значнымі тэрыторыямі нярэдка прыводзіла да

[130] Topolska B. Społeczeństwo i kultura w Wielkim Księstwie Litewskim od XV do XVIII wieku. Poznań; Zielona Góra, 2002. S. 56–57, 66.

[131] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Kięstwa Litewskiego w epoce Baroku. Warszawa, 1995. S. 196–209; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 80.

[132] Ярушевич А. Ревнитель православья князь Константин Иванович Острожский…

[133] Topolska B. Społeczeństwo i kultura w Wielkim Księstwie Litewskim... S. 126–128.

[134] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 6. Вильна, 1869. С. 65–153; Іванова Л. "Пункты заспакаення грэчаскай веры" 1632–1635 гг. // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі) / Пад рэд. М.В. Біча і П.А. Лойкі. Мн., 1996. С. 71–77; Дмитриев М.В. Религиозные войны в Речи Посполитой? К вопросу о последствиях Брестской унии 1596 года // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. 2008. № 1 (3). С. 3–22.

[135] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-западной Руси. Т. 2. Вильна, 1869. С. 60–61; Іванова Л. "Пункты заспакаення грэчаскай веры" 1632–1635 гг... С. 71–77.

канфлікту з гарадскімі ўладамі і мяшчанамі[136]. Пры гэтым у горадзе не будаваліся новыя праваслаўныя і уніяцкія храмы[137].

У сярэдзіне XVII ст. адбылася змена культурных каштоўнасцяў, прыярытэтаў. Вайна 1654–1667 гг. зраўнала ўсіх. Былі зруйнаваны ўсе храмы горада. Пасля вызвалення Гародні шляхта ў першую чаргу давала грошы на аднаўленне каталіцкіх храмаў і кляштараў. Большасць з іх была адрамантавана. Каталіцкае духавенства аднавіла сваю дзейнасць. З 1661–1662 гг. службы вялі брыгіткі, бернардынцы, францысканцы[138]. А уніяцкія цэрквы доўгі час стаялі ў запусценні ці не аднавіліся ўвогуле, бо панаваць сталі эліты каталіцкага веравызнання, якія актыўна ўносілі ў гарадское жыццё "лацінскую культуру".

Прачысценская царква праіснавала каля сямі стагоддзяў, але асноўная інфармацыя захавалася па апошнім двум. Дакументальныя звесткі амаль нічога не паведамляюць пра XII–XV стст., а XII ст. адлюстравана толькі ў матэрыяльных крыніцах. У асноўным дакументы датычаць XVI – пачатку XVIII ст. У іх фрагментарна адлюстраваўся пералік святароў. Пра тэрыторыю і насельніцтва, якое мела пляцы вакол храма, паведамляюць крыніцы першай паловы XVII ст. Больш поўна захавалася інфармацыя пра асобаў, які рабілі ахвяраванні на карысць царквы. Дзякуючы ім царква стала ўладальніцай цэлага раёну на вуліцы Падольная.

Гісторыя Прачысценскай царквы – гэта неад'емная частка гісторыі Гародні. Храм паўплываў на рэлігійнае, культурнае жыццё горада і, канешне, на горадабудаўнічую структуру, фарміраванне вуліц і раёну вакол яе. Статус Саборнай узвышаў царкву сярод астатніх храмаў. Прачысценская царква атрымлівала фундацыйныя запісы як ад польскіх каралёў і вялікіх князёў літоўскіх, так і ад гарадской і павятовай шляхты. Храм здолеў аднавіць сваю дзейнасць пасля вайны 1654–1667 гг. і праіснаваў да пачатку XVIII ст.

Адсутнасць царкоўнага архіву не дае магчымасць высветліць падзеі за перыяд XII–XV стст., аднавіць цалкам спіс святароў, фундатараў, рэканструяваць унутранае ўбранне царквы, тэрыторыю вакол царквы і інш. Аднак у параўнанні з многімі іншымі цэрквамі Гародні Прачысценская царква прадстаўлена ў дакументах значна лепш.

Адзначым, што гісторыя праваслаўя ў Гародні застаецца маладаследаванай. Вывучэння патрабуюць старажытныя цэрквы, праваслаўная культура горада, фундатарская дзейнасць, міжканфесійныя адносіны ў горадзе ды інш. Варта дадаць, што на месцы Прачысценскай царквы трэба ўсталяваць памятны знак. Гэта паслужыць захаванню гістарычнай і культурнай памяці гараджан.

---

[136] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna... S. 200–208; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня... С. 86–90, 94–101.

[137] Васкрасенская царквы была перанесена на іншае месца, таму яе не адносім да ліку новых.

[138] Chrapowicki J.A. Diariusz. Cz. 1: 1656–1664 / oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1978. S. 310, 339, 357.

*Дадатак 1.*

## Пералік дакументаў, якія захоўваюцца ў ф. 1475, воп. 1, ад.з. 2

| Назва дакументу | Дата актыкацыі | Дата апошняга выпісу |
|---|---|---|
| Арк. 51–52. Прывілей Станіслава Аўгуста Панятоўскага на пацвярджэнне прывілея Жыгімонта Старога царкве Св. Тройцы на зямлю Суслаўшчына Хадарковіча ў Азёрах, 1511 г. Дакумент надрукаваны ў: Lietuvos Metryka. Knyga 9 (1511–1518). Vilnius, 2002. С. 105. | 1511 г. | 1765 г. |
| Арк. 53–57. Пацвярджальны прывілей Станіслава Аўгуста Панятоўскага на фундацыйны запіс на шпіталь пры Прачысценскай царкве Жыгімонта Аўгуста (1565) і Стэфана Баторыя (1581). Дакумент надрукаваны ў: АВАК. Т. 1. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1865. С. 13–15. | 23 кастрычніка 1790 г. | 1790 г. |
| Арк. 58–59. Фундацыйны запіс на шпіталь пры Прачысценскай царкве Стэфана Баторыя (1581), які ўключае прывілей Жыгімонта Аўгуста (1565). | 9 кастрычніка 1596 г. | XvIII ст. |
| Арк. 60–63. Продаж гарадзенскім пратапопам Васілём Гаўрылавічам пляца харужаму гарадзенскаму Якубу Кунцэвічу, 29 снежня 1604 г. | 18 студзеня 1605 г. | – |
| Арк. 64–65. Продаж пляцу Гаўрылам Ельскім сыну Юзафу, 22 чэрвеня 1609 г. | 23 чэрвеня 1609 г. | 1753 г. |
| Арк. 66–67. Інтрамісія гарадзенскага вознага Валентыя Вільміна на пляц Юзафа Ельскага, 23 чэрвеня 1609 г. | 23 чэрвеня 1609 г. | 1753 г. |
| Арк. 68–69. Даравальны запіс Прачысценскай царкве гарадзенскага харужага Якуба Кунцэвіча і яго жонкі Барбары Фурсаўны на пляцы каля царквы, 2 сакавіка 1614 г. | 23 кастрычніка 1614 г. | 174? г. |
| Арк. 70–71. Інтрамісія гарадзенскага вознага Мацея Тамашэўскага на пляц З. Стэфановічу, 5 сакавіка 1614 г. | 5 сакавіка 1614 г. | 1748 г. |
| Арк. 72–73. Фундацыйны запіс Яраша Валовіча на пляцы, 3 кастрычніка 1626 г. Дакумент надрукаваны ў: АВАК. Т. 1. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1865. С. 52–54. | 3 кастрычніка 1626 г. | 1749 г. |
| Арк. 74–75 адв. Пацвярджальны прывілей Уладзіслава IV Васкрасенскай царкве на 2 валокі ў Альшанцы і 2 валокі ў Канюхах, які былі дадзены Стэфанам Баторыем, 20 мая 1633 г. Дакумент надрукаваны ў: АВАК. Т. 1. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1865. С.60–61. | 13 кастрычніка, 1633 г. | 1765 г. |

Працяг. Пачатак на с. 86.

| Назва дакументу | Дата актыкацыі | Дата апошняга выпісу |
|---|---|---|
| Арк. 76–77. Фундацыйны запіс Мікалая Рабея Гнайніцкага Прачысценскай царкве на пляц, 28 верасня 1634 г. | 5 кастрычніка 1634 г. | 1765 г. |
| Арк. 78–79. Скарга гарадзенскага пратапопа Юзафа Валевіча аб зруйнаванні Прачысценскай царквы і яе абрабаванні маскоўскімі войскамі, 11 верасня 1659 г. | 11 верасня 1659 г. | 1756 г. |
| Арк. 80. Пацверджанне мітрапаліта Цыпрыяна Жахоўскага кармелітам на пляц з гарбарскімі могілкамі, які раней належыў Прачысценскай царкве, 1674 г. | – | – |
| Арк. 80 адв.–81. Ліст мітрапаліта Цыпрыяна Жахоўскага правінцыялам, 1675 г. | – | – |
| Арк. 81–82 адв. Ліст мітрапаліта Цыпрыяна Жахоўскага айцу Юзафату, 1675 г. | – | – |
| Арк. 83–92. Рэвізія Гародні за 1680 г. Пераклад на беларускую мову надрукаваны ў: Брэгер Г. Дакументы сведчаць: Інвентар каралеўскага горада Гродна паводле камісарскай рэвізіі, 1680 г. // Памяць. Гродна. Мінск, 1999. С. 84–95. | – | – |
| Арк. 93–93 адв. Рашэнне па справе не выплаты чынша шляхцянкай Пшэздзецкай, 1680 г. | – | – |

Расширение набожных практик было настоятельной необходимостью из-за весьма буйного нрава гродненских студентов. В каденцию ректора Казимира Юрахи (Kazimierz Juraha, ректор в 1749-53 гг.) студенты коллегиума вломились в городскую тюрьму, где сидел некий слуга подполковника комиссара королевских экономий, приговоренный за какое-то преступление на смерть. «Разогнав стражу и выломав дверь, осужденного пустили вольно». Комисар внес жалобу в трибунал на ректора и коллегиум. Они на правосудие не явились. Тогда трибунал заочно присудил коллегиуму «10 000 злотых гривны и заезд на деревню

[27] Grodno // Encyklopedia wiedzy o jezuitach..., s. 197.

[28] Блинова Т.Б. Иезуиты в Беларуси…С. 298.

[29] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce Baroku, pod red. J. Kowalczyka, Warszawa 1995, s. 192-194.

[30] Ярашэвіч А.А., Бажэнава В.Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл ... С. 133.

[31] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie... s. 193.

Котра». Понадобилось много стараний ректора Виленской академии Яна Юрахи и подскарбия литовского Юрия Флеминга (Jerzy Fleming), чтобы трибунал отклонил свой приговор и удовлетворился телесным наказанием студентов, назначенным им ректором коллегиума[32].

В 1765 г. Гродненское староство возглавил Антоний Тизенгауз (Antoni Tyzenhauz, 1733-1785) надворный подскарбий литовский, который создал в Гродно, как выражались современники, «цветущую Голландию». Одновременно с внедряемыми Тизенгаузом новинками появились новации в иезуитском коллегиуме. В 1770-73 гг. здесь стали преподавать математику и современные языки: немецкий и французский. В 1772 г. был даже открыт шляхетский конвикт[33] и его префектом был назначен Франтишек Ксаверий Богуш (Franciszek Ksawery Bogusz, 1746-1820)[34], сыгравший значительную роль дальнейшем развитии системы образовании Речи Посполитой.

К сожалению, эти новации были последними. В 1773 г. в Риме папа издал буллу о роспуске Товарищества Иисуса, которая по сути разрушала существовавшее более двухсот лет единое европейское образовательное пространство и косвенно создавала материальную базу для создания национальных школ. Процветающий Гродненский коллегиум был передан свежеобразованной Комиссии национального образования (Komisji Edukacji Narodowej), которая на его базе в Гродно создала окружную школу, одну из девяти в Речи Посполитой. Для коллегиума это стало катастрофой. В 1772 г. его кадровый состав насчитывал 42 человека. Из них в новой школе место для работы и жизни было предоставлено только восьми профессорам[35].

В заключение краткого очерка истории иезуитского коллегиума в Гродно, надо отметить, что тема гродненских иезуитов рассматривалась с разных сторон, но история коллегиума, который и был основой единого комплекса под названием «дом Товарищества Иисуса», включавшего и костел, и аптеку, и вспомогательные службы, остается за пределами внимания исследователей. До сих пор невыяснено, как и с какой скоростью менялась жизнь региона под влиянием наличия в нем растущего образовательного центра. Не определены роль и место гродненского коллегиума в системе школ Литовской провинции Товарищества Иисуса. Да и с чисто утилитарной точки зрения весьма актуальным представляется в условиях громких нареканий на перманентную реформу современной школы взглянуть внимательнее на организацию образовательного процесса в коллегиуме, которая будучи неизменной в течение 200 лет, обеспечивала стабильно высокий уровень подготовки выпускников. Все-таки, historia magistra vitae est.

---

32 Załęski S. Jezuici w Polsce. T. III. Kraków 1905. S. 1033.

33 Конвикт фактически представлял собой студенческое общежитие интернатного типа, где юноши проживали под надзором воспитателей.

34 Блинова Т.Б. Иезуиты в Беларуси…С. 350; Natoński B. Jezuici a Komisja Edukacji Narodowej // Z dziejów szkolnictwa jezuickiego. S. 205-236.

35 Jodkowski J. Grodno... S. 38.

*Ірына Кітурка,*
*кандыдат гіст. навук (Гродна)*

# Антоній Тызенгаўз і Гарадзенская школа мернікаў. Другая палова XVIII ст.

У другой палове XVIII ст. адным з галоўных цэнтраў гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцця Вялікага княства Літоўскага была Гародня. Павышэнне эканамічнай ролі і палітычнага значэння горада, змяненне яго знешняга вобліку стала магчымым дзякуючы намаганням адной з самых неардынарных асобаў той эпохі, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, рэфарматара і мецэната Антонія Тызенгаўза. Юзаф Выбіцкі, які быў актыўным прыхільнікам тызенгаўзаўскіх пераўтварэнняў і новаўвядзенняў, увогуле назваў яго "геніем, якога нарадзілі літоўскія пушчы"[1].

Сапраўды, цяжка вызначыць тую галіну жыцця ВКЛ у другой палове XVIII ст., якую абышоў сваёй увагай "геній" А. Тызенгаўза: ад заснавання мануфактур і розных навучальных і культурных устаноў да стварэння раялісцкай партыі. Але, безумоўна, галоўным накірункам яго дзейнасці, пераўтварэннямі, station ўчых вынікаў якіх чакаў кароль, былі эканамічныя рэформы.

Абранне ў 1764 г. польскім каралём і вялікім князем літоўскім стаўленіка "Фаміліі" Станіслава Панятоўскага давала Рэчы Паспалітай шанс стаць на шлях эканамічных і палітычных рэформ, неабходнасць якіх была прадыктавана як рэальнай сітуацыяй ў краіне, так і патрабаваннем часу з яго новай ідэалогіяй Асветніцтва.

Дзеля ўмацавання каралеўскай улады важным было змяншэнне яе фінансавай незалежнасці ад сойму. Дасягнуць гэтага можна было, у першую чаргу, за кошт павелічэння прыбытковасці каралеўскіх сталовых эканомій – вялікіх дзяржаўных уладанняў, даход з якіх ішоў непасрэдна на ўтрыманне кіраўніка дзяржавы. У ВКЛ генератарам ідэй па рэфармаванню сталовых эканомій, аўтарам аграрнай і мануфактурнай рэформ стаў А. Тызенгаўз, даўні сябра Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Спецыяльным распараджэннем ад 8 сакавіка 1765 г. кароль прызначыў А. Тызенгаўза генеральным адміністратарам сталовых эканомій і даў яму шырокія паўнамоцтвы з дазволам рабіць усё для павелічэння прыбыткаў з гэтых уладанняў[2]. У гэтым жа годзе А. Тызенгаўз быў прызначаны яшчэ і на пасаду надворнага падскарбія ВКЛ.

Эканамічныя пераўтварэнні, якія меўся ажыццявіць А. Тызенгаўз, складаліся з трох арганічна звязаных паміж сабой частак: 1) аднаўленне ў эканоміях фальваркаў з паляпшэннем апрацоўкі зямлі і выкарыстаннем

[1] Wybicki J. Życie moje oraz Wspomnienia o Andrzeju i Konstancji Zamojskich. Kraków, 1927. S. 149.
[2] Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD), zes. Archiwum Tyzenhauzów (AT), sign. D-1, p. 3.

тагачаснай заходнееўрапейскай тэхнікі; 2) арганізацыя мануфактур, заснаваных на бясплатнай працы каралеўскіх сялян; 3) стварэнне разгалінаванай сістэмы шляхоў зносін для стымулявання ў краіне гандлю[3].

Калі верыць ксёндзу Ксаверыю Богушу, які таксама быў прыхільнікам рэформаў надворнага падскарбія, то пачаў А. Тызенгаўз сваю гаспадарчую дзейнасць з таго, "з чаго кожны разумны гаспадар пачынаць павінен – з перамеру (зямлі – *І.К.*)"[4].

Сапраўды, ажыццяўленне задуманых А. Тызенгаўзам эканамічных рэформаў патрабавала новага дакладнага перамеру зямлі, якога фактычна не было ў ВКЛ з часоў валочнай памеры сярэдзіны XVI ст.[5], а таксама перапісу сялянства з пазначэннем іх надзелаў, колькасці жывёлы, аб'ёмаў падаткаў і павіннасцяў і г.д. Але, як слушна заўважыў К. Богуш, "перамер такіх вялікіх эканомій[6] патрабаваў некалькіх дзесяткаў каморнікаў і мернікаў. Што зрабіў (А. Тызенгаўз – *І.К.*)? Заснаваў школу мернікаў з некалькімі дзесяткамі маладых людзей і аддаў іх вучыцца да найбольш дасведчанага на той час каморніка Маркевіча"[7].

Такім чынам, К. Богуш быў першым, хто ў сваіх "Успамінах пра Антонія Тызенгаўза" звярнуў увагу на важнасць заснавання ў Гародні школы мернікаў, аднак больш ніякай інфармацыі пра гэтую ўстанову не прывёў. Такія ж згадкі некалькі разоў сустракаліся ў працах гісторыкаў XIX ст. – Я. Ярашэвіча[8], З. Глогера[9], Т. Корзана[10]. Аднак і гэтыя аўтары нічога больш не пісалі пра заснаванне і дзейнасць гарадзенскай школы мернікаў.

На жаль, да сённяшняга дня не ўдалося знайсці архіўных матэрыялаў пра дзейнасць школы мернікаў у Гародні. Разам з тым, у літаратуры сустракаюцца кароткія згадкі пра яе існаванне ў другой палове XVIII ст. Пры гэтым важнасць і своечасовасць яе заснавання не падлягае сумненню. Вядомы польскі гісторык Станіслаў Касцялкоўскі, даследчык жыцця і дзейнасці А. Тызенгаўза, лічыў, што школа мернікаў была адной з трох навучальных устаноў (сярод якіх былі яшчэ бухгалтарская і будаўнічая школы), створаных А. Тызенгаўзам у Гародні ў перыяд 1765–1766 г.[11] Сярод сучасных гістарычных прац можна вылучыць толькі артыкул М. Мароз, даследчыцы з Беластока, якая, вывучаючы жыццё

---

[3] Похилевич Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. Вильнюс, 1966. С. 22-23.

[4] Xawery Bohusz. Spominka o Antonim Tyzenhauzie. AGAD. AT, D-22/16, p. 228.

[5] Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. T. I. Londyn, 1970. S. 416.

[6] У ВКЛ гэта былі Гарадзенская, Берасцейская, Кобрынская, Магілёўская, Оліцкая і Шавельская эканоміі.

[7] Xawery Bohusz. Spominka…, p.228.

[8] Jaroszewicz J. Obraz Litwy. Cz. III. Wilno, 1845. S. 126.

[9] Gloger Z. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi nadworny litewski //Kwartalnik Kłosów. T. II. Warszawa, 1877. S. 15.

[10] Korzon T. Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764–1794). T. II. Kraków, 1883. S. 227.

[11] Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. T. I. S. 416.

віленскага каморніка Юзафа Маркевіча, не магла абыйсці ўвагай пытанне існавання гарадзенскай школы мернікаў, якую ён узначальваў[12].

Дзяржава сапраўды мела патрэбу ў дасведчаных землямерах (каморніках) па двух асноўных прычынах. Па-першае, для правядзення люстрацыі дзяржаўных уладанняў, неабходнасць якой была зафіксавана ў канстытуцыі канвакацыйнага сойма 1764 г.[13]. Гэта было актуальна, бо ў папярэдні перыяд сярэдзіны XVII – сярэдзіны XVIII ст., які ў гісторыі атрымаў назву “разбуральнага стагоддзя”, люстрацыі не праводзіліся, а пры пасляваеннай сістэме льгот, якую ўжывала дзяржава для хутчэйшага аднаўлення гаспадаркі, многія сялянскія сем’і значна павялічылі свае надзелы, але гэта не знайшло адлюстравання ў дакументацыі ўладання. Падаткі і павіннасці прызначаліся не з той колькасці зямлі, якая знаходзілася ў фактычным карыстанні селяніна, а з раней зафіксаванай у інвентарах. Зразумела, што выправіць гэтую сітуацыю можна было толькі праз перамер зямлі[14].

Па-другое, перамер быў неабходны для ўвядзення новага адміністрацыйнага падзелу сталовых эканомій. Ініцыятарам адміністрацыйнай рэформы выступіў А. Тызенгаўз, які лічыў, што новы, больш дробны падзел сталовых эканомій на губерні і ключы (замест вялікіх ключоў і валасцей) дазволіў бы больш эфектыўна праводзіць аграрныя пераўтварэнні, а таксама даў бы магчымасць пільна кантраляваць гэты працэс. Межы новых губерняў і ключоў абавязаны былі вызначыць і зафіксаваць мернікі. А паколькі перамер зямлі ў Вялікім Княстве насіў эпізадычны характар амаль сто гадоў па прычыне ваенных разбурэнняў і адсутнасці фінансавых сродкаў, то дастатковай колькасці асобаў, дасведчаных у навуцы мерніцтва, у ВКЛ проста не было. Для ажыццяўлення сваіх планаў А.Тызенгаўзу неабходна была навучальная ўстанова, якая б здолела падрыхтаваць такія кадры.

Аднак пытанняў пра гарадзенскую школу мернікаў сёння існуе больш, чым адказаў. Дзе яна размяшчалася? Праўдападобна, што на Гарадніцы, у цэнтры тызенгаўзаўскіх пераўтварэнняў. Але канкрэтнае месца яе размяшчэння ўстанавіць сёння не ўяўляецца магчымым.

Наконт прадметаў, якія вывучаліся ў даследуемай навучальнай установе, дакладна сцвярджаць можна толькі пра геаметрыю і картаграфію. Але з ліста генеральнага мернічага ВКЛ Людвіка Кройца да караля (ад 20 студзеня 1766 г.) вынікае, што мернікі абавязкова павінны былі мець веды ў галіне грамадзянскай архітэктуры і гідраўлікі[15]. На жаль, крыніцы не даюць магчымасці высветліць, ці былі гэтыя прадметы ў гарадзенскай школе мернікаў, і хто іх выкладаў.

---

[12] Moroz M. Józef Markiewicz – komornik województwa Wileńskiego (2 połowa XVIII wieku) // Europa Orientalis. Polska i jej wschodni sąsiedzi od średniowiecza po współczesność. Toruń, 1996. S. 219-230.

[13] Volumina legum. T. VII. Petersburg, 1860. S. 85.

[14] Голубеў В., Кітурка І. Аграрная рэформа Антонія Тызенгаўза //Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.3. Мн., 2004. С. 179.

[15] AGAD. Zbiór Popiełów, № 310, p. 202.

Крыніцы таксама не падаюць ні імёнаў, ні сацыяльнага статусу вучняў гарадзенскай школы мернікаў. Толькі ў З. Глогера ўтрымліваецца інфармацыя, што ў школе вучыліся "некалькі дзесяткаў маладых людзей, сыноў небагатай шляхты, мяшчан і афіцыялістаў"[16]. На жаль, невядома, якімі крыніцамі карыстаўся З. Глогер. Гарадзенская школа мернікаў па сутнасці рыхтавала каморнікаў. Пасада каморніка вядомая з сярэднявечча. Гэта быў высокі ўраднік пры дварах князёў (каралёў). З сярэдзіны XVI ст., з часу валочнай памеры, каморнік з'яўляўся членам падкаморскага суда, але гэта была ўжо не столькі пасада, колькі канкрэтная прафесія геадэзіста-землеўпарадчыка, які займаўся вымярэннем мясцовасці і складаннем картаў у якасці судовага выканаўцы, а таксама асабіста за кошт зацікаўленага боку[17]. Такім чынам, паколькі гэтая прафесія дазваляла атрымаць грашовыя даходы, то цалкам верагодна, што ў гарадзенскай школе мернікаў і вучыліся пералічаныя З. Глогерам катэгорыі насельніцтва.

Ажыццяўленне на практыцы планаў і ідэй А. Тызенгаўза патрабавала вялікай колькасці шэраговых выканаўцаў, афіцыялістаў, ураднікаў, рамеснікаў і інш., імёны якіх у большасці засталіся невядомымі. З асобаў гарадзенскай школы мернікаў рэальна вядома, акрамя яе стваральніка, толькі адна – кіраўнік школы, каморнік Віленскага ваяводства Юзаф Маркевіч.

На жаль, невядомы ні час, ні месца нараджэння Ю. Маркевіча. Хутчэй за ўсё, паходзіў ён з шляхецкага роду Вялікага княства Літоўскага. Застаецца пытаннем, дзе ён атрымаў адукацыю і калі стаў віленскім каморнікам. Яго імя стала вядомым у гісторыі менавіта з 1765 г., калі А. Тызенгаўз прызначыў яго кіраўніком школы мернікаў у Гародні[18].

Чаму менавіта яму быў аказаны такі давер і гонар, як падрыхтоўка маладых спецыялістаў у галіне навукі мерніцтва? Адназначна адказаць на гэтае пытанне не ўяўляецца магчымым. З лёгкай рукі К. Богуша ў літаратуры XIX ст. Ю. Маркевіча называлі найбольш дасведчаным на той час каморнікам. Але ці так было на самой справе?

Не прыніжаючы "дасведчанасці" Ю. Маркевіча, нельга не заўважыць, што ў 1765 г. быў яшчэ адзін каморнік Віленскага ваяводства Людвік Кройц, які дасканала ведаў сваю працу. У сакавіку 1765 г. ён прапанаваў свой першы праект па рэфармаванню Берасцейскай і Кобрынскай эканомій, пры ажыццяўленні якога даходы з гэтых уладанняў узраслі б амаль у 2,5 разы[19]. Да сваёй справы ён ставіўся вельмі адказна і сур'ёзна. Рыхтуючыся да правядзення люстрацыі ў Берасцейскай і Кобрынскай эканоміях, ён узяў з камеральнага архіва акт рэвізіі Берасцейскай эканоміі 1566 г., якую праводзіў Дзмітрый Сапега, і рэестр памеры Гарадзенскай эканоміі 1558 – 1562 г.[20] Спецыяльным каралеўскім прывілеям у

[16] Gloger Z. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi nadworny litewski. S. 15.
[17] Анішчанка Я. Каморнікі // ЭГБ. Т. 4. Мн., 1997. С. 53.
[18] Moroz M. Józef Markiewicz – komornik województwa Wileńskiego. S. 221.
[19] AGAD. Archiwum Kameralne (AK), III/26, p. 237–240.
[20] AGAD. AK, III/1484, p. 3-4.

маі 1765 г. Л. Кройц “за практычныя здольнасці” быў прызначаны генеральным мернічым ВКЛ[21]. Але не яго, а Ю. Маркевіча выбраў А. Тызенгаўз у якасці кіраўніка гарадзенскай школы мернікаў. Чаму?

Хутчэй за ўсё, адказ на гэтае пытанне ляжыць у сферы асабістых адносінаў паміж генеральным адміністратарам сталовых эканомій і каморнікам Л. Кройцам. Справа ў тым, што прапанаваныя апошнім праекты рэфармавання Берасцейскай і Кобрынскай эканомій (за перыяд 1765 – 1766 гг. іх было тры), грунтаваліся на прынцыпах эканамічнай свабоды сялянства – ліквідацыі паншчыны і ўвядзенні падвышанага чыншу. Але гэта цалкам супярэчыла ідэі надворнага падскарбія па аднаўленню ў эканоміях фальваркаў. Перавагу чыншавай сістэмы Л. Кройц абгрунтоўваў адпаведнымі разлікамі ў лістах на імя караля, а А. Тызенгаўз вымушаны быў даказваць Станіславу Аўгусту адваротнае. Магчыма менавіта таму пры прызначэнні кіраўніка гарадзенскай школы мернікаў А. Тызенгаўз выкарыстаў свой адміністрацыйны рэсурс і аддаў перавагу Ю. Маркевічу, які не меў уласных праектаў рэфармавання эканомій і павінен быў толькі падрыхтаваць у школе выканаўцаў праектаў надворнага падскарбія.

Школа мернікаў праіснавала ў Гародні нядоўга. Ужо на пачатку 1770-х г. пра яе ні ў крыніцах, ні ў літаратуры не сустракаецца ніякіх звестак. Хутчэй за ўсё, яна выканала сваё прызначэнне, і пасля таго, як у ёй была падрыхтавана дастатковая колькасць мернікаў, яна была закрыта.

Магчыма, існавала і яшчэ адна прычына закрыцця школы – фінансавая. З гэтай нагоды цікавай падаецца супліка Ю. Маркевіча на імя караля[22] з 1781 г.[23] Маркевіч скардзіўся, што А. Тызенгаўз уцягнуў яго ў перамер сталовых эканомій, абяцаў плаціць па 5 злотых ад валокі, але пры гэтым умовы працы і аплаты не пацвярджаліся ніякімі дакументамі. Атрымалася, што Маркевіч “трапіў у ярмо незлічоных прац” (сярод якіх было і кіраўніцтва школай мернікаў), служыў бясплатна, выдаткоўваў уласныя грошы. “Падскарбі ніколі мяне не забываў, заўсёды ўзгадваў і хваліў, але калі я гаварыў пра ўзнагароду, альбо адмаўляў, гаворачы што ў касе няма грошай, альбо выдаваў вельмі маленькую суму, на асноўныя патрэбы, гаворачы, навошта Пану грошы, няхай у скарбе будуць, там не згінуць і капітал збярэш”[24].

Такое нежаданне А. Тызенгаўза выплочваць грошы Ю. Маркевічу (і не толькі яму!) тлумачыцца тым, што разгорнутыя адначасова ва ўсіх сталовых эканоміях пераўтварэнні і шырокае будаўніцтва[25] патрабавалі значных грашовых

[21] AGAD. AK, III/27, p. 217.

[22] AGAD. AK, III/69, p. 301.

[23] Гэтая супліка не мае даты, аднак са зместу, дзе гаворыцца, “ад году тваёй каранацыі сямнаццаць гадоў у скарбе бескарысна працаваў”, можна зрабіць выснову, што гэта 1781 г.

[24] Тамсама.

[25] Кожны год, пачынаючы з 1765 г. і як мінімум па 1783 г., у эканоміях складаліся дакументы, у якіх фіксаваліся новыя ўзведзеныя будынкі (цэрквы, касцёлы, эканамічныя афіцыны, корчмы, крамы, бровары і г.д.). Шэраг такіх дакументаў захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных

выдаткаў са скарбу. А хто мог ведаць фінансавыя праблемы лепш за надворнага падскарбія? Антоні Тызенгаўз спрабаваў "эканоміць" на сваіх ураднiках.

Як бы там ні было, безумоўна, гарадзенская школа мернікаў мела вялікае значэнне для ўсяго ВКЛ. Падрыхтаваныя ў гэтай навучальнай установе геаметры правялі рэвізію сталовых эканомій і па яе выніках стварылі дакладныя карты гэтых уладанняў. Вядома, што ў 1771 г. былі складзеныя карты Магілёўскай эканоміі, агульныя выдаткі на якія вызначаліся ў памеры 100 000 польскіх злотых[26]. Аднак скарыстацца імі ў поўнай меры не ўдалося, паколькі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай гэтая тэрыторыя апынулася ў руках расійскага ўраду. У 1771 г. Л. Кройцам была складзена карта Шавельскай эканоміі, а ў 1781 г. Ю. Маркевіч склаў карты Гарадзенскай і Оліцкай эканомій, якія былі дастаткова вялікія (маштаб 1:140 000) і прыгожа аздобленыя.

Дакладна вядома, што картамі ўсіх эканомій карыстаўся Жан Эмануіл Жылібер пры стварэнні фітагеаграфічнай карты для сваёй працы "Флора Літвы"[27]. Карты эканомій былі складзены па адзінаму прынцыпу і патрабаванню, у колеры, з пазначэннем новага адміністрацыйнага падзелу на губерні і ключы. У кожны ключ уваходзілі некалькі або нават некалькі дзесяткаў вёсак і фальваркаў, кожны ключ меў сваё ўласнае мястэчка, паколькі менавіта ключ станавіўся той арганізацыйнай адзінкай у гаспадарцы эканоміі, якая мела сваю ўласную адміністрацыю, уласны рынак і парафію[28]. Усё гэта знайшло адлюстраванне на картах эканомій, складзеных выпускнікамі гарадзенскай школы мернікаў у 1770–1780-я гады.

Кіруючы школай, Ю. Маркевіч у Гародні перамераў і сфарміраваў пляцы эканамічных будынкаў, мануфактур, рамесных майстэрняў і дамоў. Як ён сам сцвярджаў у сваёй сумпліцы на імя Станіслава Аўгуста, паводле яго перамераў у Гарадзенскай эканоміі паўсталі новыя вёскі і мястэчкі, ён запраектаваў перабудову галоўных дарог на шырокія і прамыя абсаджаныя дрэвамі паштовыя тракты, а таксама займаўся праектаваннем водных каналаў[29].

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што першая ўстанова навучальнага характару А. Тызенгаўза ў Гародні – школа мернікаў вывела навуку мерніцтва і картаграфію ў ВКЛ на больш высокі ўзровень. Падрыхтаваныя спецыялісты атрымалі права называцца "каралеўскімі эканамічнымі мернікамі" і працаваць у Геаметрычным дэпартаменце на карысць дзяржавы[30].

актаў у Варшаве: AGAD, AK, III/173, p. 3-8; III/175, p. 3-10, III/177, p. 44-45; III/180, p. 1-10; III/182, p. 79-80; AT, D-1/XIV і інш.

26 AGAD. AK, III/270, p. 242.

27 Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. T. I. S. 417.

28 Moroz M. Józef Markiewicz – komornik województwa Wileńskiego. S. 224.

29 AGAD. AK, III/69, p. 301.

30 Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. T. I. S. 417.

# Гісторыя.

# Гародня – Горадня – Гродна

# ў XIX – XX ст.



*Іна Соркіна,*
*кандыдат гіст. навук (Гродна)*

# Насельніцтва Гародні паводле апублікаваных матэрыялаў Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расейскай імперыі 1897 г.

Крыніцай натхнення для вывучэння гарадской супольнасці Гародні паводле матэрыялаў Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. стала кніга Юрыя Гардзеева "Магдэбургская Гародня", якая ўражвае грунтоўнасцю даследавання праблемы сацыятапаграфічнага развіцця нашага горада ў XVI – XVIII ст[1]. Аўтар падрабязна апісаў эвалюцыю горадабудаўнічага развіцця, маёмасных адносін, сацыяльнай стратыграфіі горада, а таксама этнаканфесійнай і прафесійнай структуры насельніцтва. Заглыбленне ў вір жыцця навачаснай Гародні на аснове шырокага спектра пісьмовых крыніц, галоўным чынам захаваных актавых кніг гарадскога магістрата, дазволіла Юры Гардзееву ўсебакова ахарактарызаваць разнастайную сацыяльную, этнічную, канфесійную палітру старадаўняй Гародні.

Якой жа стала Гародня напрыканцы XIX ст.? Што ўяўляла сабой канфесійная, саслоўная і этнічная структура насельніцтва горада? Якімі былі заняткі гараджанаў, прафесійная структура прадстаўнікоў асноўных этнасаў? Як можна ахарактарызаваць узровень пісьменнасці гарадзенцаў? Што было ўласціва гендэрнай структуры, узроставым паказчыкам, сямейнаму становішчу жыхароў горада? На гэтыя і іншыя пытанні дапамагаюць адказаць апублікаваныя матэрыялы перапісу насельніцтва 1897 г.

Да вывучэння насельніцтва Гародні паводле перапісу 1897 г. звяртаўся польскі гісторык Адам Даброньскі[2]. У яго артыкуле знайшлі адлюстраванне пытанні колькасці жыхароў горада, узросту і сямейнага становішча, нацыянальнасці і веравызнання, адукаванасці і гаспадарчай дзейнасці. Аналіз А.Даброньскага падаецца дастаткова грунтоўным, але засталіся пытанні, на якія польскі даследчык не адказаў.

---

[1] Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня (сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў 16 – 18 ст.). Гародня – Wrocław, 2008.

[2] Dobroński A. Mieszkańcy Grodna w 1897 roku // Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1939 roku) / pod red. Andrzeja Woltanowskiego i Jerzego Urwanowicza. Bialystok, 1997. S. 173 – 188.

Праблема стану гарадоў Беларусі, у тым ліку і Гародні, паводле дадзеных перапісу 1897 г. закраналася ў даследаваннях Захара Шыбекі[3]. Да пытанняў занятасці насельніцтва Гародні паводле матэрыялаў перапісу 1897 г. звярталіся Алег Каляга і Лада Рудзікава[4].

Шматграннасць сабраных падчас перапісу 1897 г. матэрыялаў, магчымасць іх разнастайнай інтэрпрэтацыі дазваляюць працягваць даследаванне праблемы тагачаснага стану гарадской супольнасці Гародні.

Перапіс 28 студзеня 1897 г. з'яўляўся адзіным навукова арганізаваным усеагульным перапісам ў Расейскай імперыі. У гэты дзень на тэрыторыі ўсёй краіны па агульнай праграме і адзінай методыцы былі атрыманы звесткі аб геаграфічным, узроставым, рэлігійным размеркаванні насельніцтва, аб яго пісьменнасці, занятках, побытавых і іншых асаблівасцях.

У методыцы падрыхтоўкі і правядзення Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расіі прасочваюцца наступныя прынцыпы: цэнтралізаванасць; ахоп пэўнай тэрыторыі, межы якой дакладна вызначаюцца ўрадавымі пастановамі ці рашэннем статыстычных органаў; усеагульнасць; адначасовасць; індывідуальнасць пры рэгістрацыі; апрацоўка і публікацыя дадзеных згодна з геаграфічным або адміністрацыйным падзелам краіны і асноўнымі дэмаграфічнымі, сацыяльнымі прыкметамі насельніцтва. Праграма перапісу 1897 г. ахоплівала наступныя пытанні: прозвішча, імя, імя па бацьку; пол; адносіны да “главы” гаспадаркі і “главы” сям'і; узрост; сямейнае становішча; саслоўе ці званне; веравызнанне; месца нараджэння; месца прыпіскі; месца жыхарства; родная мова; уменне чытаць, месца навучання; занятак, рамяство, пасада ці служба; адносіны да вайсковай службы ды інш.[5]

Шлях сабраных матэрыялаў да апублікавання быў доўгім і складаным. Па заканчэнні перапісу яны не адразу траплялі ў Галоўную перапісную камісію. Іх звесткі неаднаразова правяраліся. Пасля скасавання Галоўнай перапіснoй камісіі ў чэрвені 1897 г. уся далейшая распрацоўка перапіснога матэрыялу перадавалася аддзелу перапісу Цэнтральнага статыстычнага камітэту. Пасля пэўнай праверкі звесткі перапісных бланкаў кадзіравалі і пераносілі на перфакарты, якія выкарыстоўвалі пры падліку на электрычных лічыльных машынах. Дадзеныя перапісу былі апублікаваны ў выглядзе агульнаімперскай зводкі, а таксама ў 89 выпусках па асобных губернях і абласцях. Матэрыялы перапісу 1897 г., што датычаць тэрыторыі Беларусі, апублікаваныя ў выпусках па пяці губернях: Віцебскай, Магілёўскай, Менскай, Гарадзенскай, Віленскай. Гэтыя выданні складаюцца з тэкставага агляду лічбавых дадзеных і вялікай колькасці статыстычных табліц.

3 Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я г. 19 – пачатак 20 ст.). Менск, 1997.

4 Коляго О.В., Рудикова Л.В. Занятость населения Гродно по данным Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. арт. Гародня, 2007. С. 88 – 95.

5 Ходзін С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): Вучэб. дапам. Менск., 1999. С.96.

Разгледзім асноўныя характарыстыкі насельніцтва Гародні, скарыстаўшы дадзеныя табліц VI, VII, IX, XI, XIII, XIV, XV, XVI, XXI, XXIV выдання матэрыялаў Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі па Гарадзенскай губ.[6]

Выбраныя для аналізу статыстычныя звесткі былі апрацаваныя пры дапамозе *Microsoft Excel* і прадстаўленыя ў прыведзеных ніжэй 17 табліцах і 3 дыяграмах.

Але найперш некалькі заўвагаў. Нягледзячы на тое, што па сваёй дасканаласці і колькасці ахопленых пытанняў перапіс 1897 г. дасюль не мае аналагаў і застаецца лепшым за ўсю гісторыю перапісам насельніцтва Беларусі[7], методыка, па якой дадзеныя перапісу былі згрупаваны ў афіцыйных публікацыях, не дазваляе дакладна ўявіць стан тагачаснага грамадства. Апублікаваныя матэрыялы перапісу даюць магчымасць толькі разважаць аб ім, ды і тое з пэўнымі дапушчэннямі. Перапіс 1897 г. утрымлівае шэраг недахопаў, пра якія мы скажам ніжэй і якія, на жаль, зніжаюць верагоднасць стварэння аб'ектыўнай і поўнай карціны стану гарадской супольнасці Гародні канца XIX ст.

Звесткі аб размеркаванні насельніцтва Гародні **па роднай мове** прадстаўленыя ў табліцы 1.

Табліца 1

**Размеркаванне насельніцтва Гародні ў 1897 г. па роднай мове***

| Родная мова | муж | жан | усяго | % |
|---|---|---|---|---|
| габрэйская | 10820 | 11564 | 22384 | 47,70775 |
| руская | 7828 | 2687 | 10515 | 22,41096 |
| польская | 3169 | 3645 | 6814 | 14,5229 |
| беларуская | 3600 | 1834 | 5434 | 11,58166 |
| татарская | 795 | 9 | 804 | 1,713592 |
| нямецкая | 177 | 198 | 375 | 0,79925 |
| чувашская | 151 | | 151 | 0,321831 |
| ерамiская | 128 | | 128 | 0,272811 |
| украінская | 66 | 13 | 79 | 0,168375 |
| жмудская | 36 | 2 | 38 | 0,080991 |
| цыганская | 31 | 7 | 38 | 0,080991 |
| латышская | 24 | 5 | 29 | 0,061809 |
| французская | 5 | 23 | 28 | 0,059677 |

6 Первая всеобщая перепись населения Росийской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния.

7 Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). Мінск., 2005. С.215.

Працяг табліцы 1. Пачатак на с. 104

| Родная мова | муж | жан | усяго | % |
|---|---|---|---|---|
| літоўская | 16 | 11 | 27 | 0,057546 |
| Не указалі мову | 9 | 5 | 14 | 0,029839 |
| вацяцкая | 13 | | 13 | 0,027707 |
| армянская | | 10 | 10 | 0,021313 |
| чэшская | 6 | | 6 | 0,012788 |
| грэчаская | | 6 | 6 | 0,012788 |
| картвельская | 2 | 4 | 6 | 0,012788 |
| эстонская | 5 | | 5 | 0,010657 |
| фінская | 1 | 3 | 4 | 0,008525 |
| балгарская | | 3 | 3 | 0,006394 |
| мардоўская | 3 | | 3 | 0,006394 |
| лапарская | 2 | | 2 | 0,004263 |
| італьянская | 1 | | 1 | 0,002131 |
| англійская | | 1 | 1 | 0,002131 |
| турэцкая | 1 | | 1 | 0,002131 |
| Усяго | 26889 | 20030 | 46919 | 100 |

* Складзена і падлічана па дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния. С. 102 – 105.

46919 жыхароў нашага горада размаўлялі на 27 мовах, а дакладней – такую колькасць моў лічылі роднымі. Парадак пераліку гэтых моваў у табліцы – паводле змяншэння. Такім чынам, самай шматлікай “аднамоўнай” групай насельніцтва Гародні з’яўляліся габрэі (22384 чал. ці 47,7 %). На другім месцы былі тыя, хто назваў роднай мовай рускую (10515 чал. ці 22,4 %), на трэцім – польскую (6814 чал. ці 14,5 %), на чацвёртым – беларускую (5434 чал. ці 11,6 %). 804 жыхары Гародні лічылі роднай мовай татарскую (1,7 % насельніцтва). Удзельная вага іншых груп разам узятых складала 2,06 %. Гэтыя дадзеныя ілюструе дыяграма 1.




Дыяграма 1

**Насельніцтва Гародні ў 1897 г. паводле роднай мовы**

Шмат дыскусіяў і спрэчак выклікае праблема крытэрыяў выяўлення прадстаўнікоў этнічных супольнасцяў. Крытэрый роднай мовы, скарыстаны ў перапісе 1897 г.,

далёка не заўсёды выконваў ролю фактару, які б ідэнтыфікаваў прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці. Акрамя таго многія даследчыкі выказваюць сумненні ў верагоднасці дадзеных перапісу 1897 г., у якіх адлюстравалася моўная сітуацыя на беларускіх і літоўскіх землях. Перапіс адбываўся ва ўмовах актывізацыі палітыкі "располячения", і палітычная сітуацыя не магла не паўплываць на ход і вынікі гэтага перапісу. Трэба таксама ўлічваць і той факт, што перапіс ахопліваў вайсковыя гарнізоны, а гэта значыць, што нацыянальная стракатасць размешчанага на беларускіх землях расійскага войска дэфармавала сапраўдную карціну этнічнай структуры мясцовага насельніцтва. Устанаўленню дакладнай колькасці прадстаўнікоў розных этнасаў і вызначэнню нацыянальнай структуры насельніцтва на рубяжы XIX – XX ст. перашкаджае таксама незавершанасць працэсу нацыянальнага размежавання насельніцтва.

Асабліва шмат эмоцыяў узнікае пры вызначэнні колькасці палякаў у Беларуска-літоўскім краі, у т.л. і ў Гародні. Нагадаем, што ў 1897 г. 6814 чалавек ці 14,5 % жыхароў гораду назвалі роднай мовай польскую. Як ужо адзначалася, не заўсёды нацыянальная ідэнтычнасць непарыўна звязана з той мовай, якую чалавек лічыць сваёй роднай. Гэтае сцвярджэнне асабліва актуальнае ў дачыненні да шматэтнічнага горада і, у прыватнасці, да польскай мовы. Трэба ўлічваць, што ў XVI – XVIII ст. польская мова выконвала ролю сродка, які яднаў этнічную стракатасць ВКЛ. Культурная паланізацыя была спецыфічнай рысай, якая характарызавала адзінства шляхецкага "палітычнага народа", менталітэт якога быў акцэнтаваны не этнічна, а этатычна.

Польская мова, на якой складалася афіцыйная дакументацыя, акрэсліваецца як "паўночнакрэсавы" дыялект. Зоф'я Курзова вызначыла яго сутнасць наступным чынам: "Паўночнакрэсавы дыялект у сваім генэзісе з'яўляецца культурным дыялектам, таму што ён сфарміраваўся і выкарыстоўваўся вышэйшымі і адукаванымі грамадскімі слаямі. Ён паўстаў у выніку культурнай і моўнай адаптацыі польскай шляхты да беларускай моўнай асновы і беларускамоўнай шляхты". "Паўночнакрэсавы" дыялект меў рысы беларускага субстрату, якіх, паводле падлікаў З.Курзовай, было 37,5 % у галіне фанетыкі і 25 % у галіне марфалогіі[8]. Уплывы беларускай мовы на "паўночнакрэсавы" дыялект гарадзенскіх гарадскіх актаў паказаў Юры Гардзееў[9].

Супраць ужывання моўнага крытэрыя пры вызначэнні нацыянальнасці насельніцтва на беларуска-польскім паўзмежжы на рубяжы XIX – XX ст. выступаюць многія польскія гісторыкі і дэмографы, у прыватнасці, Пётр Эбэрхардт, які ўпэўнены, што толькі веравызнанне можа выступаць у ролі такога крытэрыя[10]. Аспрэчваючы такую пазіцыю, Алесь Смалянчук адзначыў: "Безумоўна, на польска-беларускім

---

[8] Цыт. па: Гардзееў Ю. Да праблемы этнаканфесійнай структуры старажытнага Гродна // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа: Зб. навук. прац. Гродна, 2003. С. 15

[9] Тамсама. С. 16.

[10] Эберхардт П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі. 1897 – 1989. Менск, 1997. С. 31.

этнічным паўзмежжы існаваў моцны стэрэатып атаясамлівання польскасці з каталіцызмам. <…> Але паўтарэнне састарэлых стэрэатыпаў вядзе толькі да таго, што беларусы, гістарычна падзеленыя на каталікоў і праваслаўных, проста знікаюць як самабытная нацыя. Апроч таго атаясамліванне каталіцызма з польскасцю не дазваляе зразумець многія важныя падзеі беларускай гісторыі. Недапушчальна ігнараванне (як і абсалютызацыя!) такой прыкметы нацыянальнасці, як родная мова. Яна заўсёды была важнай складовай нацыянальнай свядомасці"[11].

Не толькі крытэрыі вызначэння колькасці палякаў, але і пытанне паходжання польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі да сённяшняга дня выклікае дыскусіі. Праблему радаводу мясцовых палякаў у гістарычнай навуцы Беларусі, Літвы і Польшчы падрабязна прааналізаваў А.Смалянчук, які паказаў дамінаванне ў польскай, літоўскай і беларускай гістарыяграфіі тэзіса аб тым, што ў сваёй абсалютнай большасці палякі з'яўляліся нашчадкамі аўтахтонаў беларускіх і літоўскіх земляў, а галоўным фактарам фармавання польскай грамадскасці Беларуска-Літоўскага краю апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. з'яўлялася паланізацыя, а дакладней самапаланізацыя[12]. Працэс масавай дэфармацыі этнічнай свядомасці беларускага насельніцтва, які выразіўся ў замацаванні саманазвы "паляк", выдатна прасочаны Андрэем Вашкевічам і Дзянісам Нарэлем на прыкладзе Сапоцкінскага краю[13].

У лік тых, хто падчас перапісу назваў рускую мову ў якасці роднай, трапіла пэўная частка этнічных беларусаў, якія ва ўмовах мэтанакіраванай палітыкі русіфікацыі перанялі рускую мову. Не выключана, што ў групу рускамоўных гарадзенцаў трапіла і частка праваслаўных беларусаў. Паказальным з'яўляецца той факт, што ў 1903 г. агульны дэпартамент Міністэрства ўнутраных справаў тлумачыў віленскаму губернатару, што рускія – гэта "належныя ад нараджэння да рускіх падданых і праваслаўных ды нежанатыя на каталічках"[14]. Трэба ўлічваць і той факт, што на момант перапісу тут былі размешчаны значныя вайсковыя кантынгенты. Абсалютная большасць жаўнераў і афіцэраў былі рускімі, выхадцамі з цэнтральных расейскіх губерняў.

Зразумела, што лічба 5 434 чалавек (11,6 % сярод жыхароў Гародні), якія назвалі роднай мовай беларускую, не поўнасцю адлюстроўвае сапраўдную прысутнасць у горадзе прадстаўнікоў беларускага этнасу, бо частка іх з'яўлялася польскамоўнымі (пераважна землеўладальнікі), а частка – рускамоўнымі (чыноўнікі, святары).

Даволі дакладна моўны крытэрый ідэнтыфікуе габрэяў, якіх у Гародні ў 1897 г. аказалася 22 384 чалавек, ці 47,7 %. Не так адназначна і проста вызначаецца колькасць татараў, бо "беларускія татары складаюць асаблівую супольнасць,

---

11 Смалянчук А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. СПб., 2004. С. 44 – 45.

12 Тамсама. С. 17 – 36.

13 Вашкевіч А., Нарэль Д. Паміж Ласоснай і Чорнай Ганчай: Гісторыя каталіцкіх парафій у паўднёва-усходняй частцы Аўгустоўскай пушчы. Менск, 2006; Вашкевіч А. Грэка-каталіцкае насельніцтва Аўгустоўшчыны ў канцы XVIII – пачатку XX ст. (канфесійныя змены і фарміраванне этнічнай свядомасці) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. T. 24. Białystok, 2005. S. 39 – 61.

14 Цыт. па: Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я г. 19 – пачатак 20 ст.). С. 169.

Дыяграма 2

**Размеркаванне насельніцтва Гародні ў 1897 г. паводле веравызнання**




адной з характэрных рыс якой з'яўляецца славянамоўнасць. Сваю родную мову татары страцілі вельмі рана. Звесткі пра гэта знаходзім у крыніцах XVI – XVII ст."[15] Такім чынам, сапраўдная колькасць прадстаўнікоў татарскага этнасу тэарытычна можа быць большай за колькасць назваўшых роднай мовай татарскую (804 чал. ці 1,7 %).

А.Дабраньскі слушна звярнуў увагу на розныя паказчыкі размеркавання мужчынскага і жаночага насельніцтва паводле роднай мовы. Сярод мужчынаў (разам з войскам) 40,2 % назвалі роднай габрэйскую мову, 29,1 % – рускую, 13,4 % – беларускую, 11,8 % – польскую, 3 % – татарскую, 0,7 % – нямецкую, 0,6 % – чувашскую. Сярод жанчынаў (без вайскоўцаў, але разам з іх сваякамі) гэтыя прапорцыі больш праўдзівыя: габрэйская мова – 57,7 % , польская – 18,2 %, руская – 13,4 %, беларуская – 9,2 %, нямецкая – 1 %. А.Дабраньскі выключыў узроставую групу 20 – 29 гадоў (тым самым вайскоўцаў). У выніку такіх падлікаў узрасла ўдзельная вага габрэяў – да 62 – 63 %, польскамоўных гарадзенцаў – да 16 – 18 %; а беларускамоўных знізілася да 5 – 7 %[16]. Рускамоўныя гарадзенцы, згодна з нашымі падлікамі па такому ж прынцыпу, складалі каля 10 – 12 %.

Табліца 2

**Размеркаванне насельніцтва Гародні ў 1897 г. па веравызнанню***

| Веравызнанне | муж | жан | усяго | % |
|---|---|---|---|---|
| Іўдзеі | 10 966 | 11 718 | 22 684 | 48,35333 |
| Праваслаўныя | 10 564 | 3 522 | 14 086 | 30,02579 |
| Каталікі | 4 225 | 4 470 | 8 695 | 18,53431 |
| Мусульмане | 864 | 72 | 936 | 1,995183 |
| Лютэране | 231 | 226 | 457 | 0,974144 |
| Стараабрадцы | 30 | 15 | 45 | 0,095922 |
| Рэфарматы | 1 | 4 | 5 | 0,010658 |
| Англікане | 3 | | 3 | 0,006395 |
| Армяна-грыгарыяне | 2 | | 2 | 0,004263 |
| Усяго | 26 886 | 20 027 | 46 913 | 100 |

* Складзена і падлічана па дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния. С. 106 – 117.

[15] Канапацкі І.Б., Смолік А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Менск, 2000. С. 97.

[16] Dobroński A. Mieszkańcy Grodna w 1897 roku... S. 181 – 183.

**Канфесійная структура** Гародні паводле перапісу насельніцтва 1897 г. адлюстравана ў табліцы 2 і ў адпаведнай дыяграме.

Без уліку ўзроставай групы 20 – 29 гадоў (толькі так магчыма выключыць вайскоўцаў) удзельная вага праваслаўных зніжаецца да 18,5 %, а каталікоў узрастае да 20,4 %.

У далейшым аналізе мы засяродзім увагу на 4-х асноўных групах насельніцтва Гародні – назавём іх умоўна (з улікам адноснасці лінгвістычнага крытэрыя вызначэння нацыянальнай прыналежнасці) габрэямі, "рускімі", "палякамі", "беларусамі". Толькі адносна габрэяў можна не ўжываць двухкоссе.

Суадносіны паміж этнічнымі (паводле мовы) і канфесійнымі групамі насельніцтва горада адлюстроўваюць дадзеныя табліцы 3.

Табліца 3

**Размеркаванне насельніцтва Гародні па роднай мове (габрэйская, руская, польская, беларуская) і веравызнанню***

| | Габрэйская мова | | Руская мова | | Польская мова | | Беларуская мова | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | чалавек | % | чалавек | % | чалавек | % | чалавек | % |
| Праваслаўныя | | | 9793 | 96,3 | 83 | 1,2 | 3761 | 69,2 |
| Каталікі | | | 269 | 2,6 | 6695 | 98,5 | 1595 | 29,4 |
| Стараабрадцы | | | 33 | 0,3 | | | 12 | 0,2 |
| Лютэране | | | 72 | 0,7 | 16 | 0,2 | 6 | 0,1 |
| Рэфарматы | | | | | | | 2 | 0,04 |
| Англікане | | | | | | | 3 | 0,06 |
| Іўдзеі | 22380 | 100 | | | | | 39 | 0,7 |
| Мусульмане | | | | | | | 16 | 0,3 |
| Усяго | 22380 | 100 | 10167 | 100 | 6794 | 100 | 5434 | 100 |

* Складзена і падлічана па дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния. С. 106 – 117.

Габрэі, рускія, палякі мелі, па сутнасці, нацыянальныя цэрквы. Беларусы падобнага канфесійнага адзінства не мелі. 100 % габрэяў Гародні спавядалі іўдаізм, 96,3 % "рускіх" былі праваслаўнымі, 98,5 % "палякаў" з'яўляліся каталікамі. Сярод "беларусаў" Гародні знаходзім прадстаўнікоў васьмі веравызнанняў, але найбольш было праваслаўных (69,2 %) і каталікоў (29,4%). Рэлігійная раз'яднанасць беларусаў замаруджвала працэс фармавання нацыі.

Паводле падлікаў А.Даброньскага, 66,9% праваслаўных гарадзенцаў назвалі роднай мовай рускую, 30,2% – беларускую, 1,4% – польскую, 0,4% – украінскую. 77% каталікоў Гародні падалі ў якасці роднай мовы польскую, сярод жанчынаў-каталічак гэты паказчык большы – 80%. Для 18,4% жанчынаў каталіцкага веравызнання роднай мовай з'яўлялася беларуская. А.Даброньскі

Дыяграма 3

**Размеркаванне насельніцтва Гародні ў 1897 г. па саслоўям**




звярнуў таксама ўвагу на наступныя дамінацыі: 98,7 % іўдзеяў падалі габрэйскую мову ў якасці роднай; 97,7 % праваслаўных карысталіся мовамі: рускай, беларускай, украінскай; 77 % каталікоў – польскай; 71 % лютэранаў – нямецкай; 85,3 % мусульманаў належалі да турэцка-татарскай моўнай групы[17].

Табліца 4

**Размеркаванне насельніцтва Гародні ў 1897 г. па саслоўям***

| Саслоўе | муж | жан | усяго | % |
|---|---|---|---|---|
| мяшчане | 13231 | 14395 | 27626 | 59,13226 |
| сяляне | 10866 | 2744 | 13610 | 29,13162 |
| дваране патомныя | 1161 | 1135 | 2296 | 4,914489 |
| дваране асабістыя, чыноўнікі не з дваранаў | 973 | 923 | 1896 | 4,058306 |
| купцы | 267 | 258 | 525 | 1,12374 |
| ганаровыя грамадзяне | 150 | 124 | 274 | 0,586485 |
| духавенства хрысц. | 81 | 80 | 161 | 0,344614 |
| замежныя паданыя | 61 | 83 | 144 | 0,308226 |
| не указалі саслоўя | 50 | 43 | 93 | 0,199062 |
| не належаць да гэтых саслоўяў | 48 | 44 | 92 | 0,196922 |
| вайсковыя казакі | 1 | | 1 | 0,00214 |
| ураджэнцы Фінляндыі | | 1 | 1 | 0,00214 |
| Усяго | 26889 | 19830 | 46719 | 100 |

* Складзена і падлічана па дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния. С. 290 – 291.

З развіццём рынкавых адносінаў выразныя межы, што дзялілі саслоўі паступова знікалі. Аднак саслоўнасць заставалася істотным элементам грамадскага жыцця парэформеннай Расеі. Недахоп апублікаваных матэрыялаў перапісу

[17] Тамсама.

1897 г. аб саслоўнай структуры насельніцтва заключаецца ў тым, што вайскоўцы не вылучаліся асобна, а ўлічваліся сярод сялянаў, мяшчанаў і іншых саслоўяў.

Такім чынам, самымі шматлікімі былі мяшчане (59,1 %) і сяляне (29,1%). Дваране патомныя разам з дваранамі асабістымі і чыноўнікамі не з дваранаў складалі каля 9 % насельніцтва. Удзельная вага купецтва – 1,1%. Усе іншыя групы былі маналікімі, складалі менш за 1 % ад усяго насельніцтва горада.

Дадзеныя табліцы 5 дазваляюць прааналізаваць асаблівасці саслоўнага складу асноўных этнічных (паводле роднай мовы) групаў насельніцтва Гародні.

Табліца 5

**Размеркаванне насельніцтва Гародні па роднай мове (габрэйская, руская, польская, беларуская) і саслоўям***

| Родная мова | дваране патомныя і іх сем'і | | | | дваране асабістыя, чыноўнікі не з дваранаў і іх сем'і | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж | жан | усяго | % | муж | жан | усяго | % |
| габрэйская | | | | | 2 | 4 | 6 | 0,03 |
| руская | 491 | 468 | 959 | 9,1 | 580 | 532 | 1112 | 10,6 |
| польская | 438 | 586 | 1024 | 15 | 155 | 226 | 381 | 5,6 |
| беларуская | 200 | 235 | 435 | 8 | 198 | 126 | 324 | 5,7 |

| Родная мова | духавенства хрысціянскае і іх сем'і | | | | купцы і іх сем'і | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж | жан | усяго | % | муж | жан | усяго | % |
| габрэйская | | | | | 202 | 197 | 399 | 1,8 |
| руская | 50 | 45 | 95 | 0,9 | 48 | 39 | 87 | 0,8 |
| польская | 10 | 7 | 17 | 0,2 | 7 | 4 | 11 | 0,2 |
| беларуская | 19 | 26 | 45 | 0,8 | 5 | 13 | 18 | 0,3 |

| Родная мова | Мяшчане | | | | сяляне | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж | жан | усяго | % | муж | жан | усяго | % |
| габрэйская | 10537 | 11298 | 21835 | 97,5 | 37 | 24 | 61 | 0,3 |
| руская | 863 | 753 | 1616 | 15,4 | 5666 | 770 | 6436 | 61,2 |
| польская | 1167 | 1695 | 2862 | 42 | 1363 | 1085 | 2448 | 35,9 |
| беларуская | 546 | 547 | 1093 | 20,1 | 2587 | 826 | 3413 | 62,8 |

| Родная мова | вайсковыя казакі | | | | ганаровыя грамадзяне і іх сем'і | | | | асобы, якія не належаць да гэтых саслоўяў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж | жан | усяго | % | муж | жан | усяго | % | усяго | % |
| габрэйская | | | | | 24 | 29 | 53 | 0,2 | 15 | 0,1 |
| руская | 1 | | 1 | 0,01 | 95 | 60 | 155 | 1,5 | 22 | 0,2 |
| польская | | | | | 4 | 10 | 14 | 0,2 | 20 | 0,3 |

| беларуская | | | | | 21 | 22 | 43 | 0,8 | 32 | 0,4 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

Працяг табліцы 5 са стар. 111.

| Родная мова | не указалі саслоўяў | | | | замежныя паданыя | | | | усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж | жан | усяго | % | муж | жан | усяго | % | |
| габрэйская | 10 | 5 | 15 | 0,1 | | | | | 22384 |
| руская | 20 | 8 | 28 | 0,3 | | 4 | 4 | 0,04 | 10515 |
| польская | 7 | 8 | 15 | 0,2 | 9 | 13 | 22 | 0,3 | 6814 |
| беларуская | 7 | 18 | 25 | 0,5 | 2 | 3 | 5 | 0,1 | 5433 |

* Складзена і падлічана па дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Т. XI. Гродненская губерния. С. 290 – 291.

Як бачым, сярод мяшчанскага саслоўя габрэі мелі абсалютную большасць. Пераважалі габрэі і сярод гарадзенскіх купцоў. Адначасна 97,5 % габрэяў былі мяшчанамі.

Большасць “рускіх” належалі да сялянаў – 61,2 %; мяшчанамі былі 15,4 %; асабістымі дваранамі і чыноўнікамі не з дваранаў – 10,6 %; патомнымі дваранамі – 9,1 %; ганаровымі грамадзянамі – 1,5 %; духавенствам – 0,9%; купецтвам – 0,8 %. “Рускія” былі лідэрамі ў групах асабістых дваранаў і чыноўнікаў не з дваранаў, ганаровых грамадзянаў, духавенства, сялянства. Колькасць рускамоўных сярод сялянаў завышаная за кошт вайскоўцаў, пра што відавочна сведчыць значная перавага мужчынаў (5666) над жанчынамі (770). Толькі 28 % жанчынаў сялянскага саслоўя назвалі роднай рускую мову.

“Палякі” размяркоўваліся па саслоўям наступным чынам: 42 % – мяшчане; 35,9% – сяляне; 15% – патомныя дваране; 5,6% – асабістыя дваране і чыноўнікі не з дваранаў; 0,7% – купцы; 0,3% – замежныя паданыя; 0,2% – ганаровыя грамадзяне; 0,2% – духавенства. “Палякі” былі лідэрамі ў групах патомнага дваранства і замежных паданых.

62,8% “беларусаў” Гародні былі сялянамі; 20,1% – мяшчанамі; 8% – патомнымі дваранамі; 6% – асабістымі дваранамі, чыноўнікамі не з дваранаў; 0,8% – ганаровымі грамадзянамі; 0,8% – духавенствам; 0,3% – купецтвам. Перавага сярод беларускамоўных гарадзенцаў прадстаўнікоў сялянскага саслоўя ва многім тлумачыцца ўлікам вайскоўцаў. Толькі 30 % сялянак Гародні назвалі роднай мовай беларускаю.

Этнічны (паводле роднай мовы) склад саслоўных групаў насельніцтва Гародні ў 1897 г. адлюстраваны ў табліцы 6.

У групе патомных дваранаў дамінавалі “палякі”. Сярод дваранаў асабістых і чыноўнікаў не з дваранаў, а таксама духавенства, сялянаў, ганаровых грамадзянаў пераважалі “рускія”. У групах купцоў і мяшчанаў найбольш было габрэяў. Трэба звярнуць увагу, што перавага “рускіх” сярод сялянаў тлумачыцца ўлікам вайскоўцаў.

Табліца 6

В 1828 г. в связи с тем, что император Николай I поручил профессору Арсеньеву составить курс экономической статистики и географии для преподавания наследнику престола, Министерство внутренних дел собирало сведения по губерниям. В представленных из Гродненской губернии данных отмечалось: "По Неману в Кенигсберг через Гродно идут суда витины или полувитины длиной от 25 до 30 и шириной от 3 до 4 саженей и меньшие: шкуты, дубасы, лыжвы, галяры, нагруженные товарным деревом, дубовой клепкой, салом, поташем, отправляемые помещиками Гродненской, Минской и Волынской губерний"[24]. Почти такой же перечень неманских судов приводит в своем статистическом описании Литовско-Гродненской губернии И.Ляхницкий[25].

С появлением Августовской водной системы в гродненском речном порту все чаще стали появляться берлины. Это был наиболее совершенный тип непаровых судов на реках Беларуси. Берлины, использовавшиеся на Августовском водном пути и Немане, в длину обычно имели 140-144 фута, в ширину – 16-17 футов, высоту борта от 4,5 до 5 футов и 2,75 фута осадки при полном грузе[26]. Стандартные размеры берлины подбирались с учетом прохождения шлюзовых камер Августовской системы. Все ее шлюзы имели длину 22 2/7 сажени и ширину 2 6/7 сажени[27].

Во второй половине XIX в. появились и непаровые суда с железным корпусом – габары. Габары служили до 30 лет, деревянные суда выдерживали не более 10 навигаций. Средняя скорость непаровых судов по Неману составляла 40 верст в сутки[28].

Конструктивные особенности непаровых судов на Немане в основном совпадали с типами судов на других белорусских реках. Однако иногда они имели

[24] НИАБ в Гродно. Ф. 1, оп. 3, ед.х. 422. Л. 139.

[25] Lachnicki I.E. Statystyka gubernii Litewsko-Grodzenskiej. Wilno, 1817. S. 70-71.

[26] Крафт. Описание Августовской системы // Журнал путей сообщения. 1838. Т. 2. Кн. 1. С. 45.

[27] Днепровско-Бугская, Огинская и Августовская системы. Отчет комиссии по исследованию западной группы искусственных водных систем. СПб., 1893. С. 219.

[28] Сведения о лесах Гродненской губернии собранные Губернским статистическим комитетом. 1882 г. Гродно, 1882. С. 19.

и свои региональные черты, отмеченные в литературе[29]. Так, только в Неманском водном бассейне получили распространение витины и полувитины. Самые крупные витины грузоподъемностью до 15000 пудов строились на Немане в деревне Колядино управлением имений графа Хрептовича-Бутенева для своих хлебных грузов, которые отправлялись за границу весной по высокой воде[30].

На каждом непаровом судне был лоцман и рабочие-матросы. Для витины нанималось 12 рабочих, для барки – 10, для берлины – 8-15 и для гарбары 4 рабочих. Для каждого плота требовалось в зависимости от его величины и скорости течения от 1 до 5 рабочих-плотогонов[31].

Точное время появления паровых судов на Немане пока нам установить не удалось. Если время и обстоятельства постройки и испытания первого в Беларуси парохода на реке Сож и в Днепровском бассейне, нами зафиксированы с документальной точностью – это был 1824 г.[32], то первые страницы истории неманского пароходства еще не написаны. Зато весьма полно можно представить его состояние накануне Первой мировой войны. Имеющиеся в нашем распоряжении списки паровых судов, мобилизованных военным ведомством для оказания помощи действующей армии, позволяют узнать не только их название и назначение, но и год и место постройки, мощность парового двигателя, фамилии владельцев[33]. К сожалению, отсутствует указание на порт приписки, но с большой долей уверенности можно предположить, что все они не миновали гродненский причал.

Сегодняшнее состояние гродненского речного порта не внушает оптимизма. Такая же картина наблюдается в целом на водном транспорте и водных путях Беларуси. Определенные надежды на улучшение положения и возрождение гродненской пристани внушала реабилитация белорусской части Августовской водной системы. Однако работы по ее освоению и эксплуатации ведутся крайне медленно. Новой проблемой может стать запланированное сооружение ГЭС на Немане. Пока не ясно, будут ли в комплексе с ней сооружены судоходные шлюзы, или Неманский водный путь в итоге превратится в Неманский тупик.

---

[29] Litvin J. Die Memel, Wittintinen und die Binnenschiffahrt nach Konigsberg // Deutsches Schiffahrtsarchiv. 2000. N. 23. S. 373-392.

[30] Холшевников Н.В. Неман. Описание гидрографическое и навигационно-статистическое. Кострома, 1902. С. 14.

[31] Диков П. Указ. соч. С. 19.

[32] Кіштымаў А. Гомельскі маёнтак графа М.П.Румянцава: вопыт гаспадарання // Беларускі гістарычны часопіс. 1995, № 1. С. 23.

[33] См. Приложение 2.

*Приложение 1.*

**Основные типы непаровых судов на реках Гродненской губернии.**

| Тип непарового судна | Длина (сажени) | Ширина (аршины | Высота борта (аршины) | Грузоподъемность (пуды) | Стоимость постройки (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| Витина | 25 | 11 | 2,5 | 14000 | 1200 |
| Барка | 19 | 8 | 1,5 | 5000 | 550 |
| Берлина | 20 | 7 | 2 | 4000 | 1200 |
| Габара | 14 | 4,5 | 1,5 | 2500 | 1500 |

1 сажень равна 2,134 м; 1 аршин равен 71,12 см.

Источник: Диков П. Сведения о лесах Гродненской губернии собранные Губернским статистическим комитетом. 1882 г. Гродно, 1882. – С. 19.

*Приложение 2.*

**Список паровых судов бассейна верхнего Немана с притоками, мобилизованных в действующую армию в 1914-1915 гг.**

| Название | Тип | Год и место постройки | Мощность двигателя | Владельцы |
|---|---|---|---|---|
| Бирута | Буксирно-пассажирский пароход | 1880, Германия, Эльбинг, завод Шихау | 130 л. с. | Наследники Камбера И.Я. |
| Боярыня | Буксирно-пассажирский пароход | | | |
| Вильна | Торгово-пассажирский пароход | | | |
| Гродна* (бывший Секунда) | Пассажирский пароход | 1893, Пинск, завод Е.П. О'Бриен-де-Ласси | 16 л. с. | Наследники Ашкенази А.Б. (до 1914 г. Янович К.И., Почебут И.М.) |
| Девайтис | Торгово-пассажирский пароход | 1887, имение Горны, Гродненской губ., завод О'Бриен-де-Ласси | 88 л. с. | Табачник М., Рак Я.Ф. |
| Звезда (бывший Курьер и Работник) | Пассажирский пароход | 1884, Киев, завод Гинтовского | 15 л. с. | Янович К.И. |

Працяг. Пачатак табліцы на с.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Кейстут | Буксирно-торгово-пассажирский пароход | 1900, Германия, завод Фехтера | 148 л. с. | Наследники Камбера И.Я. |
| Курьер | Буксирно-торгово-пассажирский пароход | 1882, Германия, Эльбинг, завод Шихау | 120 л. с. | Наследники Фрумкина В. |
| Надежда* | Буксирно-торгово-пассажирский пароход | 1900/1914, Германия, Кёнигсберг, завод Унион-Гиссерей | 94/105 л. с. | Чернявский Ш.Н. (до 1914 г. Табачник М., Рак Я.Ф.) |
| Нерис | Торгово-пассажирский пароход | | | |
| Ольга | Торгово-пассажирский пароход | | | |
| Приятель* | Торгово-пассажирский пароход | 1878, Германия, Эльбинг, завод Шихау | 85 л. с. | Фельдман С.В. |
| Русалка* | Торгово-пассажирский пароход | 1895, Пинск, завод Е.П. О'Бриен-де-Ласси | 72 л. с. | Ашкенази О.О., Г.А., Е.А. и Чернявский Ш.Н. |

Суда, мобилизованные Гродненской крепостью, обозначены звездочкой - *. Остальные были мобилизованы Северо-Западным и Западным фронтами.

*Алесь Смалянчук,*
*доктар гіст. навук (Гродна - Вільня)*

# Горадня на старонках "Нашай Нівы". 1906 – 1910 гг.

"Наша Ніва" была другой (пасля "Нашай Долі") легальнай беларускай газетай на пачатку XX ст., якая адыграла вялікую ролю ў нацыянальна-культурным Адраджэнні беларусаў. У адрозненні ад сваёй папярэдніцы, якая больш нагадвала рэвалюцыйную пракламацыю, "Наша Ніва" была традыцыйнай газетай, рэдакцыя якой бачыла сваю галоўную задачу ў тым, каб «служыць усему беларускаму скрыўджэнаму народу», называла сябе газетай «усіх беларусоў і ўсіх тых, хто ім спагадае» і абяцала, што будзе імкнуцца, каб «усе беларусы, што ня ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусы"[1].

Праблемы палітычнага жыцця і беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння былі прыярытэтнымі. Фактычна, першая згадка Горадні ў аналітычных матэрыялах "Нашай Нівы" была звязаная з выбарамі ў II Думу. Адразу пасля выбараў у Горадні "Наша Ніва" паведаміла пра адміністрацыйнае ўмяшальніцтва ў іх ход, што і прадвызначыла перамогу "правых". Газета распавяла пра абедню, якую праводзіў архірэй спецыяльна для сялянскіх дэпутатаў на губернскі выбарчы сход. Архірэй скончыў абедню чарнасоценнай прамовай у якой "лаяў жыдоў апошнімі словамі" і пераконваў, што памешчыкі – гэта лепшыя сябры мужыкоў. Пасля гэтага сялянскіх дэпутатаў размясцілі ў Народным доме пад аховай паліцыі, каб ізаляваць ад гарадскіх выбаршчыкаў (тых самых "жыдоў"), з якімі яны раней заключылі пагадненне. Пасля выбараў гарадскія выбаршчыкі падалі скаргу, якую падтрымалі некаторыя сялянскія дэпутаты. Яны прасілі адмяніць вынікі выбараў, заяўляючы, што былі "адурманеныя духоўнымі асобамі"[2].

На выбарах ў III Дзяржаўную думу, якія адбыліся ў кастрычніку 1907 г., таксама перамаглі чарнасоценныя кандыдаты. Паводле "Нашай Нівы", гэтая перамога была абумоўлена актыўнасцю Сафійскага праваслаўнага брацтва і пагадненнем паміж "ісцінно-рускімі" і "ісцінно-польскімі" чарнасоценцамі. Супрацьстаяў гэтаму саюзу ліберальна-дэмакратычны Прагрэсіўны блок, пазіцыю якога падзяляла таксама "Наша Ніва". Агітуючы за тое, каб сялянскія дэпутаты падтрымалі прагрэсістаў карэспандэнт "Нашай Нівы" (Nemo) пісаў,

---

[1] Наша Ніва. № 1 ад 10 лістапада 1906 г.

[2] Тамсама. № 2 ад 11 лютага 1907 г.; № 8 ад 24 лютага 1907 г.

што "мужыком патрэбна не грызня паміж рознымі верамі і нацыямі, а новыя свабодныя парадкі і землі"[3].

У студзені 1908 г. праблему стаўлення беларусаў да сваёй роднай мовы ўзняў ананімны настаўнік з Гарадзеншчыны ў лісце ў рэдакцыю:

"…Даўно ўжо мучыць мяне думка аб нашай роднай мові. Народ мае сваю мову. Гаворыць у ёй, не ўстыдаецца яе, а сын гэтаго народу, як выйдзе ў людзі ўжо гаворыць іначэй з гэтым самым народам, каторы яго выгадаваў, на зямліцы каторага ён вырас і сынам каторага ён лічыцца. Чаму гэтак у нас зрабілася, што ўжо так многа інтэлігенцыі выйшла з народу, і ўся яна выраклася сваёй роднай мовы?" Аўтар заўважыў, што пасля атрымання адукацыі для інтэлігенцыі ўжо пакута размаўляць у роднай мове. Ліст канчаўся праклёнам: "Каб таму было цяжка дыхаць, хто гэта зрабіў!"[4]

Уласна беларускае культурнае жыццё ў Горадні актывізавалася пазней. У сакавіку 1910 г. нехта "Паўлюк" (?) (Павел Аляксюк?) паведаміў пра беларускую вечарыну, якая, па яго словах, "вельмі добра ўдалася". Гэтае паведамленне датычыла першай вечарыны, арганізаванай Гуртком беларускай моладзі, да якога належала Людвіка Сівіцкая, больш вядомая як "Зоська Верас". "Паўлюк" заўважыў, што Горадня – горад беларускі, але "дагэтуль аб беларусах нешта мала было чутно, і толькі цяпер пачалі яны тут будзіцца. С пачатку, праўда, ішло туга, але пасьля што раз болей і болей пачалі цікавіцца беларускім адраджэньнем, і вось цяпер ужо маем нямала беларусоў, каторые душой і сэрцэм прыналежаць да сваёй бацькоўшчыны… Найбольш нас цешыць і тое, што і нашы браты – славяне – расейцы і палякі – спагадаюць нам тутака, а найболей то цешацца літвіны, што беларускі народ, каторага сілы ешчэ не выкарыстаны, а нават і не пачынаны, - прачнуўся"[5].

Пазней праблему беларускай культуры неаднаразова ўздымаў вядомы дзеяч беларускага руху гарадзенец Павел Аляксюк. Праўда, ягоныя "беларускія замалёўкі" датычылі больш ваколіцаў Горадні. Вось фрагмент мінірэпартажу з Эйсмантаў: "Шляхта тутэйшай аколіцы, відаць, забылася ўжо сваёй прадзядоўскай мовы; а мо і ня ведае гэты цёмны народ, што даўней іх бацькі і дзяды ўжывалі толькі родную беларускую мову… Не забыліся за тое тутэйшыя людзі іншых старасвецкіх звычаёў: у аколіцы, хоць яна і не вялікая, ёсць ажно тры карчмы і як надойдзе свята, шляхта наша цягне туды, як жураўлі ўвосень, і там за кварту гарэлкі можна купіць чалавека, як кажуць, з патрахамі… Ня дзіва, што тут беднасьць расселася як у сваёй хаці, бо а прасьвеці столькі ведаюць, колькі а жалезным ваўку"[6].

---

[3] Тамсама. № 30 ад 28 верасня 1907 г.

[4] Тамсама. № 1 ад 4 студзеня 1908 г.

[5] Тамсама. № 13 ад 25 сакавіка 1910 г.

[6] Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.

Цалкам іншую карціну ён назіраў у м.Сідра: “Ці то каталік, ці праваслаўны – кожны з іх прызнае сябе цяпер толькі беларусам, і кожны з іх горнецца да беларускай кніжкі, да роднай сваёй мовы. Вельмі любяць яны чытаць ““Нашу Ніву”, асабліва казкі і розныя апавяданьня… Кепска толькі, што школ ешчэ ў нас нехват для ўсіх тых, каторые хацелі-б там вучыцьца. Кепска і тое, што ў мястэчку ёсць карчма і стаіць яна – скуль-бы не ехаў – як раз на самай дарозі, - вось і трудна з ёй размінуцца…”[7]

Паводле інфармацыі таго ж карэспандэнта, “Наша Ніва” і беларускія кнігі ў Горадні можна было набыць у кнігарнях Заморскай, Любіча і Тракеніцкай. Апроч таго “Нашу Ніву” прадаваў яшчэ хлопчык-газетчык[8].

У траўні 1910 г. П.Аляксюк паведаміў, што ў Гарадзенскі Акруговы суд перададзены тэстамент Элізы Ажэшкі. Усе грошы і дом яна адпісала сваёй сяброўцы, не забылася і пра старых слуг[9].

Смерць Э.Ажэшкі была падзеяй, якая моцна ўсхвалявала гараджанаў. “Наша Ніва” адрэагавала на смерць пісьменніцы артыкулам “Эліза Ажэшка”, падпісаным “В.Л.” (Вацлаў Ластоўскі?). Аўтар адзначаў, што смерць Э.Ажэшкі, якая “старалася шырыць агульналюдскія ідэалы, міласць да чалавека”, з’яўляецца стратай не толькі для Польшчы і польскага народу, але для ўсяго культурнага свету. Паводле В.Л., “большая частка твораў Э.А., як і сама душа пісьменніцы, неразрыўна зьвязана з беларускай глебай… Праўдзівай бацькоўшчынай Ажэшковай была Беларуская зямля, каторая яе ўзгадавала; с Польшчай – апрача мовы і гісторычных перажежыткоў – вялікая пісьменніца мела мала супольнаго. І ўсё-ж такі беларуская фантазія, беларуская казка, што рожэвай дымкай апавівала яе дзіцячыя думкі, ускалыхала вялікага духу пакойнай на славу чужым. Такая ўжо, відаць, доля нашага краю…”[10]

У лістападзе 1910 г. Гарадская дума пастанавіла ўшанаваць памяць Ажэшкі. Дзеля гэтага было прынятае рашэнне “1) назваць Пясковую вуліцу, на якой яна жыла, яе іменем; 2) плаціць з гарадскіх сродкаў за навуку 5 бедных вучняў; 3) даваць штогод на кожны з гарадскіх прытулкаў 100 руб.; 4) павесіць партрэт Ажэшкі ў зале паседжанняў гарадской думы[11].

Карэспандэнцыі Паўла Аляксюка пачалі з’яўляцца на старонках “Нашай Нівы” з кастрычніка 1909 г. Спачатку гэта былі кароткія паведамленні пра падзеі з жыцця Горадні, якія змяшчаліся ў рубрыцы “З Беларусі і Літвы”. Пазней рэдакцыя пачала вылучаць іх асобна і з’явілася рубрыка “З Гродны”. Паведамленні П.Аляксюка ствараюць даволі цікавы вобраз штодзённага жыцця

---

7 Тамсама.

8 Тамсама. № 25 ад 17 чэрвеня 1910 г. Варта адзначыць, што сёння “Нашай Нівы” ў кнігарнях і ў “хлопчыкаў-газетчыкаў” ужо не набудзеш. Забаронены друк?!

9 Тамсама. № 22 ад 27 траўня 1910 г.

10 Тамсама. № 20 ад 13 траўня 1910 г.

11 Тамсама. № 46 ад 11 лістапада 1910 г.

гораду. Да найбольш характэрных гарадзенскіх сюжэтаў належалі праблема гігіены, асвятлення вуліц, крымінальныя здарэнні, гаспадарка і адукацыя:

Кастрычнік 1909 г.: У горадзе халера, якой доўга не было. За тры тыдні памерла 30 чалавек… Зараз наводзіцца чысціня, але больш для вачэй. Калі гаспадар не хоча прыбіраць бруд, то ўсё так і застаецца. Калі паліцыя не будзе глядзець за чысцінёй, то халера будзе множыцца[12].

Лістапад 1909 г.: горад наш губернскі, а парадкі не губернскія. На адной вуліцы шмат ліхтароў, а на іншых няма. Па некаторых завулках боязна хадзіць уначы, а яшчэ і злодзеі цягаюцца. Трэба ставіць ліхтары на пустых вуліцах;

цяпер набіраюць навабранцаў у войска. На вуліцы лепш не выходзіць: "Сядзі дома і не вытыкай носа"[13].

Снежань 1909 г.: Судовая палата разглядала справу адваката Гілерсана, які на беластоцкім працэсе аб пагроме казаў антыўрадавую прамову. "Шмат сабралося на гэта дзела адвакатаў з усёй Расеі, каб бараніць свайго таварыша". Аднак Судовая палата засудзіла яго на год у крэпасць[14].

Люты 1910 г.: У нашым горадзе ёсць такія падворкі, што як залезеш туды, то і ног з балота не выцягнеш: хоць па "скорую помач" пасылай. Ёсць і іншыя парадкі: на Саборнай, напрыклад, столькі таўчэцца народу, не маючы, відаць, нічога лепшага для работы, што калі патрэба здарыцца прайсьці, то і людзям і сабе паадбіваеш бакі. (Інфармацыю папярэджваў загаловак: У нашым Гродне усё модне)[15].

Сакавік 1910 г.: Сярод бела дня вывозяць гарадскія бруды, ад якіх "аж насы рве". Калі-ж гэткім парадкам прыйдзе канец?[16]

Красавік 1910 г.: У горадзе "бруд, смурод; вечарамі такая цемь, што і прайсьці трудна. Тратуары паламаныя. Паліцыя, праўда, пішэ часам пратаколы; але з гэтым бывае ўсяляк…";

Фабрык у Горадні мала. Адна вялікая – тытунёвая І.Шэрашэўскага. Нядаўна ён звольніў 100 непатрэбных работнікаў, выплаціўшы ім 2 тыс. руб. Тыя за гэтыя грошы заснавалі ручную фабрыку тытуню. Тавар пайшоў добра. Шэрашэўскі нават знізіў цэны;

Тутэйшы гандаль апроч некалькіх багацейшых і 2-3 гуртовых крамаў у руках жыдоў;

Педагагічнае таварыства часта праводзіць публічныя лекцыі. Плата невялікая, а карысць вялізарная. Найбольш прыходзіць жыдоў, а наш брат "усё ззаду на хвасьце";

Да леташняга году горад быў падзелены Нёманам на дзве часткі. Багацейшыя трымаліся аднаго берагу, а бедакі, шукаючы таннае жыллё, перабіраліся на другі

[12] Тамсама. № 42 ад 15 кастрычніка 1909 г.

[13] Тамсама. № 48 ад 26 лістапада 1909 г.

[14] Тамсама. № 49 ад 3 снежня 1909 г.

[15] Тамсама. № 8 ад 18 лютага 1910 г.

[16] Тамсама. № 11 ад 11 сакавіка 1910 г.

бераг. Летась збудавалі мост, і цэны выраўняліся: “І тут, і там дзяруць добра!” Пайшлі скаргі на домаўладальнікаў. Гарадская дума прызначыла камісію, каб спыніць рост цэнаў[17].

Травень 1910 г.: Гарадзенская санітарная камісія баіцца вяртання халеры. Шмат гамоняць з гэтай нагоды, “а тым часам на прыватных падворках такія бруды, што бадай і сама халера пасароміцца ўткнуць туды свой нос…”[18];

гарадзенскія каталіцкія прытулкі для сірот бядуюць, што нашы дактары апрача аднаго Д-скага ня хочуць дарма лячыць. Захварэў Д. і ніхто не згадзіўся памагчы бедным. Сорам!;

непарадак у Гарадзенскай публічнай бібліятэцы: кнігі выдаюцца неакуратна, а многія згінулі;

па горадзе цягаюцца кітайцы, якія выдаюць сябе за дактароў ад усіх хваробаў. Зайшлі да адной жанчыны, тая напалохалася (у жыцці не бачыла!), выбіла шыбу і пачала крычаць. Думала, што гэта чэрці прыйшлі па яе душу[19].

Чэрвень 1910 г.: “Гарадзенская санітарная камісія рыхтуецца бараніць горад ад халеры… Трэба было б каб перш-наперш санітарная камісія звярнула ўвагу на тые скрынкі, куды выліваюцца памыі і ўсялякія бруды; скрынкі гэтыя бываюць часта густа пад самымі вокнамі кватэр бедных жыцелёў”[20].

Праблема здароўя гарадзенцаў хвалявала не толькі П.Аляксюка. Ужо згаданы Nemo ў артыкуле “Доктарская помач у Гродзенскай губ.” адзначаў, што паводле забеспячэння меддапамогай горад знаходзіцца на 56 месцы ў Расейскай імперыі (з 89 губ.): “Хваробы пануюць тутака страшэнныя, дый то найбольш тыя, аб каторых за граніцай мала чутно і каторые родзіць недаеданьне, дрэнны харч, гразь, вільгаць, наагул некультурнасць і беднасць”. Па “брушному тыфу” – у 1904-1905 гг. Горадня аказалася на трэцім месцы ў Расеі, па пнеўманіі – на чацвёртым (1904), па сыпному тыфу – на 5, па тэмпах змяншэння насельніцтва – на 7 месцы[21].

Актуальнай праблемай гарадзенскага жыцця было п’янства. Зрэшты, не толькі гарадзенскага. У студзені 1909 г. у невялікай заметцы Nemo “У гарадзенскіх дэпутатаў”, дзе аўтар распавядаў пра сваю сустрэчу з дэпутатамі Дзяржаўнай думы, ён працытаваў прызнанне аднаго з іх: “…Па вёсках у нас пайшло такое пьянства, што, здаецца, ніколі так не пілі. Проста здурэлі людзі з нуды і бяды…[22]”

У крымінальнай хроніцы таксама неаднаразова фігуравала п’янства. У прыватнасці, ў сакавіку 1910 г. п’яны салдат удзень у цэнтры горада смяротна параніў нажом палкоўніка Нікіціна. Вайсковы Акруговы суд прысудзіў салдата да смяротнага пакарання[23].

17 Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.

18 Тамсама. № 22 ад 10 траўня 1910 г.

19 Тамсама. № 19 ад 6 траўня 1910 г.

20 Тамсама. № 26 ад 24 чэрвеня 1910 г.

21 Тамсама. № 52 ад 3 снежня 1910 г.

22 Тамсама. № 1 ад 1 студзеня 1909 г.

23 Тамсама. № 14 ад 1 красавіка 1910 г.

Кур'ёзна выглядае паведамленне пра ўвядзенне Гарадской управай новых правіл для лодачнікаў-перавозчыкаў. Правілам № 1 было патрабаванне цвярозасці[24].

Высокую ацэнку карэспандэнтаў "Нашай Нівы" атрымала праца гарадзенскіх пажарнікаў: "Коні добрыя, машыны таксама; людзі шчыра працуюць і вялікая карысць і помач з іх для нашага гораду"[25]. Летам 1910 г. пажарнікі звярнуліся ў Гарадскую ўправу з просьбай набыць паравую пажарную машыну. П.Аляксюк, які паведаміў пра іх просьбу, дадаў: "Справа дужэ важная"[26].

Карэспандэнты "Нашай Нівы" звярталі ўвагу на дзейнасць Хаўрусу (Таварыства) рабочых Горадні, які ўзнік увесну 1910 г. Рабочыя сабралі пэўны капітал, "пааткрывалі пасьля свае крамы, пекарні; маюць цяпер ужо свайго доктара, сваю аптэку, кнігарню і іншыя карысныя рэчы; даюць падмогу грашмі беднейшым таварышам і гэтакім парадкам шмат дабра і карысьці робяць для сваіх братоў-працоўнікоў"[27]. Летам 1910 г. Таварыства ўжо планавала адчыніць некалькі крамаў, але сустрэла супраціў жыдоў, якія пагражалі збіць цэны. Рабочыя вырашылі адказаць байкотам жыдоўскіх гуртовых крамаў[28].

Невядомы гарадзенскі карэспандэнт "Нашай Нівы", які падпісаўся літарай [x], вельмі пазітыўна ацаніў "маёўку" гарадзенскай моладзі, якая прыцягнула шмат людзей, стварыла святочны настрой і яднала гарадзенцаў у адну грамаду. На думку гэтага карэспандэнта, бядой Горадні з'яўлялася раз'яднанасць людзей, якая "дрэнна адбівалася на грамадскім жыцці".

Матэрыялы "Нашай Нівы" дазваляюць даволі панарамна ўявіць штодзённае жыццё нашага гораду.на пачатку XX ст. Відавочна, што тагачасныя праблемы Горадні былі характэрныя для большасці беларускіх гарадоў. Гэта датычыць, як бытавых аспектаў, так і палітычных, і нацыянальна-культурных.

Адначасна прагляд і чытанне "Нашай Нівы" стогадовай даўніны выклікалі сумныя думкі пра тое, што многія тагачасныя праблемы захавалі сваю актуальнасць. Гэта і раз'яднанасць гарадзенцаў, якая абарочваецца абыякавасцю і пасіўнасцю ў грамадскім жыцці, гэта п'янства, якое выразна памаладзела і пашырылася на жаночы пол, гэта зняважлівае стаўленне большасці мясцовага чыноўніцтва і часткі гарадзенскай г.зв. "інтэлігенцыі" да беларускай мовы і культуры. Аналітычныя артыкулы 1906 – 1910 гг., прысвечаныя нацыянальна-культурным аспектам беларускага руху, успрымаюцца быццам напісаныя сучаснымі аўтарамі.

---

24 Тамсама. № 22 ад 27 траўня 1910 г.

25 Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.

26 Тамсама. № 25 ад 17 чэрвеня 1910 г.

27 Тамсама. № 16-17 ад 15 красавіка 1910 г.

28 Тамсама. № 27 ад 1 ліпеня 1910 г.

pawet.net

*Андрэй Чарнякевіч,*
*кандыдат гіст. наук (Гродна)*

# З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Канец 1918 — пачатак 1921 г.

Нашае ўяўленне аб беларускім нацыянальным Адраджэнні грунтуецца галоўным чынам на вывучэнні палітычных партый, дзейнасць якіх на пачатку XX ст. канцэнтравалася пераважна ў Мінску і Вільні. Але ў гэты час шмат хто з беларускіх дзеячоў хадзіў таксама па брукаванцы гарадзенскіх вуліц.

“...Горадня, – пісаў на старонках газеты “Новая дарога” (Беласток, 1942), у артыкуле “Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне”, аўтар, які схаваўся за псеўданімам “Ул. Крынскі”, - ўважаецца за адзін з найстарэйшых цэнтраў беларускага адраджэнскага руху. І зусім слушна. Яшчэ падчас паўстання 1863 году Горадня была сядзібай Кастуся Каліноўскага, які да пакліканьня яго на становішча дыктатара Беларусі і Літвы быў горадзенскім ваяводай. [...] Пашыраныя тут у вялікіх колькасцях экзэмпляры “Мужыцкай Праўды” і іншых выданьняў у беларускай мове, узмацоўвалі ў шырокіх масах беларускага сялянства й дробнай шляхты сьвядомасць нацыянальнай адасобленасьці. Гэта спрычынілася да таго, што распачаты Каліноўскім рух, пасля таго як паўстанне было задушана, не загінуў, а паўстанчыя традыцыі і ідэя беларускага сэпаратызму перахоўвалася тут яшчэ доўгія гады, аж пакуль не дакацілася сюды новая ажыўляючая хваля нацыянальна-асьведамляючай дзейнасьці Францішака Багушэвіча і Браніслава Эпімах-Шыпілы. [...] Усё гэта служыла спрыяючымі ўмовамі да хуткага развіцьця нацыянальна-адраджэнскага руху.”[1]

У адрозненні ад Вільні, дзе сфармавалася традыцыя беларускага нацыянальнага руху, у Гародню беларускае Адраджэнне прыходзіла хвалямі, знаходзячы з кожным разам усё большую колькасць прыхільнікаў, з тым каб пазней зноў знікнуць, амаль не пакідаючы слядоў. Уласна кажучы, да нацыянальна-творчых цэнтраў беларускага адраджэння Гародня далучылася толькі тады, калі тут пачаў дзейнічаць Гурток беларускай моладзі[2].

---

1 Ул. Крынскі Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

2 Гісторыя Гуртка беларускай моладзі ў Гародні даволі шырока прадстаўлена ў гістарыяграфіі. Асаблівая роля ў захаванні спадчыны гуртка належыць “Зосьцы Верас” (Людвіке Сівіцкай-Войцік). Гл.: Kozłowska-Głogowska H. Kołas našaj nivy // Czasopis, 2003. Nr 7-8; Stankievič A. Bielaruski chreścijanski ruch (histaryčny narys). Vilnia, 1939; Ад Гуртка да Грамады… Старонкі беларускай гісторыі Гродна першай паловы XX стагоддзя (матэрыялы да “круглага стала”

Восенню 1909 г. пад кіраўніцтвам ксяндза-каноніка Бернардзінскага манастыра Францішка Грынкевіча навучэнцы старэйшых класаў мясцовых гімназій, усяго каля дзесяці чалавек, стварылі Гарадзенскі гурток беларускай моладзі пад назвай "Хатка". Гурток гэты больш нагадваў зямляцтва, аб'яднаўшы ў асноўным выхадцаў з Сакольшчыны[3]. Паводле Адама Станкевіча, да "Хаткі" належала шмат дзяцей засценкавай шляхты, а агульныя настроі былі народніцка-краёвыя[4]. Паседжанні гуртка і вечарыны акрамя пакойчыка Ф.Грынкевіча праходзілі на кватэры ксяндза В.Родзькі ў гэтым жа касцёле, у доме сясцёр Салянак і інш. Акрамя гэтага, кожную нядзелю зранку ў касцёле адбывалася служба для каталіцкай моладзі гарадзенскіх школаў. Падчас яе выступаў хор, да якога належаў шмат хто з сябраў гуртка.

Праца першай у Гародні беларускай арганізацыі пачалася з стварэння ўласнай бібліятэкі, куды сябры гуртка ахвяравалі гадавік "Нашай Нівы", кніжкі Ф. Багушэвіча ды "Люд беларускі" А. Федароўскага. Была наладжана сувязь з пецярбургскай суполкай "Загляне сонца і ў наша ваконца" і віленскай беларускай кнігарняй. Грошы, атрыманыя з продажы беларускіх кніжак, якія гурткоўцы абавязкова везлі дадому на святы ці канікулы, ішлі на патрэбы бібліятэкі і канцылярыі гуртка. Акрамя гэтага каса гуртка папаўнялась за кошт складак[5].

Паводле Адама Станкевіча, "напрацягу 5-6 гадоў (1909-1914) асоба кс. Грынкевіча ў Гародні была асобай цэнтральнай і адзінай, якая будзіла і арганізавала там рух беларускі"[6]. Фактычна, айцец Францішак патранаваў гурток усяго два гады, прымаючы актыўны ўдзел у ягонай дзейнасці. Галоўным для яго ўсё ж такі заставалася рэлігійная дзейнасць. Паводле "Зоські Верас" (Людвіка Сівіцкая), ужо на пачатку 1912 г. ён адышоў ад гуртка. Справа, відаць, была не

23 кастрычніка 2004 г.). Гродна, 2004; Верас З. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Бібліятэка Акадэміі Навук Беларусі, аддзел рэдкай кнігі. Ф. 23, воп. 1, ад. з. 624; Верас З. Старое Гродна // Краю мой – Нёман. Мн., 1986. С. 188-194; Глагоўская Е. Вяртанне да сваіх Станіслава Грынкевіча // Ніва, 7.05.2000. № 19; Грабінскі Б. Сакольшчына-Горадня-Вільня // ARCHE. 2000. № 5. С. 179-208; Жук І. Уладыслаў Чаржынскі – беларускі навуковы і культурны дзеяч з Сакольшчыны // Bialoruskie zeszyty historyczne. 1998. № 10. S. 109-110; Л. С.-Ш. Успаміны аб Горадзенскім гуртку Беларускай Моладзі // Студэнская думка. 1925. № 3, 4; Пяткевіч А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. С. 133-134; Пяткевіч А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі і Сакольшчына // Białoruskie Zeszyty Historyczne, 1998. № 9. С. 136-141; Смалянчук А. Гарадзенскі гурток беларускай моладзі // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. Гродна, 1990. С. 34-36; Чарнякевіч А. Касцёл бернардзінцаў: Францішак Грынкевіч і беларускі каталіцкі рух // Пагоня. 9.11.2001; Чарнякевіч А. Першы колас беларускай нівы // Биржа информации. 4.09.2003. №35; Ян з-пад Ласосны. Горадзенскі беларускі гурток 1913 г. Успаміны // Kryvič. 1924. № 1(7).

3 Пяткевіч А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі... С. 135-136.

4 Stankievič A. Biełaruski chreścijanski ruch... S. 46-47.

5 Kozłowska-Głogowska H. Kołas našaj nivy; Верас З. Гродзенскі гурток беларускай моладзі...; Грабінскі Б. Сакольшчына-Горадня-Вільня. С. 179-208; Смалянчук А. Гарадзенскі гурток беларуская моладзі. С. 34-36.

6 Stankievič A. Biełaruski chruścijanski ruch... S. 46-47.

толькі ў ціску з боку духоўнага кіраўніцтва. Хутчэй Ф. Грынкевіч да гэтай працы быў ужо "астыўшы"[7].

У 1913 г. накладам у 50 асобнікаў гурток выдаў літаратурны альманах "Колас беларускай нівы", пасля чаго, праіснаваўшы яшчэ год, распаўся[8].

Летам 1915 г., калі адбылася амаль суцэльная эвакуацыя краю, адчынілася новая старонка ў гісторыі Гародні. "Другая сталіца БНР", як пасля назавуць Гародню, пачыналася па сутнасці з Барыса-Глебскага манастыра па вуліцы Маставой, 9[9]. Менавіта тут, у красавіку 1916 г. па ініцыятыве В. Ластоўскага і А. Луцкевіча і з дазволу нямецкіх уладаў была адчынена першая ў горадзе беларуская пачатковая школа. Яе настаўнікамі сталі 18-гадовая Тэкля Станішэўская і старэйшы за яе на пяць год Аляксандр Грыкоўскі[10].

"Гародня ў той час з беларускага боку была пустыняю. – Пісала "Беларуская думка". – Свядомая беларуская моладзь з надыходам немцаў была або вывезена, або сама выехала і рассыпалася па ўсходняй Беларусі і Маскоўшчыне. У Гародні бушавала польская чорная сотня, якая, карыстаючыся з прыходу немцаў, захацела спалянізаваць гэтае спрадвечнае беларускае места і з гэтай мэтаю натужала ўсе свае сілы. Над усім беларускім быў здзек. З другога боку праваслаўная царкоўная служба (псаломшчыкі і інш.), што асталася пасля выехаўшых у Маскоўшчыну праваслаўных свяшчэннікаў, пры сваім фанатызме і цемнаце была найвялікшым прыяцелем усяго маскоўскага і непрыяцелем беларускага, што пры тым уплыве на народ, які гэная служба мела падчас нямецкай акупацыі, перадавалася і самаму народу"[11].

"[...] пачаткі ня былі лёгкімі. – Узгадваў Ул. Крынскі. - Шмат трэба было перамагчы труднасьцяў, зьвязаных з арганізацыйным мамэнтам у

[7] Айцец Францішак і далей падтрымліў беларускую асвету, аднак слабей і асцярожней. У 1913-1915 гг. ён супрацоўнічаў з беларускай каталіцкай газетай "Bielarus", дапамагаючы ёй матэрыяльна, пісаў сам артыкулы і намаўляў пісаць кс. У.Талочку; прымаў удзел у выданні першага беларускага каталіцкага малітоўніка "Бог з намі" // Kozłowska-Głogowska H. Kołas našaj nivy...

[8] Смалянчук А. Гарадзенскі гурток беларускай моладзі. С. 36-37. Варта дадаць, што ў гэты ж час у Гародні працавалі ксяндзы-беларусы Радзько і Бароўка, Уладзіслаў Талочка, якія падтрымлівалі беларускамоўную асвету. Гэтую пазіцыю падтрымаў дзекан кс. Эллерт // Траццяк Я. Роля беларускіх святароў у адраджэнні роднай мовы // Гарадзенскія запісы. Вып. 1. Гродна, 1993. С. 67, 68; Stankievič A. Biełaruski chryścijanski ruch. Histaryčny narys. Vilnia, 1939, s. 46; Архівы Беларускай народнай рэспублікі [далей БНР] Кніга 1, том 2. Вільня-Нью-Ёрк-Менск-Прага, 1998. С. 1268.

[9] Праваслаўны манастыр быў адчынены ў 1854 г. у мурах былога жаночага кляштара бернардынак, пабудаванага на грошы падканцлера літоўскага Казіміра Сапегі. Гл.: Гардзееў Ю. Гродзенскія бернардзінкі // Биржа информации. 09.04.1998. № 7.

[10] Аляксандр Грыкоўскі паходзіў з в. Корніна Бельскага павету. Скончыў настаўніцкую семінарыю ў Паневежы і беларускія настаўніцкія курсы ў Свіслачы. Тэкля Станішэўская нарадзілася ў Вільні. Была сябрам беларускай музычна-драматычнай дружыны, выступала ў беларускам тэатры. У 1916 г. яна закончыла беларускія настаўніцкія курсы, была накіравана настаўніцай у Гародню // Беларусь. 2.4.1919. № 2. С.1-2; Беларуская думка. 26.5.1919. № 13; Беларускае жыццё. 5.6.1919. № 1. С. 7.

[11] Беларуская думка. 26.5.1919. № 13. С. 1-2.

ваенных абставінах. Арганізатар і кіраўнік школы Александр Грыкоўскі й яго найбліжэйшыя супрацоўнікі вучыцялі Станіслаў Качынскі й Вера Краўцэвічанка паклалі шмат ахвярнай працы, маладога запалу й энэргіі, каб школа паўстала, разьвівалася й трывала за іх пачынам яшчэ доўгія гады...”[12]

Уласна кажучы, першымі настаўніцамі беларускай школы былі таксама Зубкоўская і Корфава, якія, аднак, не вытрымалі цяжкіх варункаў і ў хуткім часе сышлі[13]. Імёны тых, хто застаўся, павінны быць залатымі літарамі запісаны ў гісторыю беларускай асветы і сярод іх, у першую чаргу, Тэклі Станішэўскай і Аляксандра Грыкоўскага.

“[...] Праца Тэклі Станішэўскай у Горадні была безупыннай барацьбой за беларускае адраджэнне і за беларускую школу. – Чытаем у “Беларускай думцы” - [...] Скора Тэклі Станішэўскай прышоў на помач малады і энэргічны вучыцель Аляксандр Грыкоўскі. Усведамлённы ёю Грыкоўскі горача прыняўся за працу, і работа ўдваіх пайшла спарней. Маладым беларускім адраджэнцам-вучыцялём прыходзілася кожны крок здабываць упорнай, доўгай і сыстэматычнай працаю. Перашкоды былі надзвычайныя. Усе іх пералічваць няма тут ніякай магчымасці. Праціўнікі беларускага адраджэння ня грэбавалі ніякімі спосабамі барацьбы проціў беларускіх дзеячоў і ўсё імі ўжывалася ад звычайнай агітацыі да абвінавачавання перад нямецкай уладаю ў расейскім шпіонстве. Але смелая і энергічная праца беларускіх працаўнікоў зрабіла сваё. Школа стала на цвёрды грунт, дзяцей хадзіла шмат, бацькі пасылалі ахвотна. Скрануўся з вялікай сілаю беларускі рух у Горадні [...]”[14]

“[...] Гэты малады ідэаліст, - пісаў Крынскі аб А. Грыкоўскім, - працаваў, не пакладаючы рук; ён быў усюды, дзе таго вымагала дабро беларускай нацыянальнай справы; ён вынес на сваіх плячох увесь цяжар піянерска-арганізацыйнага пачыну”[15].

Нягледзячы на перашкоды ўжо ў лістападзе 1918 г. у беларускай школе ў Гародні працавалі тры класы. Стараннямі настаўнікаў дзеці навучаліся бясплатна, атрымліваючы дармавыя абеды, падручнікі і школьныя прылады.

“Як прыемна, як хораша было на сэрцы, - узгадваў пазней урокі ў першай беларускай школе карэспандэнт “Беларускай Нівы”, - чуць першыя дэкламацыі вершаў у родным слове, або сьпеў харавых мелодзіяў. Дзеці былі захоплены навукаю; мімавольна вычувалася стараннасьць і зразуменне навукі і яе багацце. Тут не было пераафарбоўкі духа ў дзяцей, але самастойна кавалася і расла любоў да матчынага слова, да бацькоўскай гутаркі...”[16]

Кошт, які прыйшлося заплаціць за тое, каб зярняткі, кінутыя ў беларускую раллю, далі першыя ўсходы, аказаўся вельмі высокім. Два гады цяжкай,

---

[12] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

[13] Наднёманец. Што было і што ёсць // Беларуская Ніва. 9.12.1925. № 7. С. 1.

[14] Беларуская думка. 26.5.1919. № 13. С. 1-2.

[15] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

[16] Наднёманец Што было і што ёсць // Беларуская Ніва. 9.12.1925. № 7. С. 2.

самаахвярнай працы каштавалі Тэклі Станішэўскай і Аляксандру Грыкоўскаму жыцця. Кволае здароўе маладых настаўнікаў не вытрымала ўсіх выпрабаванняў, і яны амаль аднachасова захварэлі на сухоты. Улетку 1918 г. Т. Станішэўская прыехала ў Вільню і ўжо болей у Гародню не вярнулася. А. Грыкоўскі застаўся ў горадзе і праз нейкі час яшчэ працягваў апекавацца беларускай школай. Больш таго, ён самааддана ўключыўся ў палітычную барацьбу на мясцовым грунце[17].

"З пачыну А. Грыкоўскага, - пісала "Новая дарога", - у 1917 годзе паўстала ў Горадні першая легальная арганізацыя – "Сувязь Культурна-Нацыянальнага Адраджэньня Беларусі", якая аб'яднывала ўсе нацыянальна-творчыя й актыўныя сілы горадзенскага грамадзтва. ...У склад Ураду Сувязі ў той час уваходзілі: Аляксандр Грыкоўскі, як старшыня, Янка Натусэвіч, Уладзімір Курбскі (Кузьняцоў), Рыгор Злоцкі, Лука Дзекуць-Малей, Андрэй Якубецкі і Станіслаў Качынскі. ...На долю Сувязі выпала цяжкое заданьне бараніць беларускую нацыянальную справу ў Горадзеншчыне ў той адказны мамэнт, калі вырашаўся лёс гэтай зямлі... Асабліва ўзмоцнілася гэтая арганізацыя ў 1918 годзе, калі пачалі вяртацца ў край рэпатрыянты, а сярод іх шмат сьвядомых беларусаў"[18].

Спачатку Сувязь з'яўлялася толькі філіялам Віленскай арганізацыі і ахоплівала ўсяго каля дзесяці чалавек. Аднак падзеі точыліся гэткім чынам, што амаль адразу функцыя арганізацыі выйшла за мяжы выключна адной асветы, як гэта планавалася спачатку. Каб весці палітычную барацьбу і змагацца за ўплывы патрэбна было выступаць ад імя ўсяго народу, і Сувязь змяніла назву на "Гарадзенскі Беларускі нацыянальны камітэт". Як і чаму гэта адбылося, зараз дакладна высвятліць цяжка. Больш істотным з'яўляецца тое, што ўжо ў канцы 1918 г. мясцовыя беларусы ўпершыню атрымалі ўласнае нацыянальнае прадстаўніцтва – Гарадзенскі БНК.

Верагодна акрамя А. Грыкоўскага ў кіраўніцтва Камітэту ўвайшлі Андрэй Якубецкі, які яшчэ да вайны скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю, Янка Натусевіч, былы сябра Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі, і, магчыма, Зміцер Качан[19]. Гарадзенскі Беларускі нацыянальны камітэт надалей дзейнічаў, як прадстаўнічы орган Віленскай беларускай рады, аднак з'езд склікаць быў не ў стане, бо не меў ні грошай, ні людзей. Горш за тое. У самой Гародні і нават за яе межамі пра БНК хутка замацавалася ўяўленне як пра арганізацыю выключна беларусаў-каталікоў.

У канцы 1918 г. распачалося вяртанне з бежанства, якое расцягнулася на некалькі гадоў. Няцяжка ўявіць сабе пачуцці тых, хто прыехаўшы на Радзіму, апынуўся амаль без сродкаў да існавання (што не знішчылі пры адыходзе царскія войскі, якія стасавалі тактыку "выпаленай зямлі", тое падчас нямецкага панавання разрабавалі суседзі). У верасні ў Гародню вярнуўся епіскап Уладзімір

---

17 Беларуская думка. 26.5.1919. № 13. С. 1-2.

18 Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 13.9.1942. № 25. С. 6.

19 Referat działacza politycznego Białorusi Antonego Boryka z Wilna. S. 6 (з архіва А. Латышонка).

у якасці кіраўніка Гарадзенскай і Холмскай епархіі[20]. Прыкладна тады ж невялічкая група мясцовай “расійскай інтэлігенцыі”, а дакладней былыя расійскія чыноўнікі, вайскоўцы ды прадстаўнікі праваслаўнай царквы, з мэтай “аб’яднаць мясцовае рускае праваслаўнае насельніцтва для абароны ўласных нацыянальных, рэлігійных і грамадскіх інтарэсаў”, стварылі Гродзенскую рускую ўправу[21]. Хутка па ініцыятыве Управы і епіскапа Уладзіміра пачалася падрыхтоўка па скліканню з’езду праваслаўнага насельніцтва Гарадзенскай губ., каб заявіць аб сваім гістарычным праве на гэты край[22].

Доўгі час гэты з’езд здаваўся даволі загадкавым, бо не вельмі верылася ў тое, што ў разбураным вайною крае ва ўмовах акупацыі ўдалося на самой справе сабраць каля дзьвух соцен прадстаўнікоў з усёй губерні. Здавалася больш верагодным, што яго пазней выдумалі тыя, каму патрэбна была легітымнасць, каб выказвацца ад імя мясцовага праваслаўнага насельніцтва. Але копія пратаколу сходу не пакідае сумненняў, што “Першы гарадзенскі губернскі беларускі з’езд”, як ён пазней называўся, адбыўся насамрэч і праходзіў у вельмі драматычных умовах.

Адкрыўся з’езд у будынку Барыса-Глебскага манастыра 1 снежня 1918 г. у 15 гадзін 55 хвілін (з такой дакладнасцю гавораць аб гэтым дакументы). У ім прымалі ўдзел 192 дэлегаты з мандатамі і 35 без іх з Гарадзенскага, Сакольскага, Беластоцкага і Ковенскага паветаў. Паводле ўспамінаў палкоўніка А. Успенскага, падрыхтоўка з’езду пачалася яшчэ ў ліпені 1918 г., а ўсяго на сход прыбыло каля 600 чалавек(!)[23].

“Два месяцы назад, прыехаўшы ў Гародню, – гэткімі словамі распачаў сход кіраўнік Гарадзенскай Управы уладальнік маёнтка Навасёлкі Індурскага павету Яўграф Курлаў, – мяне ўразіла, што ні ў грамадскіх месцах, ні ў склепах, ні проста на вуліцах не было чутно роднай расійскай мовы, не кажучы ўжо аб поўнай адсутнасці расійскага друку, школы, нават шыльдаў. Ня лепш справа абстаяла і на вёсцы, дзе селянін-беларус месцамі нават баяўся адкрыць сваю нацыянальнасць… Усе жыхары губерні беларусы схаваліся па сваіх кутках па адзіночцы, як бы адразу рыхтуючыся да пагібелі… ”[24]

“У Гародні ні засталося нічога, што б нагадвала каранным жыхарам аб рускіх… – Працягваў старшыня з’езда Е. Звяркоў. – Складвалася ўражанне, што тут ніколі і не было расійскага краю. Нямецкая ўлада дзяліла мясцовае насельніцтва на габрэяў ды палякаў, ніколі не ўзгадваючы аб рускіх… Аднак мы,

[20] Митрополит Владимир Святитель // Молитвенник. 1873 - 1959. Париж, 1965.

[21] Наше утро. 1918. № 9;

[22] У склад ініцыятыўнай групы акрамя епіскапа ўвайшлі ўладальнік маёнтка Навасёлкі Індурскага павету Я. Курлаў, былыя вайскоўцы Л. Модль і С. Ілавайскі, інжынер М. Марозаў і доктар К. Бялецкі.

[23] Успенскі А. 1-шы беларускі полк у Гародні і як палякі яго разброілі // Раніца. 1942. № 44-49. Паводле пратаколу з’езда ўсяго было 186 дэлегатаў // Государственный архив Российской Федерации (далей ГАРФ). Ф. 5999, воп. 1, ад.з. 1. Арк. 1 (Дакумент прадстаўлены аўтару В. Сабалеўскай).

[24] ГАРФ. Ф. 5999, воп. 1, ад.з. 1. Арк. 1.

тыя хто ведаў гісторыю нашага краю, не маглі спакойна глядзець на намагання палякаў авалодаць ім; мы павінны былі ўсім і кожнаму абʼявіць, што гэты край ніколі польскім ня быў, а яго спрадвечна насяляў беларускі народ, і што толькі беларускі народ можа прэтэндаваць на валоданне ім!"[25]

Сённяшняму чытачу адразу кідаецца ў вочы лёгкасць з якою аратары ў сваіх прамовах абʼядналі рускіх і беларусаў, быццам бы гаворка шла аб адным народзе. На пытанне аб магчымасці існавання незалежнай Беларускай дзяржавы, былыя чыноўнікі цвёрда адказалі: "Не!", дадаўшы сціплае: "На жаль". Яны тлумачыліся, што "эканамічны дабрабыт не можа квітнець у аддзелянай ад іншых народаў Беларусі"[26].

Сярод дэлегатаў прыехаўшых на сход, знайшліся толькі некалькі чалавек, якія адкрыта выступілі ў абарону беларускасці. Гэта былі прадстаўнікі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту Янка Натусевіч і Андрэй Якубецкі. Андрэю Якубецкаму нават удалося заняць месца намесніка старшыні схода. Але барацьба гэта была няроўная.

Ужо прапанова А. Якубецкага, каб выкладанне ў вясковых школах вялося толькі на беларускай мове, выклікала пратэсты[27]. Яго падтрымаў Янка Натусевіч. У пратаколе сходу было адзначана, што ён адзіны, хто выступаў па беларуску: "…Мы не павінны адмаўляца ад сваёй роднай беларускай мовы. Не забудзьце, што за нашаю мову шмат хто пацярпеў! Я вам прачытаю верш Каліноўскага, які быў павешаны царскімі ўладамі за сваю родную беларускую мову". У зале падняўся крык і шум. Раздаліся галасы – "Ня трэба!" Па просьбе выступаючага старшыня паставіў на галасаванне пытанне, ці жадае зʼезд выслухаць верш. Большасцю супраць аднага Янка Натусевіч прачытаў верш. "Той беларус, - скончыў ён сваю прамову, - хто гаворыць па беларуску![28]"

У адказ капітан Ян Ярушэвіч пачаў бараніць расійскую мову, кажучы, што для сялян, якія паслалі яго на сход, яна больш зразумелая чым тая, на якой размаўляў папярэдні аратар. "Не навязвайце сялянам незразумелую мову!" – патэтычна заклікаў ён сабраўшыхся. У выніку за выкладанне ў школах выключна па-беларуску прагаласавала толькі 8 чалавек[29].

Ранкам наступнага дня ўдзельнікі зʼезду зноў сабраліся ў манастыры. На гэты раз абмяркоўвалася пытанне аб палітычнай будучыне краю. З з дакладам выступіў сябра Управы фон Дзітман, які выказаўся за ўваходжанне Гарадзеншчыны ў склад Літоўскай дзяржавы па прынцыпу "найменьшага зла". У адказ на трыбуну падняўся Янка Натусевіч. Ён ізноў казаў пра розніцу паміж рускай і беларускай мовамі, аспрэчваў высновы свайго папярэдніка быццам бы беларусы і рускія адно і тое ж. "Беларускі нацыянальны камітэт стаіць на платформе незалежнай

[25] Тамсама. Арк. 3.

[26] Тамсама. Арк. 19.

[27] Тамсама. Арк. 7.

[28] Тамсама. Арк. 7 адв.

[29] Тамсама. Арк. 8.

беларускай дзяржавы… Ні польскай, ні расійскай арыентацыі быць не павінна!” “Жыве незалежная Беларусь!” – напрыканцы выгукнуў Я.Натусевіч[30].

Прадстаўнік Управы фон Дзітман зноў узяў слова, адказваючы у чыноўнічай манеры здзекліва і прынізліва: “Адным з найвялікшых багаццяў чалавека з’яўляецца родная мова, але ж прыдаваць ёй такое вялікае значэнне, як гэта робіць папярэдні выступаючы, прынамсі не дальнабачна. Аратар зусім не паказаў іншых фактараў стварэння і далейшага існавання незалежнай Беларусі. Ад прадстаўніка Беларускага камітэту трэба было чакаць больш грунтоўнага і ўсебаковага асвятлення беларускага пытання. Гістарычныя дадзеныя, прыведзеныя ім, не толькі памылковыя, але нават непісьменныя. Мы не можам разглядаць пытанне пра стварэнне Вялікай Беларусі, паколькі нам прыходзіцца лічыцца толькі з Гарадзенскай губерняй, аб самастойнасці якой не можа быць і гаворкі...”[31]

Андрэй Якубецкі папярэдзіў сход, што Управа намагаецца раскалоць беларусаў на праваслаўных і каталікоў: “Я заклікаю з’езд запомніць мае словы. Мы пойдзем не за праваслаўнымі папáмі, не за рымскімі пáпамі, а будзем аб’ядноўвацца!” “Мы гаспадары гэтай зямлі, - дадаў Янка Натусевіч, - і здольныя гэта даказаць, а выносіць пастанову сходу на расейскай мове – сорамна!”. Сымон Якавюк на гэта заявіў: “Не трэба сварыцца за мову. Трэба справу рабіць”[32].

Перамога была на баку учорашніх русіфікатараў. Большасцю галасоў з’езд выказаўся за аб’яднанне Гарадзеншчыны з Літвой на правах аўтаноміі. Падобная змена ў поглядах былых русіфікатараў, яшчэ нядаўна груддзю стаяўшых за “адзіную і непадзельную Расію”, у першую чаргу, тлумачылася спадзяваннем на фінансавую дапамогу з боку літоўскага ўраду. Аднак ім прышлося лічыцца з часам. У выніку Управа змяніла назву з “рускай” на “беларускую”, як своеасаблівы палітычны камуфляж. У склад Управы нават увайшоў Аляксандр Грыкоўскі[33] Заключная рэзалюцыя сходу ўхваліла “свабоду, роўнасць, братэрства, Беларускую Управу” і заклікала: “Жыве адзінства беларусаў-каталікаў і беларусаў-праваслаўных”[34]. Зачыніўся сход апоўначы.

Толькі пасля гэтага дзеячы Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту пачалі падрыхтоўку да склікання ўласнага з’езду. Першапачаткова ён задумаваўся, як “Установчы сойм прадстаўнікоў беларускага сялянства Гарадзенскай губерні і Аўгустоўскага павету”, які павінен быў абраць Гарадзенскую Раду, каб супрацьпаставіць яе Управе і створанай напрыканцы

[30] Тамсама. Арк. 18 адв.

[31] Тамсама. Арк. 18 адв. -19.

[32] Тамсама. Арк. 20.

[33] Наше утро. 1918. № 7; Referat A. Boryka ... S. 6. Першапачаткова ў склад Управы ўваходзіла 18 чалавек: У. Боеў, К. Бялецкі, А. Грыкоўскі, Г. Грышкевіч, У. Дзітман, У. Зянькевіч, С. Ілавайскі, Я. Курлаў, У. Краўцэвіч, Д. Малашэўскі, М. Марозаў, Д. Махнач, Л. Модль, І. Скабелька, С. Чарнецкі, І. Юргель, С. Якавюк, І. Ярушевіч. Старшынёй Управы быў абраны Я. Курлаў. Былі адчынены аддзелы: Бежанскі з гарадскім і павятовым пададдзеламі, Народнай адукацыі і Зямельны // Наше утро. 1918. № 7, 14;

[34] ГАРФ. Ф. 5999, воп. 1, ад.з. 1. Арк. 21.

лістапада 1918 г. польскай "Начэльнай Радзе Гарадзенскай Зямлі". "Аднак ад пачатковага пляну склікання зьезду з цэлай Гарадзеншчыны, – узгадваў пазней Ул. Крынскі, – прыйшлося адмовіцца з прычыны матарыяльных перашкодаў і недахопу часу, а абмежавацца павятовым зьездам..."[35]

На арганізаваны камітэтам з'езд у якасці прадстаўнікоў віленскіх і мінскіх беларусаў з Вільні прыбылі В. Ластоўскі, К. Цярэшчанка, А. Смоліч, Л. Заяц, П. Аляксюк і А. Аляксюк. Сам К. Цярэшчанка пазней аб гэтым пісаў: "24 лістапада я і Ластоўскі здолелі ўжо выкарыстаць дапамогу літоўцаў; по іх просьбе немцы далі нам пропуск у Горадню, куда мы павінны былі выехаць на арганізуемы тамашнімі беларусамі мітынг"[36].

Перад сходам А.Смоліч і Алексюкі спрабавалі арганізаваць у горадзе беларускі мітынг, але вялікага водгуку сярод мясцовага насельніцтва ён не знайшоў[37]. "Прачніцеся, браты сяляне! – заклікала набраная кірыліцай і лацінкай лістоўка Беларускага нацыянальнага камітэту. – Ніщто ня можа затрымаць вас ад пасылкі дэлегатаў на Зьезд. Гляньце навокал! Усе народы ўзяліся за свае справы. Нельга чакаць і нам...[38]"

11 снежня ў горад прыехаў Пётр Крэчэўскі, прызначаны міністрам унутраных спраў Літвы Сташынскім камісарам Гародні і Гарадзенскага павету, які ўзяў на сябе матэрыяльны бок справы[39].

Сход пад старшынством прадстаўніка ўрада БНР А. Смоліча праходзіў у зале афіцэрскага казіно 15 – 16 снежня 1918 г. Пра колькасць прыбыўшых дэлегатаў нічога не вядома, але, напэўна, іх сабралася не шмат. Самі арганізатары тлумачылі гэта тым, што напярэдадні з'езду нямецкія ўлады забаранілі рух на чыгуначным транспарце.

Погляд аўтара артыкула ў "Новай дарозе" больш аптымістычны: "На з'езьдзе, апрача прадстаўнікоў Горадзенскага павету былі дэлегаты з Беластоцкага, Сакольскага й Ваўкавыскага паветаў, а гэтак сама прадстаўнікі беларускае эміграцыі з акупаваных бальшавікамі абшараў і, як паважаныя госьці, дзяржаўныя мужы Беларускае Народнае Рэспублікі, на чале з Пятром Крычэўскім, старшынёй Рады БНР й Лявонам Зайцам, дзяржаўным пісарам БНР..."[40]

На з'ездзе разглядаліся пытанні аб палітычным становішчы, стварэнні агульнабеларускай арганізацыі, зямлі, дапамозе ахвярам вайны ды адкрыцці

---

[35] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

[36] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Ф. 60, воп. 3, ад. з. 456. Арк. 30-35 адв. – 41 адв., 45 адв. - 49.

[37] Referat A. Boryka ... S. 6; Centralne Archiwum Wojskowe w Warszawe: Wojskowe Biuro Historyczne 400. 3194. -Relacja Stanislawa Iwanowskiego z jego udzialu w pracach Samoobrony w Lidze i Grodnie oraz z dzialalnosci w Komisariacie Rzadu w Grodnie. S. 9 (з архіва А. Латышонка).

[38] Czerniakewicz A. Przejmowanie wladzy przez Polakow w Grodnie... S. 45; Адраджэнне. Гістарычны альманах. Мн., 1995. С. 243 – 244.

[39] Наше утро. 1918. № 4, 5. Пётр Антонавіч Крэчэўскі займаў таксама розныя"фінансавыя" пасады ў складзе Народнага сакратарыята Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 256.

[40] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

школаў. У прынятай рэзалюцыі абвяшчалася, што "беларускі народ павінен быць цэлым і ні ад кога незалежным. Сваіх правоў ён будзе дабівацца разам с суседнімі дэмакратычнымі народамі, а перад усім з народам літоўскім"[41].

У павеце ствараліся сельскія і валасныя камітэты, перад якімі ставілася мэта правесці перапіс памешчыцкай зямлі, зрабіць прыкладныя падлікі ваенных стратаў, арганізаваць міліцыю і спажывецкія камітэты і паклапаціцца аб закладанні новых школак. Прычым, па-беларуску выкладанне павінна было весціся толькі ў пачатковых школах і то "па меры магчымасці". Акрамя гэтага, валасныя камітэты павінны былі "пратэставаць супраць арганізацыі парафіяльных камітэтаў", якія ствараліся пры касцёлах і з'яўляліся эфектыўным сродкам апалячвання мясцовага насельніцтва.

Трошкі інакш падзеі выглядаюць з успамінаў К. Цярэшчанкі: "Мітынг адбыўся ў манастыру, прайшоў ён вельмі добра. Гаварылася аб новых часах для працоўных масс, а праве беларускаго народу на самаістнаваньне і гэтак далей. Выступаўшым правым, называўшымі сябе беларусамі з так званай "Рускай Управы" Якавюку і др. сяляне ня давалі гаварыць. Чулась, што працаваць можна – была б толька магчымасьць. У Горадні мы залажылі часовы Нацыянальны Камітэт, у склад якога вайшлі вышай памяненые горадзенскія працаўнікі"[42].

Замест Губернскай рады была створана Павятовая сялянская рада. Таксама быў абраны Арганізацыйны камітэт па скліканню на 9 студзеня 1919 г. Краявога Беларускага з'езду Гарадзеншчыны[43]. З'езд выказаў пажаданне, каб "шчырыя беларусы, члены Беларускай Управы, пакінулі яе і далучыліся да Павятовай рады"[44]. Таксама ў рэзалюцыі было адзначана,што "зьезд аднадушна стануў на грунце беларускае незалежнасьці й, выбраўшы сваім выканаўчым ворганам Беларускую Павятовую Сялянскую Раду, пакінуў ёй наказ бараніць адраджэнскую й незалежніцкую справу ўсялякімі сродкамі, з якога б боку не пагражала небяспека...[45]"

Праведзенне сходу патрабавала вялікіх выдаткаў. У сваёй дакладной запісцы ад 8 студзеня 1919 г. П.Крэчэўскі прасіў Міністэрства беларускіх справаў вярнуць яму грошы, выдаткаваныя на сялянскі з'езд: на пераезд дэлегатаў 500 марак, на памяшканне 200 марак, на дровы 200 марак, на закупы харчоў і ўтварэнне сталоўкі 3000 марак і яшчэ 5000 марак на ўтрыманне Гарадзенскай беларускай сялянскай павятовай рады[46].

---

[41] Адраджэнне... С. 245.

[42] НАРБ. Ф. 60, воп. 3, ад.з. 456. Арк. 30-35 адв. - 41адв., 45 адв. - 49.

[43] У склад Гарадзенскай Павятовай сялянскай рады ўвайшлі А. Якубецкі (старшыня), Я. Натусевіч, Ул. Курбскі, З. Качан, А. Грыкоўскі, Л. Дзекуць-Малей, А. Аляксючанка, Я. Міхайлоўскі, П. Міськевіч, М. Сарока, Р. Злоцкі, А.Сініма і А. Ламашэвіч. У Арганізацыйны Камітэт па скліканню Краявога Беларускага з'езда Гарадзеншчыны – Ф. Данілюк, С. Якавюк, А. Басель, А. Якубецкі, А. Саўчыц, Л. Дзекуць-Малей, А. Аляксючанка, П. Якубецкі і Я. Натусевіч // Адраджэнне... С. 246 – 247.

[44] Адраджэнне... С. 245 – 246.

[45] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 6.9.1942. № 24. С. 4.

[46] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛІМ). Ф. 3, воп. 1, ад.з. 151. Арк. 8.

Гэткім чынам, на канец 1918 г. у Гародні існавалі ўжо тры арганізацыі, якія выказваліся ад імя беларускага народу: Гарадзенскі Беларускі нацыянальны камітэт, Гарадзенская беларуская губернская ўправа і Гарадзенская беларуская сялянская павятовая рада.

Нягледзячы на тое, што Павятовая рада ўзнікла пры актыўным удзеле Гарадзенскага БНК, яна амаль адразу стала незалежнай ад яго палітычнай арганізацыяй, якая, дарэчы, трапіла пад вельмі моцны бальшавіцкі ўплыў[47].

Прыкладна ў гэты час пачаліся перамовы паміж літоўскім урадам і прадстаўнікамі беларускіх гарадзенскіх арганізацый. Літоўскаму боку, каб прэтэндаваць на большую частку Гарадзеншчыны і Віленшчыны, тэрмінова патрэбна было стварыць хаця б нейкую фікцыю беларускага прадстаўніцтва пры ўласным урадзе. Афіцыйна ініцыятарам перамоваў з літоўцамі выступіла Віленская Беларуская Рада. У выніку 1 снежня 1918 г. Я. Варонка быў прызначаны міністрам беларускіх спраў пры літоўскім урадзе[48].

Яшчэ некалькі месяцаў таму А. Грыкоўскаму прыходзілася амаль аднаму змагацца за беларускую справу, і раптам за нейкі тыдзень Гародня ператварылася ў цэнтр беларускага нацыянальнага руху! Спачатку загадам Рады міністраў Літвы ад 19 снежня сюды павінна было пераехаць Міністэрства беларускіх спраў, а ўжо 27 снежня ў горад прыехаў Старшыня Рады міністраў БНР Антон Луцкевіч[49].

На момент пераезда ў Гародню беларускіх дзеячоў з Вільні супрацьстаянне паміж Гарадзенскім БНК і Гарадзенскай беларускай управай набыло форму “акопнай” вайны[50]. Абодва бакі знаходзіліся ў цяжкім фінансавым становішчы, што ставарала аб’ектыўныя ўмовы да сбліжэння[51].

У суботу 28 снежня ў дзесяць гадзін раніцы ў памяшканні былога рэальнага вучылішча адбылася сустрэча прадстаўнікоў беларускіх арганізацый і Гарадзенскай управы[52]. Спачатку быў зачытаны пратакол з мінулага паседжання Управы, з якога вынікала, што пяць яе найбольш адыёзных сяброў, у тым ліку епіскап Уладзімір, Я. Курлаў, С.Ілавайскі, Л. Модль і М. Марозаў, згодна з папярэднім патрабаваннем Гарадзенскага БНК абвяшчалі сваю адстаўку[53]. Беларускім дэлегатам было

[47] Наше утро. 1918. № 9;

[48] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, ад.з. 53. Арк. 41-45.

[49] Тамсама. Ад.з. 22. Арк. 131; тамсама. Ф. 458, воп. 1, ад.з. 7. Арк. 7; Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 4. С. 215; Адраджэнне... С. 228-229.

[50] Першы раз звесткі пра канфлікт паміж БНК і Управай з’явіліся ў мясцовай газеце “Наше утро” яшчэ 14 снежня. Менавіта ў гэты дзень па распараджэнні (№18783) нямецкага камендanta Гародні генерал-маёра фон Донапа Гарадзенскай управе перадаваўся будынак рэальнага вучылішча (Наше утро. 1918. № 5. С. 21).

[51] Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 4. С. 215.

[52] Ад Нацыянальнага камітэту ў ёй удзельнічалі В. Захарка, А. Якубецкі А. Луцкевіч. Быў яшчэ адзін сябра Камітэту, але аўтару гэтай інфармацыі А.Луцкевічу ён быў незнаёмы. Ад Управы былі У. Боеў, С. Якавюк, В. Зяньковіч (Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 4. С. 215.

[53] Праўда, Гарадзенская ўправа прасіла іх застацца на сваіх пасадах да прызначанага на 9 студзеня 1919 г. Беларускага губернскага з’езду, каб на ім канчаткова вырашыць гэтае пытанне.

прапанавана прадставіць новых кандыдатаў. Прадстаўнікі БНК спачатку пагадзіліся на кампраміс, аднак увечары на сустрэчы ў хворага А. Грыкоўскага высветлілася, што гарадзенскія беларусы "не ў стане даць нават столькіх здольных да працы людзей". З гэтай прычыны ўжо пазней у гатэлі "Метраполь" сабралася нарада, на якой было вырашана, што пасада ва ўрадзе БНР не павінна служыць перашкодай для працы ў грамадска-палітычнай установе[54].

Ужо праз дзень Гарадзенская ўправа паведаміла, што з яе складу маюць адыйсці не пяць сяброў, а толькі два - епіскап Уладзімір і Л. Модль, на што А.Луцкевіч заўважыў у сваім "Дзённіку": "Гэткая камбінацыя справы не ратуе. Відаць, што з Управай да ладу не дойдзем". Так і здарылася. Ужо на наступны дзень Управа адмовілася ад папярэдняй дамовы[55].

Тым часам 10 студзеня (?) 1919 г. у Гародню прыехаў Павел Аляксюк, які амаль адразу па сваім прыездзе далучыўся да працы Гарадзенскага БНК[56]. Ён намагаўся згуртаваць беларускія сілы ў Беларускім нацыянальным камітэце кааптуючы туды найбольш здольных людзей. У выніку ў БНК увайшлі Л. Заяц, Т. Вернікоўскі, К. Бялецкі ды Я. Ярушэвіч. Сам П. Аляксюк быў абраны ў склад Часовага гарадскога камітэту замест хворага А. Грыкоўскага. Менавіта ён здолеў правесці пастанову, якая надавала беларускай мове роўныя правы з расейскай, польскай ды габрэйскай.

На паседжанні Часовага гарадскога камітэту 11 студзеня 1919 г. Я. Натусевіч абвясціў аб прыпыненні ўсялякіх узаемаадносінаў паміж Беларускім нацыянальным камітэтам і Гарадзенскай управай і прапанаваў толькі Беларускі камітэт лічыць прадстаўляючым інтарэсы беларускага насельніцтва. Услед за ім П. Аляксюк кінуўся ў спрэчку з сябрам Управы В. Дзмітрыевым. На ягонае пытанне, чые інтарэсы той прадстаўляе, В.Дзмітрыеў збянтэжана адказаў: "Мясцовага насельніцтва".

Адначасова і Павятовая рада пастанавіла высветліць адносіны з Управай, дзеля чага паслала дэлегацыю ў былое рэальнае вучылішча. Але перамоваў не атрымалася. Як пісаў у сваім дзённіку А. Луцкевіч, на пытанне сябра Управы Зорына: "Навошта вы жадаеце выгнаць нас вон?" адзін з дэлегатаў-сялян выкрыкнуў: "За тое, што вы кравапіўцы, памешчыкі і капіталісты!"[57]

У гэтых умовах "антаганіст" П. Аляксюка міністр беларускіх спраў Я. Варонка пайшоў на збліжэнне з Гарадзенскай управай. "Барацьба паміж

---

[54] У перапынку паміж размовамі В. Захарка і У. Боеў былі дэлегаваны да нямецкіх уладаў, каб запытацца, ці на самой справе спыняецца рух на чугунцы для прыватных асобаў. Транспартныя праблемы прымусілі адкласці з'езд. Спрэчка паміж Беларускім нацыянальным камітэтам і Управай разгарэлася з новай сілаю.

[55] Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 4. С. 218.

[56] Ён пачаў рыхтаваць выданне ад імя БНК беларускай тыднёвай газеты, у рэдкалегію якой акрамя П. Аляксюка ўвайшлі Р. Злоцкі і Я. Натусевіч. Цікава, што Антон Луцкевіч, які моцна залежаў ад украінскай пазыкі, пішучы пра газэту, зусім не здзіўляўся адкуль П. Аляксюк возьме грошы на гэтую справу!

[57] Архівы Беларускай народнай рэспублікі. Кніга 1. Т. 1. С. 1190.

Я. Варонкай і П.Аляксюком, – чытаем у А.Луцкевіча, – разгараецца"[58]. У гутарцы з А. Якубецкім міністр адкрыта заявіў, што Гарадзенскі БНК наогул не павінен існаваць (праўда на сустрэчы з самім А. Луцкевічам ён патлумачыў, што не прызнае камітэт толькі як адміністрацыйную ўладу, але не як нацыянальную арганізацыю)[59]. Нарэшце, 24 студзеня 1919 г. у мясцовай газеце "Наше утро" з'явіўся адкрыты ліст Беларускага нацыянальнага камітэту, які А. Луцкевіч акрэсліў як "фармальнае аб'яўленне вайны Управе"[60].

На пачатку сакавіка 1919 г. Гародня апынулася амаль з усіх бакоў акружанай польскім войскам[61]. А вечарам 28 красавіка ў горад увайшлі польскія рэгулярныя часткі[62]. З пачаткам польскай акупацыі беларускі рух у Гародні на кароткі час ізноў актывізаваўся. У першую чаргу гэта было звязана з тым, што ў горад вярталіся былыя ўцекачы. 15 траўня 1919 г. быў заснаваны кааператыў "Беларусь"[63]. Адначасова перамовы з польскім камісарам веў М. Маркевіч, які 22 красавіка быў абраны старшынёй Павятовай сялянскай рады[64].

У канцы красавіка 1919 г. з Савецкай Расіі вярнуўся Ул. Курбскі. У Расіі ён спрабаваў ад імя гарадзенскіх беларускіх установ усталяваць кантакты з мясцовымі беларускімі коламі,. Хутка па яго ініцыяцыве ў горадзе паўстала новая арганізацыя – Грамада беларускай моладзі[65]. У сярэдзіне чэрвеня ў Гародню прыехаў Тамаш Грыб і разам з М. Маркевічам, Я. Чарапуком і П. Мядзёлкай заснаваў газету "Родны край"[66].

"У Горадзеншчыне ўзьняўся сільны антыпольскі рух, - узгадваў пазней Ул. Крынскі, - які ўзначальвала партыя беларускіх рэвалюцыйных сацыялістаў. Сюды пераехаў адзін з лідэраў гэтае партыі Тамаш Грыб і тут пачала выдавацца іхняя газета "Родны Край". Эсэраўская ідэалогія, скрайня нацыяналістычная і разам радыкальна-сацыялістычная, знайшла на горадзенскім грунце шмат прыхільнікаў, і ад гэтага часу Горадня сталася адным з мацнейшых цэнтраў гэтага руху"[67].

Адначасова ў горадзе прайшла першая хваля польскіх арыштаў, галоўным чынам сярод былых рускіх чыноўнікаў, звязаных з Гарадзенскай управай і Міністэрствам беларускіх спраў. Усяго, паводле Я. Антонава, было арыш-

---

[58] А.Луцкевіч Дзённік // Полымя. 1991. № 5. С. 176.

[59] Тамсама. С. 174, 176; Наше утро. 1919. № 18, 19.

[60] Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 5.С. 178; Наше утро. 1919. № 20; Архівы Беларускай Народнай рэспублікі. Кніга 1. Т. 1. С. 320.

[61] Яшчэ 13 лютага палякі занялі пакінуты немцамі Ваўкавыск. 3 сакавіка яны выбілі савецкія часткі з Слоніма, а 5 сакавіка бальшавікі пакінулі Шчучын // Łukomski G., Polak B. W obronie Wilna, Grodna i Mińska 1918-1920. Koszalin-Warszawa, 1994. S. 128, 132.

[62] Zorka (Horadnia). 1.5.1919; Jednodniówka koła związku POW. Grodno, 1936. S. 30.

[63] НАРБ. Ф. 368, воп. 1, ад. з. 42. Арк. 7 (з архіва Ул. Ляхоўскага).

[64] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, ад. з. 22. Арк. 166.

[65] У склад прэзыдыўма Грамады ўвайшлі Ул. Курбскі, К. Салошык ды М. Амельянчык. На канец траўня Грамада ўжо налічвала 32 сябра ў Гародні і 18 на правінцыі.

[66] Родны край. 1919. № 3.

[67] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 4.10.1942. № 28. С. 4.

тавана 79 чалавек, у тым ліку пратаірэй І. Карчынскі, К. Бялецкі, У. Боеў і А. Бахановіч[68]. Большасць беларускіх дзеячоў арышты не кранулі. У гэтых умовах 6 ліпеня 1919 г. адбыўся II Беларускі настаўніцкі з'езд Гарадзеншчыны. Адначасова з ім праходзіла Канферэнцыя партыі беларускіх эсэраў Гарадзеншчыны, на якой прысутнічала 25 чалавек[69].

Аднак канфлікт з польскімі ўладамі выклікаў не гэты сход, а надрукаваны 10 ліпеня ў № 5 "Роднага краю" артыкул Я. Чарапука пад назвай «Правам ці мячом». "Цяжкі і нават вельмі цяжкі нацыянальны крыж грамадзянскага жыцьця прыходзіцца нясьці нашаму гаротнаму 12-ці міліоннаму селянскаму народу на сваіх плечах... – Сцвярджалася ў ім. – Блізкія суседзі нашыя з пад Масквы і Варшавы маюць апэтыты ня то заусім прылучыць да сябе, а у апошні час у эн-дэкоу польскіх вельмі пашырылася думка, каб нас раздзяліць. Па Менск – Польшча Дмоускаго, а па другую сторану – Расея Колчака... Гэткі канец хочуць зрабіць з Беларусьсю іх "прэвасхадіцельство" і іх "ясьневельможнасьць". Няшчасныя! Яны гэтаго не разумеюць што і у беларусау могуць знайсьціся свае Петлюры... На Беларусі магчыма што падходзіць вялікая нацыянальная рэвалюцыя... І вось цяпер нам беларусам трэба зрабіць сабе ясны выбар, з чым ісьці нам у пярод, у той час калі нашыя суседзі ня вельмі так моцные, а чым пойдзе народ беларускі з правам ці з мячом?

Да гэтага часу мы верылі, што есьць на сьвеці справядлівасьць. Яна для нас была правадыром да дзяржаўнаго будауніцтва свае роднае гаспадаркі.. Але мы па справядлівасьці завяліся... Але калі мы па братэрску працягвалі нашым суседзям руку агульнае згоды, тагды, яны адкідвалі яе ад сябе, а у нас кідалі каменьнямі [...] Гэткім зьдзекам нашых суседзяу трэба палажыць канец... На бок сантымэнты і угоды... У гару дух і сэрца! За права, у рукі меч! Усе разам грамадой станемо пад нацыянальна-рэвалюцыйны штандар Беларусі і усе пойдзем здабываць вольнасьць і незалежнасьць руйнуючы гнезда двухглавых і адноглавх арлоу, якія раскіданы па нашай зямліцы...

Калі даунейшы грэк разумеу міласьць сваей Бацькаушчыны у зэмсьці і ненавісьці і яму гэта было прабачано, так і нам што ня толькі любім сваю Бацькаушчыну, але і мучанікамі яе з'яуляемся нам, таксама будзе дарована, бо мы пойдзем за гонар і вольнасьць Беларусі. Во наш праудзівы шлях, во дзе наш ратунак![70]"

Падобныя заклікі не маглі прайсці незаўважанымі. У адказ мясцовыя польскія арганізацыі выдалі адозву з пратэстам, а адна з польскіх газэт, перадрукаваўшы беларускую перадавіцу, звярнулася да пракуратуры з патрабаваннем зачыніць "Родны край". Хутка ў Гародні адбыліся новыя арышты. На гэты раз польскія рэпрэсіі былі накіраваны супраць найбольш антыпольскі настроеных беларускіх дзеячаў. 20 ліпеня былі арыштаваны П. Мядзёлка, К. Салошык, А. Фохт і Я. Натусевіч. Адначасова ў Вільне быў зняволены Т. Грыб, пазней пераведзены ў гарадзенскую турму[71].

---

[68] Пануцэвіч В. Горадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918 - 1919 гадох // Пагоня. 1994. № 11.

[69] Беларуская думка. 11.7.1919. № 42. (З архіва Ул. Ляхоўскага).

[70] Родны край. 10.7.1919. № 5. С. 1.

[71] Echo. 1919. № 150; Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. // Полымя. 1993. № 5. С. 190.

Даволі хутка ўсе арыштаваныя апынуліся на волі, за выключэннем Т. Грыба, якога вызвалілі толькі на пачатку лістапада пад залог у 400 рублей і без права выезду з Гародні. Толькі ў канцы снежня 1919 г. Т. Грыб выехаў з Гародні ў Менск[72].

З усіх беларускіх арганізацый увосень 1919 г. у горадзе акрамя ўласна БНК засталіся толькі Гарадзенская беларуская вучыцельская Рада ды Грамада беларускай моладзі[73]. Праўда, гэтая прысутнасць была даволі відавочнай. Напрыклад, Грамада за кароткі час паспела паставіць вялікую колькасць спектакляў[74]. Старшынёй Грамады, яе "рэжысёрам" і аднačасова адказным за выкарыстанне фінансаў, што шлі на беларускую працу ў Гародні ад урада БНР, з'яўлялася Паўліна Мядзёлка.

"Паночку! Як рабіць і што з грашыма? - Звярталася яна ў роспачы да А.Луцкевіча. – ...Справа вось у чым. Да гэтуль я выдавала на ўсё што патрэба па сваей увазе, выдаткі рабіла і на Грамаду моладзі і Вучыцельскага саюза вучыцелям давала невялічкую падмогу - словам аплачвала ўсе рахункі сама - не дзелячы атрыманых на асобныя арганізацыі. Але, бачыце, ёсць некаторыя тыпы, каторыя зумысла хочуць унясці разлад у нашай працы і ў дабавак за шмат лішняга знаюць пра наіную шчырасць другіх. І вось такія тыпы жадаюць даць ім адчот, бо ўважаюць, што гэтыя грошы прызначаны былі для адной арганізацыі... Будце ласкавы напішыце, што вы не прызначалі (даючы мне) на асобныя арганізацыі, а на агульную справу і што адчот я даю толькі таму, ад каго атрымліваю грошы, а не першым-лепшым каторыя цікавіцца"[75].

У пачатку студзеня 1920 г. П. Мядзёлка ад'ехала з Гародні ў Менск[76].

27 сакавіка 1920 г. у памяшканні клуба "Беларуская хатка" адбылося святкаванне другой гадавіны абвяшчэння незалежнасці БНР. Старшыня Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту Я. Натусевіч у сваёй прамове ахарактарызаваў сучаснае становішча Беларусі і падкрэсліў вялікае значэнне дня

[72] Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. С. 192, 193; Архівы Беларускай народнай рэспублікі. Кніга 1. Том 1. С. 492, 493, 509.

[73] 14 кастрычніка 1919 г. адбыўся ІІ агульны сход Грамады беларускай моладзі, на якім было абрана новае кіраўніцтва. У склад праўлення Грамады ўвайшлі П. Мядзёлка (старшыня), У. Курбскі і М. Амяльянчык (намеснікі старшыні), К.Салошак (сакратар), Л. Дзякуць-Малей (скарбнік).

[74] 20 ліпеня – "Па рэвізіі" і "Як яны жаніліся", 7 верасня – "Страхі жыцця" Ф.Аляхновіча і "Мядзьведзь" А.Чэхава, 19 верасня - на карысць бедных дзяцей беларускай школы "Паўлінку" Я.Купалы і "Міхалку", 1 кастрычніка – "Страхі жыцця". 4 кастрычніка 1919 г. адбыўся "Суботнік" Грамады і Гарадзенскай беларускай вучыцельскай рады ў памяць памёршай 1 кастрычніка беларускай настаўніцы Вольгі Янучанкі. 8 кастрычніка Грамада ставіла "Маньку" Ф. Аляхновіча, 16 кастрычніка - спектакль для беларускіх дзетак "Паўлінка" і "Міхалка", 19 кастрычніка і 22 кастрычніка – "Пашыліся ў дурні" Крапіўніцкага. Таксама адбыліся спектаклі 30 лістапада, 16 студзеня 1920 г. ды інш.

[75] Архівы БНР. Кніга 1. Том. 1. С. 458.

[76] Biełaruskaje zyccio. 13.10.1919. № 17; Biełaruskaje zyccio. 1.11.1919. №.19; Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. С. 131.

25 сакавіка. Затым слова ўзялі Л. Дзякуць-Малей і тагачасны старшыня Грамады беларускай моладзі С. Баран. "Наагул, – адзначала газэта "Беларусь", - вечар прайшоў вельмі добра і зрабіў на прысутных прыемнае ўражаньне"[77].

На наступны дзень (28 сакавіка 1920 г.) былі прызначаны перавыбары Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту[78]. "Дзеля аграмаднай важнасьці заданьняў сходу, – заклікала выдадзеная напярэдадні адозва, – камітэт горача просіць усіх беларусаў абавязкова з'явіцца на нядзельны сход, пунктуальна подлуг вызначанай гадзіны".

Сход распачаўся ў 15.00 і доўжыўся каля чатырох гадзін. Пасля справаздачы старшыні камітэту Я. Натусевіча і сябра Гарадской рады Л. Дзякуць-Малея прысутныя перайшлі да галоўнага пытання сходу – выбараў новага Камітэту. Новым старшынёй Гарадзенскага БНК стаў С. Баран[79].

У чэрвені 1920 г. пры Гарадзенскам Беларускім нацыянальным камітэце ўжо існавалі адміністрацыйны, арганізацыйны, дабрачынны аддзелы і юрыдычнае бюро. Акрамя гэтага на Гарадзеншчыне дзейнічала інструктары Камітэту Ю. Мялешка, П. Якубецкі, Сурба і Я. Пасэвіч і дзевяць культурна-асветніцкіх гуртков[80]. 15 чэрвеня 1920 г. Мінскі Беларускі нацыянальны камітэт паведамляў Гарадзенскаму БНК аб выдзяленні яму штомесяц 6 тысяч марак. У канцы чэрвеня ў сваім дакладзе С. Баран пісаў: "...тыя ўплывы на жыхарства, якія мае камітэт, заставілі адміністрацыю лічыцца з камітэтам і прызнаць яго"[81].

Але раптам усё змянілася. 4 ліпеня 1920 г. Савецкая Расія перайшла ў наступленне на ўсім Заходнім фронце. Гэта была адна з найлепш падрыхтаваных наступальных аперацый Чырвонай Арміі падчас грамадзянскай вайны. 11 ліпеня бальшавікі занялі Менск, а ўжо праз тры дні ўвайшлі ў Вільню. Чарга была за Гародняй.

Ул. Крынскі пазней згадваў з'яўленне ў горадзе "эмісару Комінтэрну нейкага Багдановіча, беларуса з групы Ігнатоўскага і Жылуновіча, які распачаў шырокую дзейнасьць у кругох беларускага грамадзянства.. Ня гледзячы на тое, што беларусы вельмі шмат уціску зносілі ад палякаў і мелі ўжо даволі польскай акупацыі, дзейнасьць Багдановіча не знайшла сярод беларускіх работнікаў і сялян ніякага водгуку, ён не здабыў тут сабе прыхільнікаў і калі заняцьце Горадні чырвонай арміі сталася даканаўшымся фактам, яму прыйшлося шукаць апоры ў іншых беларускіх угрупаваньнях, каб зусім ня страціць уплываў. Багдановіч

[77] З гісторыі святкаваньня 25 сакавіка // Спадчына. 1998. № 1. С. 38-39.

[78] Паводле іншых звестак, Гарадзенскі камітэт быў абраны на агульным сходзе 24 сакавіка 1920 г. з згоды Генеральнага камісара Е. Асмалоўскага і гарадзенскага старасты Рагалевіча.

[79] У склад Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту былі абраныя С. Баран (старшыня), С. Якавюк, Л. Дзякуць-Малей, М. Якімовіч, Я. Антонаў і У. Федарук. Не ўвайшлі ў камітэт Трафімік, Карповіч, С. Кішка, Зямкевіч, Брушка і папярэдні старшыня Я. Натусевіч (НАРБ. Ф. 325, воп. 1, ад. з. 115. Арк. 52-56 адв.

[80] НАРБ. Ф. 368, воп. 1, ад. з. 42. Арк. 4, 13 (З архіва Ул. Ляхоўскага).

[81] Тамсама. Арк. 11-13.

запрапанаваў найбольш уплывовай у Горадзеншчыне партыі беларускіх рэвалюцыйных сацыялістаў падзяліцца месцамі ў савецкіх установах пры ўмове, што гэтая партыя "стане на плятформу савецкай улады". Ён стараўся пераканаць беларускіх эсэраў, што ў праціўным выпадку палякі і жыды апануюць уладу, а беларусы ня будуць мець ніякога ўплыву на кіраўніцтва краем. Захады Багдановіча скончыліся тым, што нязначная група "левых" эсэраў на чале з С.Багданам падпісала дэклярацыю аб прызнаньні савецкай улады..."[82]

Раніцай 19 ліпеня конніца Гая пачала наступленне на Гарадзенскую крэпасць, але толькі 24 ліпеня бальшавікі занялі горад[83]. Але ўжо 20 ліпеня са складу палітатдзелу і асобага аддзелу 4 Арміі быў створаны Гарадзенскі ваеннарэвалюцыйны камітэт[84]. У гэты час з беларускіх арганізацый у горадзе засталіся толькі Беларускі нацыянальны камітэт, Беларуская школьная рада і Грамада беларускай моладзі[85]. Як згадваў Ул. Крынскі, беларусы пайшлі на супрацоўніцтва з бальшавікамі. Старшыня Гарадзенскай беларускай школьнай рады Л. Дзякуць-Малей стаў кіраўніком пададдзела прытулкаў і яслей аддзела сацзабяспячэння[86]; намеснік старшыні Грамады беларускай моладзі Ул. Курбскі – загадчыкам культпрасветаддзела; у гэтым жа аддзеле працаваў сакратар Грамады К. Салошык[87]. Інструктар Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту П. Якубецкі быў прызначаны школьным інструктарам па Гарадзенскаму ўезду, а Старшыня камітэту С. Баран стаў кіраўніком юрыдычнага аддзела Гарадзенскага рэўкома[88].

Сярод супрацоўнікаў новай улады апынуліся і гэткія вядомыя беларускія дзеячы як Аркадзь Смоліч і Сымон Рак-Міхайлоўскі. Абодвум было наканавана пражыць у Гародні даволі доўга[89]. Падчас савецкага панавання С. Рак-

---

[82] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 13.11.1942. № 34. С. 4-5.

[83] Увечары 19 ліпеня правабярэжная частка гораду была занята 15 кавалерыйскай дывізіяй. Да поўначы весь корпус Гая пераправіўся на платах праз Нёман. Аднак раніцай 20 ліпеня польскія часткі перайшлі ў контрнаступленне. Яны здолелі адкінуць бальшавікоў на вуліцы Гародні, але атрымалі загад генерала Л. Жалігоўскага адступіць. Тое ж паўтарылася 21 ліпеня. Бальшавікі спачатку занялі Занёманскі фарштат, потым страцілі яго. У фарштаце пачаліся рабункі габрэйскага насельніцтва польскімі жаўнерамі і часткай мясцовых жыхароў. Наступны дзень горад падвергся моцнаму артылерыйскаму абстрэлу з польскага боку. 22 і 23 ліпеня ў Гародні палыхалі пажары, якія, па чутках, распалілі пры адступленні польскія войскі.

[84] Гл.: Чарнякевіч А. Чырвоны ліпень 1920-га // Пагоня. 18, 25 ліпеня 1997 г.

[85] ДАГВ. Ф. 689, воп. 1, ад.з. 50. Арк. 29.

[86] Тамсама. Ад. з. 57. Арк. 4.

[87] Тамсама. Ад. з. 50. Арк. 49 зв.

[88] Тамсама. Ад. з. 10. Арк. 25; Ад. з. 31. Арк. 1-12.

[89] Напярэдадні на асобай нарадзе ў Менску было вырашана накіраваць для дзейнасці за мяжой некалькі найбольш "бээнэраўскіх" дзеячаў як акрэсліў іх Б. Тарашкевіч – В. Іваноўскага, К. Цярэшчанку, А. Смоліча і С. Рак-Міхайлоўскага. Прычым тры апошнія выязжаць не хацелі. Хутчэй за ўсё С.Рак-Міхайлоўскі трапіў у Гародню з Ваўкавыска, дзе на кароткі час спынілася Беларуская вайсковая камісія, сябрам якой ён з'яўляўся. Аркадзь Смоліч пераехаў у Гародню разам з жонкай Аляксандрай Смоліч-Каткоўскай і маленькай дачкой. Зараз цяжка сказаць ці С. Рак-Міхайлоўскі са А. Смолічам засталіся ў Гародні выпадкова, ці гэта быў запланава-

Міхайлоўскі працаваў школьным інструктарам аддзела народнай адукацыі і займаўся арганізацыяй школ у Гарадзенскім павеце. Акрамя таго, паводле асабістых паказанняў С. Рак-Міхайлоўскага на "Працэсе 45-ці" ў Беластоку, ён з'яўляўся сябрам Гарадзенскага БНК.

Аркадзь Смоліч уладкаваўся ў Гарадзенскі рэўком кіраўніком агранамічнага пададдзелу. Ён распачаў набор інструктараў па сельскагаспадарчым машынам і іншых спецыялістаў. Яго подпіс таксама стаіць пад цыркулярам аб правядзенні ўліку і мабілізацыі коней і валоў у Гарадзенскім павеце[90]. У якасці лектара зямельнага аддзела А. Смоліч выступаў на тэму "Камуны і арцелі", вёў эканамічную геаграфію на рабочых курсах[91].

За два месяцы савецкай улады ўзаемадносіны паміж бальшавікамі і беларускімі дзеячамі пагоршыліся. У першую чаргу, гэта датычала беларускай адукацыі. Беларусы неаднаразова звярталіся ў савецкія ўстановы за дапамогай.

"Наша першая заява, - пісалі настаўнікі беларускай прытулкавай школы ў Гарадзенскі рэўком, - разглядаецца вамі ўжо некалькі тыдняў, мы просім магчыма хутчэй выявіць Ваш погляд на нашу працу і калі знойдзецца немагчымым выдаць нам пэнсію, як гэта было зроблена савецкай уладай у другіх мейсцах, напрыклад у Менску, просім апавясьціць нас пісьменно, бо тады нам будзе патрэбна гэткая паперка. Калі нашы заявы разглядаліcь месяцамі і заставаліcь без увагі панамі Вазнякоўскімі, для нас гэта было зразумела, а данные адносіны да нас - не ясны. Мы просім не літасцівую падачку, законную, запрацаванную заплату, толькі таму, што нам трэба жыць. Мы працавалі ў пралетарскім прытулку, навучэнні вялі, нам не плацілі, мы жылі на пазычкі. Далей так жыць не можна. Мы звярочваемся да Вас, як зацікаўленных жыццём падначаленых Вашаму кіраўніцтву..."[92]

Наступныя крокі савецкай улады адносна беларускага руха наогул насілі варожы характар. У сярэдзіне верасня былі арыштаваныя кіраўнік Гарадзенскага БНК С. Баран ды сакратар БНК С. Якавюк[93] і высланыя ў якасці заложнікаў з горада[94].

ны крок. Той жа Б. Тарашкевіч падкрэсліваў, што "далейшай дарозе С. Рак-Міхайлоўскага ўпэўнена не перашкодзілі прычыны матар'яльнага характара і ў разе эвакуацыі з БВК ён мог мець генеральскае ўтрыманне". Пазней у сваім звароце да Ю. Пілсудскага Часовы прэзыдыўм БВК паведаміў, што С. Рак-Міхайлоўскі трапіў падчас эвакуацыі ў савецкі палон (Б. Тарашкевіч. Аўтабіяграфія... // Спадчына. 1996. № 4. С. 110; O. Latyszonek Bialoruskie formacje wojskowe… S. 140; Мікула Я. Аркадзь Смоліч на Гродзеншчыне // Гродзенскія запісы. Выпуск 1. Гродна, 1993. С. 99.

90 Мікула Я.Аркадзь Смоліч на Гродзеншчыне. С. 100.

91 ДАГВ. Ф. 689, воп. 1, ад.з. 50. Арк. 3, 5.

92 Летам 1920 г. беларускія школы ў Гародні налічвалі больш за 200 вучняў. Планавалася нават стварыць замест беларускіх школ адзіную Гарадзенскую школу 1-й ступені, у спіс будучых выкадчыкаў якой трапілі сёстры Кухарчук, Я.Мальчэўская, М.Алюшкава, У.Федарук, І.Тарасевіч, У.Шалешка, Е.Грынкевіч (ДАГВ. Ф. 689, воп. 1, ад. з. 70. Арк. 19-20, 67, 77, 91.

93 Больш падрабязна пра асобу С. Якавюка гл.: Вашкевіч А., Нарэль Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спэкулянт, манархіст і савецкі дывэрсант // ARCHE-пачатак. 2005. № 5. С. 176-232.

94 Магчыма, што арышт С. Барана быў вынікам пачатай бальшавікамі кампаніі супраць беларускіх эсэраў (Беларускае слова. 1920. № 20; Платонов Р., Сташкевич Н. Тернистый

Дзеянні бальшавікоў маглі мець падставы. Вось, што аб гэтым піша Ул. Крынскі: "Сярод беларускага грамадзянства пачалася дасьпяваць думка аб паўстанча-вызваленчай акцыі... На чале гэтай акцыі станулі хаваўшыеся дагэтуль у Горадні ўдзельнікі зялёнадубскага руху (арганізацыі) "Зялёны Дуб" палкоўнік Адамовіч і ягоны сын "Дзяргач"..."[95] Той жа Ул. Крынскі, аднак, дадае, што ўжо далейшыя падзеі на польска-савецкім фронце перакрыжавалі ўсе планы.

Звесткі аб Варшаўскай катастрофе выклікалі сярод бальшавікоў паніку. Ужо 23 жніўня выйшаў сакрэтны загад аб эвакуацыі Гарадзенскага рэўкома. Эвакуацыя больш нагадвала ўцёкі. У выніку ўжо праз тры дні рэўком апынуўся ў Віцебску, дзе хутка быў расфарміраваны. Пры гэтым усе беларускія супрацоўнікі рэўкома, акрамя арыштаваных засталіся ў горадзе[96].

Ранкам 26 верасня 1920 г. пасля цяжкіх баёў польскія часткі зноў занялі Гародню[97]. У гэты ж дзень адбылося надзвычайнае паседжанне Гарадзенскага беларускага нацыянальнага камітэту, на якім было пастаноўлена аднавіць работу і вясці яе "далей у кірунку абароны нацыянальных і эканамічных патрэб беларускага насельніцтва"[98].

Адначасова прымаецца рашэнне адчыніць усе раней існаваўшыя ў горадзе беларускія ўстановы. Менш, чым праз тыдзень на ініцыятыўным сходзе абіраецца часовае кіраўніцтва Грамады беларускай моладзі, якое абвяшчае перарэгістрацыю сяброў арганізацыі і пачынае падрыхтоўку да арганізацыйнага сходу[99].

Хутка аднавіла сваю працу яшчэ адна беларуская арганізацыя – Гарадзенская беларуская школьная рада[100]. На кароткі час наступае своеасаблівы "рэне-

---

путь к свободе // Неман. 1992. № 11. Арк. 160-161.

[95] Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. 13.11.1942. № 34. С. 4-5.

[96] Савецкая ўлада праіснавала пасля гэтага ў Гародні яшчэ месяц. Гл.: Чарнякевіч А.Новая ўлада // Пагоня. 1997. № 255, 256.

[97] Больш падрабязна гл.: Wyszczelski L. Nieman 1920. Warszawa, 1991.

[98] Беларускае слова. 1920. № 1.

[99] З складу часовага кіраўніцтва Грамады была вылучана тэатральная камісія, якая атрымала даручэнне паставіць шэраг беларускіх спектакляў, канцэртаў і вечарын, каб такім чынам "здаволіць духоўныя патрэбнасці беларускай люднасці, што больш як тры месяцы не мела беларускага тэатра". Адначасова лекцыйная секцыя павінна была наладзіць некалькі тэматычных лекцыяў. 2 і 3 кастрычніка 1920 г. па вул. Замкавай (дом № 5) праходзілі сямейныя вечарыны Грамады беларускай моладзі. Першапачаткова новым старшынёй Грамады быў абраны ...Адамовіч! Пазней склад кіраўніцтва Грамады змяніўся. Сюды ўвайшлі: У.Шалешка (сакратар), Драздоўскі (скарбнік), Амельянчык (кіраўнік тэатральнай секцыі), Матусевіч (адказны за суботнікі), С.Кішка (кіраўнічка лекцыйнай секцыі), Шах (вакальнай), Карповіч (павятовай). Грамада звярнулась з адозвай, каб "кожны, у чыіх жылах цячэ беларуская кроў нёс сваю цагліну ў той вялікі гмах, што завецца беларускай культурай" (Беларускае слова. 1920. № 1, 4, 26, 36, 47).

[100] Галоўнай мэтай Рады было адкрыццё ў горадзе некалькіх школ, гімназіі, а таксама стварэнне сеткі беларускіх школ у павеце. 16 лістапада адбылося паседжанне пленума Беларускай школьнай рады Гарадзеншчыны. У гэты ж час Беларускі нацыянальны камітэт ухваліў пастанову арганізаваць асобую гаспадарчую частку беларускага дзіцячага прытулка (Беларускае слова. 1920. № 20, 27, 37, 62).

санс" беларускага руху ў горадзе. 2 кастрычніка 1920 г. пачала выходзіць газета "Беларускае слова", рэдактарам якой першапачаткова стаў Вячаслаў Адамовіч-малодшы, больш вядомы як "атаман Дзяргач"[101].

"Наша мэта ясная, – абвяшчала "Беларускае слова" ў сваім першым нумары, – нашыя шляхі – простыя. Мы будзем змагацца, як ужо з даўніх часоў змагаецца лепшая частка беларускай інтэлегенцыі, за незалежнасць Беларусі... Мы ведаем, што ўжо хутка Беларусь станецца запраўды незалежнай... Дэмакратычная Польша, напісаўшы на штандары сваім імя і ідэю Пілсудскага, чынна паможа Беларусі здабыць незалежнасць"[102].

У палове кастрычніка ў Гародню прыехалі К. Цярэшчанка, сябры Беларускай вайсковай камісіі А. Борык, А. Плескачэўскі, Я. Шурпа, Ю. Лявыкін, А. Якубецкі, Э. Якабіні ды Ф. Умястоўскі[103]. Пачаўся перыяд дыпламатычных раўтаў ды сустрэч. У сярэдзіне кастрычніка дэлегацыю Гарадзенскага БНК прымаў новы стараста Альфонс Розэн. Ён паабяцаў выдзяліць для беларускага прытулка і гімназіі, якія часова размясціліся ў будынку Барыса-Глебскага манастыра, памяшканне, забяспечыць іх харчаваннем, акрамя таго падтрымаць беларускую адукацыю і кааператыўную справу[104]. Праз некалькі дзён дэлегацыя Беларускай вайсковай камісіі ў складзе А. Якубецкага, Э. Якабіні і Ф. Умястоўскага наведала генерала В. Сікорскага, які дазволіў працу Камісіі на тэрыторыі Гарадзеншчыны. Пры гэтым генерал выказаў асабістую сімпатыю да "беларускай справы".

27 кастрычніка 1920 г. дэлегацыя Беларускага нацыянальнага камітэту ў складзе С. Якавюка і Я. Натусевіча зноў была прынята старастай, а яшчэ праз некалькі дзён прадстаўнікі камітэту С. Баран, С. Якавюк і Я. Натусевіч сустракаліся з начальнікам II аддзела 3 арміі майорам Бэрнерам у справе арыштаваных напярэдадні беларускіх дзеячаў і Бэрнер паабяцаў "палепшыць умовы ўтрымання арыштаваных ды звольніць невіноўных"[105].

Перамены былі даволі значнымі. Напрыклад, епіскап Уладзімір, што раней уваходзіў у Гарадзенскую ўправу, на пачатку кастрычніка справіў урачыстую паніхіду па Аляксандру Прушынскаму як "вялікаму паэце беларускім, які душу сваю палажыў за вызваленне Бацькаўшчыны"[106].

Калі ў першых нумарах газэты "Беларускае слова" часта з'яўляліся звесткі аб украінскім нацыянальным руху, то пазней іх змянілі артыкулы пра С. Булак-

[101] Больш падрабязна гл.: Пашкевіч А., Чарнякевіч А. Невядомыя старонкі біяграфіі В.Адамовіча, ці да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху // Берасцейскі хранограф: Зб. навук. прац. Вып. 4. Брэст: Академия, 2004. С. 314-334.

[102] Беларускае слова. 1920. № 1.

[103] Тады ж у гатэлі "Гандлёвым" адчынілася бюро Беларускай вайсковай камісіі на чале з А. Борыкам па запісу ў беларускі клас Варшаўскай школы падхарунжых (Беларускае слова. 1920. № 7, 8, 13, 16).

[104] Беларускае слова. 1920. № 11, 12.

[105] Тамсама. № 22, 26, 27.

[106] Тамсама. № 5.

Балаховіча і гэта было невыпадкова[107]. "Праз некаторы час, – узгадваў пазней К.Цярэшчанка, – я выехаў у Горадню і заняўся кааператыўна-арганізацыйнай працай. У пачатку лістапада туды прыехаў афіцэр Дземідаў (гэта было пасьля прэлімінарнага міру) і сякрэтна пачаў рабіць у сябе зборы некаторых беларусаў, галоўным чынам тых, што нядаўна прымыкнулі да беларускага руху. На гэтых сходах красачна асьвятляўся місіанізм Балаховіча ў беларускай справе. Значна дапамагаў Дземідаву Гродзенскі архірэй, з благаславенства каторага выехала да Балаховіча шмат беларусаў. Самае сумнае з ўсей гэтай гісторыі адыграў гурток сяброў Нацыянальнага Камітэту (Якавюк, Белецкі і яшчэ двое, прозвішч іх ня помню). Гэта кампанія бяз ведама агульнаго схода Камітэту пераслала Балаховічу праз Дземідава заяву ў якой шчыра падтрымае яго акцыю, бачучы у яго асобе ядынага абаронцу Беларусі. Але Нац. Кам., даведаўшысь аб гэтай авантуры Якавюка і Ко, гэту заяву спраставаў шляхам пратэсту у прэсе. Хутка пасьля ад'езду Дземідава, да Горадні дайшлі весткі, што ў Варшаве пры Балаховічу утварыўся Палітычны Камітэт Беларусі"[108].

6 лістапада 1920 г. у газеце з'явіўся артыкул С. Рак-Міхайлоўскага "Балаховіч і Беларусь", у якім сцвярджалась неабходнасць і надалей "з вялікай асцярожнасцью адносіцца да чыннасці і намераў генерала..." А ўжо 12 лістапада газэта сціпла паведамляла аб тым, што аддзелы С. Балаховіча былі раззброены палякамі ў наваколлях Пінска. У другой палове лістапада пачалі з'яўляцца матэрыялы аб беларускай партызанке[109].

Але падпісанне ў Рызе прэлімінарнай дамовы паміж Масквой і Варшавай перакрэсліла супрацоўніцтва Гарадзенскага БНК з Польшчай. Ужо 1 лістапада 1920 г. адбылося паседжанне Камітэту, які пратэставаў супраць Рыжскай дамовы. У адказ польскія ўлады пачалі рэпрэсіі супраць беларусаў, асабліва стараючыся абмяжаваць уплывы БНК на вёсцы.

На пачатку студзеня 1921 г. "Беларускае слова" было зачынена загадам гарадзенскага старасты Рагалевіча. 20 студзеня ён жа запатрабаваў прадаставіць зацверджаны польскімі ўладамі статут Гарадзенскага і Цэнтральнага Беларускага нацыянальнага камітэтаў. Дакументы былі прадстаўлены. Нягледзячы на гэта на наступны дзень Рагалевіч падпісаў загад аб закрыцці Гарадзенскага БНК. Адначасова па Гародні прайшлі чарговыя арышты і вобыскі сярод беларускіх дзеячаў. Беларуская дэлегацыя накіравалася да старасты і ў II аддзел, але нікога там не засталі[110].

---

[107] Яшчэ 24 кастрычніка 1920 г. адбыўся сход Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту, які выступіў у падтрымку С.Булак-Балаховіча. Першы матэрыял пра яго быў надрукаваны ў "Беларускім слове" 26 кастрычніка. За дзень да гэтага генерал С.Булак-Балаховіч разам з Б. Савінкавым, В. Адамовічам-старэйшым і іншымі сябрамі Беларускага палітычнага камітэту абвясціў пра пачатак барацьбы за вызваленне Беларусі. Артыкул за 5 лістапада так і называўся: "Генерал Балаховіч пачаў вайну за незалежнасць БНР".

[108] НАРБ. Ф. 60, воп. 3, ад. з. 456. Арк. 30-35 адв. – 41 адв., 45 адв. – 49.

[109] 8 і 11 лістапада ў газеце друкуюцца матэрыялы: "На фронце генерала Булак-Балаховіча" і "Усходняя Беларусь чакае Балаховіча". Адначасова з 22 лістапада рэдактарам "Беларускага слова" становіцца У.Шалешка. Апошні артыкул "Балаховіч і беларусы" быў надрукаваны ў № 44 за 24 лістапада (Беларускае слова. 1920. № 19, 29, 30, 33, 34).

[110] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, ад. з. 115. Арк. 52-56 адв.

Супрацоўнік II аддзела так каментаваў роспуск Гарадзенскага БНК і закрыццё газеты "Беларускае слова: "На сённяшні дзень у Гародні ўжо няма II аддзела камандавання 3 арміі, які кіраваў усімі беларускімі справамі, а мясцовая секцыя не мае ніякіх інструкцый – як афіцыйных, так і неафіцыйных, аб тым, што рабіць з беларускай справай. Пасля апошніх падзей, гэта значыць пасля роспуску Камітэту, мясцовыя беларускія дзеячы звяртаюцца ўвесь час да мясцовай секцыі за дапамогай і апекай… Секцыя захоўвае як мага большую дыстанцыю як да цывільных уладаў, гэтак і да беларускага элемента"[111].

Намагаючыся захаваць беларускі цэнтр у Гародні, у горад прыехаў старшыня Варшаўскага БНК Лявон Дубейкаўскі. Ён спадзяваўся рэарганізаваць мясцовы нацыянальны камітэт, з тым, каб коштам адстаўкі найбольш радыкальных і непрыхільна настроеных да палякаў дзеячаў выратаваць самую арганізацыю. Гэткая камбінацыя, відаць, не атрымалася. Аднак нават яе поспех ужо не здолеў бы змяніць ход падзей[112].

У новых умовах, разлічваючы ў першую чаргу на падтрымку Літвы, якая мела з Польшай канфлікт з-за Вільні, камітэт перайшоў да нелегальнай дзейнасці. Частка ягоных сяброў далучылася да стварэння антыпольскага падполля і арганізацыі партызанскага руху. У Коўна за зброяй і літаратурай адправіліся шматлікія кур'еры, а Барыса-Глебскі манастыр ператварыўся ў канспіратыўны цэнтр. Апошняя кропка ў гісторыі Гарадзенскага БНК была пастаўлена вясной 1923 г. "працэсам 45-ці" ў Беластоку. Кіраўнікі арганізацыі, якую польскі суд аднёс да "антыдзяржаўных", атрымалі шматгадовыя прысуды пазбаўлення волі.

Няўдалыя спробы аднавіць беларускае нацыянальнае прадстаўніцтва ў Гародні з выразна праўрадавай і паланафільскай арыентацыяй прадпрымаліся таксама на працягу 20-х гадоў. Апошні Гарадзенскі БНК быў створаны зусім іншымі людзьмі восенню 1941 г. падчас нямецкай акупацыі. І гэтым разам усё скончылася судовымі прысудамі і турмамі, толькі ўжо савецкімі. Аказалася, што няма большага злачынства, чым выступаць у абароне ўласнага народу, асабліва, калі гэта беларускі народ...

---

[111] Ужо ў лютым 1921 г. II аддзел 2 Арміі звярнуўся ў Генеральны штаб з запытам "Аб тактычных інструкцыях адносна беларускай прапаганды". У рэзалюцыі на агентурных дакументах за 16 сакавіка 1921 г. было пазначана: "У справе беларускай прапаганды прапануецца ўстрымацца ад супрацьдзеяння, зразумела, калі яна не з'яўляецца варожай да польскай дзяржаўнасці" (CAW. II oddział NDWP, syg. I.301.8.770).

[112] 4 лютага 1921 г. выйшаў Закон аб нармалізацыі палітыка-прававога палажэння зямель, якія згодна ўмовам польска-савецкага прэлімінарнага міра адыходзілі да Польшчы. У выніку Гародня апынулася ў складзе Беластоцкага ваяводства.

*Анатоль Трафімчык,*
*кандыдат гіст. навук (Варшава)*

# Праявы антысаветызму ў сістэме школьнай адукацыі на Гарадзеншчыне ў 1939 – 1941 гг.

Стварэнне сістэмы савецкай школы ў Заходняй Беларусі ў першыя гады Другой сусветнай вайны працякала супярэчліва. Жорсткі ідэалагічны ўхіл, знішчэнне свабоды веравызнання, кантроль за жыццём вучня і настаўніка выклікалі негатыўную рэакцыю. Часта антыпатыі праяўляліся ў кантэксце супрацьстаяння савецкай уладзе ў цэлым.

Найбольш распаўсюджанай была пасіўная форма супрацьстаяння. Рашыцца на дзеянні было пад сілу далёка не кожнаму. Аднак нават іх адсутнасць не заўсёды ўберагала чалавека ад непрыемнай сустрэчы з сілавымі органамі. Часта патэнцыйная нелаяльнасць да ўлады вызначалася незалежна ад рэальных адносінаў да яе. У разрад сацыяльна-небяспечных элементаў трапілі практычна ўсе, чыё сацыяльнае паходжанне не ўпісвалася ў ідэалагічныя рамкі. Адсюль – шматлікія паведамленні пра "засмечанасць" настаўніцкіх кадраў "чуждыми элементами". Новая ўлада бачыла практычна ва ўсіх старшакласніках – нядаўніх гімназістах – сваіх праціўнікаў і контррэвалюцыянераў. Акрамя паходжання, у разлік бралася сяброўства ў моладзевых арганізацыях.

Аб уступленні мясцовых настаўнікаў у камуністычную партыю і камсамол, прынамсі, для большасці з іх не магло быць і гаворкі. Так, па Беластоцкай вобласці з 1086 настаўнікаў камсамольскага ўзросту да сакавіка 1941 г. ва УЛКСМ уступілі толькі 64 (5,9%). На ўсю вобласць камсамольскія арганізацыі былі толькі ў 20 школах з усёй колькасці 14 сярэдніх і 209 няпоўных сярэдніх, што складае 9,0%[1]. Невялікі прыток мог быць абумоўлены ўступленнем у яе дзяцей прыезджых і габрэяў. Развіццё Усесаюзнай піянерскай арганізацыі таксама адбывалася неадназначна. З аднаго боку, колькасць яе сяброў няўхільна расла, а з іншага – суправаджалася гэта частымі праявамі непрыняцця піянерскага руху, які імкнуўся перавыхаваць дзяцей у камуністычным духу. Падаплёкай непрыняцця быў рэлігійны фактар. Ён жа ўплываў на ўзнікненне яшчэ адной пасіўнай формы праяўлення антысавецкіх настрояў – ненаведвання школы ў рэлігійныя святы і адмовы выконваць заданні на ўроках падчас святаў або адмове ад пазашкольнай працы. Новыя святы школьнікі сустракалі не заўсёды добразычліва, іншы раз праяўляючы варожасць. Так, на дэманстрацыях старшакласнікі Горадні праходзілі

---

[1] Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гарадзенскай вобласці (ДАГАГВ). Фонд 6195, воп. 1, ад. зах. 291, арк 8.

каля трыбуны з мясцовым кіраўніцтвам, адвярнуўшы твары і не адказваючы на вітанні і лозунгі, а каля касцёла дэманстратыўна перахрышчваліся[2].

Страх перад НКУС падштурхнуў многіх жыхароў да ўцёкаў. Больш за 150 настаўнікаў толькі з Беластоцкай вобласці перабраліся за мяжу[3]. Прычым на ўцёкі адважваліся не толькі настаўнікі, але і нядаўнія гімназісты. Першымі былі вучні рэлігійных устаноў, якіх асабліва шмат было ў габрэйскім асяроддзі[4].

Лакмусавай паперкай настрояў сталі пытанні прадстаўнікам савецкай улады або прыезджым настаўнікам на ўроках і сходах пра арыштаваных, пра падзел Польшчы паміж Германіяй і СССР, пра галасаванне пад пагрозай савецкай зброі[5]. Паўсюль вяліся гутаркі, антысавецкая мадальнасць якіх фіксавалася агентамі НКУС.

Многія нядаўнія грамадзяне Польшчы выяўлялі актыўна сваю грамадзянскую пазіцыю. На савецкіх выбарах знаходзіліся людзі, настроеныя апазіцыйна да новых парадкаў, у т. л. настаўнікі[6]. У дакументах архіваў адзначаецца наведванне культавых устаноў школьнікамі і педагогамі. Гэта было непрымальным для савецкай улады, бо настаўнік павінен быў стаць носьбітам камуністычнай ідэалогіі. Па ўсёй Гарадзеншчыне фіксаваліся выпадкі ўзаемапранікнення школьнага навучання і рэлігіі нават пасля іх юрыдычнага размежавання савецкай уладай. А святкаванне важных дат гісторыі польскай дзяржаўнасці з’яўлялася адкрытым праяўленнем варожасці да Саветаў і падлягала неадкладнай элімінацыі.

Канфлікты таксама нараджала моўная сітуацыя. Асабліва востра на яе рэагавалі палякі. Прычым антыпатыі былі накіраваны ў адрас дзвюх моваў – рускай і беларускай. Першая навязвалася de facto, з’яўляючыся для палякаў у той жа час мовай акупантаў. Другая, якая мела перад тым статус другараднай, стала de jure мовай тытульнай нацыі ў БССР. Адносна рускай мовы інфармацыя ў такім кантэксце сустракаецца часцей, што з’яўляецца яшчэ адным доказам антысавецкасці настрояў, бо яна сінанімізавалася з новай уладай. Эскалацыя напружанасці даходзіла да межаў сабатажу, што было цалкам зразумела, бо з 30 школ Горадні ў 12 нацыянальны склад не адпавядаў дэкларуемай мове навучання[7].

Антысавецкія настроі спарадзілі імкненне арганізаваць альтэрнатыву савецкаму навучанню. Таемнае навучанне рэалізоўвалася ў двух асноўных відах: 1) на ўроках у савецкай школе замест прадметаў новай праграмы, 2) у арганізаваных падпольна таемных школах.

---

[2] Gnatowski M. Niepokorna Białostocczyzna. Opór społeczny i polskie podziemnie niepodległościowe w regionie białostockim w latach 1939 – 1941 w radzieckich żrodłach. Białystok, 2001. S. 78.

[3] ДАГАГВ. Фонд 6195, воп. 1, ад. зах. 398, арк. 14-17.

[4] Розенблат Е. Иудаизм и советская власть в западных областях Беларуси (1939 – 1941 гг.) // Radziecka agresja 17 września 1939 r. i jej skutki dla mieszkańców ziem północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Białystok, 2000. С. 186-187.

[5] ДАГАГВ. Фонд 6195, воп. 1, ад. зах. 291, арк. 10; Gnatowski M. Niepokorna Białostocczyzna. S. 79-80; Śleszyński W. Okupacja sowiecka na Białostocczyźnie w latach 1939 – 1941. Propaganda i indoktrynacja. Białystok, 2001. S. 520.

[6] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Фонд 7580 “П”, воп. 1, ад. зах. 430, арк. 6.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 4, воп. 27, адз. зах. 246, арк. 22.

Атрыбутыка савецкай улады ў многіх выклікала рэакцыю варожасці. Вучні псавалі ці знішчалі партрэты бальшавіцкіх правадыроў, савецкую сімволіку, рэвалюцыйныя лозунгі etc. Іншым разам гэта суправаджалася малюнкамі польскага арла або патрыятычнымі надпісамі. Таксама шырокі размах набылі адкрытыя вербальныя пратэсты. У іх назіраецца вялікая ступень эмацыянальнасці, якая сведчыла пра веру і ўпэўненасць у хуткіх пераменах, а часта яшчэ і пра мінімум аб'ектыўнай інфармацыі.

Важнай старонкай жыцця Гарадзеншчыны таго часу стала антысавецкая ўзброеная барацьба. Многія гімназісты яшчэ ў верасні 1939 г. ваявалі супраць Чырвонай Арміі. З іх арганізоўваліся цэлыя атрады. У выніку баявых дзеянняў гарадзенскіх гімназістаў даходзіла нават да знішчэння танкаў[8]. У далейшым Гарадзеншчына пакрылася сеткай падпольных структур. "Тут, у Гародні, паралельна дзейнічалі [...] канспіратыўныя ячэйкі, у тым ліку польская ваенная арганізацыя, аснову якой складалі вучні мясцовых гімназій. Неўзабаве яны ўстанавілі кантакты з вучнёўскай моладдзю па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, сталі рэгулярна курсіраваць сувязныя, пачаліся сумесныя скаардынаваныя акцыі па антысавецкай прапагандзе"[9].

Шматлікасць дакументаў пра "контррэвалюцыйныя", антысавецкія настроі і часта нават актыўную дзейнасць сярод навучэнцаў устаноў адукацыі сведчыць аб тым, што школа, асабліва на Гарадзеншчыне, з'яўлялася адным з асяродкаў непрыняцця новай улады і барацьбы супраць яе. Сакрэтны рапарт сакратару Беластоцкага абкама КП(б)Б Кудраеву ад 10 мая 1941 г. гаворыць пра "панаванне" антысавецкіх настрояў сярод вучняў і настаўнікаў у школах Аўгустова[10].

Савецкая ўлада жорстка распраўлялася з праціўнікамі. У польскай гістарыяграфіі фігуруюць дадзеныя пра крайнюю брутальнасць рэпрэсій. Так, у Горадні былі расстраляны 20 вучняў, якія абаранялі Дом Стральца, прычым выканаўцамі былі функцыянеры НКУС. Па словах мясцовага жыхара У. Навіцкага, яшчэ ў верасні 1939 г. групы дзяцей пад узброеным канвоем выводзіліся з горада ў лес і расстрэльваліся[11]. Трагічная доля чакала і настаўнікаў, якія ўзялі ў рукі зброю. У далейшым па школах пракацілася хваля арыштаў, прычым у турмы кідалі нават 12-13-гадовых падлеткаў[12].

Антысавецкія праяўленні, у якіх школьная моладзь прымала актыўны ўдзел, зафіксаваныя па ўсёй далучанай да БССР тэрыторыі. Аднак сярод насельніцтва Горадні і навакольнага рэгіёна супраціў савецкай уладзе быў найбольш моцным.

---

8 Liszewski K. Wojna polsko-sowiecka 1939 r. Londyn, 1986. S. 41, 58, 61-62.

9 Сямашка Я. І. Армія Краёва на Беларусі. Мінск, 1994. С. 16.

10 Gnatowski M. Niepokorna Białostocczyzna. S. 399-401.

11 Filipowicz M., Sawicka F. Zbrodnie sowieckie na obroncach Grodna 1939 r.// Biuletyn Historii Pogranicza. 2005. № 6. S. 12, 15-16. Падобныя ўспаміны патрабуюць верыфікацыі, бо іх носьбіты з прычыны пакрыўджанасці савецкай уладай нярэдка схільны гіпербалізаваць пяратыўнасць савецкай улады.

12 Batura W., Makowski A., Szlaszyński J. Dzieje Augustowa od założenia do 1945 roku. Suwałki, 1997. S. 291.

*Дадатак*

## Дыферэнцыяцыя формаў антысавецкіх настрояў і дзеянняў у школах Горадні і Гарадзеншчыны (1939 – 1941)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Пасіўныя выяўленні | У выглядзе адсутнасці дзеянняў | | Сацыяльнае паходжанне |
| | | | Захаванне дыстанцыі паміж прыехаўшымі і мясцовымі |
| | | | Неўступленне ў піянерскую і камсамольскую арганізацыю, кампартыю ці выхад адтуль |
| | | | Ненаведванне школы ў дні рэлігійных святаў |
| | | | Адмова выконваць заданні на ўроку ў дні рэлігійных святаў ці адмова ад пазашкольнай дзейнасці |
| | Якія не праследавалі антысавецкіх мэтаў, але выяўлялі пазіцыю | | Эміграцыя, уцёкі за мяжу |
| | | | Страх арышту, прэвентыўныя меры ў гэтай сувязі |
| | | | Пастаноўка на грамадскіх сходах “няправільных” пытанняў, прапаноў |
| | | | Абмеркаванне недахопаў жыцця пры новай уладзе (бытавы, міжасабовы узровень) |
| Актыўныя выяўленні | Актыўная грамадзянская пазіцыя (т. зв. маральны супраціў) | | Галасаванне супраць савецкай улады на выбарах ці ігнараванне іх |
| | | | Дапамога рэпрэсаваным савецкай уладай |
| | | | Выкананне рэлігійных і культурных традыцый |
| | | | Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць (у школе ці па-за ёй, пры супрацоўніцтве са святарамі ці без) |
| | | | Патрабаванні пераводу школы на польскую мову ці захаванне польскай структуры школ, пераход у польскія школы |
| | | | Школьныя забастоўкі, у т. л. ігнараванне савецкай школы, а таксама байкот рускай і/ці беларускай мовы і інш. |
| | Дзеянні, якія мелі яўна антысавецкі характар і з’яўляліся крыміналам па савецкіх законах | Т. зв. малы сабатаж | Антаганізм паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей на глебе антысаветызму |
| | | | Тайнае навучанне (у т. л. выкладанне прадметаў праграмы польскай школы) |
| | | | Пашкоджанне савецкай сімволікі і атрыбутыкі, у т.л. партрэтаў правадыроў, а таксама псаванне маёмасці |
| | | | Стыхійныя антысавецкія выказванні, заклікі, пагрозы, лістоўкі, лозунгі і да т. п. |
| | | Арганізаваная барацьба | Баявыя дзеянні (перадусім у верасні 1939 г.), напады на савецкіх функцыянераў і калабарантаў |
| | | | Арганізацыя падпольных структур і “контррэвалюцыйная” прапаганда, агітацыя і інш. дзейнасць |

# Гістарыяграфія. Крыніцазнаўства



*Юры Гардзееў, Ph D (Кракаў)*

# Горадабудаўнічая культура Гародні: паміж фактам і вымыслам[1]

У 2007 г. выйшла з друку кніга Юрыя Нікадзімавіча Кішыка, прысвечаная горадабудаўнічай культуры Гародні. Улічваючы адносна невялікую колькасць публікацый па гарадской праблематыцы Беларусі, яе з'яўленне, бясспрэчна, належыць вітаць. Кніга складаецца з уступу, пяці раздзелаў, заканчэння, спісу літаратуры. Першы раздзел прысвечаны развіццю планіроўкі далакацыйнага, г.зн. дамагдэбургскага горада. Аўтар спрабуе рэканструяваць планіровачную сетку сярэднявечнага горада. У другім раздзеле змешчаны аналіз горадабудаўнічага развіцця Гародні ў XVI ст. У трэцім – аўтар засяродзіў увагу на архітэктурных здабытках перыяду Новага часу. Чацвёрты і пяты раздзелы распавядаюць пра архітэктурна-планіровачнае развіццё ў XIX і XX ст.

Уражвае багаты ілюстрацыйны блок. У першую чаргу звяртаюць на сябе ўвагу выкананыя асабіста аўтарам малюнкі, аксанаметрычныя панарамы горада розных перыядаў. Дзякуючы змешчаным у публікацыі фасадам (№ 114-127) аўтар ажыўляе нашыя ўяўленні пра архітэктурна-мастацкія здабыткі XIX – пачатку XX ст. У кнізе шмат, як выкарыстаных раней, так і малавядомых планаў Гародні XIX ст. Заслугай аўтара з'яўляецца таксама даследаванне некранутых дагэтуль крыніц другой паловы XX ст., што захоўваюцца ў Беларускім архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Найбольш наватарская частка кнігі – апошняя, прысвечаная рэканструкцыі гістарычнага горада ў другой палове XX ст. Аўтар уводзіць у навуковы абарот невядомыя планы горада, нязДзейсненыя праекты перабудовы яго цэнтральнай плошчы. Напрыклад, упершыню публікуецца план Гародні 1950 г. з "белымі плямамі" знішчаных кварталаў горада (с. 229). Каштоўнымі з'яўляюцца матэрыялы пра планы грунтоўнай перабудовы Савецкай плошчы ў 1946-1949 г. (с. 230-236) і ўзвядзення на ёй Дома Саветаў (с. 237).

Аўтар заўважае, што актыўны наступ на гістарычную забудову распачаўся ў 60-х гг. XX ст., калі гістарычнае асяроддзе ўспрымалася як прымітыўнае. І як вынік – знішчэнне Фары Вітаўта, планы татальнага знішчэння вуліц Замкавай ды К. Маркса. Але менавіта ў гэты час пачалі гучаць галасы, якія аспрэчвалі такія падыходы да гістарычнай спадчыны Гародні. Ю.Кішык упершыню прааналізаваў Генплан 1973 г., які прадугледжваў пабудову новага гарадскога цэнтра за Гараднічанкай (с. 248-261), а таксама іншыя праектныя прапановы. У 70-я гг. XX ст. перапланіроўка павінна была закрануць плошчу У.Леніна (с. 261-264).

[1] Аўтар разважае над тэкстам кнігі Юрыя Кішыка *Градостроительная культура Гродно (Минск, 2007, 303 с.)*

Аўтар лічыць, што праект рэгенерацыі цэнтра А. Горба 1989 г. і праект, распрацаваны інстытутам "Белспецпраектрэстаўрацыя" ў гэтым жа годзе, якія прадугледжвалі радыкальную ахову горадабудаўнічай спадчыны, рэстаўрацыю ратушы ды "Фары Вітаўта", не дастаткова абгрунтаваныя (с. 268-270). Ён сцвярджае, што немэтазгоднасць іх аднаўлення вынікае са створанага ў 50-60-я гг. XX ст. архітэктурнага асяроддзя, у якое ані "Фара Вітаўта", ані ратуша не ўпісваюцца. У іншым месцы аўтар прыводзіць прыклад мастацкага ўзаемадзеяння гістарычнай і пасляваеннай архітэктуры, звяртаючы ўвагу на тое, што 4-павярховы будынак Аблсаўпрофа "отторгается от исторической застройки" па прычыне сваёй маштабнасці, высотнасці ды мастацкіх асаблівасцей (с. 274-275).

Якія ж перспектывы Старога горада? З разважанняў аўтара насоўваецца небясспрэчная выснова, што комплексная рэгенерацыя гістарычнага цэнтра не мае пад сабой падставы. На яго думку, трэба абмежавацца фрагментарным аднаўленнем помнікаў, спалучаным з кансервацыяй іх захаваных частак. Але праблема ў тым, што ў сённяшніх умовах рэстаўрацыя асобных помнікаў ці кансервацыя гістарычнай забудовы ў Гародні зведзена да фікцыі. Таму можна пагадзіцца з яшчэ адным меркаваннем, што рэстаўрацыя належыць не столькі да навукова-рэстаўрацыйнай, колькі да грамадска-палітычнай дзейнасці (с. 270-271). Аб гэтым сведчаць "рэканструкцыя" цэнтра горада, "зачыстка" паасобных каштоўных помнікаў неабарока і канструктывізму. А гэта значыць, што забудова гістарычнага цэнтра ўспрымаецца не ў якасці гісторыка-культурнага патэнцыяла горада, але хутчэй як фізічны баласт.

На думку аўтара, арыгінальнасць архітэктуры заключаецца ў "мастацкай выразнасці новай забудовы" (с. 272). Прыкладам тэндэнцыі спалучэння традыцыі і сучаснага можна палічыць стылізацыю забудовы, прывязаную да гістарычнага асяроддзя (будынкі К. Маркса 3, 38).

Працягваючы аналіз зместу кнігі, спынімся на метадалагічных падыходах аўтара, стаўленні да крыніц, іх выкарыстання ды інтэрпрэтацыі. Ва ўступе кнігі Ю.Кішык слушна заўважае, што як дагэтуль працы па гісторыі горадабудаўніцтва Гародні пісаліся пераважна гісторыкамі, археолагамі, мастацтвазнаўцамі ды краязнаўцамі. Архітэктары не надавалі ўвагі гэтай праблематыцы (с. 8). З гэтай пасылкі аўтар робіць выснову аб няздольнасці гісторыкаў і археолагаў раскрыць эвалюцыю планіровачнай структуры, выявіць прыкметы горадабудаўнічай пераемнасці, зрабіць прафесійную графічную рэканструкцыю аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі забудовы горада. Дзеля доказу свайго меркавання аўтар чамусьці згадвае беспадстаўную "дыскусію" аб часе атрымання магдэбургскага права. Гаворка пра гэта пойдзе ніжэй.

Сцвярджэнне, што гісторыкам не ўласцівы тэарэтычныя разважанні наконт эвалюцыі горадабудаўнічага ансамбля і яго эстэтычна-мастацкіх асаблівасцяў, а таксама навыкі правядзення аксанаметрычнай рэканструкцыі гарадской забудовы,

не выклікае пярэчанняў. Можна пагадзіцца з сцвярджэннем аўтара, што ні гісторыкі, ні археолагі не ў стане самастойна раскрыць усе горадабудаўнічыя таямніцы. Але ці па сілах гэта таксама архітэктарам?

Згаданая вышэй катэгарычнасць суджэнняў не ўласціва навуковым даследаванням. У навуцы трэба заўсёда імкнуцца да пошукаў *aurea mediocritas*. А такой залатой сярэдзінай у дадзеным выпадку з'яўляецца інтэрдысцыплінарнасць, прынцып выкарыстоўвання напрацовак гістарычнай навукі, архіўных пошукаў пісьмовых ды графічных матэрыялаў у сукупнасці з вынікамі археалагічных даследаванняў. Толькі на іх падставе магчыма праводзіць абагульненні, будаваць тэорыі, увогуле спрабаваць аргументавана разважаць.

Аўтар слушна заўважае, што можна нанава ўглядзецца ў аб'ект і вобразна адчыніць дзверы, праз якіх ніхто не ўваходзіў, г.зн., прымяняючы новыя метады даследавання і выкарыстоўваючы вядомыя дакументы можна атрымаць новыя высновы, аб якіх раней ніхто не здагадваўся.

На жаль, аўтар не заўсёды прытрымліваецца прынцыпа прыцягнення новых крыніц. Аб гэтым сведчыць безапеляцыйнае сцвярджэнне аб адсутнасці "совершенно неизвестных документов" (с. 9), напэўна, маючы на ўвазе ў першую чаргу графічныя матэрыялы. У іншым месцы сустракаецца меркаванне, якое, на жаль, не можа не засмуціць: "Очень беден комплекс документов, которые могут дать представление о градостроительной структуре, скрытой в глубине веков" (с. 14). Гэта меркаванне слушнае адносна дамагдэбургскай гісторыі горада, але з ім нельга пагадзіцца, калі гаворка ідзе пра перыяд XVI – XVIII стст.

Асабіста амаль 20 год вяду архіўныя пошукі па гісторыі Гародні. Эфектам пошукаў з'яўляюцца шматлікія крыніцазнаўчыя артыкулы, у тым навуковыя манаграфіі[2]. Насамрэч, у архівах захоўваецца безліч крыніц, у першую чаргу гэта недаследаваныя пісьмовыя матэрыялы па гісторыі горада: тэстаменты, апісанні асобных сядзіб, акты іх куплі-продажу, спісы ўладальнікаў нерухомай маёмасці, згадкі пра гарадское рамяство і гандаль, якія паходзяць з архіва гарадзенскага магістрата XVI – XVIII стст. У архіўных сховішчах знаходзяцца таксама цікавыя графічныя матэрыялы, у тым ліку планы Гародні, кварталаў горада, фасады шматлікіх камяніц XIX ст., што аўтар сам, зрэшты, даводзіць у апошніх раздзелах кнігі. Нельга пагадзіцца з выказанай думкай наконт беднасці крыніцазнаўчай базы даследаванняў гісторыі Гародні.

Археалагічныя раскопкі падаюцца аўтару бесперспектыўным спосабам даследавання, па прычыне іх правядзення на абмежаваных месцах. "Следует начисто отказаться от мысли, что археологические изыскания откроют нам предисторический (VIII-X века) или раннесредневековый (XI-XIII века) Городно, – с укреплениями и посадами, храмами и торгами... Можно истратить немало

---

[2] Gordziejew J. Socjotopografia Grodna w XVIII w. Toruń, 2002; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня (сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў 16 – 18 ст.). Гародня – Wrocław, 2008.

средств и времени и обнаружить лишь повторение того, что уже стало ясным". Аўтар падмацоўвае свае разважанні выказваннем Валянціна Сядова пра тое, што раскопкі ў Кіеве і Ноўгарадзе не высветлілі карціны паходжання гэтых гарадоў (с. 14). Безумоўна, нельга абсалютызаваць значэнне археалагічнай навукі, але таксама нельга змяншаць яе магчымасці.

Чаму для вывучэння сярэднявечнай гісторыі Гародні важнымі з'яўляюцца раскопкі? У адрозненні ад заходнееўрапейскіх гарадоў магістрацкія канцыляры, а г.зн. і гарадскія архівы на беларускіх землях пачалі складвацца даволі позна. Актавыя кнігі магістрата Гародні пачалі пісацца пасля атрымання горадам магдэбургскага права. Акрамя таго не ўсе яны захаваліся. Па гэтай прычыне археалагічныя раскопкі з'яўляюцца асноўнай, хаця і не адзінай, крыніцай па гісторыі сярэднявечнага горада. Аніякія "разважаннні на тэму" іх не заменяць.

Паспрабуем адказаць на пытанне аб дасягненнях археалагічных пошукаў у нашым горадзе. Раскопкі, праведзеныя на тэрыторыі горада ў XX ст., заўсёды прыводзілі да нечаканых адкрыццяў. Да такіх належаць, напрыклад, Ніжняя царква на замкавым дзядзінцы ці Прачысценская царква. Дзякуючы ім удалося наблізіцца да разгадкі месцазнаходжання Васкрасенскай царквы (дзядзінец Новага замка) і Малой царквы. Зрэшты, у 90-х гг. XX ст. падчас будаўнічых прац былі адкрыты рэшткі Васкрасенскай царквы, перанесенай у XVII ст. на скрыжаванне сучасных вуліц Кірава і Сацыялістычнай.

Прыходзіцца канстатаваць, што ідэя недасканаласці гісторыка-археалагічнай метадалогіі даследаванняў ды ігнараванне іх вынікаў праходзіць праз кнігу "чырвонай ніткай", становіцца стрыжнем разважанняў аўтара.

Узнікае пытанне, якія метады даследавання горадабудаўнічай структуры горада найбольш аптымальныя? У першую чаргу аўтар прапануе метад гісторыка-генетычнага аналізу, які здаўна прымяняецца навукоўцамі, што займаюцца гісторыяй горадабудаўніцтва Гародні. Аўтар прапануе таксама метады параўнальнага і структурнага аналізу, якія дапамагаюць раскрыць унутраныя сувязі ды супадпарадкаванне розных горадабудаўнічых кампанентаў. Да першага метаду параўнання варта паставіцца з пэўнай засцярогай па прычыне ягонай "ускоснасці". Яго падманлівасць заключаецца ў выпадковасці аналогіі і памылковым падабенстве. Інакш кажучы, прычыны фарміравання падобных кампазіцыйных элементаў горадабудаўнічай структуры ў розных гарадах, напрыклад, квадратнай па форме плошчы могуць выразна адрозніваца. Акрамя таго факт існавання ў горадзе *X* доўгага рынку не дае падстаў казаць аб тым, што такі ж рынак абавязкова функцыянаваў у горадзе *Y*. Галоўным метадам ці "основным языком проведения анализа" аўтар лічыць графааналітычны метад, аб прыкладах якога пойдзе гаворка ніжэй. Істотнае месца ў сваёй кнізе аўтар прысвячае спробам рэканструкцыі планіровачнай кампазіцыі Гародні ў раннім сярэднявеччы, абапіраючыся на рэгрэсіўным метадзе аднаўлення планіроўкі сярэднявечнага горада польскага даследчыка С. Бабінскага (с. 18-19).

Паводле згаданай вышэй методыкі, даследаваць горадабудаўнічую структуру ранняй Гародні прадстаўляецца магчымым дзякуючы правядзенню аналіза найбольш старога, захаванага плана горада. Аўтар падкрэслівае, што гэта план Юзафа Маркевіча 1780 г., які, цытую "принят в качестве графической опоры исследования" (с. 19). З такім захадам трэба згадзіцца. Дазволю заўважыць, што згаданы метад прымяняецца ў даследаванняў па гісторыі планіровачнай структуры горада пачынаючы з 60-х гг. XX ст. Першай у навуковы абарот кадастравы план Гародні 1780 г. увяла Алена Квітніцкая, якая на яго падставе правяла рэканструкцыю планіровачнай сеткі Гародні XVI ст.[3] Акрамя таго, абапіраючыся на ім, была зроблена гіпатэтычная спроба адказу на пытанне аб планіроўцы, гарадскіх межах і забудове дамагдэбургскай Гародні другой паловы XIII – пачатку XV ст.[4]

Аўтар кнігі робіць спробу правесці рэканструкцыю найбольш старадаўняй, сярэднявечнай структуры Гародні (мал. 12). На ягоную думку, "выявленные на берегах Городничанки элементы доисторического поселения (sic!)... убеждают в том, что это и есть исходное пятно, завязь будущего Городно". Не адкідваючы магчымасці кожнай навуковай гіпотэзы, трэба зазначыць, што меркаванне аўтара вельмі адважнае. Паспрабуем разабрацца ў ягоных разважаннях.

Па-першае, думкі наконт лакалізацыі старажытнай структуры Гародні, якая выцягвалася ўздоўж рэчкі (град – прысёлак – торг), нельга лічыць гіпотэзай. Неабходным элементам гіпотэзы з'яўляецца абгрунтаваная пасылка, якая ў тэксце адсутнічае. Па-другое, аўтар не прыводзіць ніякіх грунтоўных, пераканаўчых доказаў існавання града над Гараднічанкай. Нельга знайсці адказы на пытанні, якім чынам на берагах Гараднічанкі было выяўлена першапачатковае паселішча? У якіх крыніцах былі знойдзены гэтыя звесткі? Аўтар нібыта абапіраецца на „весь комплекс доступных нам источников (якіх? – *Ю.Г.*), в том числе – на своеобразный и загадочный опорный план" (мал.10). Урэшце, з'яўляецца пытанне, куды знікла гэта дагістарычная гарадзенская "Троя"? Чаму ў пазнейшых дакументах аб ёй няма ніякіх звестак?

На жаль, доказы тэзіса адсутнічаюць. Сваё меркаванне аўтар грунтуе на адным аргуменце, які нельга лічыць навуковым: "Обитавшие здесь люди обязательно должны были обратить внимание на небольшой выступ верхнего плато на левом берегу Городничанки". Насоўваюцца пытанні, а калі не звярнулі? Калі выбралі іншае месца?

Як сцвярджае аўтар, "древний Городно возник не только вокруг княжеского замка, не исключительно из порубежной крепости на границе Киевской Руси, и не из одних лишь торгово-ремесленных поселений, как это рисуется истори-

---

3 Квитницкая Е. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. 1964, № 17, с. 11-38.

4 Гардзееў Ю. Планіроўка Гродна ў другой палове 13 - пачатку 15 стст. // Гістарычны альманах. 1998, № 1, с. 13-26.

ками в отрыве от реальной картины". Паводле Ю.Кішыка, да з'яўлення Гародні прычыніўся "сам ход исторического развития родо-племенного строя" (с. 29). Над Гараднічанкай узнік племянны цэнтр са сфарміраванай горадабудаўнічай структурай, які меў сваю сацыяльную арганізацыю на чале з старэйшынамі. Другі цэнтр – сядзіба князя – знаходзіўся на Замкавай гары. Аднак, на думку аўтара кнігі, яна мела другасную ролю. Побач з ёю месціліся гандлёва-рамесныя пасады: "Появившийся значительно позже князь уже застал в Городно сложившуюся структуру власти старейшин и сформировавшуюся градостроительную структуру" (с. 29).

Узнікае яшчэ адно пытанне, а калі з'явіліся ў Гародні князі? Адказ на гэтае пытанне знаходзім далей. На падставе летапісных згадак пра паходы кіеўскіх князёў на землі Панямоння ў канцы X – першай палове XI ст. аўтар робіць выснову: "Значит, не исключено, что самостоятельность Городно как племенного центра пала еще с конца X или начала XI века. Местные старейшины тогда были заменены чиновниками Киева" (с. 29, 30). Такім чынам, сцвярджаецца, што ў Гародні існавалі два цэнтры. Першы – племянны над Гараднічанкай з сваім градам ды старэйшынамі, другі – на Замкавай гары – з кіеўскімі "чыноўнікамі". У іншым месцы можна сустрэць думку, якая пярэчыць вышэйвыкладзенай канструкцыі: „Новый град на Замковой горе ... служил ...средоточением выделявшейся племенной знати, присвоившей власть" (с. 31). Як жа мясцовая племянная знаць захапіла ўладу на Замкавай гары, калі, паводле слоў аўтара, у канцы X – першай палове XI ст. яна была заменена "чыноўнікамі" з Кіева?

Можна задаць шэраг іншых пытанняў аўтару кнігі, які намаляваў карціну ідылічнай сельскай абшчыны. Аўтар не тлумачыць, чый гэта быў племянны цэнтр. Ці ў выпадку старажытнага паселішча мы маем дачыненне з паселішчам першабытнабшчыннага ладу і тэрытарыяльнай абшчынай? Чаму маёмаснае расслаенне прывяло да фарміравання абшчыны на чале толькі з старэйшынамі? А што з рода-племяннай знаццю ці дружынай? І ўрэшце, калі ў Гародні ў раннім сярэднявеччы сфарміравалася структура ўлады, то чаму тут "значительно позже" з'явіліся князі?

Распавядаючы пра існаванне знешняй абарончай лініі горада, аўтар сцвярджае, "позже к этому мнению (Рапапорта – *Ю.Г.*) присоединились белорусские исследователи А.К. Кравцевич и Ю. Гордеев, не приводя, однако, доказательств места и времени строительства второй линии укреплений" (с. 32). Паспрабую адказаць на заўвагу. Меркаванне П. Рапапорта мела гіпатэтычны, хаця і небезпадстаўны характар. Ён асцярожна выказаўся аб магчымасці існавання знешней лініі абароны. А. Краўцэвіч не абмежаваўся дапушчэннем. Ён звярнуў увагу на асаблівасці рэльфа: 1) высокія рачныя берагі, глыбокі яр з усходу ад вакольнага горада, якія стваралі "сістэму кругавой абароны", 2) крыжацкую небяспеку, 3) абапіраючыся на рэканструкцыю плана Гародні XVI ст. А. Квітніцкай,

паказаў іх лакалізацыю[5]. Як відаць з тэксту, кнігі яе аўтар згаджаецца з яго версіяй, падаючы прыблізную трасіроўку гарадскіх умацаванняў (с. 33).

Што тычыцца доказаў існавання знешняй лініі гарадской абароны, то яны былі знойдзены ў лісце мазавецкіх князёў да папы рымскага Яна XXII. Ліст датуецца 1325 г. У такога тыпу карэспандэнцыі не змяшчаліся падрабязныя звесткі пра гарадскія збудаванні Гародні, а толькі мімаходзь згадвалася ўмацаванне *oppidum* без указання канкрэтнай даты і месца[6]. Гэтыя дадзеныя даюць нам права дапускаць факт існавання лініі знешніх гарадзенскіх умацаванняў ужо на пачатку XIV ст.

Кішык прапануе версію аб магчымым узвядзенні другой лініі ўмацаванняў у канцы XII ст. (мал. 18), не прыводзячы доказаў гэтай даты ў кнізе, а іх магчымае з'яўленне тлумачыць даволі агульна, а менавіта імкненнем надаць замку новую якасць, удасканаліць абарончыя збудаванні ды інш. Нягледзячы на адсутнасць спасылак, такое меркаванне выглядае цалкам праўдападобна, калі ўлічыць незаўважанную аўтарам прычыну – пачатак рэгулярных крыжацкіх нападаў, які датуецца 1283 г.

Графічным падсумаваннем разважанняў наконт дамагдэбургскай Гародні з'явіўся шэраг аксанаметрычных панарам горада. На першай з іх, якая прадстаўляе Гародню пачатку XIII ст., аўтар, абапіраючыся ў першую чаргу на вынікі археалагічных раскопак Алеся Краўцэвіча, пазначае месцазнаходжанне галоўных аб'ектаў – замка, Каложскай царквы, Прачысценскай царквы (адкрытай ў 80-х гг. XX ст.), а таксама схематычна размяшчае на плане гіпатэтычныя гарадскія абарончыя муры, цэрквы Малую ды Васкрасенскую, якая, як мяркуецца, стаяла на тэрыторыі вакольнага пасада. На панараме былі нанесены “место бывшего предисторического города” над Гараднічанкай ды тры рынкі (“торговища”), існаванне якіх не прасочваецца ў пісьмовых крыніцах.

Найбольшыя спрэчкі выклікае пазначэнне на аксанаметрычнай выяве царквы св. Іллі, якая з'яўляецца прыкладам пападання аўтара ў пастку суб'ектывізму ды іканаграфічнай міфатворчасці. Нагадаем, што царква св. Іллі згадваецца ў крыніцах толькі адзін раз у 1633 г. Аўтар падкрэслівае, што яе “местоположение... ранее было не установлено” (стар. 35) (sic!). Пры гэтым ён размяшчае яе на аксанаметрычнай рэканструкцыі Гародні пачатку XIII ст. (!?) (мал. 19). Такім чынам, паводле змешчанага ў кнізе плана, чытач можа зрабіць памылковую выснову аб тым, што царква св. Іллі існавала ўжо ў XII ст. (!?) і займала адно з наднёманскіх плато (на месцы сённяшняга драмтэатра). Такую выснову аўтар робіць на падставе медзярыта Адэльгаўзэра/Цюндта XVI ст., на якім злева ад ратушы стаіць храм, які, паводле меркавання Ю.Кішыка і быў царквой св. Іллі

[5] Краўцэвіч А. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV-XVIII стст. (планіроўка, культурны слой). Мінск, 1991. С. 75-76.

[6] Гардзееў Ю. Планіроўка... С. 25-26; Nowy kodeks dyplomatyczny Mazowsza. Wyd. I. Sułkowska-Kuraś i S. Kuraś. Cz. 2. Wrocław, 1989. S. 178.

Прарока (с. 93) (!?). Разважаючы наконт гісторыі царквы, аўтар піша, што пасля вайны з Масквой 1654-1667 гг., на яе месцы быў пабудаваны касцёл кляштара бернардынак (!?). Заўважым, што даступныя крыніцы не згадваюць аб існаванні ў Гародні ў XII-XIII стст. царквы св. Іллі. Гэта вымысел аўтара кнігі. Ён выразна ігнаруе даследаванні па соцыятапаграфіі горада, у тым гісторыю кляштара бернардынак ды вывучаныя маёмасныя адносіны гэтай часткі горада[7]. Ю.Кішык бяздоказна сцвярджае, што гэты ўчастак „оставался свободным от рядовой застройки вплоть до середины XVII века” (с. 37).

Як жа на самой справе выглядала засяленне і маёмасная прыналежнасць пляцаў, на якіх сёння знаходзіцца будынак абласнога драмтэатра? Як вядома, бернардынкі з’явіліся ў Гародні не пасля 1667 г., як піша аўтар, а ў 1618 г. На пачатку XVII ст. манашкі атрымалі ад пісара літоўскага Януша Скуміна Тышкевіча шэраг забудаваных пляцаў. Праз два гады яны набылі ўчастак з домам ад Юрыя Сцыпіё дэ Кампы. Гэтыя факты сведчаць аб тым, што да з’яўлення кляштара пляцы гэтага квартала знаходзіліся ў валоданні шляхты, а не царквы св. Іллі. У 1621 г. на сродкі манаскіх пасагаў і з фундацыі літоўскага падканцлера Казіміра Сапегі былі ўзведзены будынкі кляштара і касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Маці Божай. У 1651 г. храм быў асвечаны. У сярэдзіне XVII ст. маскоўскія войскі спалілі ўсе кляштарныя збудаванні, а не царкву св. Іллі[8].

Царква св. Іллі XII ст. ды царква св. Спаса XIV ст. таксама нанесены на панараму горада канца XIV ст. Апошнюю аўтар размясціў на месцы, дзе цяпер знаходзяцца будоўлі пабернардынскага кляштара (с. 41) (!?) І ў гэтым выпадку ступень верагоднасці такой рэканструкцыі з’яўляецца надзвычай сумніўнай і спрэчнай.

Свае метадалагічныя падыходы аўтар тлумачыць прымяненнем метада аксанаметрычнай рэканструкцыі, які абапіраецца на „сведение в единое целое разнообразной информации, основанной на источниках разной степени достоверности, а также на неизбежных предположениях”. Можна згадзіцца з сцвярджэннем пра выкарыстанне рознабаковай інфармацыі з рознай ступенню даставернасці. Але, на жаль, прыклад царквы св. Іллі паказвае на метадалагічную перавагу “неизбежных предположений”. Прыходзіцца канстатаваць, што лакалізацыя царквы св. Іллі ды царква св. Спаса – вынік выключна фантазіі аўтара.

У далейшых разважаннях аўтар спрабуе высветліць шэраг загадак, звязаных з гэтым раёнам горада. Адной з іх з’яўляецца лакалізацыя збудаванняў кляштара аўгусцінцаў. На жаль, і ў гэтым выпадку аўтар надалей застаецца прыхільнікам дэдуктыўнага падыходу. На пытанне, дзе стаяў кляштар з касцёлам св. Тройцы, аўтар адказвае: “Участок монастыря аугустинцев находился в блоке застройки между улицами, которые образовались из упоминавшихся, проходящих возле града дорог. Позже они получат свои названия – Большая Троицкая и улица от

[7] Падрабязней гл. Gordziejew J. Socjotopografia..., s. 169.

[8] ЛДГА. Ф. 694, воп. 1, ад.з. 3985, арк. 13адв; ад.з. 4020, арк. 259; Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі. № 6325, арк. 6; VL. T. IV, s. 475.

Немецкого рынка к Виленской улице. Но улица от Немецкого рынка в конце XV века проходила не по трассе нынешней улицы Доминиканской, а несколько севернее, и старое торговище находилось не там, где после перепланировки разместился Немецкий рынок, хотя и очень близко”. Гэтая думка схіляе чытача да таго, што касцёл св. Тройцы стаяў не ў Нямецкім рынку, а на паўночны ўсход ад яго, у таямнічым рынку (пра які адсутнічаюць згадкі!), на супрацьлеглым баку Траецкай вуліцы, на поўнач ад вуліцы *Ад Нямецкага рынка да Віленскай*, якая аказваецца зусім не тоеснай сучаснай Даманіканскай.

Нягледзячы на тое, што кляштар аўгусцінцаў існаваў у канцы XV – XVI ст., г.зн. у “пісьмовым” перыядзе гісторыі Гародні, спасылкі на гэтыя крыніцы ў кнізе адсутнічаюць. Аўтар будуе сваю рэканструкцыю не на аргументах, а на інтуіцыі.

Між тым, як сведчаць архіўныя крыніцы, вялікі князь Аляксандр Ягайлавіч заснаваў каталіцкі кляштар аўгусцінцаў у канцы XV ст.[9] На версію аб тым, што аўгусцінская сядзіба ляжала ў паўднёвай частцы Нямецкага рынка, паказвае згадка 1494 г. аб вуліцы (вуліца Плябанская), якая вяла „versus ecclesiam claustralem sancte Trinitas”, ці „да касцёла кляштара св. Тройцы”[10]. Гэтую гіпотэзу ўскосна пацвярджае архіўная згадка аб тым, што ў 1674 г. пляц мяшчанкі Ганны Раўскай знаходзіўся паміж Гараднічай, „старадаўнім Віленскім гасцінцам” ды пляцамі “Святой Тройцы”[11]. Вышэй прыведзеныя матэрыялы схіляюць да версіі аб знаходжанні кляштара аўгусцінцаў менавіта ў паўднёвай частцы Нямецкага рынка. Канешне, не выклікае сумнення, што і гэта дапушчэнне патрабуе дадатковага крыніцазнаўчага пацверджання.

Нямецкі рынак, названы Ю. Кішыкам “новообразованным”, з’явіўся ў XVI ст. на месцы “предисторического торга, вблизи него, посреди сгустка старых дорог ...” (с. 73). Узнікае пытанне, чаму ў валочнай памеры Гародні 1560 – 1561 гг. гаворыцца аб тым, што ў гэтым рынку „ніякага гандлю не бывае...”[12] Гэтая згадка сведчыць, што Нямецкі рынак у першай палове XVI ст. ужо прыйшоў у заняпад, і што ён існаваў раней.

Сумненні выклікае таксама рэканструкцыя лакалізацыі “дарогі ў Польшчу”, якая ішла праз Нёман (мал. 19 № 9), а г.зн. гарадской пераправы і мосту. На думку аўтара, А. Квітніцкая памылялася, сцвярджаючы, што вуліца “Вялікая да мосту на Падоле” ішла праз Замкавы роў (паміж узвышшамі, дзя цяпер стаяць Новы замак ды драмтэатр), што тлумачыць неспрыяльнымі для праезду перападамі вертыкальных адзнак рэльефа і нахілам скатаў. Паводле аўтара, вуліца Вялікая вяла да мосту, які знаходзіўся “между третьей и четвертой при-

[9] Gozdawa M. Augustianie w Brześciu Litewskim // Rocznik Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie. T. III. Wilno, 1910, s. 95; Kurczewski J. Biskupstwo wileńskie. Wilno, 1912, s. 253.

[10] Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. T. 1, z. 1. Kraków, 1932, s. 474.

[11] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1800, воп. 1, ад.з. 1, арк. 561.

[12] Писцовая книга Гродненской экономии. Вильно, 1882. С. II, с. 43-44.

родными вершинами", што прыблізна паказвае на месца, дзе сёння знаходзіцца Стары мост (с. 72).

Аднак аналіз графічных матэрыялаў пацвярджае правату А. Квітніцкай, якая была ўпэўнена, што месца пераправы праз Нёман знаходзілася паміж Новым замкам ды кляштарам бернардынак. Пра гэта сведчаць планы горада 1705, 1793 і 1798 гг.[13] Трасіроўку старажытнай нёманскай дарогі-пераправы добра відаць на захаваных планах ды на адным з малюнкаў Напалеона Орды. Акрамя таго, трэба памятаць, што тапаграфія гэтай часткі горада ў даўнія часы выглядала інакш. Сучасная вуліца Давыда Гарадзенскага не існавала, таму, як выглядалі перапады рэльефа і вуглы нахілаў скатаў, мы не ведаем.

Яраслаў Вайцахоўскі заўважыў, што нёманскі мост пераходзіў у дарогу, якая ішла на замак. Яна цягнулася ярам, які аддзяляў узвышша былога вакольнага горада (тэрыторыя Новага замка) ад тэрыторыі магдэбургскага горада (узвышша, на якім цяпер стаіць абласны драмтэатр), потым паварочвала на захад і бегла ўздоўж будоўлі Прачысценскай царквы. Далей гэтая дарога праходзіла тры масты. Апошні – пад'ёмны – знаходзіўся каля брамы Старога замка[14].

Ю. Кішык лічыць, што гарадская ратуша знаходзілася не ў сярэдзіне плошчы, а на рагу з вуліцай Замкавай (г.зн. на месцы, дзе цяпер знаходзіцца Палац тэкстыльшчыкаў) (мал. 55). Сваё меркаванне ён абумоўлівае аналізам плана 1655 г., на якім ратуша пазначаны ва фронце забудовы. Але і тут памылка!

Комплексны аналіз графічных і пісьмовых крыніц прымушае задумацца пра сапраўдную дату складання гэтага плану. Пазначаная дата (1655 г.) выклікае сумненні, паколькі на ім бачныя некаторыя аб'екты, што былі ўзведзены пазней, напрыклад, мураваны касцёл езуіцкага кляштара, якога ў сярэдзіне XVII ст. яшчэ не было[15]. Апроч таго на шэрагу планаў Гародні, напрыклад, плане 1705 г. на скрыжаванні Замкавай вуліцы ды паўднёва-заходняга боку Рынка стаяла камяніца, пазначаная надпісам „ратуша"[16]. Але гэта не была сядзіба мясцовых уладаў! Як вядома, пасля вайны з Масквой у 60-я гг. XVII ст. будынак ратушы быў пашкоджаны, што абумовіла перанясенне сядзібы магістрата ў рынкавыя камяніцы заможных мяшчан ды магістрацкіхураднікаў. Напрыклад, у 1661 г. пасяджэнні гарадзенскай лавы ды рады адбываліся ў рынкавай камяніцы рай-

---

[13] Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (далей РДВГА). Ф. 846, воп. 16, ад.з. 1466, 21528, ч. 6, арк. 4; ад.з. 21874.

[14] Wojciechowski J. Stary zamek w Grodnie // Biuletyn Historii Sztuki i Kultury. R. VI. 1938, nr 2, s. 136.

[15] Квитницкая Е. Планировка..., с. 28; Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. Wyd. 2. Poznań, 1989, s. 229. Зусім праўдападобна, што гэты план быў складзены на пачатку XVIII ст. (Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV-XVIII wieku // Acta Collegii Suprasliensis. T. VII. Supraśl, 2005, s. 18; Kotljarchuk A. In the shadows of Poland and Russia. The Grand Duchy of Lithuania and Sweden in the European crisis of the mid-17th century // Södertörn doctoral dissertations. Nr 4. Stockholm, 2006, s. 301).

[16] РДВГА. Ф. 846, воп. 16, ад.з. 1466.

ца Яна Зеляпугі, а ў 1664 г. – у доме бурмістраў Канстанціна Дзівы ды Адама Цвікліча[17].

Шмат месца ў кнізе прысвечана пытанню перапланіроўкі Гародні ў XVI ст. На думку Ю.Кішыка, "перепланировка Гродно в начале XVI века представляет для нас интерес, поскольку это был первый ставший известным в истории градостроительного развития Великого княжества Литовского сознательный шаг, направленный на формирование относительного целостного, художественно организованного постранства" (с. 74-75). Аўтар, праўда, не прыводзіць аніводнага доказу і не спасылаецца на крыніцы, якія б сведчылі пра згаданыя радыкальныя горадабудаўнічыя пераўтварэнні. Нягледзячы на гэта, факт перапланіроўкі падаецца як здзейснены: "ставший известным ... сознательный шаг".

Паводле яшчэ адной версіі перапланіроўка Гародні адбылася паміж 1533 г. (дата выкупу каралевай Бонай гарадзенскага староства ад Радзівілаў) і 1541 г. (яе ж прывілей аб добраўпарадкаванні Гародні) (с. 80-81). У іншым месцы распавядаецца пра перапланіроўку горада ў сярэдзіна XVI ст., што звязваецца з праводзеннем валочнай памеры ды ўздзеяннем ідэй Адраджэння (с. 67-69). Можна канстатаваць, што факт выдання якога-небудзь прывілея, распараджэння і загаду ў даўнія часы не азначаў іх аўтаматычнага выканання. Яскравым сведчаннем таго з'яўляецца прыклад закінутага калодзежа, які Бона загадала пачысціць ды аднавіць. Але, як паказвае аналіз крыніц, да грунтоўнай перабудовы гэтага аб'екта дайшло толькі ў канцы XVIII ст.![18]

Адсутнасць верагодных крыніцаў не перашкодзіла аўтару распавесці пра перапланіроўку, увесці ў абарот версію пра выкраенне Рынка з верацяна, геаметрызацыю вулічнай сеткі, як выніку гарадской рэформы (с. 68, 75), заснаванні Нямецкага рынка, які, на яго думку, з'яўляецца прыкладам рэнесансавага падыходу да арганізацыі плошчы (с. 75-76), з'яўленне вуліцы Златарскай у перыяд лакацыі (с. 73). Канкрэтныя пацверджанні сваіх меркаванняў аўтарам не прыводзяцца. Аўтарскія тэзісы абапіраюцца толькі на жаданне аўтара ўбачыць пэўныя працэсы і з'явы.

Цяпер разглядзім справу датавання ўвядзення самакіравання ў Гародні. Аўтар слушна піша, аб тым, што "в известных работах о Гродно много неточностей, непроверенных факты, заимствований" (с. 8-9), маючы на ўвазе дыскусію па згаданай праблеме (с. 49). З абсалютнай упэўненасцю ён заўважае, што „каждый ее участник в силу патриотических побуждений стремится отодвинуть дату как можно дальше" (с. 9). Магу станоўча і аўтарытэтна запэўніць, не кожны! Гэтая цытата сведчыць аб тым, што аўтар кнігі не сачыў за дыскусіяй[19].

---

[17] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, ад.з. 1, арк. 87, 145-146, 170.

[18] Gordziejew J. Socjotopografia..., с. 81-82.

[19] Гардзееў Ю. Заўвагі да праблемы даследаванняў гісторыі Гародні (на падставе выдання серыі "Памяць" // Гістарычны альманах. Т. 6, 2002, с. 192-193; Rimša E. Pieczęcie miast Wielkiego Księstwa Litewskiego. Warszawa, 2007, s. 401.

Увядзенне ў літаратуру міфа пра атрыманне Гародняй магдэбургскага права ў 1444 г. належыць Тэадору Нарбуту. Міхал Балінскі і Тыматэй Ліпінскі ў сваёй кнізе *Starożytna Polska*, умацавалі казус, сцвярджаючы, што ў 1391 г. Уладзіслаў Ягайла надаў Гародні "прывілей на гарадскія свабоды", а Казімір Ягялончык у 1444 г. – "магдэбургскае права". У 1889 г. Яўстафій Арлоўскі выказаў свае сумненні адносна магчымасці надання гарадскіх правоў у 1391 г. Аднак і яму не было наканаванана пазбегнуць памылкі, якая прывяла да вывядзення даты атрымання магдэбургскага права ў 1444 г. Пошук гэтых дакументаў праводзіў Юзаф Ядкоўскі, але не знайшоў іх.

Насамрэч, наданне нашаму гораду права на самакіраванне адбылося ў 1496 г. Аналіз гэтага гарадзенскага прывілея, а таксама яго пазнейшых пацверджанняў ці канфірмацый 1506, 1576, 1589, 1718 гг. выразна ўказваюць на гэту дату.

Разважаючы наконт этнаканфесійнай структуры даўняй Гародні, аўтар піша аб тым, што каланізацыя гарадоў Польшы і ВКЛ праходзіла з удзелам нямецкага і габрэйскага насельніцтва (с. 28). Калі адносна габрэяў гэта сцвярджэнне можна палічыць у нейкай ступені абгунтаваным (у Гародні XVI ст. доля габрэйскага насельніцтва складала каля 10%, а ў другой палове XVIII ст. вырасла да 40% ад агульнай колькасці гараджан), то пацверджанні масавай нямецкай каланізацыі, у перыяд, калі горад атрымаў магдэбургскае права, адсутнічаюць. Гэта сцвярджэнне хутчэй за ўсё запазычаная з польскіх публікацый.

Яшчэ аднім старым міфам, які аўтар крытыкуе і адкідвае, з'яўляецца думка аб тым, што Гародню і яе ўмацаванні ў 1241 г. знішчыў Кайдан (с. 28, 35). Гэты міф бытуе ў літаратуры з XIX ст. У навуковы абарот палажэнне аб знішчэнні горада манголамі і яго падпарадкавання літоўскаму князю Эрдзівілу ў 1241 г увёў Нарбут, які пазычыў палажэнне з *Кронікі Быхаўца* і *Кронікі Стрыйкоўскага.*

Падсумуем метадалагічныя палажэнні кнігі. Пры распрацоўцы горадабудаўнічай праблематыкі аўтар прапануе праводзіць даследаванне камбінаваным метадам спалучэння пісьмовых, археалагічных, этнаграфічных крыніц, а гэтак жа іншых метадаў, пра якія ішла гаворка вышэй. Аднак характэрнай рысай кнігі з'яўляецца яе апрыёрнасць і катэгарычнасць выказванняў. Аўтар зыходзіць не з першаснасці фактаў, на якіх будуецца тэорыя, а наадварот, імкнецца да сваёй тэорыі дапасаваць факты. Вось адзін прыклад. Аўтар піша пра фарміраванне планіровачнага верацяна, якое было перабудавана ў XVI ст. Элементамі верацяна была даўняя вуліца Віленская (цяпер Савецкая) ды Калюцінская. Аўтар задае пытанне, чаму вуліца Калюцінская выгінаецца і потым і злучаецца з Віленскай? Яе выгін і зліццё з Віленскай, на думку аўтара, доказ верагоднасці тэорыі верацяна. Так выглядае заключэнне, калі ісці ад тэорыі да факта. А калі паспрабаваць спачатку даследаваць архівы ды назапасіць усе магчымая крыніцы, а толькі потым рабіць высновы на падставе прааналізаваных фактаў? Такой з'яўляецца логіка кожнага даследавання. Пра што сведчаць крыніцы? Пра тое, што на паўночных ускрайках горада, блізу Гараднічанкі

знаходзілася Віленская брама, праз якую трэба было ўязджаць у горад, і да якой па гэтай прычыне збягаліся і Віленская, і Калюцінская[20]. Можа менавіта таму апошняя і выгіналася?

Логіка даследчага працэсу мае пэўныя заканамернасці. Яе асноўны прынцып – аб'ектыўнасць, якая праяўляецца ў вывядзенні высноў на падставе крыніц, іх аналізу. На жаль, замест эмпірычнай праверкі гіпотэз у кнізе дамінуюць асабістыя, суб'ектыўныя ўяўленні і мастацкі вымысел, з чым звязаны неабгрунтаваныя рэканструкцыйныя эксперыменты па "гипотетически восстановливаемой" забудове. Аўтар лічыць мадэліраванне вобразу горада (с. 10) метадам пазнання яго горадабудаўнічай структуры. Але мадэліраванне павінна абапірацца не на домыслах, а на фактах.

[20] Gordziejew J. Socjotopografia..., s. 87-88.

*Вольга Мась (Гродна)*

# Карты і планы Гродна XVII – XX ст.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей з'яўляецца адным з старэйшых на тэрыторыі Беларусі. Яго гісторыя пачынаецца з 1920 г. На пачатку сакавіка была створана пастаянная Камісія апекі над помнікамі мастацтва і культуры пры павятовым упраўленні ў Гродна. Адным з чальцоў камісіі стаў будучы першы дырэктар Гродзенскага музея, гісторык мастацтва, археолаг Юзаф Ядкоўскі. 12 сакавіка на арганізацыйным сходзе Камісіі апекі, па ініцыятыве Гродзенскага старасты Казіміра Рагалевіча, старшынёй камісіі быў прызначаны інжынер В.Хэрман, а 14 сакавіка кіраўніцтва камісіяй было даручана Ю.Ядкоўскаму.

Дзякуючы самаадданай і плённай дзейнасці гэтага нястомнага чалавека, за два гады была сабрана значная колькасць дакументальных і матэрыяльных рухомых гістарычных помнікаў музейнага значэння. Захаваліся дакументальныя звесткі аб тым, што першы картаграфічны матэрыял паступіў для будучага музея ў 1920 г. На пасяджэнні камісіі апекі 17 мая 1920 г. былі прадстаўлены 23 планы канца XVIII – першай паловы XIX ст., якія падараваў інжынер І.Цытажыньскі, 18 планаў і картаў (у тым ліку план Гродна 1797 г.) канца XVIII – пачатку XIX ст., атрыманыя ад Гродзенскай камендатуры паліцыі.

Да станоўчага вырашэння пытання аб перадачы пад музей Старога замка ўвесь сабраны матэрыял часова быў размешчаны ў памяшканні Гродзенскага староства. Далейшы лёс гэтага збору моцна хваляваў чальцоў камісіі, паколькі ўмовы яго захавання былі кепскімі. Праблема была вырашана з прыездам у Гродна 13 чэрвеня 1922 г. прадстаўнікоў Міністэрства па справах рэлігіі і публічнай асветы. У памяшканні староства адбылося пашыранае пасяджэнне, на якім вырашана сабраныя камісіяй гістарычныя помнікі прызнаць асновай для адкрыцця дзяржаўнага музея. 12 верасня на пасаду кіраўніка музея быў прызначаны Юзаф Ядкоўскі. 9 снежня 1922 г. у пакоях староства пры значнай колькасці сабраных, адбылося ўрачыстае адкрыццё музейнай экспазіцыі, у якой занялі сваё месца і некалькі планаў[1].

У сучасным зборы Гродзенскага музея картаграфічная калекцыя з'яўляецца адной з найбольш значных з пункту гледжання гістарычнай каштоўнасці і колькасці музейных прадметаў – больш за 400 адзінак. Асноўная частка калекцыі была сабрана да 1939 г. У склад яе ўвайшлі планы Старога замка, выкананыя Ю.Ядкоўскім і Я.Вайцахоўскім; карты і планы зямельных надзелаў, гарадоў, Гродзенскай і сумежных з ёй губерняў, еўрапейскіх дзяржаў і іншае.

[1] Muzeum w Grodnie. Zarys dziejów powstania i rozwoju. 1920-1922. Grodno, MCMXXIII.

У XVIII – XIX стст. складаннем і зацвярджэннем планаў, картаў, чарцяжоў ведала Будаўнічая экспедыцыя Казённай палаты, якая ў 1805 г. была пераведзена пад кіраўніцтва Губернскага праўлення. У 1832 г. – перайменавана ў Будаўнічую камісію. 31 сакавіка 1850 г. – пераўтворана ў Губернскую будаўнічую і дарожную камісію, з 1865 г. - у Будаўнічае аддзяленне Губернскага праўлення[2].

Большасць з прадстаўленых планаў і картаў к. XVIII – п. XX стст. былі выкананы ў Гродзенскай губернскай чарцёжнай. Апошняя была ўтворана ў 1871 г., калі на паўночна-заходнія губерні быў распаўсюджаны закон 1868 г. "О порядке производства межевых дел в местностях, где введены в действие судебные уставы 20 лістапада 1864 г." Яе ўзначаліў гродзенскі губернскі землямер, дзейнасць якога пачалася яшчэ з утварэннем Гродзенскай губерні ў 1802 г. Губернскі землямер на правах чальца ўваходзіў у склад *Общего присутствия* Гродзенскага губернскага праўлення, якое назірала за ходам межавання зямель у губерні. Гродзенская губернская чарцёжная падпарадкоўвалася губернатару, губернскаму праўленню і Межавому дэпартаменту. Штат чарцёжнай складаўся з губернскага землямера, яго памочнікаў, павятовых землямераў, справаводаў, чарцёжнікаў, пісараў[3].

Спецыялістаў для чарцёжнай меркавалася рыхтаваць у Гродне. 31 сакавіка 1861 г. сапраўдным тайным саветнікам Кавалеўскім было зроблена распараджэнне аб адкрыцці землямерна-таксатарскіх класаў пры Гродзенскай губернскай гімназіі. На працягу двух гадоў навучання ў класах павінны былі выкладацца спецыяльныя дысцыпліны: таксаграфія, нівеліраванне, чарчэнне, ілюміноўка, надпісванне, накладка планаў, межавыя законы. У клас меркавалася набіраць 40-50 чалавек, з якіх 15 маглі атрымліваць стыпендыю 96 рублёў, 10 чалавек – 60 рублёў. Права на стыпендыю маглі атрымаць толькі вучні "стесненные в способах своего существования". У класы прымаліся вучні ўсіх саслоўяў не малодшыя за 15 год, якія скончылі курс у 4-м або ў адным з вышэйшых класаў гімназіі. Яны залічваліся без экзаменаў. Усе астатнія пасля папярэдніх іспытаў па рускай граматыцы, геаграфіі, гісторыі, матэматыцы, маляванню. Інспектарам землямерна-таксатарскіх класаў быў прызначаны выконваючы абавязкі Гродзенскага губернскага землямера тытулярны саветнік Станкевіч. Але класы гэтыя так і не адкрыліся. З ліста Станкевіча ад 21 кастрычніка 1861 г. да Ковенскага губернскага землямера Суршачэўскага вынікае, што перашкодзіла адсутнасць фінансавання[4].

Але тым не менш Гродзенская чарцёжная працавала і з'яўлялася ўстановай, якая займалася рознымі пытаннямі межавання земляў. Яна таксама павінна была выраблять і выдаваць копіі планаў, што захоўваліся ў архіве чарцёжнай[5].

---

2 Нацыянальны гістарычны архіў (НГАБ) у Гродне. Ф.8, воп. 1.

3 НГАБ у Гродна. Ф.11, воп. 1

4 НГАБ у Гродна. Ф.11, воп. 1, ад. з. 283, арк. 1-1 аб, 4-4 аб, 6-6 аб, 7.

5 НГАБ у Гродна. Ф.11, воп. 1.

Ніжэй пойдзе гаворка аб планах і картах, на якіх прадстаўлены, як сам горад, так і розныя яго часткі.

1. *КП – 9217. Delineacya[!] Placu z Domem drewnianym Koszary zwanym, oraz z Częścą Lodowni drewnianey[!]: w ogóle[!] Morg ieden[!] w Sobie zawieraiącego[!]. Podpisuię[!]*[6].

План 1793 г. Аўтар невядомы. Выкананы магчыма ў Гродне. Рукапіс каляровы, папера ручнога вырабу, на паперы вадзяны знак "Паштовы ражок". Памер плана: 22 × 35,5 см. План паўночнага геаграфічнага арыентавання. Прадстаўлена частка Гарадніцы з драўлянымі домам і лядоўняй. План падпісаны каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім. На адваротным баку маецца надпіс, што дадзены пляц падараваны каралём Феліцыяну Пачобуту. План быў перададзены ў дар музею 08.11.1930 г. п.Вандай Каменскай, аб чым сведчыць надпіс на адваротным баку. Захаваўся прамавугольны штамп "Muzeum w Grodnie" (малюнак 1).

2. КП – 8495. *Plan Placów w Mieście Grodnie. Wyliczenie Placów w Mieście Grodnie do Klasztoru PP.Brygidek należnych po uczynionym wymiarze przez Niżej podpisanego Geometrę w Roku 1830 dnia 14 Sierpnia Uczynione [подпіс адсутнічае].*

План 1830 г. Выкананы магчыма ў Гродне. Маштаб: у цалі 10 сажаняў ці [1 : 840]. Рукапіс каляровы, папера, на паперы вадзяны знак: "Wilna. F.Langenbach. Z 9". Памер аркуша: 96,3 × 50,5 см. Арыентаванне: паўднёва-ўсходняе. Прадстаўлены пляцы ў Гродне, якія належалі кляштару брыгітак. У легендзе падаецца спіс пляцаў гродзенскіх брыгітак, іх плошча і прозвішчы арандатараў (малюнак 2).

Наступны план – гэта копія папярэдняга, якую выканаў Ю.Ядкоўскі.

3. КП – 14673. *Place w Grodnie, należące do klasztoru panien Brygidek według planu z r:1830.*

Гродна, 20-30-я г. XX ст. Маштаб: у цалі 10 сажаняў ці [1:840]. Рукапіс каляровы, калька. Памер аркуша: 49,5 × 69 см. Арыентаванне: паўночнае. На плане пазначаны вуліцы вакол маёмасці кляштару брыгітак: Паліцэйская (Жэзніцкая), Брыгіцкая (Скідзельская), Іерусалімская, Татарская (Баніфратэрская), Навікоўская (Дзявоцкая, Паштовы завулак). Падаецца ўласнасць гараджан.

4. КП-9010. *Планъ Геометрическій Части Города Гродна, то есть: Плаца съ строеніемъ Гродненской Еврейской Больніцы.*

Гродна, 1830 г. Падаецца частка горада ў раёне вуліцы Траецкай: вул. Замкавая, Дамініканская, Могілкаўская, завулак Дамініканскі, старыя габрэйскія могілкі, Казіны рынак, касцёлы, сады і агароды. Пазначаныя праекты новых вуліц (млюнак 3).

5. КП–14701. *Планъ плаца Состоящаго въ Где Гродне при Городнице дровяной рынокъ называемый[!], принадлежащій къ Гродненским Бонифрателямъ. Измералъ[!] и планъ Сочинялъ Гродненской Казенной палаты Землемеръ Сонхацкій.*

---

[6] Назвы планаў і карт падаюцца ў арыгінальнай арфаграфіі. Словы з неразборлівым напісаннем пазначаныя [!]

План 1838 г. Гродна. Маштаб: у адной цалі 25 сажаняў або [1 : 2 100]. Рукапіс каляровы, папера. Памер: 33,7 × 20,1 см. Арыентаванне: паўночнае. На плане прадстаўлена частка Гарадніцы ў раёне вул. Раскоша. Пасля назвы падаюцца тлумачэнне знакаў і памеры пляца, які належаў гродзенскім баніфратарам.

6. КП - 14759. *Планъ Существующей вокругъ Города Гродно двухверстной Черты и ново отведенной[!] двухверстной предохранительной дистанціи Чарочнаго откупа. Составленъ по Указу Гродненскаго Губернскаго Правленія отъ 29. Декабря 1851 г. за № 16417. Дистанцію Отводилъ и Планъ составлялъ: Гродненскій Уездный Землемеръ Станкевичъ[!].*

План 1851 г. Гродна. Маштаб адсутнічае. Рукапіс каляровы, папера, на паперы вадзяны знак "J.Whatman. 1850". Памеры аркуша: 99,1 × 132 см. Арыентаванне: паўночна-ўсходняе. На плане пазначаны горад Гродна, дарогі, рака Нёман і населеныя пункты, якія ўваходзяць у двухвярстовую мяжу. З левага боку змешчана легенда: тлумачэнне межаў. Захаваўся прамавугольны штамп "Muzeum w Grodnie".

7. КП - 14765. *Геометрическій Чертежъ окружной межи губернскаго города Гродно и выгонныхъ его земель, во исполненіе предписанія Г.[осподина] Гродненскаго Губернскаго Землемера отъ 15 Апреля 1863 года за № 471 основаннаго на указе Гродненскаго Губернскаго Правленія отъ 30 Декабря 1858 года за № 8835 окружную межу утверждалъ и спорнуя[!] границы въ натуре означалъ согласно Плана Землемера Тодта, по мередіану магнитной стрелки которая отъ истиннаго мередіана склоненіе имеетъ отъ Севера къ Западу на 10º градусовъ и Чертежъ сей составлялъ въ 1865 году месяца Марта 5 дня Белостокскій Уездный Землемеръ Коллежскій Секретарь Владиславъ Шпаковскій. Сколько же внутри означенныхъ границъ земли, тозначится[!] въ Экспликаціи. Белостокскій Уездный Землемеръ Коллежскій Секретарь Владиславъ Шпаковскій.*

План 1865 г. Магчыма выкананы ў Беластоку. Маштаб: у англійскай цалі 100 сажаняў або [1 : 8 400]. Рукапіс каляровы, папера. Памер: 98 × 95 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлена акружная мяжа г.Гродна. У правай верхняй частцы змешчана легенда з пазначэннем памераў акружной мяжы Гродна. У правай ніжняй частцы падаецца змест судовай справы, па рашэнню якой быў выкананы дадзены чарцёж. З правага боку ад чарцяжа знаходзіцца апісанне сумежных земляў. Захаваўся прамавугольны штамп "Muzeum w Grodnie".

8. КП - 14757/5. *Планъ г.Гродно.*

План 1867 г. Гродна. Аўтар невядомы. Маштаб: у англійскай цалі 50 сажаняў або [1 : 4 200]. Рукапіс каляровы, калька, папера, тканіна. Памер аркуша: 79,9 × 67,7 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план горада і бліжэйшага наваколля. План складаецца з 24 частак памерамі 13,3 × 16,8 см, наклееных на тканіну. План быў аформлены ў цвёрдую вокладку.

9. КП - 14757. *Планъ Про…ированнаго Расположения Губернского Города Гродно 1882 г.*

План 1882 г. Выдадзены ў Санкт-Пецярбургу. Аўтар невядомы. Маштаб адсутнічае. Друк аднакаляровы, папера. Памеры аркуша: 88,5 × 71 см. Арыентаванне: паўночнае. У левай цэнтральнай частцы падаецца апісанне горада, дзе пералічваюцца каменныя і драўляныя пабудовы, якія існуюць і плануюцца да будаўніцтва. У ніжняй цэнтральнай частцы змешчана легенда: тлумачэнне знакаў.

10. КП - 14757/3. *Планъ города Гродны. Составленъ въ Губернской Чертежной въ 1892 году. Печ. въ Типо-Литографiи Грод. Губерн. Правленiя.*

Аўтар невядомы. Маштаб: у англійскай цалі 100 сажаняў ці [1 : 8 400]. Літаграфія аднакаляровая, папера. Памер: 46,2 × 58,8 см. Арыентаванне: паўночнае. Падаецца план Гродна з назвамі вуліц. У левым верхнім куце размешчаны герб губерні – на тарчы пад каронай выява зубра. Пад гербам знаходзіцца ўказальнік будынкаў грамадскага прызначэння і некаторых уласных будынкаў (малюнак 4).

11. КП - 14757/7. *Планъ гор. Гродно.*

План 1903 г. Гродна. Аўтар невядомы. Маштаб: у англійскай цалі 50 сажаняў ці [1 : 4 200]. Літаграфія аднакаляровая, папера, тканіна. Памер: 60,8 × 80,3 см. Арыентаванне: паўночнае. Падаецца план горада.

12. КП - 14757/2. *Stadtplan von Grodno.*

Можна меркаваць, што план быў выдадзены ў перыяд з 1915 па 1918 гг. Месца выдання невядома. Аўтар невядомы. Маштаб: [1 : 8 200] Літаграфія двухкаляровая, папера. Памер: 39,5 × 53 см. Арыентаванне: паўночнае. Падаецца план Гродна з пазначэннем назваў вуліц. У левай частцы размешчаны ўказальнік рускіх грамадскіх і гарадскіх будынкаў, а таксама нямецкіх адміністрацыйных будынкаў на нямецкай мове.

Пасля ўказа ад 20 красавіка 1863 г., які дазволіў мець друкарні ў мяжы аселасці, у Гродне ўзнікае сетка габрэйскіх друкарняў і літаграфій. Сярод іх былі літаграфіі сям'і Мейлаховічаў. Першая з іх была заснавана Маісеем Мейлаховічам. У 1868 г. яго сыны Іосель і Давід атрымалі дазвол на адкрыццё чарговых літаграфій. У сваю чаргу Давід навучыў мастацтву друкавання сваіх дзяцей Рыўку-Юдэсу і сына Зундэля[7]. Менавіта ў адной з майстэрань гэтай сям'і ў 1924 – 1928 гг. былі надрукаваны наступныя планы г.Гродна (малюнак 5).

13. КП - 14783. *Plan Góry Zamkowej w Grodnie. Wykonany w Kier. Rej. Inż. i Sap. Grodno podług południka magnetycznego w roku 1924 na mocy roskazu M. S. Wojsk. Dep. V. Inż. i Sap. l. 5364/24.V. Tjn. w. IV. a. d. 11.10.1024 r. Rysował Ułanowski kreslarz. Nakład Muzeum Państwowego w Grodnie. Odbito w litografji „Z.Mejłachowicz" w Grodnie. 1924.*

План 1924 г. Гродна. Маштаб: [1 : 500]. Рукапіс каляровы, друк аднакаляровы, папера, тканіна. Памер аркуша: 97,5 × 120,5 см. Арыентаванне: паўночнае.

---

[7] Сабалеўская В. Спрадвечныя іншаземцы: старонкі гісторыі гарадзенскіх яўрэяў. Гародня, 2000. – 88 с.

На плане падаюцца назвы вуліц вакол Замкавай гары, а таксама прозвішчы ўладальнікаў дамоў уздоўж набярэжнай Нёмана. У левым ніжнім куце знаходзіцца легенда: тлумачэнне колераў. У правым ніжнім куце змешчана апісанне межаў: прадмесце Гродна, рака Нёман, зямля Каложскай царквы, прыватныя ўладанні і інш.

14. КП - 14757/4. КП - 29753. *Plan m. Grodna wykonany na podstawie zestawienia budownictwa mejskiego[!] m.Grodna. Wykonał według planów Biura Pomiarów Magistratu m.Grodna w 1928 r. A.Mielnikow. Wydawnictwo księgarni E.Ibierskiego, Grodno. Lit. „Z.Miejłachowicz", Grodno, 1928.*

План 1928 г. Гродна. Маштаб: [1 : 15 000]. Літаграфія каляровая, папера. Памер: 57,2 × 43,1 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план горада з назвамі вуліц. У левым ніжнім куце змешчана легенда: тлумачэнне знакаў; у левым верхнім – герб Гродна. З адваротнага боку размешчана гандлёвая рэклама.

15. КП - 14687/1,2. *Plan nowego parku miejskiego w Grodnie, urządzanego według projektu W.Tańskiego z oznaczeniem miejsca, na którym ma stanąć pomnik Elizy Orzeszkowej.*

План 1929 г. Гродна. Выканаў Ю.Ядкоўскі. Маштаб: [1 : 500]. Рукапіс аднакаляровы, калька. Святлакопія каляровая, папера. Памер: 40 × 41 см. Арыгінал і святлакопія. Арыентаванне: паўночнае. План прадстаўляе тэрыторыю гарадскога парка паміж гарадскім батанічным садам, гарадскім тэатрам, плошчай Незалежнасці, Гарнізоннай царквой, Швейцарскай далінай і вуліцай Элізы Ажэшка.

16. КП - 7439. *Stadtplan von Grodno. Hergestellt im Reichsamt für Landesaufnahme, Berlin 1940. Generalstab der Luftwaffe. Grundlagen: Orjentacyjny Plan Miasta Grodno 1:10 000, 1937.*

План 1940 г. Берлін. Маштаб: [1 : 10 000]. Друк двухкаляровы, папера. Памер: 51,4 × 46,2 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план горада і бліжэйшага навакольля. Асобна вынесены падрабязны план Рыбнага рынка (7,2 × 12,6), план пасёлка і чыгуначнай станцыі Ласосна (7,2 × 8,7). З левага боку падаецца ўказальнік будынкаў грамадскага прызначэння, а таксама спасылка, што гэта дадзеныя часоў расійскага ўладання. У верхняй правай частцы змешчаны надпіс, які сведчыць, што гэта спецыяльны выпуск для службовага карыстання. Пад планам знаходзіцца легенда: тлумачэнне знакаў. З адваротнага боку падаецца ўказальнік вуліц у алфавітным парадку. На самім плане ад рукі арабскімі лічбамі пазначаны хутчэй за ўсё ваенныя аб'екты.

17. НД – 251/13, 14. *Orjentacyjny plan miasta Grodna. Wydawnictwo księgarni E. Ibierskiego, Grodno. Zakł. graf. Ł.Miejłachowicza, Grodno. 1937 r.*

План 1937 г. Гродна. Аўтар невядомы. Маштаб: [1 : 10 000]. Літаграфія каляровая, папера. Памер: 61,8 × 46 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план горада і бліжэйшага навакольля. У левым верхнім куце знаходзіцца герб Гродна. У левым ніжнім куце змешчана легенда: тлумачэнне знакаў. Асобна падаецца падрабязны план Рыбнага рынка (9,6 × 12,7), план пасёлка і чыгуначнай

станцыі Ласосна (8,4 × 8,8). З адваротнага боку размешчана гандлёвая рэклама, спіс вуліц, алей і плошчаў, грамадскіх будынкаў, а таксама фотаздымкі некаторых помнікаў горада.

18. КП – 29933. *Stadtplan fon Grodno.*

Копія з польскай карты 1920-30-х г., 1941 (?). Месца выдання невядома. Аўтар невядомы. Маштаб: [1:4 000]. Друк каляровы, папера, тканіна. Памер аркуша: 188,5 × 152,5 см. Арыентаванне: паўночнае. Падаецца план Гродна і ваколля. Злева ад плана змешчана легенда: тлумачэнне знакаў.

19. КП - 14757/1,6, КП – 29934. *Miasto Grodno. Z planu 1 : 1 000, sporządzonego przez mierniczego przysięgłego Antoniego Augustynika, pomniejszył fotomiechanicznie Inż. Franciszek Augustynek, mierniczy przysięgły w Warszawie.*

План 1920-30-х гг. Выдадзены магчыма ў Варшаве. Маштаб: [1 : 10 000]. Друк двухкаляровы, папера. Памер аркуша: 79,7 × 63 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план горада з пазначэннем вуліц, будынкаў, мастоў, могілак і бліжэйшых ваколіцаў.

20. КП – 14675. *Karta Odgraniczająca Miasto Grodno z Wygonami od Maiętnosci Stanisławowa i Augustowa oraz od Gruntów Juryzdycznych Skarbowych i innych na mocy Ukazu Izby Skarbowej Littej w roku 1797 Dnia 22 Augusta wyszłego sporządzona i kopcami oraz Liniami Geometrycznemi[!] przezemnie[!] Adama Todta Komornika Pttu Grodzieńskiego wyprowadzona.*

Копія, выкананая ў 1920-30-я г. Ю.Ядкоўскім. Гродна. Маштаб: [1 : 33 600] (?). Рукапіс каляровы, калька. Памер аркуша: 50 × 31,5 см. Арыентаванне: паўночнае. Прадстаўлены план Гродна з пазначэннем будынкаў горада і бліжэйшых ваколіц: Пышкі, Пярэсялка, Станіславова, Панемунь, Аўгустовак.

Наступныя два планы тычацца аднаго і таго ж участка Гродна, дзе стаяў дом гродзенскага мешчаніна, жандармскага унцер-афіцэра Фамы Кісялёва. Па дадзеных НГАБ, будаўніцтва дома суправаджалася судовым разбіральніцтвам. 103 квартал Занеманскага фарштата, дзе павінен быў будавацца дом, знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці ад крыніцы, якую называлі “Каралеўскай студняй”. Яшчэ ў 1895 г. мяшчане Ю.Гітль і Г.Сталярскі падалі прашэнне аб назначэнні агляду месца і забароне будаўніцтва з прычыны таго, што гэта будзе дрэнна ўплываць на якасць вады ў крыніцы, якую бяруць для вырабу сельцерскай[8]. Праверка была праведзена губернскай камісіяй, якая пастанавіла, што дом можна будаваць, але неабходна перанесці яго на правы бок участка[9].

21. КП – 78952. *Проектъ на постройку деревяннаго дома Фомой Киселевымъ на местности его временно арендуемой имъ отъ Города въ 103 кварт. занеманскаго города Гродны Форштадта.*

План выкананы ў гарадской управе г. Гродна 5 верасня 1895 г. Арыгінал.

Прозвішча аўтара невядома. Зацверджаны план ваенным інжынерам Жукоўскім. Маштаб да плана дома: у 1 цалі 3 аршыны або адна сажань ці [1 : 84].

[8] НГАБ у Гродна. Ф. 8, воп. 2, ад. з. 1123, арк. 2-8 адв.

[9] НГАБ у Гродна. Ф. 8, воп. 2, ад. з. 1123, арк. 2-8 адв.

Маштаб да плана часткі горада Гродна: у 1 цалі 50 сажаняў ці [1 : 4 200]. Каляровы рукапіс на кальцы. Памер: 62,4 х 29,3 см. Арыентаванне: паўднёвае. На плане маецца анатацыя: "Гродненская Городская Управа, согласно постановленію своему 5-го Сентября состоявшемуся, настоящій планъ утверждаетъ и постройку по оному деревяннаго дома, на временно арендуемой городской земле разрешаетъ съ темъ, чтобы таковой, по истеченію срока содержанія сей земли, былъ снесенъ владельцемъ онаго на собственный счетъ, безъ претензіи къ городскому общественному управленію. Сентября 5 дня 1895 года. Г.Гродно. Причитающийся гербовый сборъ уплаченъ". Маецца таксама пячатка Гродзенскай гарадской управы і подпісы гарадскога галавы, сакратара гарадской управы. На плане паказаны: план дома, фасад дома, разрэз па аб, план участка, план часткі г.Гродна. Да плана мясцовасці падаецца тлумачэнне.

22. КП - 78953. *Plan działu ziemi miejskiej, znajdującej się w posiadaniu ob. Tomasza Kisielewa, przy ul. Lewej-Nabrzeżnej na przedmieściu m.Grodna położonej. Sporządzony w 1925 r.*

План 1925 г. Гродна. Аўтар невядомы. Маштаб: [1 : 250]. Рукапіс каляровы, калька. Памер: 31,9 × 44 см. Арыентаванне: паўночнае. На плане прадстаўлены ўчастак зямлі Т.Кісялёва. У левай цэнтральнай частцы знаходзіцца апісанне агульнай плошчы. У левым ніжнім куце падаецца апісанне забудовы. На адваротным баку ёсць надпіс ад рукі, які сведчыць аб тым, што дадзены гарадскі пляц быў прададзены на вечнае ўладанне Хэлене Рэй. Тэкст замацаваны круглай пячаткай магістрата Гродна.

Як ужо адзначалася вышэй, картаграфічная калекцыя Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея з'яўляецца адной з найбольш значных і каштоўных. Карты і планы Гродна – багатая крыніца для вывучэння гісторыі нашага горада, яго будаўніцтва.

---

**Спіс ілюстрацый:**

1. КП – 9217. Delineacya[!] Placu z Domem drewnianym Koszary zwanym, oraz z Częścą Lodowni drewnianey[!]: w ogóle[!] Morg ieden[!] w Sobie zawieraiącego[!]. Podpisuię[!].
2. КП – 8495. Plan Placów w Mieście Grodnie. Wyliczenie Placów w Mieście Grodnie do Klasztoru PP.Brygidek należnych po uczynionym wymiarze przez Niżej podpisanego Geometrę w Roku 1830 dnia 14 Sierpnia Uczynione.
3. КП – 9010. Планъ Геометрическій Части Города Гродна, то есть: Плаца съ строеніемъ Гродненской Еврейской Больніцы.
4. КП – 14757/3. Планъ города Гродны. Составленъ въ Губернской Чертежной въ 1892 году. Печ. въ Типо-Литографіи Грод. Губерн. Правленія.
5. НД – 251/13, 14. Orjentacyjny plan miasta Grodna. Wydawnictwo księgarni E. Ibierskiego, Grodno. Zakł. graf. Ł.Miejłachowicza, Grodno. 1932 r.



1. КП – 9217. Delineacya[!] Placu z Domem drewnianym Koszary zwanym, oraz z Częścą Lodowni drewnianey[!]: w ogóle[!] Morg ieden[!] w Sobie zawieraiącego[!]. Podpisuię[!].

2. КП – 8495. Plan Placów w Mieście Grodnie. Wyliczenie Placów w Mieście Grodnie do Klasztoru PP.Brygidek należnych po uczynionym wymiarze przez Niżej podpisanego Geometrę w Roku 1830 dnia 14 Sierpnia Uczynione.





3. КП – 9010. Планъ Геометрическій Части Города Гродна, то есть: Плаца съ строеніемъ Гродненской Еврейской Больніцы.




4. КП – 14757/3. Планъ города Гродны. Составленъ въ Губернской Чертежной въ 1892 году. Печ. въ Типо-Литографіи Грод. Губерн. Правленія.




5. НД – 251/13, 14. Orjentacyjny plan miasta Grodna. Wydawnictwo księgarni E. Ibierskiego, Grodno. Zakł. graf. Ł.Miejłachowicza, Grodno. 1932 r.

*Вольга Сабалеўская,*
*кандыдат гіст. навук (Гродна)*

# Крыніцы па габрэйскай “жаночай гісторыі” ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гародні

Адной з прыкметных падзеяў у развіцці гістарыяграфіі канца XX ст. стала з’яўленне новага напрамку міждысцыплінарных даследаванняў – *Gender Studies*, якія звярнулі ўвагу на соцыякультурную сутнасць полу. Для сучаснай гістарычнай навукі імкненне “убачыць жанчыну” – гэта не даніна модзе, а надзённая патрэба даследаваць у гістарычнай рэтраспекцыі сутнасць укладу ў гісторыю яе важнейшага суб’екта.

У габрэйскім асяроддзі роля жанчыны не зводзілася да вядзення хатняй гаспадаркі і выхавання дзяцей. Яна выконвала функцыю эканамічнага забеспячэння сям’і і падтрымання традыцый праз веданне і дасканалае выкананне кашрута. Пашырэнне даследаванняў гісторыі габрэйскай жанчыны робіць актуальным пытанне забеспячэння гэтай тэматыкі крыніцамі.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні з’яўляецца адным з старэйшых і буйнейшых збораў пісьмовых крыніц у Рэспубліцы Беларусь. Ён налічвае 1 200 фондаў, у якіх знаходзяцца 408 тыс. адзінак захавання. Тут захоўваюцца дакументы з XVI па пачатак XX ст., якія адносяцца да гісторыі сучаснага заходняга рэгіёну Беларусі – колішніх тэрыторый Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Гарадзенскай губ., а таксама Вілейскага, Ашмянскага, Дзісненскага і Лідскага паветаў Віленскай губ. Расейскай імперыі.

Габрэі заўсёды складалі значную частку жыхароў заходняга рэгіёну Беларусі. Згодна з дадзенымі губернскай статыстыкі на 1881 г., іх колькасць дасягала 19,7 % насельніцтва Гарадзенскай губ. (229 574 чал.). Менавіта іх прысутнасць абумовіла наяўнасць у фондах НГАБ у Гародні комплексу крыніц па іўдаіцы, што практычна не адлюстравана ў архіўных каталогах. Прадстаўленая праца будзе садзейнічаць ліквідацыі гэтага недахопу.

Матэрыялы НГАБ у Гародні ахопліваюць шырокае кола тэм, якія звязаны з гісторыяй габрэйскай жанчыны. Іх можна умоўна падзяліць на групы:

**Статыстычныя звесткі.** Дадзеныя пра колькасць габрэйскіх жанчын, у тым ліку з указаннем саслоўнай прыналежнасці:

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);

Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);

Ф. 14. Гарадзенскі губернскі статыстычны камітэт (1835-1915);
Ф. 100. Гарадзенская губернская перапісная камісія (1896-1897),
Гарадскія і мяшчанскія ўправы;
Ф. 492. Берасцейская гарадская ўправа (1895-1916);
Ф. 1046. Слонімская гарадская ўправа (1910);
Ф. 680. Друйская гарадская ўправа (1702-1866);
Ф. 676. Лідскі гарадавы магістрат (1795-1868);
Ф. 237. Ваўкавыскае гарадское спрошчанае грамадскае кіраванне (1902-1916);
Ф. 1574. Лідскае гарадское спрошчанае кіраванне (1897-1915);
Ф. 116. Берасцейская мяшчанская ўправа (1879-1917);
Ф. 132. Ваўкавыская мяшчанская ўправа (1888-1903);
Ф. 975. Валпянская мяшчанская ўправа (1915);
Ф. 976. Зяльвянская мяшчанская ўправа (1893);
Ф. 537. Індурская мяшчанская ўправа (1906);
Ф. 1641. Арлянская мяшчанская ўправа (1904);
Ф. 1210. Поразаўская мяшчанская ўправа (1904);
Ф. 1640. Радуньская мяшчанская ўправа (1906);
Ф. 1639. Шчучынская мяшчанская ўправа (1908-1915);
Ф. 38. Гарадзенская дырэкцыя народных вучылішчаў (1862-1917).

Гэтыя дадзеныя збіраліся чынавенствам гарадскіх дум, магістратаў, ратуш і павятовай паліцыі і абагульняліся ў справаздачы гарадзенскага губернатара, якая адпраўлялася ў сталіцу. У Фондзе 1 яны адкладаліся ў выглядзе комплекса, які складаецца з некалькіх дзесяткаў спраў пад назвай “Статыстычная звесткі пра насельніцтва і эканамічны стан губерні”. Дырэкцыя народных вучылішчаў, збіраючы інфармацыю пра колькасць габрэяў, цікавіліся лічбай патэнцыяльных вучняў казённых школ.

**Дэмаграфічныя дадзеныя.** Інфармацыя пра натуральных рух насельніцтва і гісторыю сям’і.

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);
Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);
Ф. 24. Гарадзенская губернская казённая палата (1813-1917)

Фонды габрэйскіх грамадстваў:
Ф. 146. Гарадзенскае габрэйскае грамадства (1697-1874);
Ф. 232. Берасцейскае габрэйскае грамадства (1874-1897);
Ф. 273. Кобрынскае габрэйскае грамадства (1838-1856);
Ф. 1507. Ваўкавыскае габрэйскае грамадства (1764-1765);
Ф. 1536. Пружанскае габрэйскае грамадства (1859)

Фонды павятовых сінагогаў:
Ф. 56. Радунская сінагога (1897-1914);
Ф. 33. Ражанкаўская сінагога (1896-1914);

Ф. 79. Жалудоцкая сінагога (1896-1914);
Ф. 255. Шчучынская сінагога (1900-1914);
Ф. 272. Васілішкаўская сінагога (1896-1914);
Ф. 286. Воранаўская сінагога (1897-1914);
Ф. 271. Арлянская сінагога (1901-1914);
Ф. 290. Астрынская сінагога (1897-1914).
Ф. 1787. Дзісненскі павятовы рабін (1896-1914).

У рэвізскіх сказках ёсць дадзеныя па складу сям'і з указаннем прафесіі і адрасу. Пасямейныя спісы габрэяў Гародні, якія жылі на некаторых цэнтральных вуліцах горада ў 1795 г., можна знайсці ў Фондзе казённай палаты. Метрычныя кнігі асобных грамадстваў захаваліся фрагментарна. Больш раннія, якія тычацца першай паловы XIX ст., можна знайсці ў Фондзе 1 у справах, якія звычайна маюць назву "Звесткі пра колькасць кагалаў, сінагог, школ, службовых асоб і настаўнікаў габрэйскага закону". Найбольш поўныя звесткі на 1840 г.[1] Пазьнейшыя, якія адносяцца да мяжы XIX – XX ст., часцей за ўсё па 3-5 адзінак захавання ў вопісу, утрымліваюцца ў фондах аднайменных сінагогаў. Пры дапамозе гэтых крыніцаў можна вывучыць гісторыю габрэйскай сям'і і правесці канкрэтнае генэалагічнае даследаванне.

**Эканамічная дзейнасць.** Звесткі пра заняцце гандлем і прамысловасцю, капіталах купчых, асваенні жанчынамі новых відаў дзейнасці.

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);
Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);
Ф. 8. Будаўнічае аддзяленне (1816-1915);
Ф. 9. Урачэбная ўправа (1839-1917);
Ф. 24. Гарадзенская губернская казённая палата (1813-1917);
Ф. 100. Гарадзенская губернская перапісная камісія (1896-1897).

Інфармацыя пра ўдзел габрэяў губерні ў гандлі ўтрымліваецца ў многіх справах Фонду 1. Тут дадзеныя пра валоданне лаўкамі і арэнду іх у магістратаў, аб'ёмы продажу і асартымэнт тавару. Змястоўныя спісы на 1819 і 1822 гг. прыведзеныя ў вопісу 1[2]. Атрымліваецца, што ў 1822 г. сярод 119 габрэяў, якія легальна гандлявалі ў Гародні, было 26 жанчын з капіталам ад 50 да 900 руб. Яны прапаноўвалі пакупнікам галянтарэйныя тавары, вопратку (часцей ужываную), гародніну і посуд. Дакумэнты архіва распавядаюць пра габрэяк-ліхвярак, напрыклад, Хаю Варшаўскую з Берасця, у закладзе ў якой апынулася нават срэбра сямятыцкай сінагогі[3].

На працягу XIX – пачатку XX ст. габрэйкі Гарадзенскай губ. валодалі саматужнымі прадпрыемствамі. Скураныя заводы трымалі ў 20-я гг. XIX ст. купчыха

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні (НГАБ). Ф. 1, воп. 20, ад. зах. 641.
2 Тамсама. Воп. 1, ад. зах. 1422, 2677.
3 Тамсама. Ф. 98, воп. 1, ад. зах. 511.

3 гільдыі Х.І.Фінава з Гародні, у 40-я гг. З.Л.Пужыц з Берасця. Звесткі пра працу іх фабрык можна знайсці ў гадавых "Ведамасцях фабрык і заводаў Гарадзенскай губерні" ў Фондзе 1. Яшчэ больш прыкметны след габрэйскія жанчыны пакінулі ў вытворчасці і продажы спіртных напояў. У "Перапісцы з Гарадзенскай казённай палатай пра збор падаткаў з піцейных прадпрыемстваў Гарадзенскай губерні" за 1825 г. узгаданыя гарадзенскія шынкаркі Хася Іонова з Троіцкай вуліцы, Сорка Кофманова з вуліцы Маставой, Песя Лейбава і Хесна Гешэлева з Рынка[4].

Дакументы сведчаць, што беластоцкія габрэйкі ў 1888 г. актыўна канкуравалі з мужчынамі ў продажы алкаголю. З 22 шынкоў Беластоку 6 належалі жанчынам: Рэйзле Кавальскай, Ясе Лямперт, Гіндзе Камянецкай, Індзе Ізбіцкай, Таўбе Розенталь[5]. Пры гэтым габрэйскія жанчыны ўдзельнічалі не толькі ў продажы, але і ў вытворчасці моцных напояў. У 1898 г. у Беластоку броварамі валодалі Рохля Гайль і Лея Памеранц, у Гародні – Рохля Андрэс. Таўбе-Хаі Геллер належалі бровары ў Беластоку і Бельску, а таксама піўная лаўка. Вопытным прадпрымальнікам была купчыха 2 гільдыі Хая-Лея Яфэ з Гародні. Яна кіравала справамі вінакурні, віннай лаўкі і склепу для продажу пэйсахавай водкі ў Брэст-Літоўску, бровару ў Гародні, аптовага склада ў мястэчку Індура і піўной лаўкі ў Саколцы[6].

На мяжы стагоддзяў у Гарадзенскім рэгіёне з'явілася вялізарная колькасць габрэйскіх крамаў і майстэрань, якія аказвалі насельніцтву розныя паслугі. Сярод іх уласнікаў дакументы нярэдка называюць жанчын. Напрыклад, Рыўка Глэйберман з Беластоку, якая яшчэ пры жыцці мужа кіравала майстэрняй па рэзцы пячатак, а калі аўдавела, прыняла на сябе кіраванне фірмай[7].

Той факт, што жанчыны становяцца ўтрымальніцамі кнігарань і чытальняў (С.Ф.А.Гальперн, К.А.Хазіна, С.-Г.Блюмэнфельд, Ш.Э.Хавановіч[8]), якія прапаноўвалі літаратуру на замежных мовах, сведчыць пра распаўсюджанне ў жаночым асяроддзі асветы заходняга накірунку. Нельга не адзначыць, што жанчыны асвойвалі новыя віды дзейнасці – фатаграфію, друкарскую справу[9], вольныя прафесіі, медыцынскія спецыяльнасці, пра што сведчаць паданні на імя губернатара, сабраныя ў Фондзе 1, дакументы Фондаў 9 і 100.

Асаблівую цікаўнасць прадстаўляюць паданні аб дазволе пабудаваць альбо рэканструяваць прадпрыемствы (Фонд 8). З яго дакументаў можна даведацца пра прадпрымальніцкую дзейнасць купчыхі Малкі Зыскіндаўны Каўфман, якая валодала на гарадзенскім Фарштаце вінакурнымі і мукамольнымі заводамі, пра будаўніцтва вінакурні Х.-Л.Яфэ ў 80 – 90-х гг XIX ст.[10]

[4] Тамсама. Ф. 1, воп. 3, ад. зах. 48.

[5] Тамсама. Воп. 8, ад. зах. 2338.

[6] Тамсама. Воп. 9, ад. зах. 848.

[7] Тамсама. Ад. зах. 837.

[8] Тамсама. Ад. зах. 498, 900, 1618.

[9] Там же. Воп. 18, ад. зах. 1382.

[10] Тамсама. Воп. 9, ад. зах. 835, 2338.

У Фондах 8 і 9 знаходзім інфармацыю пра працу габрэяк Гарадзенскай губ. у якасці павітух. Перапісныя лісты Фонду 100 даюць комплекснае ўяўленне аб тым, чым займаліся габрэйкі губерні, ці была іх прафесія асноўнай крыніцай прыбытку сям'і альбо сродкам дадатковага заробку. Аказалася, што з 329 габрэйскіх жанчын Гародні працаздольнага ўзросту, якія былі названы ў перапісных лістах, 131 працавалі прыслугай (нянькамі, гувернанткамі, кухаркамі), 33 – рабочымі на прадпрыемствах, 24 – займаліся рамяством, 18 - гандлем, 3 - рукадзеллем, астатнія былі настаўніцамі, павітухамі, ліхвяркамі, агародніцамі[11].

**Удзел у сацыяльна-палітычным, рэлігійным і культурным жыцці.**

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);

Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);

Ф. 103. Гарадзенская губернская канцылярыя па справах таварыстваў і саюзаў (1906-1914);

Ф. 581. Гарадзенская аб'яднаная палата крымінальнага і грамадзянскага суда (1831-1883);

Ф. 34. Гарадзенскі акруговы суд (1883-1917);

Ф. 35. Пракурор гарадзенскага акруговага суда (1883-1915);

Ф. 366. Гарадзенскае губернскае жандармскае кіраванне (1867-1917).

У матэрыялах гэтай групы дакументаў адлюстраваны тыя сферы грамадскага і культурнага жыцця, якія былі даступныя для габрэйскай жанчыны XIX – пачатку XX ст.: наведванне розных культурных мерапрыемстваў, тэатру. Не заўсёды яно праходзіла легальна. У дакумэнтах архіва ёсць звесткі пра арганізацыю тайных малітоўных дамоў, несанкцыянаваных уладамі хатніх спэктакляў. Удзел габрэяў у палітычным жыцці назіраўся ужо ў 60-я гг XIX ст., праўда, хутчэй у кур'ёзным сэнсе. Напрыклад, Хася Браўдава, Хая Марголісава, Сора Пейсах і Рыўка Сосава былі асуджаны за ўдзел у паўстанні 1864 г. Адныя пастаўлялі паўстанцам малочныя вырабы, іншыя гандлявалі кулямі[12].

У Фондзе 103 захаваліся матэрыялы, якія асвятлялі ўдзел габрэйскіх жанчын у дабрачыннасці, а таксама статуты таварыстваў, якія аказвалі дапамогу жанчынам: "Навука і прызначэнне", "Таварыства дапамогі габрэйкам-вучаніцам гімназій", "Дапамога тым, хто падае", "Таварыства габрэйскіх дзіцячых калоній".

Пра хрост габрэяк апавядаюць матэрыялы Фонду 1. Гэта прашэнні аб дазволе змены веравызнання, якія ствараюць магчымасць вывучэння матываў прыняцця гэтага важнага рашэння. Хтосьці змяняў веру, не маючы іншай магчымасці развесціся з мужам, хтосьці жадаў атрымаць еўрапейскую адукацыю, хтосьці спадзяваўся атрымаць дапамогу для выхрыстаў альбо проста баяўся пакарання. Прысутнічалі таксама рамантычныя і крымінальныя абставіны. Адзначаны выпадкі пераследаванняў габрэяк, якія прынялі хрост, з боку былых

[11] Тамсама. Ф. 8, воп. 2, ад. зах. 430.

[12] Тамсама. Ф. 100, воп. 1, ад. зах. 196, 197.

адзінаверцаў. Адзначаны выпадкі чаравання, распаўсюджвання забабонаў[13]. Фонды "сілавых структур" з 80-х гг XIX ст. адзначаюць рост палітычнай актыўнасці габрэяў і ўдзел жанчын у дзейнасці сіяністскіх арганізацый і Бунда[14].

**Асвета.**

Ф. 100. Гарадзенская губернская перапісная камісія (1896-1897);

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);

Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);

Ф. 9. Урачэбная ўправа (1839-1917);

Ф. 14. Гарадзенскі губернскі статыстычны камітэт (1835-1915);

Ф. 125. Гарадзенская гарадская дума (1876-1916);

Ф. 38. Гарадзенская дырэкцыя народных вучылішчаў (1862-1917)

Ф. 839-842. Інспектары народных вучылішчаў па паветух Гарадзенскай губ (1898-1918).

Матэрыялы гэтых фондаў дазваляюць атрымаць звесткі пра прыватныя і дзяржаўныя жаночыя школы і вучылішчы, пра колькасць вучаніцаў, пансіёны, пра хатніх настаўнікаў, прызначэнні стыпэндый вучаніцам габрэйскіх казённых вучылішчаў і гарадзенскай жаночай гімназіі, распаўсюджанне адукацыі сярод габрэяк. Фонд 9 дае ўяўленне пра дзейнасць гарадзенскай спавівальнай школы, значную долю вучаніцаў якой складалі габрэйкі. Па перапісных лістах Фонду 100 можна вывучыць стан пісьменнасці і схільнасць да моўнай асіміляцыі, сувязь сацыяльнага паходжання з узроўнем адукацыі. Атрымліваецца, што з 415 гарадзенскіх габрэяк старэйшых за 5 гадоў, інфармацыя пра якіх падаецца ў перапісных лістах 100 фонда, пісьменных было 278. З іх 168 атрымалі хатнюю адукацыю, 34 – гімназічную, 21 – скончылі курс прыватнага а 8 – казённага вучылішчаў, адна наведвала школу пры фабрыцы Шарашэўскага, адна закончыла Санкт-Пецярбургскую мэдыка-хірургічную акадэмію. Рускую мову назвалі роднай жанчыны з сем'яў купцоў і прадстаўнікоў вольных прафесій (бухгалтар, адвакат)[15].

Асобны комплекс справаў у Вопісу 25 Фонда 1 складаюць пасведчанні аб палітычнай дабранадзейнасці, якія афармляліся для паступлення ў дзяржаўныя навучальныя ўстановы. Па іх мы можам высветліць, якія прафесіі былі найбольш прывабнымі для габрэйскіх дзяўчат губерні, у якія навучальныя ўстановы яны імкнуліся. Роза Раецкая, Рэйзля Эпштэйн і Сора Гальперн марылі стаць стаматолагамі, дзеля чаго паступалі ў Кіеўскі універсітэт і зубаўрачэбныя школы. Некалькі дзяўчат здавалі іспыты за курс гімназіі, каб атрымаць званне аптэкарскіх вучаніцаў і працаваць у аптэках, якія належалі супругам. Берта Эйдман плянавала стаць народнай настаўніцай[16].

[13] Тамсама. Ф. 1, воп. 34, ад. зах. 3567.

[14] Тамсама. Воп. 3, ад. зах. 352.

[15] Тамсама. Ф. 366, воп. 1, ад. зах. 160.

[16] Тамсама. Ф. 1, воп. 25, ад. зах. 2400 б.

**Сямейна-пабытовае жыццё і маральнасць.**

Ф. 100. Гарадзенская губернская перапісная камісія (1896-1897);

Ф. 1. Канцылярыя гарадзенскага губернатара (1802-1917);

Ф. 320. Канцылярыя кіраўніка Беластоцкай вобласці (1807-1842);

Ф. 9. Урачэбная ўправа (1839-1917);

Ф. 2. Гарадзенскае губернскае праўленне (1802-1913);

Ф. 581. Гарадзенская аб'яднаная палата крымінальнага и грамадзянскага суда (1831-1883);

Ф. 34. Гарадзенскі акруговы суд (1883-1917);

Ф. 35. Пракурор гарадзенскага акруговага суда (1883-1915).

У гэтай групе фондаў знаходзяцца дакументы, якія апавядаюць пра ўнутрысямейныя канфлікты, што патрабавалі судовага вырашэння (развод, раздзельнае пражыванне, гвалт, выкраданне і спакушэнне дзяўчат, падзел маёмасці, скандалы). Матэрыялы судовых установ утрымліваюць дакументы пра згвалтаванне, крымінальныя аборты, дзетазабойствы, двайжонства. У Фондзе 1 прыцягваюць увагу паданні прыватных асобаў, якія падавалі скаргі на ўтрымальнікаў бардэляў. Фонд 9 захоўвае інфармацыю пра прастытуцыю, у т.л. вынікі інспекцыі бардэляў Берасця, Гародні, Слоніма, Беластока, санітарна-гігіенічныя патрабаванні, урачэбныя кніжкі прастытутак, якія дазваляюць зрабіць высновы пра іх узрост і сацыяльнае паходжанне.

Такім чынам, у фондах НГАБ у Гародні захоўваецца шмат рознабаковай інфармацыі, якая можа спрыяць даследаванням "жаночага твару" габрэйскай гісторыі Беларусі. Карысныя нават тыя матэрыялы, у якіх адсутнічаюць згадкі габрэйскіх жанчын. Напрыклад, тое, што яны не названыя сярод прадстаўнікоў пэўных прафесій, сведчыць пра прыярытэты габрэйскага свету, які вельмі марудна прасоўваўся па шляху мадэрнізацыі, пра нізкі ўзровень эмансіпацыі ў гэтым асяроддзі.

Трэба адзначыць, што праца даследчыка будзе ўскладняцца некаторымі абставінамі. Справа ў першую чаргу ў канфесійным прынцыпе падачы статыстыкі, які быў прыняты ў Расійскай імперыі. Практычна немагчыма прасачыць лёс жанчыны габрэйскага паходжання, якая прыняла хрост. Яна адсутнічае ў спісах "габрэяў" (іўдзеяў), яе імя і прозвішча змененыя. Акрамя таго ў габрэйскім асяроддзі спрацоўваў жорсткі гендэрны стэрэатып, згодна з якім справай жанчыны была хатняя гаспадарка і дзеці, а задачай мужа – фінансавае забеспячэнне сям'і. Хаця на справе гэтая мадэль даўно адыйшла ў мінулае. У XIX ст. менавіта на жаночыя плечы лёг цяжар забеспячэння выжывання сям'і, аднак уласнікам майстэрні альбо крамы часцей за ўсё будзе названы мужчына, а не яго жонка, рэальная гаспадыня бізнеса.

***Аляксей Шаланда,***
***кандыдат гіст. навук (Менск)***

# Прыватны ліст віленскага цэйкварта Вільгельма Поля ад 6 мая 1641 г. аб водаправодзе і арсенале ў Горадні

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Менску сярод розных папер фонда Радзівілаў захоўваецца прыватны ліст ад 6 мая 1641 г. Вільгельма Поля, віленскага цэйкварта, у якім гаворыцца аб водаправодзе і арсенале ў Горадні[1]. Дакумент гэты ўжо трапляў у поле зроку даследчыкаў, якіх, праўда, больш цікавіла апісанне гарадзенскага арсеналу[2]. Добрая палова ліста, якая засталася па-за ўвагай, адносіцца да праекта пабудовы ў Горадні водаправода да Старога замку.

Водаправод у горадзе існаваў ужо ў 1629 г.: гарадзенскі бурмістр Ганус Фандэберг за свой кошт правёў *"wodą rurami do rynku na pożytek pospolity"*[3]. Як вынікае з дакументу, планаваўся яшчэ і спецыяльны водаправод да замку. Падрабязны каштарыс будаўнічых прац, складзены Вільгельмам Полем, дае ўяўленне якім ён павінен быў быць.

Ці быў гэты праект рэалізаваны на практыцы? Каб адказаць на гэтае пытанне патрэбны далейшыя архіўныя пошукі. Адное можна казаць упэўнена – дакумент сведчыць аб даволі высокай ступені развіцця інжынерна-тэхнічнай думкі ў ВКЛ у першай палове XVII ст. і высокім узроўні цывілізаванасці тагачаснага беларускага грамадства. Ліст таксама з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі архітэктуры Горадні, рамяства і тагачаснай метралогіі.

Пры друкаванні дакументу па магчымасці захаваны ўсе адметнасці і асаблівасці аўтэнтычнага тэксту рукапісу: заглаўныя літары ў сярэдзіне сказаў, малыя літары пасля кропкі, аўтарскія знакі прыпынку, вынасная літара °, злітнае напісанне некалькіх асобных словаў. У квадратных дужках даецца раскрыццё скаротаў і прапушчаныя словы і літары, адноўлены тэкст. Аўтарскія памылкі вылучаны словам (sic!).

---

1 НГАБ. Ф.694, воп.4, ад. зах. 956, ч.1, арк.165.

2 Ткачев М. Замки Белоруссии. Мн., 1981. С. 34; Госцеў А., Швед В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 г.). Гродна, 1993. С. 29.

3 АВАК. Вильна, 1874. Т.VII. С. 111; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня, Вроцлаў, 2008. С. 50.

**Ліст прыватны віленскага цэйкварта Вільгельма Поля па справе пабудовы водаправоду да гарадзенскага замку і аб стане замкавага арсеналу, Вільня, 6 мая 1641 г.**

Na Rozkaz W(aszej)M(iło)sci M(miłościwego)Pana y Dobrodzieja[4] mego ziechałem do Grodna, dla zważenia y zprowadzenia wody do Zamku Grodzieńskie(g)°[5], y przyiachawszy do folwarku JE(g)°M(iło)sci(weg)° Pana Czernickieg°[6], ktory Folwarek nazwano Putrisky[7], w ktorim iest wody niemalo, ktora wybierza zguri, zpułdnie y poczałem wazic az do Zomku (sic!) Grodzieńskie(g)°, nalazłem co może być ta woda w zamku Grodzi(e)nskim wisoko na trzy sażnie[8] A ztego woda aż do miasta Grodna do brami Wilenskiej[9]. Jest prentow[10] 1600. Od brami Przes (sic!) miasto do Zamku, prutow 250. Uczyni wszytkiego prętow 1850. to iest Mylą[11] drogę y prent 50. Kazdy prent rachuiąc po lokću[12] (sic!) Siedm y puł, do prowadzenia tey wody potrzeba

---

[4] Маецца на ўвазе або віленскі ваявода Януш Тышкевіч, або віленскі кашталян і гарадзенскі староста Крыштаф Хадкевіч. Гл.: Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / Pod red. A.Rachuby. Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba, P.Romaniuk. Warszawa, 2004. T. I. s. 195; Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Мн., 2006. Т. 2. с. 710.

[5] Стары замак у Горадні.

[6] Род Чарніцкіх гербу "Ястрабец" зменены або "Мілян" (на тарчы падкова без крыжа, у кляйноце ястраб без падковы) у Гарадзенскім павеце быў мазавецкага паходжання. Фальваркам Путрышкі ў 1641 г. валодаў Якуб Чарніцкі, які згадваецца ў 1629–1633 г. як уладальнік маёнткаў Русота і Гожа Катаўшчызна, пасля яго спадчына перайшла сынам: Аляксандру Антонію на Чарніцах Чарніцкаму, падстолію віленскаму (1650–1676 г.) (жонка Эльжбета Ямніцкая) і Марціну Казімеру Чарніцкаму, падчашаму гарадзенскаму (1669–1678 г.) (жонка Барбара Славагурская). (Kojałowicz W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium. Kraków, 1897. s. 76. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek… s. 155; Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.Warszawa, 1906. T. III. s. 9; Boniecki A. Herbarz Polski. T. 3. Warszawa, 1901. s. 367–368; Niesiecki K. Herbarz Polski / Wyd. J.N.Bobrowicz. Lipsk, 1839. s. 247; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Supraśl, 2005. s. 184, заўвага 453; НГАБ у Горадні, ф.128, воп.1, спр.3, арк.17). Апошні ў 1678 г. быў асуджаны на баніцыю. У баніцыйным лісце быў згаданы яго маёнтак Тузаўляны і іншыя "w Powiecie Grodzieńskim" ляжачыя. (ГДГАМ, КП 9216, арк.1). Магчыма, сярод не названых былі і Путрышкі. Так, у 1690 г. у Гарадзенскай парафіі згадваюцца 5 дымоў у Тузаўлянах і Путрышках, якімі, праўда, ужо валодаў Станіслаў Казімер Гадачэўскі, скарбнік пінскі (1695 г.). Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo Trockie 1690 r./ Opr. H.Lulewicz. Warszawa, 2000. s. 98, заўвага 69.

[7] Правільна – Путрышкі. Згаданы фальварак знаходзіўся каля сучаснай аднаіменнай вёскі, якая знаходзіцца ў 9 км на паўночны ўсход ад Горадні. Гродненская область. Карта памятных мест Второй мировой войны. Гродно, 2004.

[8] Сажань – мера даўжыні. 1 сажань = 194,8 см. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны. Мн., 2008. С. 81).

[9] Віленская брама Горадні стаяла на паўночнай гарадской мяжы на скрыжаванні Віленскай і Калюцінскай вуліцаў. Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня… С. 63].

[10] Прут – адзінка вымярэння даўжыні і плошчы. 1 прут = 7,5 локцям = 4,87 м. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны… С. 82).

[11] Міля – адзінка вымярэння даўжыні (адлегласці). 1 міля = 7,777 км. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны… С. 81).

[12] Локаць – адзінка вымярэння даўжыні. 1 локаць = 64,96 см. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны… С. 82).

drzewa kop[13] 25 posążnią puł czwarta. A teraz zaraz do początku potrzeba drzew kop trzy pocziąwszy robić, potrzeba zaraz więc(e)i dowozic, Rormistrza y Rorniki potrzeba zaraz, zkoro drzewo będzie, ztąd z Wilna posłać. Cieślę y Grabarzie są w Grodnie[14]. Cziesłem z Grabarzem co będą sadzawkę kopać, y obrombowacz (sic!), albo y wodę wzrumę fasowac, potrzeba przytydnem płaczic; bo onny, y Ja sam nie mogę wiedzieć co będzie kosztowalo. Rormistrowi temu potrzeba do wiernich rąk dac sto kop z ktorych on powinnien będzie Lidzbu uczynic. A kedy Sadzawka będze gotowa, potrzeba Rornikem, zarazem, zaplacic. Od kręcenia Rur, y od polozenia Rur, od Każdei Ruri po ql[15] 10, A kopaczom osobno potrzeba też zaraz dac szwidra porobicz. także tesz z buxi do Rur za każdą po gros 20. Tego roku potrzeba buxow 250. tak Ja kladę, plus minus, co każda Rura będzie kosztowala z buxami, Rurnikom y Grzebarzom po zlotych dwa. Co wszytkie(g)° uczyni zlotych[16] 3000.

Strony Risztunku. Dział Moskiewskych 6 leży za Nemlą[17] w polu obawam się że by szkoda nie przypadla, coby uszy nie odbito potrzeba by ich ztego Miesce (sic!) poprowadzic.

Zbroja wszytka w Zamku, w sklepie mają bic 600 ktorę platnar[18] poprawił gotowego sto y 39 zaplacono Jemu za sto po trzych zlotych; potrzeba ostatek doplacic iescie za 39. Sam że on platnar niezadlugo będzie y list przy sobie ma od JE(g)°M(iło) sci Pana Oeconoma[19] strony Muszketą łeżąc też na gromadę bez lożę. Jest tam Rzemiestnik, z ktorim JE(g)°M(iło)sć zmowił za kazdą Muszkiet; za Loże, y za Slosarską robotę, co tylko nabicz y strzelacz, po zlotych pultora. Szpadę Niemieckich iest tesz gromada, ałe iesce nic gotowego. Iako wieła każdego iest, może W(asza) M(iło)sć M(ój)M(iło)sci(wy) Pan, do JE(g)°M(iło)sci[20] Pisac o Jnwentarz.

Mnie sie zda, co by temu Rzemiesnikowi zadatek poslac na sto Moszketow (sic!) złotych pultorasta. A kedy tę zroby, znowu na sto Moszketow (sic!) złotych sto.

Datt w Wilnie yakom przyiachał Jn 6 Maja Roku 1641.

M(ojej)M(iło)s(ci) Na(j)nyszy sluga Wihelm Poll Ceikwart[21] Wilensky.

---

13 Капа – тут у сэнсе 60.

14 Гарадзенскія цесляры ў XVI–XVIII ст. уваходзілі ў аб’яднаны цэх будаўнічых спецыяльнасцяў. (Шаланда А. Пергаміны канца XVI–XVII ст. на лацінскай і польскай мовах у фондах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // Герольд Litherland. Горадня, 2002. № 3–4. С. 97–119; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня… С. 114–119).

15 Скарот, які абазначаў слова “грошаў”. Грош – білонная манета, біццё якой у ВКЛ пачалося ў 1535 г. 1 грош =10 пенязяў. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны... С. 102–103).

16 Злоты – грашовая адзінка ў Каралеўстве Польскім, якая ў XVII ст. шырока выкарыстоўвалася ў грашовым абарачэнні ВКЛ. 1 злоты = 30 грошам. (Калечыц І. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны… С. 103).

17 Маецца на ўвазе рака Нёман (ням. Memel).

18 Плятнар – (ням. Plattner) рамеснік, які займаўся аздобай халоднай зброі. Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня… С. 337.

19 Асоба гарадзенскага эканома не ідэнтыфікавана.

20 Тут: да эканома.

21 Цэйкварт – (ням. *Zeugwahrter*) арсенальскі наглядчык.

*Антон Грыб,*
*Зміцер Яцкевіч (Мінск)*

# Тэстамент гарадзенскага мешчаніна Барталамея Галоўчыца 1639 г. як крыніца па гісторыі беларускага мяшчанства

У актавай кнізе гарадзенскага магістрата за 1639 – 1644 гг. быў выяўлены тэстамент гарадзенскага мешчаніна Барталамея Галоўчыца. Увогуле, тэстамент – гэта прававы акт ці распараджэнне, складзенае ў вызначанай форме пра асабістую маёмасць на выпадак смерці. Асоба, якая жадала скласці тэстамент, павінна была сваю волю выказаць у прысутнасці земскага, гродскага ці магістрацкага ўраду адпаведнага павету[1].

Тэстаменты даследаваліся і друкаваліся пераважна польскімі вучонымі Уршуляй Аўгустыняк, Аліцыяй Фаліноўскай-Градоўскай і Малгажатай Баркоўскай[2]. З беларускіх даследчыкаў мяшчанскія тэстаменты вывучаў Максім Гардзееў[3]. Таксама пра тэстаменты пісала Вольга Бабкова[4].

---

1 Маслыка Г. Тастамент // Вялікая княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 2. Мінск, 2006. С. 661-662.

2 Augustyniak U. Testamenty ewangelikow reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim. Warszawa, 1992; Falinowska-Gradowska A. Testamenty szlachty Krakowskiej XVII–XVIII w. Kraków. 1997; Borkowska M. Dekret w niebieskim ferowany parlamencie. Wybór testamentów z XVII–XVIII wieku. Kraków, 1984.

3 Гардзееў М.Ю. Новыя звесткі да біяграфіі Сімяона Полацкага // Кантакты і дыялогі. 1998. № 7–8. С. 54–56; Гардзееў М.Ю. Новы дакумент да біяграфіі Сімяона Полацкага // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта ім. А.А. Куляшова. 1999. № 1. С. 60–67; Гардзееў М.Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого: завещание матери просветителя // Славяноведение. 1999. № 2. С. 37–47; Гардзееў М.Ю. Матэрыяльнае становішча сям'і Сімяона Полацкага // Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность. Материалы Международной научной конференции. Полоцк, 1999. С. 53–57; Гардзееў М.Ю. Сімяон Полацкі: сям'я і роднасныя сувязі // Штогоднік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 1999. Мн., 1999. С. 40–47; Гардзееў М.Ю. Тэстамент маці Сімяона Полацкага // Беларускі горад у часе і прасторы. 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: Зборнік навуковых прац. Наваполацк, 2001. С. 87–97; Гардзееў М.Ю. Запісы-тэстаменты полацкіх мяшчан часоў вайны 1654–1667 гг. як пісьмовыя гістарычныя крыніцы // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы Рэсп. навукова-практ. канф. Мінск, 27 сакавіка 1999 г.: У 2 ч. Мн., 1999. Ч. 2. С. 39–42.

4 Бабкова В.У. Тэстаменты з актавых кніг Менскага гродскага суда XVI – XVII стст. // Архіварыус. Вып. 3. Мінск, 2005. С. 104–119.

У фондзе 1761 Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі (НАРБ) захоўваецца 25 спраў гарадзенскага магістрата за 1638 - 1810 гг. Першая кніга, у якой і быў змешчаны дадзены тэстамент, з'яўляецца храналагічна самай ранняй. Яна мае 298 аркушоў і ўтрымлівае 287 дакументаў, якія зведзены з двух магістрацкіх кніг: бурмістроўска-радзецкай за 1639-1642 гады (аркушы 1-86), і войтаўска-лаўніцкія за 1638-1644 гады (аркушы 87-298). Тэстамент Барталамея Галоўчыца быў актыкаваны ў войтаўска-лаўніцкіх кнігах. Гэтыя кнігі былі складзены пісарам Казімірам Петрасевічам[5] і перапісаны пры бытнасці лаўніцкага пісара Адама Маргіевіча ў 1650 г.[6]

Тэстамент Барталамея Галоўчыца быў актыкаваны 4 красавіка 1639 г. пасля смерці тэстатара[7]. У сумарыюшы войтаўскіх кніг за 1639 г. ён змешчаны ў канцы кнігі і разам з тэстаментам Стэфана Максімавіча Гібулы пад № 5. Тэстамент складаўся ў доме Барталамея Галоўчыца пры яго ложку. Спецыяльна скліканы суд гайны перад самой смерцю тэстатара запісаў і засведчыў яго волю. У яго склад увайшлі лаўнікі Матэуш Ябланоўскі і Фёдар Юрэвіч, пісар Казімір Петрансевіч[8] і бурмістр Грыгорый Варабеёвіч.

Большую частку маёмасці Барталамей Галоўчыц ахвяраваў каталіцкім ордэнам: езуітам – 26 злотых, дзве капы і пяць талерак алавяных і паўмісак, дамінаканцам – 10 коп, бернардынам – 30 злотых і вялікую колькасць іншай маёмасці (срэбра са шкатулы, брайцараў – пяць, занглаў – два, прэнцікаў – два, колкоў – два, дзівэк – шэсць, чапрачок – адзін, злітак серабра і сыгнет), на фарны касцёл – 10 коп літоўскіх грошаў. У цэлым – 56 злотых і 22 капы, або пры пераліку на літоўскія грошы – 44,4 капы (2 664 грошы).

Значную частку маёмасці Барталамей Галоўчыц пакінуў свайму дзядзьку Венцлаву Галоўчыцу, а менавіта даўгі гарадзенскіх мяшчан (3 капы і 9 злотых), 3 бочкі солі і астатнюю маёмасць, якая па нейкай прычыне не адзначана ў тэстаменце. Жонцы Барталамей завяшчаў толькі 4 меры солі; брату – сала, авечку і ягня; стрыечнай сястры Аўдоцці, якая жыла ва ўрочышчы Канапелькі над ракой Гараднічанкай[9], сала і 2 авечкі з ягнятамі; мужу Аўдоцці – капеняк і кажух; пасынку Якубу – шэры жупан; хлопцу Крысю – астатніх авечак, даламан, кажух і шаблю. Рэзніку Пархвену, відаць, добраму сябру і калегу, дараваў доўг у 4 капы. Селімону Барталамеяваму і Кадышу Мазуру – па адным салу. Доўг шаўца Крыся (Крышка) запісаў два разы – Венцлаву і ўнуку Крысю. Загадаў таксама з тых бочак (пэўна з салам), якія адыходзілі Венцлаву, даць па палове бочкі брату Лаўрыну і стрыечнай сястры Аўдоцці. Акрамя гэтага тэстатар адклаў

[5] Пісар лаўніцкі Казімір Петрасевіч (Петрашэвіч) неаднаразова згадваецца ў актавых кнігах гарадзенскага магістрата, і ў 1650 г. – яго ўдава Магдалена Ганна Зяленская Петрашэвічова. Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. Suprasl, 2005. S. 213, 242, 243.

[6] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, ад. з. 1, арк. 87.

[7] Тамсама. Арк. 108 адв. – 109.

[8] Прозвішча падаецца як у дакуменце.

[9] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna… S. 197.

невялікія грошы сабе на пахаванне. Пяць коп, якія знаходзіліся ў Канапельках, загадаў знайсці і падзяліць паводле волі выканаўцаў тэстамента – Венцлава і Якуба. Нарэшце, у канцы тэстамента Барталамей згадаў пра каня, які знаходзіўся ў Рыбаках Азёрскіх[10] у Цімоха Трушкі, і быў пакінуты жонцы.

Пра веравызнанне тэстатара сведчыць месца пахавання. Галоўчыц пажадаў, каб яго пахавалі на могілках пры Фарным касцёле. Таксама варта ўвагі тое, што тэстатар ахвяраваў толькі на каталіцкую царкву.

У дадзеным тэстаменце адлюстраваўся значны аб'ём гістарычнай інфармацыі. Вялікая колькасць нумізматычных тэрмінаў (грош, злоты) сведчыць пра тагачаснае грашовае абарачэнне, а назва вопраткі (кажух, капеняк[11], даламан[12], дэлія[13], зангли[14] ад паса, брайцары[15] і іншыя рэчы) – пра матэрыяльную культуру[16]. Польскія злотыя, літоўскія грошы на той час суадносіліся наступным чынам: 1 капа літоўскіх грошаў = 1,25 капы польскіх грошаў = 2,5 польскіх злотых = 60 літоўскіх грошаў[17]. У тэстаменце згадваецца ўсяго 60 коп наяўных грошай, але без уліку грошай на пахаванне.

Авечкі з ягнятамі, сала, саланіна і соль, на нашу думку, звязаны з прафесійнай дзейнасцю Барталамея, як рэзніка. Нельга не прыгадаць і хлопца (вучня) Крыся. Вялікая колькасць вопраткі кажа пра дабрабыт гэтага рамесніка. Сярод іншых даўжнікоў адзначаны гарадзенскія рамеснікі швец Крысь, рымар Крыштаф, мечніка Каспар, а таксама гарадзенскія магістрацкія ўраднікі Фёдар Юрэвіч, лаўнік Аляксандр Казерадовіч, былы радца Ян Грандзіч і яго жонка. Паколькі многія людзі былі на момант складання тэстамента вінны Барталамею значныя сумы грошай, можна сцвярджаць, што Барталамей Галоўчыц займаўся ліхвярствам.

У тэстаменце добра прасочваецца сваяцкія сувязі паміж тэстатарам і членамі яго сям'і, таму тэстамент можа выкарыстоўвацца як генеалагічная крыніца. У параўнанні з іншымі дакументамі тут пералічаны ўсе (за рэдкім выключэннем) бліжэйшыя сваякі. Да таго ж часам можна па асобных дэталях высвятліць узаемаадносіны ў сям'і, месца жыхарства і г.д. Напрыклад, кідаецца ў вочы тое, што амаль усю маёмасць тэстатар завяшчаў каталіцкаму касцёлу, што ўласціва чалавека такога дастатку. Такія распараджэнні дазваляюць казаць пра заможнасць сям'і і адсутнасць жывых дзяцей. Сваёй другой жонцы Барталамей пакінуў некалькі бочак сала і каня. Ён згадаў, што падчас хваробы жонка запісала яму 20 коп літоўскіх грошай. Сям'я Б. Галоўчыца складалася з

[10] Магчыма, назва вёскі ў накірунку якой ішла вуліца Азёрская.

[11] Капеняк – плашч ад дажджу без рукавоў.

[12] Даламан – гусарская верхняя куртка.

[13] Дэлія – від сукні з шырокімі рукавамі.

[14] Зангла (занкель) – запанка ці брошка ад паса.

[15] Брайцар (брайцарка) – металічнае кольца, на якім вісіць пас.

[16] Głoger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. W 4 t. Warszawa, 1985.

[17] Словарь древняго актоваго языка Северо-Западнаго края и Царства Польскаго / Составил Н. Горбачевский. Вильна, 1874. С. 332.

тэстатара, яго другой жонкі Рагіны Дземянаўны, сына нябожчыка(?) Стэфана, дзядзькі Венцлава, сына Рагіны ад першага шлюбу Якуба Крыся, роднага брата Барталамея Лаўрына, стрыечнай сястры Аўдоцці і яе мужа Міхаіла. Не ўзгаданы жонкі Венцлава, Якуба і Лаўрына, а таксама іх дзеці, што не дае поўнай карціны пра род Галоўчыцаў.

Што ж да знешняга боку тэстамента, то відавочна, што тэстамент складаўся незадоўга да смерці тэстатара. Запісаны і зацверджаны ён быў лаўніцкім судом, які быў спецыяльна скліканы, у прысутнасці бурмістра. Прысутнасцьураднікаў надавала яму законнасць, аб чым адзначана ў дакуменце: “Суд гайны быў спраўлены”. Сам факт пра згадванне месца правядзення суду як “дом пані Барталамеевай” можа сведчыць пра своеасаблівую прыпіску пры актыкацыі, калі ўжо пана Барталамея не было ў жывых, а хата стала законнай маёмасцю яго жонкі і ўжо згадваецца толькі як яе ўласнасць. Але, на нашу думку, больш верагодна, што хата і першапачаткова належала толькі пані Рагіне. Пра гэта ўскосна сведчаць наступныя факты. Па-першае, у самім тэстаменце нідзе не згадваецца якая-небудзь нерухомасць, у тым ліку і гэтая хата, што можа сведчыць пра адсутнасць на той час у Барталамея Галоўчыца сваёй нерухомай маёмасці. Па-другое, у гэтай жа магістрацкай кнізе ёсць дакумент, дзе сказана, што 7 мая 1636 г. Барталамей Галоўчыц з жонкай Рагінай Дземянаўнай прадалі пляц з домам Юзафу Градкоўскаму[18], г.зн. свой дом Барталамей прадаў, а жыць перайшоў да жонкі. Па-трэцяе, сам факт, што і Рагіна, і Барталамей уступілі ў шлюб другі раз можа сведчыць пра шлюб па разліку.

Такім чынам, дадзены тэстамент з’яўляецца цікавай крыніцай па гісторыі гарадзенскага мяшчанства, які асвятляе сямейныя адносіны, матэрыяльны стан, веравызнанне.

***Дадатак.***

# Тэстамент Барталамея Галоўчыца

*Тэстамент напісаны лацінскімі літарамі, скорапісам на польскай мове сярэднепольскага перыяду. Насавыя літары “ą” і “ę” заўсёды выдзяляюцца. Дыфтонг “rz” пішацца злітна, таму ў некаторых выпадках падобны на літару “n”. Літара “t” пішацца без левай часткі папярэчыны, таму “t” і “r” у большасці выпадкаў адрозніваюцца толькі па сэнсе. Літары “i”, “j” і “y”(без кропкі) часам блытаюцца, аднак на канцы слоў звычайна выкарыстоўваецца “y”, а перад галоснымі “i”. На канцы слоў літара “l” звычайна падвойная (legowałł). Усе імёны, прозвішчы, пасады і назвы прафесій пішуцца з вялікай літары (у публікацыі з вялікай літары толькі імёны і прозвішчы).У тэксце ўжываюцца, як традыцыйныя скароты—геаграфічныя і грашовыя,так і графічные пры пазначэнні бочак з соллю. Пры траскрыбіраванні тэксту мы прытрымліваліся палітарнай перадачы, з раскрыццём*

[18] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, ад. з. 1, арк. 262.

*вядомых скаротаў у дужках, пазначэннем аркушаў кнігі ў квадратных дужках. У перакладзе пазначаліся толькі аркушы.*

[108 адв.] Sąd Gainy potrzebny był wyłozony w domu P(ani) Bartłomieiowey Hołowczycowey rzezniczka y miesz(czanka) Grod(zenska), był odprawowany przez sławetnych PP(anow) Matheusza Jabłonowskie(g)o, Fiedora Jurewicza ławnikow y P(ana) Kazimierza Petransewicza pisarza m(eys)ca Gro(dzienskiego), przy bytnosci P(ana) Grzegorza Worobieiowicza bur(mistra). Roku 1639, dnia 4 Aprilis.

Testament.

Przed ktorym urzędem będac zastany P(an) Bartlomiey Holowczyc na poscieli acz na ciele chory, ale na umysle y rozumie barzo dobrze zdrowy, ostatnią wole swoią tym testamentem swym chcął rosporządzic. Naprzod ofiarował Bogu duszę, a ciało przy kosciele Farskim Grod(żeńskim) pogrzesc roskazałł na cmentarzu. A po smerci moiey na Farę leguie kop 10 s tych p(e)n(ę)dzy, co mi małzonka moia, takze chora na poscieli będąc przy mnie, legowałła mnie iako męzowi swemu po smierci swoiey kop 20 lit(ewskich). A na kosciołł dominikanski kop 10, za co powinni P(ana) Boga prosic za dusze moją. Tenze testator mianował u Janowey Grandziney, rackiey bywszey, dlugu ma zło(tych) 20, kop dwie przez nieboszczyka winne(g)o, a przez nie samą kop 6. Ten dlug zapisuie y leguię oycom jezuitom, przy tym y talerzow cynowych pięc, a pułmisek szosty. Tenze testator zeznał u Alexandra Kozieradowicza terazneys(z)e(g)o rackiego zło(tych) 6, y to oycom jezuitom legowałł. Soli 2 s tey soli tenze testator legowałł dziackiewi swemu Wencławowi Hołowczycowi iednę soli y sadeł dwie y kocioł do te(g)o temuz Wencławowi. A zenie swey teraznieyszey na jmie Raginie Machniance Bartłłomieiowey sadeł cztery. Ten ze testator legowałł y paneuke szrzednią temuz Wencławowi Hołowczycowi. Tenze testator zeznałł długu sobie winne(g)o u Krzyska szewca kop 2, u Krzysztopha rymarza kopa jedna y u P(ana) Fiedora Jurewicza ławnika Grod(ziemskiego) zło(tych) 9 temuz Wencławowi dziackowi swemu Hołowczycowi oddac. Owiec swoie jałowych chłopcowi swemu Krzysiowi Jakubowiczowi, y co dwie kopie u Krzysia Szewca to temuz chłopcowi Jakubowiczowi. Syna me(g)o Stephana doloman y kozuch to temuz chłopcowi do Konopielek. Siestrze cioteczney na jmie Audoci owiec dwoie z jagnięty, połec słoniny y sadło jedno. A bratu swemu ławrynowi sadło y owce [109] owcę z jagnięciem. Tenze testator zeznałł zupan szary Jakubusiowi pasierzbowi swemu legowałł, a delią na mnie włozyc czerwoną. Parchwien rzeznik winien kop 4, co to mu darowałł zeby za duszę ie(g)o P(ana) Boga prosiłł. Sadło iedno Kadyszo wi Mazurowi swemu powinnemu legowałł, Sielimonowi Bartłomieiowiczowi sadło jedno takze legowałł. Tenze testator legowałł ciotczance swey z bratem ławrynem niech razdzielą po połowicy beczki iedney, ktorem Wencławowi Hołowczycowi legowałł. A szablę chłopcowi Krzysiowi, ktora iest u Kaspra miecznika nic nie winno legowałł. Srebra dzięg 30, y od pasa zangły dwoie z łancuszkiem, y cokolwiek iest drobiazgu, oprocz zony swey srebra, to oycom Bernardynom, y drugie srebro od ładownice, braicarow pięc, zangłow dwa, przęcek dwie, kolek dwie, dziwek szesc, czapraszka iedna, zlewek srebra y sygnet

tymze oycom bernardynom legowałł. Kopieniak y kozuch moy własny Michałowi Audocinemu męzowi do konopielek tenze testator legowałł. A co sie tknie gotowych p(e)n(ę)dzy, kturych nie wiele y tych nie mianowałł, ostawiłł sobie na pochowanie. A executorami te(g)o testamentu uczyniłł Wencława Hołowczyca y pasierzba swe(g)o Jakuba Harasimowicza, syna wlasne(g)o małzonki swoiey teraznieyszey, zostawuiąc sobie moc y władzę az do smierci w tey wyszey pomienioney liegatiey swoiey. Z Rybakow Jezierskich u Cimocha Truski kon szpakowaty zony moiey teraznieyszey. A kop pięc moia własna, ktorą naidzą powinni, moi co są w Konopielkach, ci maią odyskac y podzielic sie. Ktory to testament iest za zesłaniem urzędowym stwierdzony y umocniony. Matheusz Jabłonowsky ręką swą.

## Пераклад

[108 адв.] Суд гайны, які адбыўся ў доме пані Барталамеевай Галоўчыцавай, рэзнічкі і мяшчанкі Гародні, быў выканаңы вядомымі панамі Матэушам Ябланоўскім, Фёдарам Юрэвічам лаўнікамі і панам Казімірам Петрансевічам пісарам горада Гародні, у прысутнасці пана Грыгорыя Варабеёвіча, бурмістра. Году 1639, дня 4 красавіка.

Тэстамент

Перад гэтым урадам асабіста вызнаў пан Барталамей Галоўчыц на пасцелі, целам хворы, але ў добрым і здаровым розуме і пры разуменні. Апошнюю волю сваю гэтым сваім тэстаментам хацеў абвясціць. Найперш ахвяраваў Богу душу, а цела загадаў пахаваць на могілках пры фарным касцёле ў Гародні. А па смерці маёй на фару завяшчаю коп 10 з тых грошай, што мне жонка мая, таксама хворая на пасцелі будучы пры мне, завяшчала мне, як мужу свайму, пасля сваёй смерці 20 коп літоўскіх. А на касцёл дамініканскі – 10 коп, за што павінны Пана Бога прасіць за маю душу. Той жа тэстатар згадаў, што жонка былога радцы Яна Грандзічы, доўгу мае 20 злотых і 2 капы, якія вінен нябожчык муж, а яна сама 6 коп. Той доўг запісваю і завяшчаю айцам езуітам, пры тым і талерак алавяных 5 і паўмісак шосты. Той жа тэстатар згадаў у Аляксандра Казерадовіча, цяперашняга радцы, 6 злотых, і таксама падараваў айцам езуітам. Солі 2 бочкі, з той солі той жа тэстатар завяшчаў свайму дзядзьку Венцлаву Галоўчыцу і адну бочкі солі і 2 бочкі сала і кацёл таксама таму ж Венцлаву. А жонцы сваёй цяперашняй па імені Рагіна Махнянка Барталамеева сала 4 бочкі. Той жа тэстатар завяшчаў і сярэднюю панеўку таму ж Венцлаву Галоўчыцу. Той жа тэстатар загадаў, каб яму вінныя доўгі шаўца Крыся 2 коп, рымара Крыштафа капа адна і пана Фёдара Юрэвіча, гарадзенскага лаўніка, 9 злотых аддаць таму ж свайму дзядзьку Венцлаву Галоўчыцу. Сваіх яловых авечак падараваў свайму хлапцу Крысю Якубовічу, і што дзве капы ў шаўца Крыся, таксама таму ж хлапцу Якубовічу, а майго сына Стэфана даламан і кажух – таму ж хлапцу да Канапелек. Стрыечнай сястры па імені Аўдоцця авечак дзве з ягнятамі, палову саланіны і сала 1 бочку, а свайму брату Лаўрыну аддаў сала і авечку [109] і ягня

той жа тэстатар. Шэры жупан Якубусю пасынку свайму завяшчаў, а чырвоную дэлію на мяне апрануць. Рэзнік Пархвень вінен 4 капы, гэта яму дараваў, каб за душу яго Пана Бога прасіў. Сала 1 бочку Кадышу Мазуру свайму віннаму завяшчаў, Селімону Барталамееваму сала адно таксама завяшчаў. Той жа тэстатар завяшчаў сваёй сястры і брату Лаўрыны, каб яны раздзялілі напалову адну бочку з тых, якія Венцлаву Галоўчыцу завяшчаў, а шаблю завяшчаў хлопцу Крысю, якая ў нічога не віннага мечніка Каспара. Серабра 30 грошай і ад паса занклы два з ланцужком і трохі ёсць драбнаты, акрамя сваёй жонкі серабра, тое айцам бернардынам і другое серабро са шкатулы, брайцараў – пяць, занглаў – два, прэнцікаў – два, колкоў – два, дзівэк – шэсць, чапрачок – адзін, злітак серабра і сыгнет тым жа айцам бернардынам завяшчаў. Капеняк і мой уласны кажух Міхаілу, мужу Аўдоцці да Канапелек той жа тэстатар завяшчаў. А што датычыцца гатовых грошаў, якіх не шмат і тых не прызначыў, а пакінуў сабе на пахаванне. А выканаўцамі таго тэстамента зрабіў Венцлава Галоўчыца і пасынка свайго Якуба Гарасімовіча, сына уласнага сваёй цяперашняй жонкі, пакідаючы сабе сілу і ўладу аж да смерці у тым вышэй памянёным запісе сваім. З Рыбакоў Язерскіх у Цімоха Трушкі шэры конь маёй цяперашняй жонцы. А 5 коп маіх уласных, якія знайсці павінны, што ёсць у Канапельках і павінны адшукаць і падзяліць самі. Гэты тэстамент у прысутнасці ўрада зацверджаны і ўмацаваны. Матэуш Ябланоўскі ўласнаю рукой.

*Кацярына Дзянісава,*
*Наталля Сліж, кандыдат гіст. навук (Гродна-Вільня)*

# *Inscriptiones Ecclesiarum Grodnensium:* Касцёл Маці Божай Анёльскай і кляштар францысканаў

Інскрыпцыі ў храмах як гістарычныя крыніцы сталі аб'ектамі даследавання зусім нядаўна[1]. Гістарыяграфія па інскрыпцыям гарадзенскіх касцёлаў небагатая, але тым не менш заслугоўвае ўвагі. У прыватнасці, пры апісанні гарадзенскіх касцёлаў Юзаф Ядкоўскі цытаваў надпісы на шыльдах[2]. Толькі дзякуючы гэтаму захавалася, напрыклад, інскрыпцыя пра род Юндзілаў у касцёле Маці Божай Анёльскай. У апошнія гады даследаванні інскрыпцый друкаваліся ў часопісе *Герольд-Litherland*[3]. Зразумела, што дадзеную тэму нельга лічыць вычарпанай.

Францысканскі ордэн быў заснаваны Святым Францыскам Серафіцкім у 1209 г. Што ён сабой уяўляў? Францысканцы – Ordo Fratrum Minorum (OFM), жабрацкі ордэн, які быў заснаваны ў мэтах захавання евангелля і дасягнення падабенства свайго з жыццём Хрыста, у першую чаргу праз убоства. У шырокім сэнсе тэрмін "францысканцы" ўключае тры аўтаномныя сям'і: 1. Ордэн Братоў Меншых, якія носяць цёмнакарычневы хабіт. Ён вылучаецца самай строгай інтэрпрэтацыяй францысканскіх правіл і складаецца з чатырох адгалінаванняў: Ордэн Братоў Меншых Рэгулярнай Абсэрванцыі (Fratres Minore Regularis Observantiae, OFMObs), якіх называюць у Польшчы і ў Беларусі бернардынцамі, Ордэн Братоў Меншых Сціслай Абсэрванцыі (Ordo Fratrum Minorum Strictoris Observantiae), у які ўваходзяць дыскалцэаты (Ordo Fratrum Minorum Discalceatorum, OFMDisc), рэфарматары (Ordo Fratrum Minorum Reformatorum, OFMRef) і рэкалектары (Ordo Fratrum Minorum Recollectorum,

---

[1] Prokop K. Nowożytne inskrypcje ze świątyń bernardyńskich na Litwie i Białorusi (XVI–XVII w.) // Lituano-Slavica Posnaniensia. 2007. T. XII. S. 144–145.

[2] Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 71–102.

[3] Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня (працяг) // Герольд-Litherland. 2001. № 2. С. 78; Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня (працяг) // Герольд-Litherland. 2001. № 3–4. С. 120–121; Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня // Герольд-Litherland. 2002. № 3–4 (7–8). С. 191; Гардзееў Ю. Матэрыялы да генеалогіі і эпіграфікі ў гарадзенскім фарным касцёле // Герольд-Litherland. 2004. № 1–2 (13–14). С. 27–29; Паўлоўская Г. Лацінскія пахавальныя інскрыпцыі XVII ст. у Бернардынскім касцёле ў Горадні // Павятовая шляхта ВКЛ: гісторыя, геральдыка, генеалогія, культура (XVI–XVIII ст.). Матэрыялы навуковай канферэнцыі, Горадня, 18 лютага 2005 г. Горадня, 2006. С. 37–44.

OFMRec); 2. Ордэн Братоў Меншых Канвентуальных з чорным колерам хабіту (Ordo Fratrum Minorum Conventualium, OFMConv). Братоў гэтага ордэна на тэрыторыі Польшчы і Беларусі называюць францысканцамі; 3. Ордэн Братоў Меншых Капуцынаў з ярка карычневым колерам хабіту і адменным пакроем (Ordo Fratrum Minorum Capuccinorum, OFMCap) і Трэці Ордэн Рэгулярны (Tertius Ordo Regularis, TOR)[4].

У Гародні францысканцы з'явіліся дзякуючы фундацыі Зузаны і Яўстафія Курчаў. Яны ахвяравалі ордэну Кудаеўскую камяніцу, якая знаходзілася ў Гародні на вул. Маставая і была набытая ў гарадзенскіх мяшчан Стэфана, Мікалая і Яна Кудаеўскіх, а да таго яшчэ маёнткі Панямунь, Пракшоўчына, Гнойніца, купленыя ў гарадзенскай шляхты Крушынскіх, Ельскіх і Прокшы[5] (1635)[6]. Камяніца была пазней прададзена віленскаму кашталяну, пісару ВКЛ, гарадзенскаму старосце Андрэю Катовічу, а той яе падараваў кармелітам (1651)[7]. Фундацыйны запіс быў пацверджаны Уладзіславам IV у 1639 г. За фундатарскую дзейнасць партрэты Я. Курча і яго жонкі былі змешчаны ў касцёле. Касцёл і кляштар пабудавалі ў 1639–1641 гг. Але падчас вайны 1654–1667 гг. усе пабудовы былі знішчаны. У першай палове XVIII ст. быў пабудаваны мураваны касцёл і кляштар. Кансэкраваны касцёл быў у літаратуры 1744 г., а ў 1761 г. адбылася частковая кансэкрацыя, што было звязана з капітальнай перабудовай. Гэта адзіны касцёл і кляштар, што былі заснаваны ў той час на левым беразе Нёмана. Але гэта не азначала, што яны знаходзіліся на ўскрайку культурнага і рэлігійнага жыцця горада. На 1775 г. кляштар валодаў 337 га зямлі, меў дзве карчмы, цагельню, кузьню, бровар, пякарню, друкарню, шэраг гаспадарчых пабудоў. У сувязі з паўстаннем 1830–1831 гг. кляштар быў скасаваны ў 1832 г., як і шмат іншых[8].

У 80-я гг XX ст. Надзеяй Высоцкай праводзілася інвентарызацыя касцёлаў Гарадзенскай вобласці, у тым ліку і касцёла францысканцаў. На жаль, эпітафіі і інскрыпцыі яе не зацікавілі. Былі толькі сфатаграфаваны дзве пліты, адна з іх прысвечана пакутам францысканцаў на "зямлі літоўскай", а другая – падзеям, звязаных з касцёлам. Згадваецца, што ў касцёле быў надгробак 1761 г., але ж не даецца ягонае апісанне. Гэта мог быць адзін з надгробкаў, якіх у касцёле было тры: адзін прысвечаны сям'і Юндзілаў, другі – Агінскім, а трэці – братам-францысканцам.

---

[4] Encyklopedia Katolicka. Lublin, 1989. T. V. s. 473.

[5] Я. Курч набыў часткі Панямуні ў Яна Марцінавіч Крушынскага і Марціна Грымалы ў 1610, а ў Яна Арцёмавіча Прокшы і яго сына Лукаша двор Панямунь і сенажаць пры ім (1620). Архіў гарадзенскага францысканскага касцёлу. Ф. 1, воп.1, ад.з. 6, 7.

[6] Makarczyk J. Kustodia Grodzieńska Zakonu Braci Mniejszych Konwentualnych w latach 1687–1832. Lida, 2005. S. 134–139.

[7] Архіў Гарадзенскага Францысканскага касцёлу. Ф. 1, воп.1, ад.з. 69.

[8] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. Supraśl, 2005. S. 160–171; Makarchyk J. Kustodia Grodzieńska Zakonu Braci Mniejszych Konwentualnych w latach 1687–1832. Lida, 2005. S. 43–46, 134–139, 165–166.

У правым бакавым нефе раней была крыпта. Уваход быў накрыты плітой з зацёртым гербам "Лебядзь" і надпісам на ёй.

D.[eo] O.[ptimo] M.[aximo]/ NA WIECZNY/ POKOY/ JASNIE WIELMOZNA/ JUNDZILLOW/ FAMILII.

Пераклад: "Божа Найлепшы, Найвышэйшы/ На вечны/ спакой/ Яснай Вяльможнай/ Юндзілаў/ сям'і.".

Пліта была прывезена з Крулеўца гарадзенскай кашталянавай Юндзілавай. Пра гэта сведчыць інвентар Францысканскага касцёлу за 1759 г.[9] Верагодней за ўсё тут пахаваны гарадзенскі маршалак Крыштаф Юндзіл, а пазней Канстанцыя з Юндзілаў, жонка мсціслаўскага кашталяна Самуэля Лазова, бо яны згадваюцца як мецэнаты дадзенага касцёлу. Канстанцыя ахвяравала 300 злотых на шпіталь для бедных (1730). А з маёнтка Галынка Крыштафам Юндзілам было прызначана на яго 12 злотых, бочка грэчкі, бочка ячменю, 6 гарнцаў солі. Фундацыйны запіс быў актыкаваны ў 1738 г.[10] Не спасылаючыся на крыніцы, Ю. Ядкоўскі адзначыў, што яна фундавала пабудову званіцы (1750), набыла арган, гадзіннік на вежу (1759), срэбную лампу для алтара (1763). Яе фундатарскі партрэт быў змешчаны ў касцёле ў 1753 г.[11] Ю. Ядкоўскі і Я. Арлоўскі адзначалі фундатарскі партрэт гарадзенскага маршалка Крыштафа Юндзілы, які памёр на 104 гаду жыцця. Выява знаходзілася на левым баку касцёла і была моцна пашкоджана[12].

У касцёле былі яшчэ дзве пліты, якія накрывалі дзве крыпты. Першая крыпта – Агінскіх, а другая – братоў-францысканцаў. Аднак яны не захаваліся.

З правага боку пад хорамі знаходзіцца пліта з белага мармуру з партрэтам, прысвечаная айцу-францысканцу Мельхіору Юзафу Фардону.

O[jćec] MELCHIOR/ JOZEF/ FORDON/ Franciszkanin/ 1862–1927.

Пераклад: "Айцец Мельхіор/ Юзэф/ Фардон/ францысканін/ 1862-1927".

Мельхіор Юзаф Фардон нарадзіўся ў Гародні ў сям'і збяднелай шляхты Бацькі – Якуб Фардон і Феліцыя з Луковічаў. У 1883 г. ён паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Пасля яе сканчэнне служыў пробашчам у Струбніцы (1887-1893), Дамброве Беластоцкай (1893-1903), у прыходзе Маці Божай Анёльскай у Гародні (1903-1905) і Усіх Святых у Вільне (1905-1909). У гады першай сусветнай вайны а. Мельхіор выратаваў жыццё 13 чалавекам, якія былі асуджаны на смерць. Яго яшчэ пры жыцці назвалі святым чалавекам за тую дапамогу, якую ён аказваў людзям. Калі ён памёр, жалоба была ва ўсім горадзе, а пахавальнае шэсце цягнулася на некалькі кіламетраў. У 2003 г. астанкі былі перанесены ў касцёл. Працэс яго беатыфікацыі быў распачаты яшчэ ў 70 гг. XX ст. Беластоцкай дыецэзіяльнай курыяй. Зараз ён працягваецца таксама намаганнямі святароў касцёлу[13].

---

[9] Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 102.

[10] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku... S. 164.

[11] Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 101.

[12] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910. С. 101.

[13] Макарчык Ю. Слуга Божы А. Мельхіор Фардон фрацішканін (1862–1927) / Пераклад з польскай мовы Д. Бічэль-Загнетава. 2007.

У правым бакавым нефе размешчана табліца з мармуру з фотаздымкам, прысвечаная айцу-францысканцу Аркадзю Вальтасу, з наступным надпісам.

S.[więtej] P.[amięci]/ o.[jćec] ARKADIUSZ WALTOS/ franciszkanin/ 1916–1975/ w dowód wdzięczności za 35 lat służby Bogu/ i posługiwania wiernym w tym kościele./ W 20-tą rocznicę śmierci/ wierni m.[iasta] Grodna.

Пераклад: "Святой памяці/ айцец Аркадзь Вальтас/ францысканін/ 1916-1975/ у доказ удзячнасці за 35 гадоў служэння Богу/ і вернікам у гэтым касцёле./ На 20-я ўгодкі пасля смерці/ вернікі г. Гродна".

Аркадзь Вальтас нарадзіўся ў 1916 г. у Львове. У гэтым жа годзе быў ахрышчаны ў прыхадскім касцёле Св. Антонія і атрымаў імёны Кароль Юзаф. Гэта быў не толькі адданы сваёй справе святар, але ж і вельмі таленавіты чалавек. Мала хто ведае, што ён быў знакамітым музыкам і таленавітым мастаком[14].

На пілоне ў цэнтральным нефе знаходзіцца памятная табліца, прысвечаная 600-годдзю славутага Міланскага эдыкту імператара Канстанціна.

313 + 1913 R./ TEM/ zwyciężysz.

Пераклад: "313+1913 г. / Гэтым/ пераможаш".

На першым пілоне ад уваходу на правым баку размешчана пліта з мармуру ў гонар Святога Максімільяна.

W tym kościele i klasztorze/ żył i pracował/ w latach 1922-1927/ SW. MAKSYMILIAN/ franciszkanin.

Пераклад: "У гэтым касцёле і кляштары/ жыў і працаваў/ у 1922-1927 гадах / Святы Максімільян/ францысканін".

Максімільян Марыя Кольбэ нарадзіўся 8 студзеня 1894 г. у Здуньскай Волі. У 1907 г. з братам Францыскам пачаў вучыцца ў францысканскай семінарыі ў Львове. У 1918 г. стаў ксяндзом. Падчас другой сусветнай вайны ў 1941 г. Максімільян трапіў у канцэнтрацыйны лагер Аўшвіц. У гэтым лагеры Святы Максімільян аддаў сваё жыццё за вязня Францыска Гаёўнічка, які быў абраны на галодную смерць. Максімільян Кольбэ скончыў сваё жыццё 14 жніўня 1941 г. у блоку 13, так званым "блоку смерці". Да апошняга моманту ён падтрымліваў людзей, што знаходзіліся побач, заахвочваў іх да малітвы[15].

У левым бакавым нефе знаходзіцца пліта, якая расказвае аб пакутах францысканцаў на землях Вялікага княства Літоўскага.

Vilnae/ [Prim]o: A.[nno]D.[omini] 1323 P.[atres] Ord.[inis] Min.[oris] Conven.[tus] Franciscani/ primi ingresi urbem Vilnam gratia prae/ dicandi fidem catholicam N.[umer]o 14 Fratrum/ mortem subiisse, alii Cruce affixi ca/ pita plaxi in hac urbe/ [Secund]o A.[nno] D.[omini] 1341 P.[atres] Francicani N[umer]o 36 ob ean/ dem catholicam fidem in urbe Vilna ab in/ cursione Tatarorum Martyrium subiisse/ [Terti]o: A.[nno] D.[omini] 1406 quinque P.[atres] Franciscanorum in ur/ be Vilna crudelissime occisos fuere a G.[eorgius] S.[viatoslavide] S.[molescensi] D.[uce]/

[14] Lignum vitae. Rocznik teologiczny. Lodz, 2002. S. 346-358.

[15] Dyczewski L. Swięty Makszmilian Maria Kolbe. Warszawa, 1984.

Supressi sunt 1864 Augu.[sti] 12/ Hoc monumentum donavit R.[everendiimus] P.[ater] Mich.[ael] Orlowski Franciscan[us].

Пераклад: "У Вільні/ У першы раз у 1323 г. ад нараджэння Хрыста першыя айцы Ордэну Меншых Братоў Канвентуальных, францысканцы/ прыбыўшы ў горад Вільня,/ дзеля апавяшчэння асноўных прынцыпаў веры каталіцкай у колькасці 14 братоў,/ былі забіты: адных да крыжа прыбілі, другія былі забіты ў гэтым горадзе./ У другі раз, у 1341 г. ад нараджэння Хрыста айцы францысканцы ў колькасці 36 братоў за тую ж/ самую каталіцкую веру ў горадзе Вільня / з-за нашэсця татараў панеслі пакутніцкую смерць./ У трэці раз, у 1406 г. ад нараджэння Хрыста пяць айцоў францысканцаў у/ горадзе Вільня самым жахлівым спосабам былі забіты Юрыем Святаслававічам, князям Смаленскім. /У 1864 г. 12 жніўня ордэн быў забаронены./ Падараваў гэты помнік вялебны айцец Міхаіл Арлоўскі, францысканец".

Такая ж пліта (па зместу) знаходзіцца ў кафедральным касцёле Св. Станіслава і Уладзіслава ў Вільні. У адрозненні ад гарадзенскай віленская пліта выглядае больш шыкоўна: на чорным мармуры залатыя літары. Віленская пліта была апісана, але ж скарачэнне G.S.S.D. не было расшыфраванае[16]. Магчыма, тут схаванае імя князя Смаленскага Юрыя Святаслававіча, які ў 1406 г., паводле Тэадора Нарбута, напаў на францысканскі кляштар у Вільні[17]. Таксама сімвалічнай з'яўляецца выява гары Трох крыжоў, на якой загінулі сем францысканцаў. Надпіс на гэтай пліце павінен быў нагадваць пра гісторыю францысканскага ордэну.

Побач знаходзіцца пліта, прысвечаная фундатару касцёла Яўстахію Курчу і прывілею Уладзіслава IV.

Conventui Grodnensi PP. Franciscanorum fundator illustris/ simus Eustachius Kurcz Capitaneus Upitensis. Sedem/ et domicilium certum elegit in domo sua lapidea olim/ iuxta plateam ipsius Grodnae Mostowo dictum quam et dota/ vit illum una cum rustico praedio Poniemonie anno 1635/ Ast urgente mandato Serenissimi Poloniae Regis Ladislai IV/ in suprema concursione sub die 13 Aprilis 1639 anni lata ipsi Pa/ tres Conventuales in agris alterius ripae fluvii Niemen partim/ coemptis, partim vero donatis templum et monaterium muratum ex/ radditibus memorati praedi Poniemonie et aliorum Benefactorum/ elemosynis decursu XVII saeculi extrui fecerunt/ ecclesiae vero sub titulo Beatissimae Maria Virginis Angelorum/ vulgo Portiunculae consecratio facta est anno 1761 ab Epicopo/ Felice Towianski Franciscano suffraganeo Albae Russiae cuius conse/ crationis anniversarium selebratur Dominica 26 post Pentecostes/ hoc monumentrum 1874 anno sculpsit R. P. Michael Orlowski Franciscanus.

Пераклад: "Гарадзенскаму кляштару ордэна францысканцаў фундатар, найсвяцейшы Яўстахій Курч, упіцкі староста, які жыў у горадзе Гродна на

[16] Inskrypcje z wileńskich kościołów. T.1 / Pod red. W. Appela i E. Ulčinaitė. Vilnius, 2005. S. 83–84.

[17] Narbut T. Dodatki do dziejow narodu litewskiego Tomu V-go. Wilno, 1839. s. 2-3; Orłowski M. Mowa do ludu w Wilnie. Wilno, 1861. s. 34; Staich W. Chrzciciele Litwy. Wilno, 1935.

вуліцы Маставой, падараваў вёску Панямонне ў 1635 г., атрымаў пацверджанне ад вялікага караля польскага Уладзіслава IV на сваю фундацыю дакумент ад 13 красавіка 1639 года для тых айцоў ордэна на зямлю, якая знаходзіцца над ракой Нёман, з якога частка касцёла і кляштара была збудавана з маёнтка Панямонне, які згадваўся раней, і іншых ахвяраванняў ў XVII стагоддзі атрыманых. Касцёл пад назвай Найсвяцейшай Панны Марыі Анёльскай часткова кансэкраваны ў 1761 г. біскупам Феліксам Тавянскім, францысканцам, Беларускім суфраганам, якога гадавіна святкуецца ў 26 нядзелю пасля зыходжання Святога Духа. Гэты помнік быў узведзены ў 1874 г. Міхаілам Арлоўскім, францысканцам".

На сённяшні дзень у касцёле Маці Божай Анёльскай не захавалася аніводнай шыльды XVII–XVIII стст. У дакументах згадваецца толькі тры шыльды таго часу, якія раней там знаходзіліся. Вядомы надпіс толькі адной з іх, прысвечанай сям'і Юндзілаў. У касцёле знаходзіцца шэсць шыльдаў XIX – XX ст. Інскрыпцыі на двух з іх зроблены на лацінскай мове, а на чатырох – на польскай. Тры шыльды прысвечаныя падзеям – пакутніцтву францысканцаў у ВКЛ, фундацыі касцёла, Міланскаму эдыкту, а тры – асобам: святому Максімільяну, айцу Аркадзю Вальтасу і айцу Мельхіёру Фардону.

Гэтыя інскрыпцыі з'яўляюцца носьбітамі гістарычнай, культурнай і рэлігійнай памяці. Яны звяртаюць на сябе ўвагу святароў і прыхаджан. Згадкі пра заснавальнікаў касцёлу, ксяндзоў заўсёды будуць прыкладам для наступнага пакалення духавенства. Яны ствараюць лакальную памяць, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і мае вялікі сэнс для супольнасці.

pawet.net

# Змест

Прадмова ... 3

## Гісторыя. Гародня ў XII – XVIII ст.

*Краўцэвіч Аляксандар*
Фармаванне гістарычнага цэнтру Гародні ... 8

*Янушкевіч Андрэй*
Харугва Гарадзенскага павету ў паспалітым рушэнні ВКЛ 1567 г. ... 17

*Borowik Przemysław*
Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie
podczas „potopu moskiewskiego” (1655-1661)
oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali ... 29

*Катлярчук Андрэй*
Кейданская унія 1655 г. паміж Вялікім Княствам Літоўскім
і Швэцыяй і шляхта Гарадзенскага павету ... 40

*Галубовіч Віталь*
Пастулаты Гарадзенскага сойміка на Сойм 1646 г. ... 48

*Мацук Андрэй*
Эліта Гарадзенскага павету ў перыяд праўлення Аўгуста III. 1733-1763 гг. ... 54

*Сліж Наталля*
З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI – XVIII ст. ... 64

*Лявшук Владимир*
Иезуитский коллегиум в Гродно XVII-XVIII стст.:
очерк эволюции забытого образовательного учреждения ... 96

*Кітурка Ірына*
Антоній Тызенгаўз і Гарадзенская школа мернікаў. Другая палова XVIII ст. ... 105

## Гісторыя. Гародня – Горадня – Гродна ў XIX – XX ст.

*Соркіна Іна*
Насельніцтва Гародні паводле апублікаваных матэрыялаў
Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расейскай імперыі 1897 г. ... 112

*Киштымов Андрэй*
Гродно и неманский водный путь. Конец XVIII – начало XX в. ... 136

*Смалянчук Алесь*
Горадня на старонках “Нашай Нівы”. 1906 – 1910 гг. ... 145

*Чарнякевіч Андрэй*
З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту.
Канец 1918 — пачатак 1921 г. ... 151

*Анатоль Трафімчык*
Праявы антысаветызму ў сістэме школьнай адукацыі
на Гарадзеншчыне ў 1939 – 1941 гг. .......... 173

## Гістарыяграфія. Крыніцазнаўства

*Гардзееў Юры*
Горадабудаўнічая культура Гародні: паміж фактам і вымыслам .......... 178

*Мась Вольга*
Карты і планы Гродна XVII-XX ст. .......... 191

*Сабалеўская Вольга*
Крыніцы па габрэйскай "жаночай гісторыі"
ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гародні .......... 204

*Шаланда Аляксей*
Прыватны ліст віленскага цэйкварта Вільгельма Поля
ад 6 мая 1641 г. аб водаправодзе і арсенале ў Горадні .......... 211

*Грыб Антон, Яцкевіч Зміцер*
Тэстамент гарадзенскага мешчаніна Барталамея Галоўчыца 1639 г.
як крыніца па гісторыі беларускага мяшчанства ..........

*Дзянісава Кацярына, Сліж Наталля*
Inscriptiones Ecclesiarum Grodnensium:
Касцёл Маці Божай Анёльскай і кляштар францысканаў .......... 221

pawet.net